SCRIPTOR UNIVERSITATIS

У. І. Пічэта

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ







Я не гісторык і таму прачытаў кнігу Уладзіміра Іванавіча Пічэты «Гісторыя Беларусі» з цікавасцю чалавека, якому хочацца ведаць гісторыю сваёй краіны. Але гэтая кніга цікавая для мяне і тым, што напісана першым рэктарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Значнасць асобы У. І. Пічэты ўяўляецца ўжо са сціслага пераліку асноўных момантаў біяграфіі вучонага-гісторыка. Ён нарадзіўся ў 1878 годзе ў Палтаве (Украіна). Скончыў Маскоўскі універсітэт, дзе пасля працаваў і стаў прафесарам. У сваіх навуковых працах даследаваў гісторыю Беларусі, Украіны, Расіі, Польшчы, Чэхіі, Сербіі, Балгарыі і Літвы.

Аўтар больш як 500 навуковых прац, акадэмік АН БССР, АН СССР, заслужаны прафесар БССР... Яго захапленне Беларуссю не абмяжоўвалася толькі пільнай увагай да яе гісторыі. Вучоны даследаваў беларускую мову, падтрымліваў творчыя і асабістыя сувязі з М. Багдановічам, Я. Купалам, Я. Коласам, М. Гарэцкім, З. Бядулем, Ц. Гартным і іншымі нашымі славутымі пісьменнікамі. Жыццё Уладзіміра Іванавіча было складаным. У 1930-я гады ён зазнаў арышт і ссылку. Але, нягледзячы на гэта, у канцы 1930-х і ў 1940-я гады вучоны здолеў плённа працягнуць творчую дзейнасць, якую не перапыняў да самай сваёй смерці ў 1947 годзе.

Мне вельмі прыемна, што спадчына У. І. Пічэты вяртаецца да нас і што Беларускі дзяржаўны універсітэт шануе памяць свайго першага рэктара. Дарэчы, у БДУ прысуджаецца прэмія імя У. І. Пічэты за значныя дасягненні ў сферы сацыяльных і гуманітарных навук.

«Гісторыя Беларусі», надрукаваная ў 1924 годзе і ўпершыню перавыдадзеная ў Белдзяржуніверсітэце пасля працяглага перапынку, я ўпэўнены, будзе карыснай для тых, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі і яе народа.

Рэктар БДУ,
прафесар В. І. Стражаў

SCRIPTOR UNIVERSITATIS

У. І. Пічэта

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2005

УДК 947.6
ББК 63.3(4Беи)
П36

*Серыя заснавана ў 2003 г.*

**Пічэта, У. І.**

П36 Гісторыя Беларусі / У. І. Пічэта. — Мн. : Выд. цэнтр БДУ, 2005. — 179 с. — (Scriptor universitatis).
ISBN 985-476-157-6.

Прапанаваная ўвазе чытачоў праца належыць выдатнаму вучонаму-гісторыку, аднаму са стваральнікаў і першаму рэктару БДУ, аднаму з арганізатараў Інбелкульта і Акадэміі навук Беларусі, Інстытута славяназнаўства і кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян Маскоўскага універсітэта акадэміку Уладзіміру Іванавічу Пічэту (1878—1947). «Гісторыя Беларусі» не перавыдавалася з дня першага выхаду ў свет. З'яўленне яе было абумоўлена неабходнасцю пашырэння ведаў па гісторыі Беларусі як сярод студэнтаў БДУ, так і сярод беларускага грамадства. Кніга ахоплівае падзеі ад старажытных часоў да Люблінскай уніі 1569 г.

Адрасуецца выкладчыкам гісторыі, студэнтам, а таксама ўсім тым, хто цікавіцца жыццём і навуковай спадчынай знакамітага гісторыка.

**УДК 947.6**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 985-476-157-6**

© Афармленне. Выдавецкі цэнтр БДУ, 2005



*Владимир Иванович Пичета*

# НАПІСАНАЕ — ЗАСТАЕЦЦА

Кніга, перавыданне якой вы трымаеце ў руках, убачыла свет 80 гадоў таму. Надрукаваная на шурпатай, ледзь не абгортачнай паперы, месцамі нязграбна падклееная, з пажоўклымі абарванымі старонкамі, гэта кніга перажыла ўсё: і ганьбу вобыскаў, і вогнішча вайны, і цяжар забыцця. Але вось яна з'явілася да нас ізноў, другім выданнем, і яе аўтар па-ранейшаму імкнецца данесці да нас свае веды, думкі і пачуцці. Гэтая кніга называецца проста — «Гісторыя Беларусі», і мае яна такі ж цяжкі лёс, як і наша краіна на працягу ўсяго часу свайго існавання.

Жыццёвы шлях яе аўтара Уладзіміра Іванавіча Пічэты сёння дастаткова вядомы і ў нашай краіне, і за яе межамі. Пра яго напісаны кнігі і сотні артыкулаў у газетах і часопісах, выдадзена большасць ягоных твораў. Аднак мы зноў і зноў звяртаемся да яго навуковай спадчыны, вывучаем пуцявіны яго лёсу. І не толькі таму, што ён быў адным са стваральнікаў і першым кіраўніком Беларускага дзяржаўнага універсітэта, але і таму, што ён — адзін з самых яркіх прадстаўнікоў яшчэ той «старой», дарэвалюцыйнай гістарычнай школы, які паслядоўна і мэтанакіравана вывучаў палітычную, сацыяльна-эканамічную і культурную гісторыю Беларусі.

У 1920-я гг. — у той час, калі У. І. Пічэта ствараў сваю «Гісторыю Беларусі», — толькі закладваліся асновы нацыянальнай гістарыяграфічнай канцэпцыі. Тады ў навуковым асяроддзі меўся шэраг прац, якія асвятлялі гісторыю Беларусі цалкам. Гэта былі «Кароткая гісторыя Беларусі» В. Ю. Ластоўскага, «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» У. М. Ігнатоўскага, гістарычны нарыс «Асновы дзяржаўнасці Беларусі» М. В. Доўнар-Запольскага, «Нарыс гісторыі нацыянальнага і рэвалюцыйнага руху беларусаў» Ф. Ф. Турука і інш. З гэтымі працамі У. І. Пічэта быў добра знаёмы[1]. У прыватнасці, ён высока ацэньваў працу У. М. Ігнатоўскага як «з'яву вялікай культурнай важнасці» і адзначаў, што яна «дае яркае і дакладнае ўяўленне аб асноўных шляхах і кірунках у развіцці нацыянальна-культурнай самасвядомасці беларусаў»[2]. Разам з тым Уладзімір Іванавіч падкрэсліваў, што маецца цэлы шэраг нераспрацаваных пытанняў, якія чакаюць свайго даследчыка.

---

[1] *Пичета В.* Новейшая история Белоруссии в зарубежной историко-политической литературе // Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ. 1921. № 1. С. 29–32; *Его же.* Новые работы по истории Белоруссии // Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ. 1921. № 2. С. 18–24; 1922. № 1. С. 15–18; № 2. С. 10–13; № 3–4. С. 34–37.

[2] *Пичета В.* Новые работы по истории Белоруссии // Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ. 1922. № 1. С. 16–17.

Відавочна, што У. І. Пічэта лічыў пільна патрэбным стварэнне новай працы па гісторыі Беларусі. Такая праца была неабходна ўсім навучэнцам і асабліва студэнтам універсітэта і іншых ВНУ, бо папярэднія спробы, нягледзячы на іх вялікую папулярнасць, паступова пераставалі адпавядаць узроўню гістарычных ведаў.

Нельга не адзначыць, што рэктар-гісторык, які доўгі час займаўся вывучэннем і выкладаннем беларускай гісторыі, павінен быў публічна, праз вучэбнае выданне выказаць свой пункт гледжання на гістарычны шлях, што прайшлі беларусы. Вядома, што «Гісторыі Беларусі» папярэднічала напружаная выкладчыцкая праца яе аўтара. Уладзімір Іванавіч, нягледзячы на велізарную загружанасць рэктарскімі абавязкамі, вёў актыўную педагагічную дзейнасць: ён быў вымушаны чытаць разнастайныя лекцыйныя курсы, каб забяспечыць выкананне вучэбнага плана ва ўмовах катастрафічнага дэфіцыту прафесарскага складу. Як прафесар факультэта грамадскіх навук (ФГН) ён з пачатку дзейнасці БДУ чытаў курсы па расійскай гісторыі, па гісторыі рускага і беларускага права. У хуткім часе, якраз перад выданнем свайго вучэбнага дапаможніка, У. І. Пічэта стаў выкладаць асобныя курсы беларускай гісторыі і крыніцазнаўства, а таксама весці некалькі семінараў па некаторых пытаннях палітычнай і эканамічнай гісторыі Вялікага княства Літоўскага XVI ст. Для будучых эканамістаў і юрыстаў ён чытаў курс «Гісторыя народнай гаспадаркі Расіі і Беларусі». Калі У. І. Пічэта знаходзіўся за кратамі па абвінавачванні ў антысавецкай дзейнасці, ён з поўным правам падкрэсліваў у сваім творы «Маё грамадска-палітычнае крэда», напісаным дзеля апраўдання яго дзевяцігадовага перыяду працы ў Беларусі (1921—1930), што ён «...паставіў на моцны фундамент вывучэнне эканомікі, гісторыі і культуры Беларусі»[1].

Праца У. І. Пічэты ахоплівае перыяд ад старажытнасці да Люблінскай уніі (1569). Падкрэслім, што гэта толькі першая частка «Гісторыі Беларусі». Верагодна, другая частка павінна была ахапіць перыяд ад канца XVI ст. да пачатку XX ст. Аднак яна не была выдадзена, хаця, магчыма, была створана гісторыкам. Неабходна адзначыць, што адначасова У. І. Пічэта працаваў над «Гісторыяй сельскай гаспадаркі і землеўладання на Беларусі» (яе першая частка выйшла ў Мінску ў 1927 г. і ахоплівала перыяд да канца XVI ст). Аднак скончыць абедзве працы У. І. Пічэта не здолеў, бо ў 1929 г. яго беспадстаўна не перавыбралі на пасаду рэктара БДУ, а неўзабаве і арыштавалі.

Як адзначалася, У. І. Пічэта быў добра знаёмы з папярэднімі працамі па гісторыі Беларусі, аднак зразумела, што, як адказны і аўтарытэтны навуковец, ён пайшоў сваім творчым шляхам. Па-першае, ён меў свой пункт гледжання на гістарычны працэс, па-другое, у яго ўжо быў распрацаваны курс лекцый па гісторыі беларускага народа, які ён чытаў у Маскве ў 1918—1920 гг. у Беларускім народным універсітэце. Відавочна, менавіта гэты курс быў пакладзены ў аснову «Гісторыі Беларусі». Вялікую ролю адыгрывала і тое, што У. І. Пічэ-

---

[1] Архіў УФСБ РФ па Санкт-Пецярбургу і Ленінградскай вобласці. Арх.-улік. спр. № П-65245. Т. 19. Арк. 261.

та быў гісторык-прафесіянал і на той момант ужо меў багатыя навуковыя здабыткі[1]. Безумоўна, навуковыя стэрэатыпы і погляды аўтара адбіліся на яго працы самым непасрэдным чынам.

Асноўная перыядызацыя, якую У. І. Пічэта выклаў у сваім творы, заснавана на прынцыпе дзяржаўнай прыналежнасці Беларусі. Аўтар вылучыў у гісторыі Беларусі наступныя перыяды: 1. Дагістарычнае мінулае; 2. Гісторыя беларускага народа да другой паловы XI ст.; 3. Беларускія землі ў XI–XIII стст.; 4. Беларусь у складзе Вялікага княства Літоўскага; 5. Шляхецкая феадальная дзяржава (маецца на ўвазе Рэч Паспалітая).

Першы і другі перыяды асвятляюцца ў першым раздзеле працы «Тэрыторыя і яе мінулае». На думку У. І. Пічэты, этнічная тэрыторыя Беларусі «замкнёна ў чатырохкутніку рэк: Заходняй Дзвіны, Нёмана, Прыпяці, вышнявіны Дняпра з Бярэзінай» (с. 18), што супадае з высновамі этнаграфічных даследаванняў канца XIX – пачатку XX ст. У гэтым раздзеле аўтар паслядоўна разгледзеў рэльеф, рэкі Беларусі, глебы, клімат, раслінны і жывёльны свет. Усё гэта, як лічыў У. І. Пічэта, мае самы непасрэдны «ўплыў на гістарычнае жыццё народа», бо «пад уплывам і ў залежнасці ад прыроды ўтвараўся і першапачатковы эканамічны быт народа і ўвесь уклад яго жыцця» (с. 21). Разгледзеў ён і геапалітычны фактар: «Суседства з больш дужымі эканамічнымі і палітычнымі арганізмамі, як Польшча і Масква, з'яўлялася значнай перашкодай на шляху нацыянальна-культурнага і палітычнага развіцця беларускага народа» (с. 21).

У. І. Пічэта ўпершыню ўключыў раздзелы аб геалагічнай прыродзе Беларусі. Падкрэсліваючы яе вялікае значэнне для народнай гаспадаркі, ён не памыліўся. Звяртаючы вялікую ўвагу на археалагічныя помнікі, У. І. Пічэта, можа, упершыню ўключыў у гісторыю Беларусі археалагічную перыядызацыю па эпохах палеаліту, неаліту, бронзавым веку. Пры гэтым ён разгледзеў археалагічныя знаходкі найбольш даследаваных тэрыторый Мінскай, Віцебскай і заходніх паветаў Смаленскай губерняў, што супадае з этнічнай тэрыторыяй Беларусі. Тут аўтар падкрэсліў, што ў параўнанні з іншымі тэрыторыямі Беларусь з'яўляецца маладаследаванай. У адрозненне ад сваіх папярэднікаў, У. І. Пічэта палічыў неабходным змясціць тапанімічныя звесткі (гідронімы), што служаць для абгрунтавання высноў аб даславянскім насельніцтве тэрыторыі. Пры гэтым балцкае насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ён назваў значна больш познім этнонімам «літвіны».

Істотнай асаблівасцю працы з'яўляецца тое, што гісторыю Беларусі У. І. Пічэта разглядзеў у кантэксце агульнай славянскай гісторыі. Ён пачаў

---

[1] Литовско-польские унии и отношение к ним литовско-русской шляхты // Сб. статей, посвященных В. О. Ключевскому его учениками, друзьями и почитателями ко дню тридцатилетия его профессорской деятельности в Московском университете. М., 1909. С. 605–631; Литовско-русское государство // Русская история в очерках и статьях. М., 1910. С. 337–439; Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве. Ч. 1–2. М., 1917; История белорусского народа // Курс белорусоведения: Лекции, читанные в Белорусском народном университете в Москве летом 1918 г. М., 1918–1920. С. 1–84; История Литовского государства до Люблинской унии. Вильно, 1921.

гісторыю «ab ovo»[1], распавядаючы аб прарадзіме славян, аб суседзях славян — готах, іранскіх плямёнах скіфаў і сарматаў і інш. У. І. Пічэта слушна заўважыў, што ўсе яны аказалі вялікі культурны ўплыў на славян. Аўтар неаднаразова падкрэсліў, што менавіта дзякуючы руху плямён у час Вялікага перасялення народаў славяне пачалі засяляць новыя землі. Гэты працэс у аўтара атрымаў назву «ўсходнеславянскай каланізацыі» (с. 32), якая, мабыць, была выкарыстана пад уплывам настаўніка і сваяка У. І. Пічэты Мацвея Любаўскага. Пад каланізацыяй аўтар разумеў перасяленне славян «на паўночны захад у Палессе і Задняпроўе, поўдзень, паўночны ўсход і паўднёвы ўсход Усходне-Еўрапейскай раўніны» (с. 32). Тады ж усходнеславянскія плямёны пачалі дзяліцца на тры групы: «заходнюю і паўночна-заходнюю (крывічы, дрыгавічы, радзімічы), паўднёвую (паляне, драўляне) і паўночна-ўсходнюю, якая каланізавала міжрэчча Акі і Волгі ўжо ў пазнейшыя гістарычныя часы...» (с. 33). Аўтар падагульніў: «Гэтыя тры групы з'яўляюцца ядром трох народаў — беларускага, украінскага і вялікарускага» (с. 33). Гаворачы аб этнагенезе беларусаў, У. І. Пічэта зрабіў выснову, што «падзвінскія і падняпроўскія крывічы, радзімічы, дрыгавічы, часткаю драўляне склалі асноўнае этнаграфічнае ядро беларускага народа» (с. 40), які ўтварыўся ў перыяд XIII—XV стст. Гісторык прапанаваў таксама і некалькі версій назвы «Белая Русь». Сам ён, аднак, устрымаўся ад трактоўкі, гаворачы, што «тэрмін "Белая Русь" не атрымаў яшчэ зусім правільнага тлумачэння» (с. 40).

Тут неабходна адзначыць, што дадзенае перавыданне працы У. І. Пічэты ўтрымлівае толькі самыя неабходныя ўдакладненні да тэксту. Справа ў тым, што існуе шэраг ксеракопій працы У. І. Пічэты. Аднак у экзэмпляры, які захаваўся ў Музеі гісторыі БДУ, зроблена некалькі правак рукою самога аўтара. Так, напрыклад, у месцы, дзе ідзе гаворка аб назве «Белая Русь», насупраць слоў: «Акадэмік Ламанскі лічыць, што тэрмін Белая Русь — агульнанароднага паходжання і што ён ужываўся ў палове XIII ст.» (с. 40) стаіць пытальнік. Ён, верагодна, быў пастаўлены таму, што ў друку была дапушчана памылка. У. І. Пічэта, безумоўна, добра ведаў працы акадэміка У. І. Ламанскага. У прыватнасці, пра паходжанне назвы Белая Русь той пісаў: «Можна, здаецца, упэўнена сказаць, што ў канцы XV і ў XVI ст., калі пад Белай Руссю разумелі вольную і незалежную, то мелі на ўвазе не Белую Русь ва ўласным сэнсе, а Русь паўночна-ўсходнюю, Маскоўскую»[2].

Жадаючы данесці да чытача не толькі думку аўтара, але і «голас эпохі», у якую У. І. Пічэта стварыў сваю працу, рэдакцыя як мага больш ашчадна паставілася да тэксту арыгінала, максімальна захаваўшы аўтарскі стыль, але ў пэўнай ступені адаптуючы тэкст да нормаў сучаснай беларускай мовы. Толькі там, дзе сэнс атрымаўся цьмяным, дзе былі пэўныя недакладнасці, розначытанні, рабіліся неабходныя заўвагі і ўдакладненні некаторых момантаў тэксту. Дадзенае перавыданне мае на мэце ўвесці ў шырокі ўжытак працу першага рэктара БДУ, даць магчымасць гісторыкам стварыць адпаведны навуковы каментарый.

---

[1] Тут: «з самага пачатку» (лац.).

[2] *Ламанский В. И.* Белая Русь // Живая старина. 1891. Вып. 3. С. 245—250.

Некаторыя сцвярджэнні У. І. Пічэты досыць спрэчныя. Напрыклад, ён лічыў, што «ў славян не было ні святынь, ні духоўнікаў, ні балваноў» (с. 36). Такое сцвярджэнне можна растлумачыць хіба толькі тым, што гістарычныя веды па гэтым пытанні ў той час былі невялікія.

Большая частка першага раздзела прысвечана гісторыі «беларускага племені» да першай палавіны XI ст. У асобных падраздзелах паслядоўна разглядаецца гісторыя племянных саюзаў, утварэнне дынастычнай дзяржавы, гандлёвыя сувязі, грамадства, дзяржаўны лад, хрысціянізацыя Беларусі і прававыя погляды.

У. І. Пічэта не адышоў ад сваёй канцэпцыі разгляду гісторыі Беларусі ў агульным кантэксце. Ён звярнуўся да старажытнарускіх летапісаў, арабскіх і візантыйскіх аўтараў, скандынаўскіх саг, выкарыстаў археалагічныя крыніцы. Не выяўляючы сябе прыхільнікам «нарманскай тэорыі», гісторык слушна падкрэсліў, што менавіта «стычка славянскага і нарманскага светаў з'явілася пачаткам дынастычнага аб'яднання славянства» (с. 44).

Раннюю гісторыю Полацкай зямлі У. І. Пічэта разглядаў як барацьбу «поўначы» і «поўдня» — варажскіх княстваў і Ноўгарадскага і Кіеўскага княстваў — за гандлёвыя шляхі. Паміж гэтымі княствамі апынуліся полацкія крывічы, дрыгавічы, драўляне і інш. Вынікам была перамога «поўначы» (князя Алега) і аб'яднанне плямён, якія жылі на шляху «з варяг у грэкі», пад уладай кіеўскага князя. Утворанае дзяржаўнае аб'яднанне У. І. Пічэта слушна назваў Кіеўскай дзяржавай (а не Кіеўскай Руссю), падкрэсліваючы, што «павярхоўны працэс аб'яднання не датычыў унутранага жыцця славянства» (с. 46). На думку аўтара, нягледзячы на вылучэнне асобных зямель, само «ўтварэнне варажскіх княстваў у Тураве і Полацку не мела вялікага ўплыву на ўнутраную пабудову славянскіх пляменняў» (с. 48).

У некаторых пытаннях У. І. Пічэта ў сваім выкладанні гісторыі Беларусі пайшоў за летапісцам, не падыходзячы да тэксту крытычна. Так, гаворачы пра вядомую бітву на рацэ Судоме ў 1021 г. (с. 47), ён паўтарыў версію летапісца. Таму не зусім зразумелым застаецца, чаму Яраслаў, калі ён сапраўды разбіў Брачыслава, раптам падараваў яму гарады Віцебск і Усвят, а разам з імі і кантроль над волакамі.

Прычыны шматлікіх паходаў славян на чале з варажскімі князямі на Візантыю, Камскую Булгарыю, Хазарыю і г. д. У. І. Пічэта абгрунтаваў выключна «неабходнасцю наладзіць гандлёвыя справы», «гандлёвымі інтарэсамі» (с. 49). Гісторык уважліва разгледзеў гандлёвыя стасункі з Візантыяй, Захадам, Усходам, гандлёвыя дамовы, гандлёвыя шляхі, прадметы гандлю і інш. Пры гэтым ён ужыў тэрміны-мадэрнізмы «прамысловая Візантыя», «прадметы індустрыі і ўсходняй прадукцыі» (с. 51), «супольны капітал» (с. 54).

У агульным кантэксце аўтар разгледзеў і гандаль гарадоў Турава, Полацка і Смаленска. Пры гэтым У. І. Пічэта неаднаразова падкрэсліваў старажытнасць гандлёвых кантактаў беларускіх зямель як з Захадам, так і з Усходам, ранняе паходжанне гэтых стасункаў, пасрэдніцкі характар, іх уплыў на развіццё эканомікі, культуры, палітыкі.

У. І. Пічэта паслядоўна разгледзеў гістарычную ролю ў станаўленні і развіцці славянскіх зямель асобных народаў і дзяржаў: Візантыі, Булгарыі, хазараў, нарманаў. Асабліва неардынарнай выглядае думка аўтара аб значэнні Хазарыі, якая дзякуючы свайму геаграфічнаму становішчу «мела вялізнае для славян стратэгічнае значэнне», бо хазары, «стрымліваючы націск азіяцкіх народаў, далі магчымасць славянскім плямёнам каланізаваць узбярэжжа Чорнага і Азоўскага мораў, якое мела вялікае гандлёвае значэнне» (с. 55). Аслабленне Хазарыі, у тым ліку і ў выніку паходаў Алега, Святаслава, прывяло да прарыву ў Паўночнае Прычарнамор'е азіяцкіх вандроўных народаў, якія выбілі адтуль славян і перахапілі паўднёвыя гандлёвыя шляхі. Барацьба ж з вандроўнікамі, як справядліва адзначыў У. І. Пічэта, «вымагала вялікага напружання матэрыяльных і духоўных сіл, падарвала эканамічную моц і еднасць Кіеўскай дзяржавы» (с. 55).

Непараўнальна менш увагі аўтар надаў праблемам грамадскага і дзяржаўнага ладу, культуры перыяду IX—XI стст. Пры гэтым У. І. Пічэта асабліва падкрэсліў значную ролю веча пры «пэўнай слабасці княжай улады і пры нязначным аб'яднанні ў палітычных адносінах паасобных краін з Кіевам» (с. 57).

Гаворачы аб прыняцці хрысціянства, гісторык сцвярджаў, што гэты працэс быў «не толькі барацьбою асоб, але і дзвюх рэлігійна-палітычных партый» (с. 58) — хрысціянскай (Яраполк) і язычніцкай (Уладзімір). Між іншым, разгляд падзей 80-х гг. X ст. у гэтым ракурсе дазваляе інакш аналізаваць канфлікт па восі Ноўгарад (Уладзімір) — Полацк (Рагвалод) — Кіеў (Яраполк). Становіцца зразумелым, чаму Рагнеда не жадала ісці замуж за Уладзіміра (бо, верагодна, сама была хрысціянкай) і чаму пасля шлюбу Уладзіміра з Ганнай Рагнеда здзейсніла замах на мужа (ахрышчаны Уладзімір не мог мець дзвюх законных жонак).

Тут У. І. Пічэта слушна заўважыў, што «грунт для прыняцця хрысціянства быў падрыхтаваны ўсім папярэднім ходам візантыйска-славянскіх адносін» (с. 59). У гэтым святле даследчык дастаткова крытычна ахарактарызаваў летапіснае апавяданне аб хрышчэнні Уладзіміра, падкрэсліваючы, што ў яго ўвайшлі толькі «тры верыгодныя факты: хрышчэнне Уладзіміра, паход на Корсунь і шлюб з Ганнай» (с. 59).

У працэсе распаўсюджвання хрысціянства аўтар убачыў тое, што яно мела «павярхоўна-прымусовы характар» (с. 60) і што хрысціянства на Полацкай і Смаленскай землях «пасоўвалася вельмі павольна» (с. 61). Гаворачы аб характары хрысціянізацыі, У. І. Пічэта зрабіў выснову, што яна была павярхоўнай, насіла «прымусовы характар» і была вымушана «прыстасоўвацца да простага светаразумення» (с. 61).

Утварэнню і гісторыі самастойных Полацкай, Тураўскай і Смаленскай «зямель-краін» прысвечаны другі і трэці раздзелы кнігі. Даследчык меркаваў, што пачатак умацавання палітычнай самастойнасці Полацкага княства прыпадае на княжанне Брачыслава Ізяславіча, бо «Полацкая зямля не ўвайшла ў склад Кіеўскай дзяржавы» (с. 65). Пры гэтым У. І. Пічэта лічыць, што ўзаемаадносіны паміж Полацкам і Кіевам вызначаліся барацьбой за гандлёвыя шляхі. (Дарэчы, дадзенае меркаванне не заўсёды адлюстроўваецца ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі.) Аўтар лічыў, што гэтая барацьба была асабліва напружанай пры

князю Усяславу Брачыславічу, «які з'яўляўся ўвасабленнем ідэі незалежнасці Полацкай зямлі ад Кіева і палітычнага яе ўмацавання» (с. 65). На думку гісторыка, у барацьбе Полацка і Кіева «перамога... была на баку Усяслава» (с. 69). Трэба дадаць, што пры апісанні гераічнай асобы князя Усяслава Чарадзея У. І. Пічэта, магчыма, выкарыстоўваў пераклад «Слова аб палку Ігаравым» Янкі Купалы.

Прычыну феадальных усобіц гісторык бачыў у парушэнні спадчыннага права Яраславічамі, якія імкнуліся засяродзіць уладу ў сваіх руках. Аўтар выказаў меркаванне, што падзел Кіеўскай дзяржавы «бярэ пачатак у нормах агульнаславянскага сямейнага права» (с. 66). Аднак першаснымі ён лічыў эканамічныя адносіны: «Кіеўская дзяржава, зложаная з паасобных зямель-краін, звязаных з Кіевам толькі эканамічнымі адносінамі, была ўнутры вельмі слабай» (с. 65—66), і «шэраг з'яў эканамічнага характару ў выглядзе скарачэння дняпроўска-візантыйскага гандлю прысяпшылі працэс распаду» (с. 67).

Шмат увагі У. І. Пічэта надаў дэталёваму разгляду палітычных падзей як на Полацкай зямлі, так і ў Кіеўскай дзяржаве. Пры гэтым ён не пазбегнуў пэўных гістарычных мадэрнізацый, што ўвогуле было характэрна для 1920-х гг. Напрыклад, барацьбу паміж князямі Яраславам і Святаполкам пасля смерці князя Уладзіміра Святаславіча (1015) гісторык назваў «грамадзянскай вайной» (с. 47), а падзеі паўстання ў Кіеве супраць князя Ізяслава Яраславіча (1068) — «Кіеўскай рэвалюцыяй» (с. 68).

Распавядаючы аб бітве на Нямізе, аўтар адзначыў цікавую дэталь — напад Яраславічаў адбыўся ўзімку 1067 г., «калі палавецкія набегі фактычна былі немагчымыя» (с. 67). Праўда, вынікі бітвы У. І. Пічэта разгледзеў згодна з тагачаснай традыцыяй, не заўважыўшы той акалічнасці, што калі б Усяслаў быў сапраўды цалкам разбіты, то Яраславічы не рушылі б далей на Полацк, не чакаючы лета, калі існавала пагроза набегаў полаўцаў. Прамаруджванне Яраславічаў, страта імі спрыяльнага моманту, мірныя перамовы, магчыма, сведчаць аб іншым выніку бітвы на Нямізе.

Вельмі важным і істотным падаецца тое, што разгляд гісторыі беларускіх зямель — Полацкай, Смаленскай, Турава-Пінскай (менавіта іх вылучае У. І. Пічэта) — зноў жа ідзе ў агульным кантэксце славянскай гісторыі. Прычыны аслаблення Полацкай зямлі даследчык убачыў у вялікім напружанні сіл і сродкаў, людскіх рэсурсаў у змаганні за захаванне самастойнасці, кантроль над гандлёвымі шляхамі, барацьбе са Смаленскім княствам. У гэтых умовах «змяншэнне аўтарытэту княскай улады спрычынілася да ўмацавання народнага веча» (с. 70).

Уплыў Тураўскай зямлі робіцца нязначным, на яго думку, з прычыны таго, што «аслабелі культурныя і дыпламатычныя сувязі з Польшчай» (с. 72). Геастратэгічнае становішча Тураўскай зямлі было для яе і плюсам, і мінусам. З аднаго боку, аддаленасць ад «пляцу барацьбы з палавецкімі і полацкімі франтамі» давала магчымасць умацаваць незалежнасць, з другога боку, тая ж аддаленасць прывяла да страты «даўнейшага эканамічнага і палітычнага значэння» (с. 72).

Вельмі цікавым падаецца сцвярджэнне У. І. Пічэты аб тым, што на рэчцы Рось, якая ўпадае ў Дняпро, «зусім не было паселішчаў к часам Яраслава Першага»

(с. 75). Гэты тэзіс мог бы моцна пахіснуць канцэпцыю аб паўднёвым месцы паходжання назвы Рось (Русь), калі б існавалі больш дакладныя звесткі аб тым часе.

У. І. Пічэта вызначыў акалічнасці і асаблівасці палітычнага развіцця Полацкай, Турава-Пінскай, Смаленскай зямель, прысвяціўшы апошняй немалы раздзел кнігі. Адзначым, што гісторыя Смаленскага княства гэтага перыяду ў параўнанні з гісторыяй Полацка альбо Турава значна менш вывучаецца ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі і ў падручніках яна ўзгадваецца толькі ўскосна. Таму вельмі карысна будзе азнаёміцца з ёй у працы У. І. Пічэты. Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі тэкст дапоўнены генеалагічнымі табліцамі князёў смаленскіх і полацкіх.

Перыяд другой паловы XII — пачатку XIII ст. у палітычным развіцці Полацкага княства У. І. Пічэта выклаў дастаткова сціпла. Неаднаразова ён згадаў «пратэктарат» Смаленскага княства над Полацкам, на самай жа справе такога прамога падпарадкавання не існавала. Большага можна было б чакаць ад аўтара і пры апісанні ўзаемаадносін палачан і немцаў. Так, барацьба палачан з Лівонскім ордэнам амаль не адзначана, хаця пэўныя зрухі ў вывучэнні гэтага пытання ў той час ужо былі зроблены[1].

Затое разгляд развіцця народнай гаспадаркі ў XI—XIII стст. уражвае сваёй дакладнасцю і грунтоўнасцю. Цікава, што больш увагі гісторык надаў стану гаспадаркі Смаленскай зямлі, яе эканамічнаму развіццю, гандлю і інш. Падаецца не зусім зразумелым аўтарскае сцвярджэнне: «...ці мела месца ў Полацкай зямлі апрацоўчая прамысловасць, няма ніякіх даных» (с. 85). Калі пад «апрацоўчай прамысловасцю» гісторык разумеў рамесніцтва, то гэты тэзіс ніяк не стасуецца з тым, аб чым ён піша ніжэй (аб вырабе розных рэчаў: вагаў, мячоў, тканін і г. д.).

Разглядаючы гісторыю XI—XIII стст., У. І. Пічэта шмат увагі надаў праблемам дзяржаўнага і грамадскага ладу, асаблівасцям узаемаадносін веча і князя. Ролю веча ў Полацку і Смаленску ён вызначыў як першасную. Разам з тым аўтар падрабязна асвятліў пытанні арганізацыі заканадаўства і права.

Як і яго сучаснікі і калегі (У. М. Ігнатоўскі, М. В. Доўнар-Запольскі), У. І. Пічэта даў грунтоўны агляд культурнага развіцця беларускіх зямель у XI—XIII стст. Пры гэтым ён лічыў, што «галоўным асяродкам беларускай асветы быў Смаленск» (с. 98). Гэтая думка супярэчыць яго выказванням аб тым, што Полацкая дзяржава стала незалежнай ужо ў XI ст., а Смаленская — толькі ў XII ст. Яна адрозніваецца ад меркаванняў У. М. Ігнатоўскага, які лічыў калыскай беларускай культуры Полаччыну, і М. В. Доўнар-Запольскага, які вылучаў тры цэнтры: Тураў, Смаленск, Полацк[2]. Цікава, што з'яўленне моўных адметнасцей на беларускіх землях У. І. Пічэта аднёс да XIII ст. (1229), называючы іх «смаленска-полацкай гутаркай» (с. 99). Вельмі нязвыклым для тагачаснай гістарыяграфіі з'яўляецца раздзел, прысвечаны палітычнай думцы XI—XIII стст. Гэтага мы не сустрэнем ні ў папярэднікаў У. І. Пічэты, ні ў далейшых навуковых распрацоўках.

---

[1] Гл.: *Ластоўскі В. Ю.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Вільня, 1921.

[2] *Ігнатоўскі У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1992. С. 52; *Доўнар-Запольскі М. В.* Гісторыя Беларусі. Мн., 1994. С. 49.

У чацвёртай частцы «Гісторыі Беларусі» разглядаецца гісторыя Вялікага княства Літоўскага. Характарызуючы літоўскія плямёны, У. І. Пічэта перыядычна выкарыстоўваў назву «літвіны». Магчыма, гэта было зроблена ім наўмысна, каб паказаць адрозненне тых гістарычных літоўцаў ад жыхароў тагачаснай Літоўскай рэспублікі (летувісаў).

Канцэпцыя У. І. Пічэты аб генезісе ВКЛ не вызначаецца арыгінальнасцю: распад радавых адносін у літоўскіх плямён, іх палітычнае аб'яднанне пад ціскам знешняй небяспекі (барацьба з суседзямі, асабліва з Лівонскім ордэнам), падпарадкаванне Міндоўгам часткі Літвы, захоп ім Чорнай Русі з цэнтрам у Навагрудку, далучэнне аслабелай Полацкай зямлі і г. д. (с. 107—108). Відавочна, што тут У. І. Пічэта пайшоў следам за сваім настаўнікам — буйнейшым даследчыкам гісторыі ВКЛ М. К. Любаўскім[1]. Пэўнае адрозненне ёсць толькі ў тым, што У. І. Пічэта акцэнтаваў увагу на тэрытарыяльна-этнічным характары гістарычнай Літвы.

Між іншым, прыкладна той жа канцэпцыі прытрымліваўся і У. М. Ігнатоўскі, які, верагодна, таксама карыстаўся працамі М. Любаўскага і нават запазычыў яго недакладнасць, змясціўшы тэрыторыю Чорнай Русі на правыя (правільна — на левыя) прытокі Нёмана. Прыкладна на тых жа пазіцыях стаяў і М. В. Доўнар-Запольскі[2].

Аднак тут неабходна заўважыць, што і У. М. Ігнатоўскі, і М. В. Доўнар-Запольскі, і У. І. Пічэта падкрэслівалі характар збудаванай дзяржавы як не проста літоўскай, але літоўска-беларускай. У. І. Пічэта, у прыватнасці, звязваў працэс станаўлення дзяржавы з імёнамі вялікіх князёў Войшалка (1263—1267) і Віценя (1295—1316) (с. 108—109). Аўтар падкрэсліваў, што працэс аб'яднання зямель у адну дзяржаву не быў заваёвай, таму што князі ВКЛ абмяжоўваліся «павярхоўным прызнаннем сваёй улады» і ва «ўнутраным кіраўніцтве далучаныя землі захоўвалі сваю самастойнасць» (с. 113). На думку даследчыка, Вялікае княства Літоўскае ўяўляла сабой «федэрацыю краін, звязаных з цэнтрам вельмі нетрывалымі вузламі» (с. 114), г. зн. федэратыўную дзяржаву. Пры гэтым У. І. Пічэта адзначыў, што этнічныя літоўцы ў ёй складалі меншасць, «распыленую ў моры беларускага народа» (с. 114). Менавіта таму аўтар назваў ВКЛ Літоўска-Беларускай дзяржавай.

Вялікае значэнне У. І. Пічэта надаў адносінам Літоўска-Беларускай дзяржавы з яе суседзямі — з Тэўтонскім і Лівонскім ордэнамі, Маскоўскім княствам, Польшчай. Пры гэтым значна больш увагі аўтар звярнуў на разгляд адносін з паўночна-ўсходняй Руссю — з Ноўгарадам, Цвер'ю і Масквой ужо з XIV ст. Аўтар неаднаразова падкрэсліў, што інтарэсы ВКЛ і Вялікага княства Маскоўскага (ВКМ), ці, як прынята называць у сучаснай расійскай гістарыяграфіі, Княства ўсяе Русі, сутыкнуліся за гандлёвыя шляхі. Менавіта ў гэтым ён бачыў пачатак працяглага канфлікту.

---

[1] *Любавский М. К.* Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. М., 1910; *Его же.* Областное деление и местное управление ко времени издания первого Литовского статута. М., 1893.

[2] *Ігнатоўскі У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. С. 73; *Доўнар-Запольскі М. В.* Гісторыя Беларусі. С. 54.

Разглядаючы адносіны ВКЛ з Польшчай, У. І. Пічэта прывёў не толькі палітычныя, але ўскосна і эканамічныя прычыны збліжэння дзяржаў: «калі немцы захапілі вусце Віслы і Нёмана, то абедзве дзяржавы папалі ў поўную эканамічную залежнасць ад Тэўтонскага закона» (с. 119). Што ж тычыцца ўмоў Крэўскай уніі, то даследчык назваў іх «дэкларацыяй, ажыццяўленне якой было немагчыма» (с. 119). Аб Віленска-Радамскай уніі гісторык слушна заўважыў, што яна была вынікам паражэння войск Вітаўта на рацэ Ворскле ў 1399 г. Пры гэтым ён быў цвёрда перакананы, што «ў момант смерці Вітаўта Літоўска-Беларуская дзяржава была фактычна незалежнай ад Польшчы» (с. 121).

Некаторыя паведамленні У. І. Пічэты досыць спрэчныя і маюць шэраг недакладнасцей, якія могуць заблытаць непадрыхтаванага чытача, як, напрыклад, пра «пагром над усімі рускімі» (с. 120) у ВКЛ падчас канфрантацыі Вітаўта з Масквой. Тут, відавочна, маецца на ўвазе загад Вітаўта перабіць маскоўскіх купцоў з прычыны парушэння міру князем Васілём Дзмітрыевічам. Недакладным з'яўляецца і паведамленне У. І. Пічэты аб міжнацыянальнай барацьбе ў XV ст. літоўцаў, беларусаў і ўкраінцаў (с. 122—124). Сёння ўжо дакладна вядома, што падзел у ВКЛ адбыўся не на этнічнай (у той час гэтаму не надавалі такой вялікай увагі), а на рэлігійнай глебе. Разлом, які прывёў да грамадзянскай вайны 1432—1439 гг., адбыўся праз адсутнасць палітычных і эканамічных правоў у шляхты праваслаўнага веравызнання, у адрозненне ад каталікоў, якія іх мелі. На першы план у аўтара выступае выключна этнічны (нацыянальны) элемент, хаця ён не абыходзіць увагай і рэлігійны.

Не зусім справядліва сцвярджэнне У. І. Пічэты аб Жыгімонту Кейстутавічу як аб «спадручным Польшчы» (с. 124). Наадварот, у апошнія гады княжання ён пачаў шукаць шляхі да збліжэння з германскім імператарам, аддаляцца ад Польшчы і згубіў яе падтрымку. І ў змову супраць Жыгімонта былі ўцягнуты не толькі «літоўскія» (г. зн. летувіскія) феадалы, але і «рускія» (беларускія і ўкраінскія) — трокскі ваявода Лялюш, Іван і Аляксандр Чартарыйскія, князь Алелька Уладзіміравіч і іх баяры.

Істотным у працы з'яўляецца і тое, што У. І. Пічэта прывёў дастаткова дэталёвы агляд падзей другой палавіны XIV ст. Асабліва падрабязна ён раскрыў характар узаемаадносін з Масквой пачынаючы ад часоў Казіміра Ягайлавіча. Прычыны канфлікту, на думку гісторыка, не ў «абароне рускай нацыянальнасці і праваслаўнай веры» (с. 129). Гэта была толькі зачэпка для ўмяшання ва ўнутраныя справы ВКЛ і для развязання войнаў. Прычыну аўтар бачыў у імкненні Масквы захапіць усходнія землі ВКЛ, каб кантраляваць прамыя гандлёвыя шляхі на Захад, прайсці да Балтыкі. І высновa У. І. Пічэты пра тое, што барацьба ВКЛ і ВКМ — «гэта барацьба за берагі Балтыйскага мора» (с. 129) і за «гандлёвыя шляхі на Захад» (с. 130), выглядае бясспрэчнай.

У гэтым жа рэчышчы гісторык разгледзеў прычыны барацьбы паміж ВКЛ і ВКМ за Ноўгарад. На яго думку, праз Ноўгарад можна было «падтрымліваць беспасярэднія гандлёвыя зносіны з нямецкімі купцамі» (с. 129). Неабходна толькі дадаць, што рэальныя магчымасці аказаць дапамогу Ноўгараду ў Казіміра былі. Толькі заходні вектар яго палітыкі амаль заўжды пераважаў над

усходнім (вайна з Тэўтонскім ордэнам 1454—1466 гг., дынастычная барацьба ў Чэхіі і Венгрыі і г. д.). У знешняй палітыцы Казіміра польскія інтарэсы рэальна пераважалі над інтарэсамі Беларуска-Літоўскай дзяржавы.

У адрозненне ад папярэднікаў, У. І. Пічэта асвятліў даволі падрабязна, хаця і трохі схематычна, войны паміж ВКЛ і ВКМ канца XIV — пачатку XV ст. Цікава, што аўтар не лічыў пераможную для войскаў ВКЛ бітву пад Оршай (8 верасня 1514 г.) выключнай падзеяй праз адсутнасць значных наступстваў. У параўнанні з падачай падзей, звязаных з гэтымі войнамі, ваенна-дыпламатычныя адносіны двух вялікіх княстваў Русі з Крымскім ханствам выкладзены больш чым сціпла, без усялякіх падрабязнасцей.

Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі У. І. Пічэта ўвёў раздзел, прысвечаны нацыянальнаму складу насельніцтва ВКЛ, паслядоўна разглядаючы розныя этнічныя групы: беларусаў, летувісаў («літвінаў»), палякаў, рускіх («вялікарасійцаў»), яўрэяў, татар, немцаў. Пры гэтым аўтар вызначыў летувісаў, палякаў, рускіх, татар і немцаў як меншасць, адзначаючы, аднак, іх нераўназначны ўплыў на этнічную большасць — беларусаў.

Вельмі важным з'яўляецца раздзел, у якім разглядаецца развіццё гаспадаркі ў XV — першай палове XVI ст. Менавіта тут аўтар прааналізаваў прычыны слабасці дзяржаўнага (гаспадарскага) скарбу, невялікую даходнасць гаспадарак рознага ўзроўню і малую эфектыўнасць гаспадарчай дзейнасці ўвогуле. Адпаведна гэта вызначала малыя выдаткі на войска, залежнасць гаспадара ад магнатаў і інш.

Шмат увагі аўтар надаў праблемам права ВКЛ. Упершыню ў падручнік былі ўведзены для вывучэння прывілеі вялікіх князёў, а таксама раздзел аб грамадскім ладзе ВКЛ. Асабліва падрабязна гісторык асвятляе пануючае саслоўе — шляхту і прыходзіць да важнай высновы: «вузкастанавыя пастановы» шляхецкіх вальных соймаў «падрывалі горад як гандлёва-прамысловую адзінку» (с. 145). Відавочна, што ў гэтым трэба шукаць усе далейшыя прычыны заняпаду дзяржавы.

Не згубілі сваёй навуковай актуальнасці і сёння раздзелы, прысвечаныя аналізу заканадаўства ВКЛ канца XV — пачатку XVI ст. Каштоўнай падаецца характарыстыка У. І. Пічэтам прынцыпаў Статута 1529 г. — «абарона правоў шляхетнае асобы і індывідуальная адказнасць за праступленні» (с. 152). Аўтар заўважыў таксама, што Статут 1529 г. упершыню ўвёў інстанцыйны парадак разгляду судовых спраў (с. 153).

Раздзел пра культуру ВКЛ невялікі, але вельмі істотны. У ім У. І. Пічэта падкрэсліў, што ВКЛ «у культурных адносінах з'яўлялася беларускім». Падставай для гэтай высновы аўтара паслужыла тое, што толькі беларуская мова была дзяржаўнай, бо менавіта на ёй пісаліся «гаспадарскія лісты, граматы, соймавыя ўхвалы» (с. 153), яна «ўжывалася ў гаспадарскай канцылярыі», на ёй складаліся «беларускія летапісы, хронікі, жыцці святых, свецкія белетрыстычныя творы» (с. 154). У. І. Пічэта падкрэсліў, што беларуская культура панавала ў ВКЛ, закранаючы без выключэння ўсе слаі грамадства.

Пяты раздзел кнігі носіць назву «Пачатак шляхецкае феадальнае дзяржавы». У ім разглядаюцца абставіны стварэння Рэчы Паспалітай. Безумоўна, гэта

быў толькі пачатак даследавання, а працяг планаваўся ў другой частцы «Гісторыі Беларусі», якая, аднак, не пабачыла свет.

Унутрыпалітычныя адносіны і знадворныя праблемы ВКЛ, напрыклад Лівонская вайна, былі пададзены У. І. Пічэтам вельмі канспектыўна. Для параўнання: праца У. М. Ігнатоўскага ўтрымлівала таксама няшмат звестак, але ўжо М. В. Доўнар-Запольскі ў сваёй «Гісторыі Беларусі», створанай у той жа час, што і праца У. І. Пічэты, падзеі Лівонскай вайны выклаў больш падрабязна.

Значна больш гаворыцца аб захадах, якія рабіў урад ВКЛ для павышэння абараназдольнасці краіны. Менавіта ў такім кантэксце У. І. Пічэта разгледзеў вядомую аграрную рэформу сярэдзіны XVI ст. І зразумела чаму — найбольшага спецыяліста па гэтай праблеме, як рэктар БДУ, проста не існавала. Яго доктарскае даследаванне «Аграрная рэформа Жыгімонта Аўгуста ў Літоўска-Рускай дзяржаве» (1917) не страціла свайго значэння і ў наш час.

Вельмі ўважліва і сур'ёзна падышоў У. І. Пічэта да праблемы асвятлення беларускага Адраджэння XVI ст. Тут ён зрабіў значны крок наперад у тагачаснай беларускай гістарыяграфіі. Пачатак беларускага Адраджэння даследчык звязаў з ростам гандлёвых адносін з Заходняй Еўропай, павелічэннем тавараабмену, са з'яўленнем багатага мяшчанства і багатых землеўладальнікаў (г. зн. з узнікненнем сацыяльных слаёў, падрыхтаваных да ўспрыняцця культуры новага ўзроўню), бо менавіта «гандлёвыя сувязі з Захадам пазнаёмілі літоўска-беларускіх землеўласнікаў з еўрапейскай культурай» (с. 168). Гуманізм на Беларусі У. І. Пічэта ўпершыню падзяліў на дзве плыні: гарадскую і шляхецкую. Пры гэтым аўтар сцвярджаў, што «гарадскі гуманістычны рух меў замкнёны характар і не выходзіў за межы горада» (с. 169). Зыходзячы з тэксту можна меркаваць, што да прадстаўнікоў гарадской плыні гуманізму гісторык адносіў Ф. Скарыну, С. Буднага, В. Цяпінскага і такіх выдатных прадстаўнікоў беларускага Адраджэння, як браты Кузьма і Лукаш Мамонічы, бо ўсе яны займаліся выдавецкай справай менавіта ў гарадах. Згодна з У. І. Пічэтам, істотным «паказчыкам культурнага руху на Беларусі» (с. 169) з'яўляецца кнігадрукаванне.

Шляхецкую плынь у беларускім Адраджэнні гісторык лічыў неаднароднай. У. І. Пічэта падзяліў яе на наступныя кірункі: кансерватыўны, прыхільнікам якога з'яўляўся князь А. Курбскі, і прагрэсіўны, якога прытрымліваліся князі Ю. Слуцкі і Р. Хадкевіч. Асноўнае разыходжанне паміж гэтымі кірункамі, на думку аўтара, у тым, што першыя лічылі новыя рэлігійныя захапленні і скажэнні тэкстаў Бібліі шкоднымі і трымаліся за старую царкоўную адукацыю, а другія выступалі за больш цесныя стасункі з еўрапейскай культурай, імкнуліся «да адраджэння асветы на грунце царкоўнага пісьменства і праваслаўных традыцый» (с. 181) шляхам друкавання кніг. Пры гэтым, як меркаваў даследчык, і тыя, і другія «адносіліся варожа да імкнення наблізіць кнігі Святога Пісьма да народнага ўразумення» (с. 173). Тым не менш У. І. Пічэта падкрэсліваў, што «беларускае Адраджэнне — гэта эпоха росквіту старога беларускага пісьменства, залаты век беларускай літаратуры» (с. 173).

Разглядаючы праблемы адукацыі, аўтар адзначыў, што ў такой шматканфесійнай краіне, як Беларуска-Літоўская дзяржава, натуральнай з'явай былі і школы розных канфесій. Пры гэтым для ўсіх школ было агульным тое, што «спачатку школьнае навучанне мела прафесіянальны характар і павінна было здавальняць разнастайныя запатрабаванні той або іншай царквы» (с. 174). Гісторык паслядоўна разгледзеў праваслаўныя, каталіцкія, уніяцкія і пратэстанцкія школы.

Адной з самых галоўных, складаных і драматычных па сваіх наступствах падзей гісторыі Беларусі — Люблінскай уніі 1569 г. прысвечаны зусім невялікі апошні раздзел кнігі. Магчыма, аўтар меркаваў вярнуцца да больш падрабязнага разгляду гэтай падзеі і яе вынікаў у другой частцы сваёй кнігі, а тут падаць яе ў выглядзе прэамбулы і завяршыць тым працу. Аб гэтым сёння мы можам толькі здагадвацца. Затое У. І. Пічэта як заўсёды дакладны ў сваіх ацэнках. Асноўную прычыну уніі ён бачыў у шляхетызацыі дзяржаўнага і грамадскага ладу ВКЛ, бо шляхта «глядзела на... унію як на сродак для барацьбы з магнацтвам» (с. 176). Другая прычына, на думку аўтара, у цяжкім становішчы ВКЛ пасля Лівонскай вайны. Не пакінуў па-за ўвагай У. І. Пічэта і імкненне палякаў да уніі, бо яны жадалі «інкарпарацыі Вялікага княства Літоўскага» (с. 176). Аўтар пералічыў умовы Люблінскай уніі, але не асвятліў, ці былі яны выкананы. І хаця выснова У. І. Пічэты пра тое, што Люблінская унія «ўстанаўлівала дыктатуру шляхецтва» (с. 177), дастаткова катэгарычная, але відавочна, што ўсеагульнае ўзвышэнне шляхты на Беларусі пачалося менавіта з гэтага часу.

Да асаблівасцей працы трэба аднесці ўжыванне аўтарам разнастайных тэрмінаў-мадэрнізмаў, напрыклад такіх, як «абрабляючая прамысловасць», «здабываючая прамысловасць» (с. 33) (адносна гаспадарчага жыцця славян у IX—XI стст.), «банкроцтва» (с. 88), «партыя» (с. 90), «інтэлігенцыя» (с. 36). Характарызуючы эканамічныя і грамадскія адносіны XIII—XIV і XV—XVI стст., ён ужывае такія паняцці, як «еўрапейскі капітал» (с. 115), «рабочы клас» (с. 115), «каланіяльныя прадукты» (с. 138), «буржуазія» (с. 145) і інш.

Напрыканцы нельга не адзначыць адну цікавую тэндэнцыю дадзенай працы. У сваім творы У. І. Пічэта ўпарта змяшчаў цэнтр беларускай цывілізацыі на Смаленшчыну. Якой бачыў аўтар Беларусь? Гэта амаль выключна землі Полаччыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Меншчыны. Пад Літвой ён разумеў, верагодна, сучасную Заходнюю Беларусь (Гродзеншчыну, Берасцейшчыну), а таксама Віленшчыну, што вынікае з усяго кантэксту кнігі. Магчыма, гэта тлумачыцца тымі настроямі, якія панавалі ў тагачасным беларускім грамадстве і ў партыйным і савецкім кіраўніцтве БССР. Якраз у гэты час адбывалася вяртанне ўсходніх беларускіх зямель (так званае «ўзбуйненне БССР» 1924 і 1926 гг.) — паветаў і асобных валасцей Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губерняў. Усё гэта патрабавала пэўнага ідэалагічнага абгрунтавання, што і было паспяхова выканана У. І. Пічэтам. Безумоўна адно — пры ўсіх пэўных недахопах «Гісторыя Беларусі» Уладзіміра Іванавіча Пічэты была значным крокам наперад, і яна не згубіла сваёй каштоўнасці і ў наш час.

*А. А. Яноўскі, А. Г. Зельскі*

# I

# Тэрыторыя і яе мінулае



# 1. АГУЛЬНЫ ВЫГЛЯД

**Рэльеф.** Славянскія пляменні, якія асноўным ядром увайшлі ў склад беларускага народа, засялялі паўночна-заходнюю частку Усходне-Еўрапейскай раўніны, замкнёную ў чатырохкутніку рэк: Заходняй Дзвіны, Нёмана, Прыпяці, вышнявіны Дняпра з Бярэзінай. Паверхня першапачатковай беларускай тэрыторыі дзеліцца па свайму характару на дзве часткі: паўночную — узгоркавую і паўднёвую — нізінную. Паўночна-ўсходняя частка Беларусі з'яўляецца працягам Сярэднерасійскага ўзвышша. На паўночна-заходняй частцы раскінуты Вілейска-Нёманскія ўзвышшы, якія з'яўляюцца водападзелам паміж вадазборамі Чорнага мора і Балтыйскага. На поўначы тэрыторыі цягнецца ў палуднікавым кірунку з поўдня і паўднёвага ўсходу на поўнач і паўночны захад ад Віцебска Невельска-Віцебская горная града, якая падымаецца над роўнем мора да 100—140 сажняў. Усходняя частка тэрыторыі, раскінутая ў паўднёва-заходняй частцы сярэднерасійскага ўзвышша, мае хвалістую паверхню, на якой сустракаюцца ўзвышшы да 147 сажняў вышыні над роўнем мора. Самае высокае ўзвышша «Окаўскі лес» злучае Валдайскае ўзвышша з Сярэднерасійскім узвышшам. Другая горная града цягнецца на паўднёвы захад ад Валдайскага ўзвышша і дасягае 100 сажняў вышыні над роўнем мора. Іншыя ўзвышшы падымаюцца на 120—140 сажняў над роўнем мора. Усе гэтыя ўзвышшы з'яўляюцца водападзеламі паміж Волжскім, Заходне-Дзвінскім і Дняпроўскім рэчнымі вадазборамі. Паўднёвая частка беларускай тэрыторыі — гэта ёсць багніста-лясістая нізіна, гэтак званае Палессе. Толькі ўздоўж крутых і высокіх правых берагоў Прыпяці, асабліва каля Мазыра, знаходзяцца мясцовасці, якія крыху падымаюцца над агульным роўнем; гэта, аднак, нязначна змяняе агульны характар мясцовасці.

**Абвадненне.** Рэкі Беларусі прыналежаць да чатырох галоўных рэчных вадазбораў: Нёманскага, Заходнедзвінскага, Дняпроўскага і часткай — Волжскага. Першыя два рэчныя вадазборы ўваходзяць у склад вадазбору Балтыйскага мора. Два апошніх рэчных вадазборы з'яўляюцца часткамі вадазбораў Чорнага і Каспійскага мораў. Водападзеламі, як паміж морскімі, гэтак і паміж рэчнымі вадазборамі, з'яўляюцца ўзвышшы, раскінутыя на тэрыторыі. Вілейска-Нёманскія ўзвышшы аддзяляюць Балтыйскі вадазбор ад Чарнаморскага, «Окаўскі лес» з'яўляецца водападзелам паміж Дняпром з аднага боку і прытокамі Заходняе Дзвіны і Волгі — з другога. Узвышша, што знаходзіцца на паўднёвы захад ад «Окаўскага лесу», з'яўляецца водападзелам паміж прытокамі Заходняй Дзвіны і Дняпром. Іншыя ўзвышшы аддзяляюць вадазбор Дняпра ад ва-

дазбору Волгі. На поўначы тэрыторыі цячэ рака Заходняя Дзвіна, аддзеленая шэрагамі ўзгоркаў ад вадазбору ракі Нёмана і Валдайскімі гарамі ад вадазбору рэк Вялікай і Ловаці. Дняпро цячэ амаль што па сярэдзіне тэрыторыі, а паўднёвая частка тэрыторыі абвадняецца Прыпяццю. Вадазборы рэк значна прыбліжаюцца адзін да другога. Нязначная вышыня ўзгоркаў не перашкаджала зносінам і ўзаемнаму ўплыву паміж усімі насельнікамі тэрыторыі. Правыя прытокі Заходняй Дзвіны — Дрыса, Аболля, Усвяча — зближаюць Заходнедзвінскі вадазбор з вадазборам Чудскага і Ільменскага азёр. Левыя прытокі — Лучэса, Касплля, Ула — злучаюць Заходнюю Дзвіну з вадазборам Дняпра. Вышнявіны Заходняй Дзвіны, падыходзячы вельмі блізка да вышнявін Волгі, злучаюць вадазборы гэтых рэк. Левай прытокай — Улою — Заходняя Дзвіна злучаецца з Бярэзінай. Левай прытокай Заходняй Дзвіны — Дзіснай і правай прытокай Віліі — Жымянай злучаюцца вадазборы Заходняй Дзвіны і Нёмана. Дняпроўскі вадазбор ракой Бярэзінай і яе прытокай Поняй праз Вілію зближаецца з вадазборам Нёмана. Вышнявіны Дняпра злучаюць вадазбор Дняпра і Волгі разам з Акой. Прыпяць сваім вусцем звязваецца з сярэднім Дняпром, а сваімі вышнявінамі праз сваю прытоку Піну і Мухавец, прытоку Заходняга Буга, прыбліжаецца да Віслянскай воднай артэрыі; рэчкай Ясельдай праз Шчару, прытоку Нёмана, Прыпяць злучаецца з вадазборам Нёмана. Дзякуючы гэтаму вадазборы Балтыйскага і Чорнага мораў былі вельмі блізкія паміж сабой. Тэрыторыя Беларусі багата азёрамі і балотамі. Ва ўсходняй частцы тэрыторыі азёр нямнога. Найбольш значнымі з азёр з’яўляюцца: возера Лубань (73,9 квадратных вёрст) у паўночнай частцы тэрыторыі, возера Князь (49,5 квадратных вёрст) у паўднёвай частцы. Балоты пераважна спатыкаюцца ў заходняй і паўднёвай частках тэрыторыі.

**Глеба.** У стасунку да глебы тэрыторыя Беларусі прыналежыць да нечарназемнай паласы і азначаецца вялікай разнастайнасцю ў залежнасці ад паасобных раёнаў. Наогул жа на тэрыторыі Беларусі спатыкаюцца глебы суглінкавыя, балотныя (багністыя), пясчаныя, патрабуючыя або значнага ўгнаення, або зусім непрыгодныя для сельскай гаспадаркі.

**Клімат.** У стасунку да клімату тэрыторыя Беларусі прыналежыць да мернай паласы, у якой няма раптоўных пераходаў ад дзеннай гарачыні да начнага холаду. Кліматычныя ўмовы залежаць ад палажэння Беларусі ў паўночна-заходняй частцы Усходне-Еўрапейскай раўніны. Пераважным ветрам трэба тут лічыць паўночна-заходні, які прыносіць з сабою значную колькасць вільгаці і павышае зімовую тэмпературу. Сярэдняя гадавая тэмпература хістаецца паміж +4,5 °С ва ўсходняй, +5 °С у паўночнай і +6 °С у заходняй частках тэрыторыі. Поры года не размяжованы раптоўна адна ад другой і вызначаюцца вялікай нясталасцю. Часта бывае, што ў маі і чэрвені паяўляюцца халады, якія значна шкодзяць расліннасці. Лета бывае то засушлівым, то надта дажджыстым. Гэткая самая і восень. Зіма бывае або снежнай і цёплай, або бясснежнай і халоднай. Большую частку года неба бывае пакрыта воблакамі. Найбольшая колькасць воблачнасці прыпадае на зімовыя месяцы: лістапад,

снежань і студзень. У летнія месяцы воблачнасць найменшая. Што датыча вільгаці, то ўся тэрыторыя Беларусі даволі ёю багата. Першае месца ў гэтых адносінах займае Палессе. Найбольшая колькасць атмасферных ападаў прыходзіцца на летнія месяцы.

**Расліннасць і жывёльнасць.** Тэрыторыя Беларусі – гэта краіна лясоў, раскінутых на ўзвышшах і на нізінах – паміж балот. Лясы Беларусі маюць характар мяшаных лясоў. У іглыстых лясах найчасцей спатыкаецца хвоя, а ў ліставых лясах – вольха, бяроза, асіна. Апрача гэтага растуць ясень, клён, ясакар, бук, ліпа, дуб, рабіна, вяз. Даволі часта спатыкаюцца хмызнякі, зарослыя барбарысам, баярышнікам, шыпшынай, чарніцай, брусніцай, калінай, цярноўнікам, малінай, парэчкамі. Распаўсюджаны і садовыя фруктовыя гатункі, як яблыні, грушы, слівы, вішні. Тэрыторыя багата травяной расліннасцю. Усяго спатыкаецца да 900 відаў раслін, якія адносяцца да расліннасці сухіх лугоў, леснай, травяной, воднай і балотнай, а гэтаксама да расліннасці ўзараных лугоў. Паміж травяністых раслін звяртаюць на сябе асаблівую ўвагу лекавыя травы: крываўнік, буквіца, чарада, клін, падтыннік, малочніца, сардэчнік і інш. Жывёльнасць Беларусі ў даўнейшыя часы была вельмі багатай і разнастайнай. Спатыкаліся тут дзікія каты, расамахі, буры мядзведзь, ласка, барсук, рысь, воўк, ліса, куніца, тхор, выдра, гарнастай, норка, вавёрка, бабры. Капытныя жывёлы былі прадстаўлены выміраючымі зубрамі, ласямі, дзікамі і звычайнай свойскай жывёлай. Незвычайна багата тэрыторыя птушкамі, паміж іх нямала драпежных, як напрыклад: арлы, беркуты, арляняты, крыкуны, белахвосты, сокалы, ястрабы, сычы, совы, пугачы і соўкі. Вельмі багата прадстаўлены вераб'іныя гатункі; спатыкаем тут начніц, стрыжоў, ластавак, удодаў і інш. Багата спатыкаецца тут і спеўных птушак – дразды, пеначкі, малінаўкі, пліскі, чыжы, шчыглы. Паміж лазячых птушак маюцца зязюля, дзяцел, круцігалоўка. Курыны род прадстаўлен глушцамі, цецерукамі, курапаткамі, перапёлкамі. Распаўсюджаны і цыбатыя птушкі: жураўлі, буслы, чыбісы, шэрыя чаплі, дзергачы, лысухі, водныя куркі. Плывуны-птушкі прадстаўлены чайкамі, шэрымі гусямі, дзікімі качкамі і інш. У параўнанні нямнога на тэрыторыі гадаў, паміж якіх найчасцей спатыкаюцца яшчаркі, вужы, сліўні і гадзіны. Незвычайна багата царства рыб: акунь, судак, ёрш, бычкі, язі, ментузы, сом, карп, шчупак, карась спатыкаюцца ўсюды. У Заходняй Дзвіне апрача гэтага – ласосі, міногі, калюшкі, быстранкі, а ў Прыпяць часамі заплываюць асятры, чарнаморскія селядцы, сцерлядзі.

З прычыны мноства лясоў на тэрыторыі Беларусі багата маецца шасціножак, галоўным чынам двукрылых – камароў і мошак.

**Уплыў прыроды на гісторыю.** Геаграфічныя варункі маюць вялікі ўплыў на гістарычнае жыццё народа. Адсутнасць горных перашкод спрыяла аб'яднанню насялення і зносінам. З другога боку, вялікая колькасць лясоў з'яўлялася часткова перашкодай рассяленню насялення па ўсёй тэрыторыі. Блізкасць аднаго рэчнага вадазбору да другога давала магчымасць насяленню перасоўвацца па рэках і дзякуючы гэтаму даволі хутка каланізаваць тэрыторыю. У той самы час тыя ж водападзелы служылі як этнаграфічнымі граніцамі беларуска-

га плямення, гэтак і палітычнымі граніцамі ўтвараючыхся палітычных арганізмаў. Аднак невыгодным з надворнага боку для тэрыторыі было тое, што яе граніцы былі пазбаўлены значных прыродных перашкод. Тэрыторыя была даступна розным чужаземным нападам і найсцям. Злучаная сваімі рэчнымі вадазборамі з Балтыйскім морам, тэрыторыя Беларусі з'яўляецца пляцам барацьбы чужаземных дзяржаў за берагі Балтыйскага мора. Беларусь не раз была спустошана вайной, а гэта прыпыняла яе эканамічнае і культурна-сацыяльна-палітычнае развіццё. Пад уплывам і ў залежнасці ад прыроды ўтвараўся і першапачатковы эканамічны быт народа і ўвесь уклад яго жыцця. Прымітыўная эксплуатацыя (выкарыстанне) прыродных багаццяў будзе на працягу доўгага часу падставай народнае гаспадаркі. Злучанасць галоўных рэчных вадазбораў з Балтыйскім морам прымусіць Беларусь стыкацца з іншымі народамі, з якімі на тэрыторыі Беларусі будзе наладжвацца гандаль і культурна-эканамічныя зносіны. З другога боку, блізкасць вадазбору верхняга Дняпра да вадазбору Волгі і Дона дасць магчымасць насяленню прымаць удзел ва ўсходнім гандлі і разам з гэтым быць перадавальнікам усходніх тавараў на Захад. У залежнасці ад палажэння тэрыторыі знаходзяцца і культурна-палітычныя сувязі і адносіны Беларусі ў гістарычныя часы. Суседства з больш дужымі эканамічнымі і палітычнымі арганізмамі, як Польшча і Масква, з'яўлялася значнай перашкодай на шляху нацыянальна-культурнага і палітычнага развіцця беларускага народа. На тэрыторыі Беларусі стыкнуцца польскі і велікарасійскі культурныя ўплывы. Нацыянальна-культурнае і палітычнае адраджэнне пачнецца пазней і будзе адбывацца больш павольным тэмпам, чымся ў іншых краях.

## 2. МІНУЛАЕ ТЭРЫТОРЫІ

**Геалагічная будова.** У большасці геалагічных перыядаў тэрыторыя Беларусі была морскім дном, хаця рэшткі гэтых адкладаў спатыкаюцца даволі рэдка. У паўночна-ўсходняй частцы тэрыторыі (былой Віцебскай і былой Магілёўскай губерняў) усюды спатыкаюцца ледавіковыя адклады, якія пакрываюць ніжэйпаложаныя пароды. Тут мае перавагу гэтак званая дэвонская фармацыя. Пласты яе цягнуцца ад Рыжскае затокі праз увесь вадазбор Заходняе Дзвіны. Мінеральны склад, які спатыкаецца ў краіне ўтвораў дэвонскае фармацыі, адзначаецца недахватам цвёрдых і разнастайных земных парод. Спатыкаюцца толькі вапнякі і пескавікі. У першых пападаюцца выкапні чарапашын, а ў другіх — рэшткі рыб. У паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі маюць перавагу абгаленні крэйдавай фармацыі. Апрача крэйдавых парод вядомы гэтаксама зеленавата-шэрыя гліністыя пяскі з рэшткамі цвёрдага скалкавага пескавіку. У Палессі крэйдавыя адклады складаюцца з даволі рыхлае крэйды са скалкамі і не прапушчаючых ваду белых крэйдавых мергеляў. Нарэшце, у паўднёвай частцы былой Магілёўскай губерні і Палесся спатыкаюцца глаўканітавыя і белыя кварцавыя пяскі з праслоямі цёмнай гліны; гэтыя пяскі з'яўляюцца вын-

кам утварэння трацічнай сістэмы з дамешкам крэйдавай фармацыі ў выглядзе кавалкаў крэйды, вымытай з крэйдавых парод. Ад геалагічнае будовы залежыць убогасць Беларусі карыснымі выкапнямі. На тэрыторыі маецца ў нязначнай колькасці жалезная руда, галоўным чынам у паўночнай частцы. У паўднёвай і паўднёва-ўсходняй частцы тэрыторыі спатыкаецца ў вялікай колькасці балотная жалезная руда, аднак даволі дрэннага гатунку, а гэтаксама знаходзіцца гліна ва ўсходняй частцы тэрыторыі. Апрача гэтага ў паўночнай і ўсходняй Беларусі распаўсюджаны вапнякі і даламіты, а гэтаксама ёсць торф, асабліва ў паўночна-ўсходняй частцы Палесся. Нарэшце, у паўночнай частцы знаходзяцца мінеральныя крыніцы, пераважна жалезістыя, але невялікай вартасці. Агульны характар геалагічнае будовы меў для народнае гаспадаркі велізарнае значэнне.

**Археалагічнае мінулае. Эпоха палеаліту.** Археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Беларусі маюць сваю значную даўнасць. У параўнанні з археалагічнымі даследаваннямі поўдня і ўсходу Усходне-Еўрапейскай раўніны тэрыторыя Беларусі з'яўляецца мала даследаванай. Археалагічныя помнікі — матэрыял вялікай гістарычнай вартасці. Яны даюць магчымасць як пранікнуць далёка ў мінулае тэрыторыі, гэтак і намеціць асноўныя вехі ў яе гістарычнай эвалюцыі; адначасна з гэтым археалагічныя помнікі даюць багаты матэрыял, на падставе якога можна выявіць бытавы ўклад жыцця насялення. З археалагічнага боку найбольш даследаваны былая Віцебская губерня ў яе заходніх частках і Смаленская губерня. Рэшта тэрыторыі толькі пачынае даследавацца. Найбольш старажытнай эпохай з'яўляецца эпоха каменнага веку. Гэты апошні дзеліцца на палеаліт і неаліт. Характэрнай азнакай першага з'яўляецца ўжыванне прыладаў з неацесанага каменю, тады як у эпоху неаліту ўсе прылады адшліфаваны. Эпоха палеаліту ў параўнанні слаба прадстаўлена на тэрыторыі Беларусі. Палеалітычныя прадметы знаходзяцца ў паўночнай і сярэдняй частках. У вадазборы верхняга Дняпра іх зусім не знаходзяць. Найбольшая колькасць прадметаў палеаліту прыпадае на Віцебскую губерню. Гэтак, у Себежскім павеце, на беразе возера Глубачынскага, знойдзен экзэмпляр адбіўнай скалкавай стралы. У Гарадоцкім павеце знойдзена мноства скалкавых нажоў. Скалкавыя прылады спатыкаюцца і ў іншых паветах: Веліжскім, Невельскім, Віцебскім на правым беразе Заходняй Дзвіны. Паасобныя прадметы палеаліту знаходзяцца і на тэрыторыі Меншчыны.

**Эпоха неаліту.** Помнікі неалітычнага перыяду прадстаўлены больш багата. Яны спатыкаюцца на ўсёй тэрыторыі Беларусі, хаця размеркаваны няроўна. На поўнач ад левага берага Заходняй Дзвіны прадметы эпохі неаліту пападаюцца невялікімі групамі. На тэрыторыі на поўдзень ад Заходняй Дзвіны неалітычныя прадметы спатыкаюцца гусцей. Вялікая майстэрня каменных прыладаў была знойдзена каля злучэння рэк Нарвы і Бабра ў Гарадзеншчыне. Гэткае размеркаванне прадметаў неаліту сведчыць аб тым, што частка насялення жыла вандроўным жыццём, а другая — аселым. Неалітычныя становішчы былі раскінуты на берагах рэк, азёр, дзе можна было знайсці рыбу для жыў-

насці і скалку для вырабу прыладаў. Разам з гэтым спатыкаюцца прадметы неалітычнай эпохі, зробленыя з такіх гатункаў каменю, якія не спатыкаюцца ў паўночнай частцы Беларусі, а гэтаксама пацеркі і чарапашыны, што сведчыць аб развіцці тавараабмену з суседзямі. Прадметы неаліту з'яўляліся прыладамі для барацьбы з жывёлаю і дзеля паляўніцтва. Апрача гэтага, да неаліту адносяцца: долаты, рубілы, сякеры, сярпы, жорны і інш. У эпоху неаліту ўжо было вядома ганчарнае рамясло. У паўднёвай частцы Беларусі была знойдзена магіла з чатырма глінянымі пасудзінамі. Пахаванне нябожчыкаў у эпоху каменнага веку яшчэ не мела пэўнай усталенай формы. Існуюць магілы дваякага тыпу пахавання: адны — вынік трупаспалення, другія — вынік трупазакапання.

**Металічная эпоха.** Помнікі бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі спатыкаем даволі рэдка. У паўночнай частцы тэрыторыі зусім не знойдзена помнікаў гэтае эпохі. У Смаленшчыне, у гэтак званым Гнездаўскім могільніку, знойдзена некалькі невялікіх выпуклых гузікаў, рэшткі доўгага, падобнага да чаравіка, бронзавага футляра, бронзавая спражка, бронзавы персцень, прасунуты ў загнуты канец дроту, кавалак бронзавай чатырохкутнікавай бляшкі, загнутай дужкай, з чатырма цвічкамі на канцах. Наогул, бронзавыя помнікі Смаленшчыны нязначны. Больш помнікаў бронзавага веку спатыкаецца на Меншчыне. Прадметы металічнай эпохі належаць да жалезнага веку; гэты век папераджаўся гэтак званай «пераходнай эпохай», калі побач з прадметамі жалезнымі ўжываліся і каменныя прылады. Пераход ад каменнага перыяду да жалезнага веку адбываўся вельмі паволі. Помнікі металічнага перыяду не адносяцца раней X—XI стст. Да іх адносяцца: пацеркі са шкла, нашыйныя ланцугі з буйных або дробных колак, пакручастыя наручнікі, сякеры, пікі, нажы, мячы, металічныя бляшкі, жалезныя астрогі, жалезныя цвікі, вянкі на галаў, ланцужкі на шыю, фібулы, пярсцёнкі, паясы, кальчужныя тканіны, прасніцы. Ад эпохі металічнага веку захавалася значная колькасць курганоў, могільнікаў. Раскопкі высвятляюць форму пахавання нябожчыкаў. У раёне Заходняй Дзвіны пераважна палілі трупы. У раёне Прыпяці і Бярэзіны пераважна закопвалі трупы ў зямлю. У раёне верхняга Дняпра і Сожа шмат дзе часцей закопвалі трупы, чымся палілі. Немагчыма азначыць, да якога народа прыналежаць раскіданыя па тэрыторыі могільнікі. У кожным выпадку яны былі не славянскія і не латышскія. Латышы называюць гэтыя магілы чужымі. Разам з гэтым па левых прытоках Заходняй Дзвіны, а гэтаксама ў Горадзеншчыне, Віленшчыне знаходзяцца ў вялікім ліку курганы, у якіх труны пароблены з каменных пліт. Побач з гэткімі магіламі спатыкаюцца курганы, абложаныя каменнямі, а на Бярэзіне каля Барысава — нават з каменным скляпеннем. Каменныя магілы знойдзены каля ракі Бабра і на правым беразе Заходняй Дзвіны, у вельмі, аднак, нязначным ліку. Гэтыя курганы адносяцца да культуры нейкага іншага народа ў параўнанні з курганамі і магіламі першага тыпу.

**Першыя насельнікі.** Азначыць нацыянальнасць першых насельнікаў вельмі трудна. Магчыма думаць, што найбольш старажытнымі насельнікамі былі

фіны, мова якіх прыналежыць да ўрала-алтайскай групы моваў. Фінскае племя дзеліцца на дзве галіны: заходнюю і ўсходнюю, і спрадвеку жыло на тэрыторыі Усходне-Еўрапейскай раўніны ад Балтыйскага мора да вусця Енісея. Пад уплывам славянскай каланізацыі фінскія пляменні не раз пераходзілі з месца на месца. Фінскія пляменні, што жылі на тэрыторыі Беларусі, прыналежаць да заходняй галіны. Геаграфічная наменклатура дазваляе пабудаваць гэты вывад. Паміж вялікай колькасці неславянскіх геаграфічных назоваў у раёне паўночнага Падзвіння і верхняга Падняпроўя спатыкаецца шмат назоваў рэк з канчаткам на *-ва, -за, -ма, -га, -са, -ша* (Вязьма, Орша, Костра, Протва, Лучэса, Дрыса, Волга, Нічэсма, Велеса і г. д.), якія ўсе фінскага паходжання. Даследаванне Люцынскага могільніка і параўнанне яго з могільнікамі на тэрыторыі фінскага плямення ліваў, а гэтаксама археалагічныя раскопкі на поўдзень і паўднёвы ўсход ад Люцына і па Дзвіне, ніжэй Полацка, сведчаць аб падабенстве з пахаваннем Люцынскага могільніка. Апрача геаграфічнай наменклатуры фінскага паходжання маецца вялізная колькасць назоваў не фінскага характару, але безумоўна чужацкіх і вельмі дзіўнагучных назоваў, як напрыклад: Жакта, Докша, Кадосна, Гардосна, Семта, Дунгіты, Обачы, Рычы, Чамнасы. Гэткія назовы спатыкаюцца ў Падзвінні і ў верхнім Падняпроўі, але найбольш іх у раёне левых прыток Прыпяці і на сярэдзіне Заходняй Дзвіны. Гэтаксама і прытокі Бярэзіны: Мрой, Гнюта, Нача, Усяж, Зор — чужаземнага паходжання. На тэрыторыі паміж Прыпяццю і Бярэзінай пападаюцца гэтаксама чужаземныя назовы: Іпа, Ола, Пютча, Даколька. У даліне ракі Нёмана гэтыя чужаземныя назовы з'яўляюцца пануючымі. Сама Прыпяць з правымі прытокамі — Стаход, Стыр, Гарынь, Весялуха, Жалобніца, Случ, Быстрыца, Млынка, Струбля, Плотніца, Балотніца, Зімуха і інш. — славянскага паходжання. Можна дзеля гэтага думаць, што другімі прыходцамі на тэрыторыю Беларусі былі ліцвіны, якія жылі ў дагістарычныя часы значна далей на ўсход ад сваёй гістарычнай айчыны і ў IV ст. прымушаны былі пасунуцца на захад. Курганы, раскопаныя ў Калужскай губерні на рацэ Протве, і па форме пахавання — закапанне трупаў, і па прадметах культуры тыя самыя, што і курганы рэк Нёмана і Заходняй Дзвіны, літоўскае паходжэнне якіх не выклікае жаднага сумнення (сякеры, засцежкі, спражкі, пікі, падвескі, персцяні з рэзьбай, сярпы, бранзалеты — усе прадметы зроблены надта дасканала). Далейшы рух ліцвінаў на захад у межы Ковеншчыны, Горадзеншчыны і Віленшчыны злучан з напорам славянскага плямення з вадазбору Прыпяці на поўнач па Бярэзіне і Дняпры. Фінаў і ліцвінаў змянілі славяне, якія занялі тэрыторыю з даволі значнай культурай.

**Культура фінаў.** Фіны, жывучы ў лясах, пераважна па берагах рэк, займаліся звералоўствам; скура ўжывалася на вопратку і дзеля вымены. Земляробства знаходзілася яшчэ ў зачатковым стане. Ад суседніх іранскіх пляменняў, што жылі на поўдні Усходне-Еўрапейскай раўніны, фіны пазнаёміліся з металамі і меддзю. У фінскіх магілах знаходзяць наступныя прылады: нажы, сякеры, мячы, стрэлы, молаты, лемяхі. Заходнія фіны падлягалі значнаму культурнаму

ўплыву суседніх ліцвінаў, пазнаёміўшых фінаў з жытам, лёнам, свіннёй і казой і з прыгатаваннем сена. Ліцвіны навучылі фінаў будаваць цёплыя хаты. Фінскі бог Грамавік называецца «Пуркінэ», што гэтаксама ёсць скутак культурнага ўплыву ліцвінаў, які адбіўся часткова і на мове заходніх фінаў. Грамадскія адносіны заходніх фінаў былі даволі прымітыўныя і не выходзілі за межы старажытнага радавога саюза.

**Культура ліцвінаў.** Літоўская культура была вышэй за фінскую. Ліцвіны былі добра знаёмы з ральніцтвам, але пераважнай жыўнасцю была мясная. Адзін сучаснік XVII ст. — немец — цвердзіў, што «ліцвіны ядуць ваўкоў, лісіц, варон, соваў, сарок і ўсялякае іншае паскудства». Матэрыяльны быт ліцвінаў прымітыўны. Найбольш пашыраным тыпам памяшкання была курная хата. Пад уплывам суседзяў славян ліцвіны навучыліся будаваць цёплыя хаты з шырокай рускай печчу (істуба). Хаты будаваліся з тоўстых плашак елкі. Жывёла знаходзілася разам з людзямі. Сацыяльна-палітычны быт ліцвінаў характарызуецца панаваннем радавых саюзаў з усімі выплываўшымі адгэтуль звычаёва-праўнымі поглядамі на жанчыну як на здабытак роду. Радавыя саюзы жылі паасобку адзін ад другога. Сучасная сяліба з'яўляецца паказальнікам паасобкавага жыцця радавых саюзаў. Што датыча рэлігіі, дык ліцвіны доўгі час заставаліся паганцамі. Яшчэ ў XVI ст. паганскія ўплывы былі вельмі моцныя на Жмудзі. Паганства ліцвінаў афармляла сябе пад уплывам суседзяў-фінаў і агульнаіндаеўрапейскага культу продкаў. Звычай частых гаданняў, прынашэнне ў ахвяру чорных курэй, парасят, бараноў і белых коней розным бажкам, культ мураўёў, змей, загаворы і заклінанні — скутак фінскага ўплыву. У ліцвінаў быў пашыраны культ жывёл, раслін і прадметаў, як, напрыклад, мядзведзяў, зайцоў, вужоў, жаб, каменняў, дубовых дрэваў — усё гэта ёсць выразны паказальнік рэлігійнага фетышызму. Культ продкаў выяўляўся ў выглядзе падтрымання беззупыннага дамовага агню, у звычаях, звязаных з памінкамі нябожчыка, у легендах аб тым, што душы памёршых адпраўляюцца да іншых продкаў, у кульце вужа як увасаблення душы продка, які тоіцца ў хаце і ахоўвае яе. Старажытныя ліцвіны не ведалі ніякай рэлігійнай сістэмы. Уся рэлігія грунтавалася на прымітыўным абагаўленні сіл прыроды: сонца, месяца, зораў, агню, вады, грому і маланкі.

## 3. ДАГІСТАРЫЧНАЕ МІНУЛАЕ СЛАВЯН

**Прабацькаўшчына славян.** Славяне з'яўляюцца часткай індаеўрапейскай сям'і і прыналежаць разам з ліцвінамі да ўсходняй яе групы. Славяне і ліцвіны спачатку жылі па-суседску. Можна меркаваць, што каля апошняга тысячалецця да Нараджэння Хрыстова (Н. Х.) ліцвіны пачалі выасабняцца ад славянскіх пляменняў. Гэтае выасабненне ўжо зусім вызначылася ў першым веку пасля Н. Х. Славянскія вандроўкі III і IV стст. пасля Н. Х. канчаткова адасобілі славян ад ліцвінаў. Разам з тым гэтыя вандроўкі спрыялі і выасабненню паасоб-

ных славянскіх народаў. Славянскае племя — спрадвечнае племя на тэрыторыі Еўрапейскай раўніны. Славяне не з'яўляюцца выхадцамі з Азіі, дзе даўней шукалі бацькаўшчыны ўсіх арыйцаў. «Начальны летапіс» захаваў паданне аб супольным жыцці славян на Дунаі, адкуль распачаўся працэс рассялення славянства. Аднак летапісу нельга прыдаваць вялікага значэння. Само слова «Дунай» не славянскага, а кельцкага паходжэння. Паяўленне славян на Дунаі не было першапачатковым фактам у гісторыі славянскай каланізацыі. Славяне прыйшлі на Дунай, пакінуўшы сваю старую бацькаўшчыну. Чэшскі вучоны Нідэрле[1] лічыць, што тэрыторыя, якая была для славян прабацькаўшчынай, была мясцовасцю, багата зарослай лясамі: букам, дубам і бярозаю; была багата заалагічнымі і воднымі багаццямі і пазбаўлена ад усялякіх прыродных перагарод. Граніцай славянскай прабацькаўшчыны на паўднёвым захадзе было Карпацкае плоска-ўзвышша. Затым яна паварачвалася на захад у кірунку Віслы і на поўнач да вадазбору правага паўднёвага берага Прыпяці. Левыя прытокі Прыпяці — літоўскага пахаджэння. На паўночным усходзе граніца даходзіла на Дняпры да горада Магілёва. На ўсходзе славяне занялі вадазбор сярэдняга Дняпра, а на поўдні граніца перасякала вышнявіны рэк Серэта, Прута, Днястра, Паўднёвага Буга, даходзячы па Дняпры да ўтокі ў яго Псёла.

**Суседзі славян. Паўночныя суседзі.** Суседзямі славян на паўночным захадзе было германскае племя готаў. Да II ст. пасля Н. Х. готы паспелі ўжо аб'яднацца, мелі моцную княжую ўладу і дасягнулі даволі значнага культурнага развіцця. Гоцкая металічная культура была даволі добрага гатунку. Готы выраблялі пераважна зброю. Яны складалі ўсходнюю частку германскага плямення і засялялі ўзбярэжжа Балтыйскага мора на ўсход ад Віслы. Готы былі сціснуты з усходу славянамі, з другога боку суседнія германскія пляменні перашкаджалі ім пасоўвацца на захад. У пачатку II ст. колькасць насялення готаў значна павялічылася. Готы прымушаны былі шукаць выхаду для свайго павялічанага насялення. Гэтак падгатаўляўся паток гоцкай эміграцыі, якая мела вялікі ўплыў на славянскія вандроўкі.

**Паўднёвыя суседзі славян. Грэцкая каланізацыя.** Элінскі свет даволі рана знайшоў паўночныя берагі Чорнага мора. Магчыма, што грэкі прыйшлі сюды следам за фінікіянамі і малаазійскімі карыйцамі, якія мелі тут вялікія гандлёвыя сувязі. Грэцкая каланізацыя пачалася з VII ст. Грэкі выбіраліся на поўнач па жывёлу, рыбу, хлеб, футры, шэрсць, мёд, воск, ільняныя і канапляныя тканіны. Асаблівае значэнне меў гандаль збожжам. У IV ст. да Н. Х. палова збожжа прывозілася ў Грэцыю з поўначы, з берагоў Чорнага мора. А Грэцыя пасылала сюды віно з астравоў Хіоса, Тадоса і Радоса. Ганчарныя (керамічныя) вырабы прыбывалі з Афін і Карынфа, а гэтаксама металічныя, залатыя і срэбныя аздобы і розныя прадметы роскашы. Партыйная барацьба ў гарадах, знадворныя мітрэнгі, пералюдненне спрыялі пашырэнню каланізацыйнай дзей-

---

[1] Нідэрле Любар (1865–1944), чэшскі археолаг, этнограф і гісторык-славіст. У 1898–1929 гг. прафесар Пражскага універсітэта. Аўтар прац «Чалавецтва ў дагістарычныя часы», «Славянскія старажытнасці» і інш.

насці грэкаў. Каланізацыйную палітыку пачалі гарады Мілет у Малой Азіі і Мегара ў Еўропе. Мілету прыпісваюць заснаванне 80 калоній. Мілет заснаваў Ольвію на правым беразе Буга, Тыру на Днястроўскім лімане, а на паўднёвым узбярэжжы Крыма — Феадосію і Пантыкапею (Керч) і Фанагорыю на процілеглым беразе супроць Пантыкапеі. Выхадцы з Мегарскай калоніі — Гераклеі — заснавалі Херсанэс. Побач з развіццём Афінскае дзяржавы ўсё ўзбярэжжа Чорнага мора як культурна, гэтак палітычна і эканамічна папала ў сферу ўплыву Афін. Адначасна з упадкам палітычнага ўплыву Афін у III—II стст. у калоніях узмацняецца ўплыў Малой Азіі і Александрыі. У I ст. да Н. Х. асталёўваецца рымскі ўплыў, які змяняецца візантыйскім.

**Гістарычныя лёсы калоній.** Тыра — свабодная незалежная рэспубліка з народным соймам, сенатам і 4 архонтамі на чале — захавала сваю незалежнасць да паловы I ст. пасля Н. Х., калі яна перайшла пад уладу Рыма. Цэнтрам грэцкага гандлю была Ольвія, якая праіснавала да III ст. пасля Н. Х. і зусім заняпала дзякуючы найсцю вандроўных ордаў, што змянілі скіфскія пляменні. З часам у Ольвіі была пастаўлена рымская залога. Херсанэс пераважыў звычайны лёс усіх чарнаморскіх калоній — росквіт і заняпад. Стаўшы ў візантыйскую эпоху асяродкам грэцкае культуры, Херсанэс меў вялікі ўплыў на культурнае развіццё ўсходняга славянства пасля яго рассялення. Пантыкапея стала сталіцаю Баспорскага царства, якое пашырыла свой уплыў і на вусце Дона з калоніяй Танаіс. Сельскагаспадарчая культура ў Баспорскім царстве атрымала вялікае развіццё. Вёскі былі асяродкам збожжавай прадукцыі, а гарады з'яўляліся месцамі для гандлю і прамысловасці. Гандаль і рыбацтва павялічвалі эканамічнае значэнне Пантыкапеі. У II ст. да Н. Х. Баспор паддаўся рымскаму ўплыву. Затым ён папаў у сферу візантыйскага ўплыву. У VII ст., калі на ніжняй Волзе з'явіліся хазары, на Баспоры асталявалася ўлада хазар. Фанагорыя пачала называцца Таматархі. А славяне пазней называлі гэту мясцовасць Тмутаракань.

**Уплыў грэцкай культуры.** Народы, што жылі ў чарнаморскіх стэпах і былі беспасрэднымі суседзямі славян, вынеслі на сабе ўплыў грэцкай культуры. Археалагічныя раскопкі сведчаць аб прысутнасці тут мноства прадметаў грэцкага вырабу, як ганчарных, гэтак і металічных. Сфера грэцкага ўплыву даходзіла да сярэдняга Дняпра, дзе была знойдзена пасуда артыстычнай работы і розныя ювелірныя рэчы.

**Іранскія пляменні.** Чарнаморскія стэпы спрадвеку былі заселены. Грэцкія пісьменнікі Гамер, Гесіёд і Герадот падаюць даволі дакладныя аб іх весткі. Самымі старажытнымі насельнікамі былі кімерыйцы — народ вандроўны, які карміўся малаком. У V ст. да Н. Х. чарнаморскія стэпы былі заняты скіфскімі пляменнямі, якія знаходзіліся ў пастаянных зносінах з грэцкімі каланістамі. Скіфскія пляменні — іранскага пахаджэння і былі выхадцамі з Сярэдняй Азіі. Скіфскія курганы поўдня Расіі і Сярэдняй Азіі разам з Сібір'ю змяшчаюць у сабе аднастайныя помнікі.

**Тэрыторыя скіфаў.** Зямля скіфаў, паводле слоў Герадота, прадстаўляла сабою раўніну, багатую травой і добра абводненую. Па ёй цякуць рэкі: пяці-

вусцевы Істр (Дунай), за ім Тырас (Днестр), Гіпаніс (Буг), Барысфен (Дняпро), Танаіс (Дон). Найбольшае значэнне для Скіфіі меў Дняпро. Ён даваў статкам вельмі багатыя пасбішчы, выборную рыбу; вада яго вельмі прыемна на смак і адзначаецца чыстатою. Уздоўж яго цягнецца вельмі добрая ворная зямля або расце вельмі высокая трава там, дзе глеба не засяваецца; у яго вусці багата асядае солі; у ім ловяцца на саленне вялікія рыбы без хрыбетніка — асятры. У III ст. скіфы былі падбіты сарматамі. Скіфы растварылі сябе і сваю культуру паміж прыходцаў-заваявальнікаў. Частка скіфаў патрапіла выасабніцца ад сарматаў і затрымалася на Каўказе. На месца сарматаў у I ст. пасля Н. Х. паяўляюцца аланы, якіх змяняюць готы, гуны.

**Скіфа-сармацкія курганы.** На тэрыторыі старажытнай Скіфіі ад вусцяў Дуная і Дняпра, уверх па Бугу, па Дняпры і яго прытоках да мястэчак Смелы і Ромнаў Палтаўскай губерні, да Харкаўскай губерні, па Таўрыцкім паўвостраве, па Доне і берагах Азоўскага мора, па Кубані і яе прытоках — знаходзіцца вялікая колькасць кургаНоў. Скіфы-сарматы хавалі сваіх нябожчыкаў у старанна зробленых магілах, якія характарызуюць быт багатых ваяк. Раскопкі скіфа-сармацкіх магіл пачалі адбывацца даўно. Паміж раскопаных курганоў выдатнае месца займае Кульобская магіла[1], раскопаная ў 1831 г. недалёка ад Керчы, а гэтаксама Чартамлыцкі курган каля мястэчка Нікопаля ў Екацерынаслаўскай губерні, раскопаны ў 1862 г. Абедзве магілы адносяцца да III—I стст. да Н. Х. У апошнія часы многа археалагічнага матэрыялу далі раскопкі ў Крыме. Скіфская культура знаходзілася пад моцным уплывам суседняга грэцкага свету. Залатыя вырабы і вазы, знойдзеныя ў магілах, — грэцкага пахаджэння. У паўночных магілах знойдзена шмат прадметаў, зробленых непрактычнаю рукою, дзе чуецца часткаю перайманне грэцкіх прадметаў. Гэта былі пачаткі самастойнай скіфскай культуры.

**Быт скіфаў.** Скіфы дзяліліся на дзве групы: на вандроўнікаў і на ральнікаў. Першыя жылі паміж Донам і Дняпром, карміліся вараным мясам, пілі кабылле малако і елі сыр з кабылляга малака. Усходнія скіфы займаліся гадоўляй жывёлы і паляўнічтвам. Статкі ў скіфаў складаліся з коней, авец і валоў. Скіфы палявалі на дзікоў і аленяў. Заходнія скіфы займаліся ральніцтвам, рыбацтвам, пчалярствам і часткай жывёлаводствам. Скіфы ўжывалі ў якасці жыўнасці хлеб, часнок, чачавіцу і проса. Збожжа вывозілася ў вялікай колькасці. Скіфскія звычаі былі суровыя і ваяўнічыя. З чэрапаў найбольш выдатных ворагаў скіфы рабілі сабе кубкі, часамі аздаблялі іх золатам і карысталіся імі ва ўрачыстыя моманты. Хто забіў найбольшы лік ворагаў, той карыстаўся найбольшай павагай і пашанаю. З палітычнага боку скіфскія пляменні былі аб'яднаны дэспатычнай уладай цара, які вырашаў усе справы самаўладна і меў у сваіх руках неагранічанае права жыцця і смерці.

**Рэлігія скіфаў.** Рэлігія скіфаў для нас не зусім ясна. Грэцкаму пісьменніку Герадоту не ўдалося падмеціць сутнасць скіфскага культу. Можна думаць, што рэлігія скіфаў развілася з першапачатковага пакланення небу і зямлі і затым

[1] Курган Куль-Аба.

дайшла да ўвасаблення сіл і з'яваў прыроды ў паасобных боствах. Найбольшай пашанай карысталася багіня дамовага вогнішча і сямейнага дабрабыту. Затым ішло боства неба, багіня ўрадлівасці і ральніцтва, бог сонца і свету. У скіфаў не было ні святынь, ні прыслужнікаў культу. Старэйшыя ў родзе выступалі наперад пры рэлігійных урачыстасцях і прыносілі ахвяры. У ахвяру найчасцей прыносілі коней, якіх душылі пятлёй. Лепшую частку мяса і вантробы прыносілі ў ахвяру багам, а рэшту мяса смажылі. З вялікай урачыстасцю знатныя скіфы хавалі сваіх нябожчыкаў. Герадот апавядае, што памёршага цара, пасля таго як яму рабіліся розныя ўшанаванні, апушчалі ў выкапаную магілу і закопвалі разам з ім адну з яго жонак, а гэтаксама слуг, коней, лепшую жывёлу, залатыя прылады. Над магілай насыпаўся вялікі курган. Ужо генуэзскія каланісты XIV ст. ведалі аб багаццях, якія знаходзяцца ў скіфскіх магілах, і раскопвалі гэтыя магілы.

**Іранскі ўплыў.** Скіфы-сарматы мелі вялікі ўплыў на сваіх суседзяў — фінаў, славян і нават грэкаў. Іранцы пазнаёмілі фінаў з металамі — з меддзю, серабром, золатам, часткаю з ральніцтвам і свойскаю жывёлай — каровамі і авечкамі. Суседні элінскі свет, дзякуючы безупынным стычкам з іранскімі пляменнямі, падлягаў уплыву скіфаў. Грэкі страцілі чыстасць сваёй мовы, адзяваліся па-скіфску, носячы нагавіцы і плашчы чорнага колеру.

**Вандроўкі готаў.** Рух усходнегерманскага племення готаў ад берагоў Балтыйскага мора на поўдзень у чарнаморскія стэпы быў выкліканы як ростам насялення, гэтак і націскам суседзяў — славян і германцаў. Рушыўшыся ад берагоў Балтыйскага мора, готы перайшлі праз непраходныя багны, праўдападобна, пінскага Палесся. У часе гэтае вандроўкі на плытах і пераправах загінула многа народу. Мінуўшы гэтыя небяспечныя месцы, готы прыйшлі ў краіну, празваную імі Ошт; адгэтуль яны былі прымушаны пасоўвацца далей на поўдзень у чарнаморскія стэпы, дзе готы пражывалі ў працягу III—IV стст. у межах ад Дняпра да Дуная і Карпат. Мясцовае іранскае насяленне, падобліва, было падбіта готамі. Рака Днестр дзяліла готаў на ўсходніх і заходніх — остготаў і вестготаў. Готы ўтварылі даволі значную дзяржаву і ваявалі з Рымам. Гоцкі ўплыў пашыраўся і на суседнія народы, паасобку і на славянскія плямені. Гандлёвыя і вайсковыя зносіны з Візантыяй спрыялі хрысціянізацыі готаў. Масавае хрышчэнне готаў адбылося ў палове IV ст. Знаходзячыся ў чарнаморскіх стэпах, готы рабілі напады на суседнія народы і рабавалі іх. Гоцкая эміграцыя была штуршком для славянскай каланізацыі.

**Рух гунаў.** У канцы IV ст. у Еўропу з Азіі хлынула хваля вандроўных татарскіх народаў, вядомых пад назовай гунаў. Яны падбілі ўсходніх готаў. Заходнія готы перайшлі за Дунай, у межы Візантыйскай імперыі. Зруйнаваўшы гоцкую дзяржаву, гуны рушыліся ў Панонскую нізіну і залажылі вялікую дзяржаву, якая дасягнула найбольшай магутнасці пры Атылу. Рымскія пісьменнікі падаюць некаторыя весткі аб гунах.

**Быт гунаў.** Пісьменнік Аміян Марцэлін апісвае гунаў як агідлівую брыдоту, з каранастым станам і грубой шыяй, зусім безбародых. Гуны не маюць ста-

лых памяшканняў і жывуць вандроўным жыццём. Адзежа гунаў зроблена з палатна або скуры і надзяваецца праз голаў. Носяць яе датуль, пакуль яна не пашарпаецца так, што сама зваліцца з плеч. На галовы надзяваюць футраныя шапкі, а ногі абвіваюць казлінаю скураю. Страву ядуць нявараную і непрыпраўленую. Гуны не маюць ядынай царскай улады, але падлягаюць паасобным верхаводцам. Гуны надта спрытныя коннікі і вельмі трапныя стралкі.

**Лёс гунаў.** Гунская дзяржава разваліласа пасля смерці Атылы (453). Падбітыя гунамі народы паўсталі і прагналі гунаў з Паноніі. Частка гунаў перайшла на правы бераг Дуная і пасялілася ў Дабруджы. Другая частка рассеялася ў чарнаморскіх стэпах. Падобліва, што суседнія з гунамі славянскія пляменні прызнавалі ўладу Атылы.

**Балгары.** Следам за гунамі ў чарнаморскіх стэпах паяўляюцца балгары. Першыя весткі аб іх маюцца з канца V ст. У VI ст. балгары жылі на Азоўскім узбярэжжы па Доне і Кубані. У VII ст. балгарская арда распадаецца на некалькі орд. Заходнія балгары перайшлі Дунай і разам са славянамі рабілі напады на Візантыйскую імперыю. Падбіўшы славян, балгарская арда растварылася ў славянскім моры. Усходнія балгары пасяліліся пры ўтоцы Камы ў Волгу, дзе ўтварылі ў IX—X стст. вялікую дзяржаву. Другая частка ўсходніх балгар спынілася на Паўночным Каўказе.

**Авары.** У VI—VII стст. у чарнаморскіх стэпах паяўляюцца авары, якіх начальны летапіс называе «обрамі». Авары рабілі напады на славянскія пляменні, што жылі каля Карпат. Авары не раз перапраўляліся праз Дунай і рабілі набегі на Візантыйскую імперыю.

**Першапачатковыя весці аб славянах.** Славянскія пляменні прыналежаць да сям'і індаеўрапейскіх народаў. Рымскі пісьменнік Пліній і грэцкі географ Пталемей ведалі аб славянах і называлі іх «венетамі», жывучымі паміж Віслай і Балтыйскім морам. Пталемей называе славян мнагалюдным народам. Пісьменнік VI ст. Іярдан называе славян «венетамі», але дзеліць іх на дзве часткі: уласціва славян ад Дуная да Днястра і на поўнач да Віслы, і антаў — ад Днястра да Дняпра. У VI ст. славяне, што жылі на Дунаі, робяць напады на Візантыйскую імперыю. Грэцкія пісьменнікі VI ст. Пракопій і імператар Маўрыкій падаюць каштоўныя весці аб славянах. Трэба лічыць даведзеным, што ў VI ст. славянства раздзялілася на дзве галіны: заходнюю — славян, і ўсходнюю — антаў.

**Славянскія вандроўкі.** Славянскія пляменні распачалі вандроўку пад уплывам гоцкай эміграцыі, якая прайшла па сярэдзіне славянскай прабацькаўшчыны. Готы раздзялілі славянскую сям'ю на дзве групы: заходнюю і ўсходнюю. Першыя павінны былі пасунуцца на захад да Віслы і Эльбы і на паўднёвы захад прабацькаўшчыны за Карпаты к Дунаю. Усходняя галіна славянства пасунулася на ўсход к Дняпру і спусцілася на поўдзень да вадазбораў вялікіх чарнаморскіх рэк. З утварэннем гоцкай дзяржавы славяне ўваходзілі ў яе склад і знаходзіліся пад уладай остготаў. Распад гоцкай дзяржавы і ўтварэнне гунскага царства адпаведным чынам адгукнуліся на славянах і антах. Распад гун-

скай дзяржавы вярнуў славянскім пляменням палітычную свабоду. Заходнеславянская галіна пасунулася далей к Дунаю. На сярэднім Дунаі заходнеславянскія плямені стыкаліся з паўднёваславянскімі. Каланізацыйная хваля ўсходнеславянскай галіны не пашырылася на чарнаморскае ўзбярэжжа. Паміж абедзвюма славянскімі галінамі не заўсёды былі добрыя суседскія адносіны. У 534 г. паміж славянамі і антамі, недзе каля Дуная, адбылася спрэчка, быць можа, за непадзеленую дабычу. Анты былі пераможаны.

**Усходнія славяне і авары.** У палове VI ст., калі авары пасоўваліся з прыкаспійскіх стэпаў на захад, адбылася стычка паміж аварамі і антамі і пры гэтым не без уплыву суседняй Візантыі. Тэрыторыя антаў была вельмі спустошана. Авары падбілі сабе антаў і разам з імі рабілі напады на балгар і Візантыйскую імперыю. Аднак гэтая залежнасць была не даволі моцнай і сталай. У другой чвэрці VII ст. аварская арда пачынае занепадаць. Пры Карлу Вялікім франкі задалі аварам апошні ўдар. Вызваленне ад авараў і пераход славян на Балканскі паўвостраў далі магчымасць антам заняць левы бераг Дуная.

**Культура славянства перад каланізацыяй.** На падставе славянскай лінгвістыкі магчыма пабудаваць даволі дакладнае прадстаўленне аб матэрыяльным быце славян. Яны былі знаёмы з ральніцтвам (жыта, пшаніца, ячмень, проса, авёс, лён, каноплі). У славян была свая земляробская тэрміналогія: араць, ратай, ріва, ралля, леха. Славяне мелі і земляробскія прылады: саху, барану, плуг, сярпы, косы, граблі. Ведалі мельніцы, умелі звязваць збожжа ў снапы і малаціць. Славяне ўмелі пячы хлеб. Ім было вядома агародніцтва і садоўніцтва (боб, гарох, чачавіца, хмель, рэпа, мак, часнок, яблыкі, грушы, чарэшні, вішні, арэхі). Спаміж свойскае жывёлы славянам былі вядомы быкі, валы, каровы, цяляты, коні, кабылы, вепры, свінні, парасяты, бараны, авечкі, ягняты, гусі, вуткі, куры і галубы. Елі славяне мяса, пілі малако, умелі вырабляць сыр і масла, ужывалі яйкі і шэрсць жывёлы для свае патрэбы. Займаліся пчалярствам (пчала, борць, мёд, воск), паляўніцтвам (бабры, куніцы, ваўкі, мядзведзі, зайцы, ласі, алені) і рыбацтвам (ласосі, шчупакі, асятры, угры, акуні і інш.). Славяне ўмелі вырабляць скуры, умелі карыстацца шэрсцю, вырабляць рэчы з гліны і дзерава (цясаць, цясло, долата, струг, клешчы, піла, кола, вось, човен, лодка, бочка, бодня, дзяжа, вядро, збан, карыта). Славяне мелі паасобныя памяшканні (дамы, хаты (ізбы), сцены, кроквы, вокны, дзверы). Славянам былі вядомы металы: золата, срэбра, медзь, жалеза. Агульнаславянскімі з'яўляюцца словы «кузнец», «кавач», «залатар»; назовы аружжа — «кап'ё», «шчыт», «суліца», «сякера», «лук» з «цяціваю», «страла», «броня», «шолам», а гэтаксама металічныя аздобы — «персцень», «абручы», «грыўні» і музычныя інструманты — «бубны», «гуслі». Дзеля гандлёвага карыстання ўжываліся словы «торг», «мера», «локаць».

**Іранскі ўплыў на славян.** Скіфа-сармацкая культура мела ўплыў на культуру славян. Словы «курган», «шатры», «бугар», «чартог», «сабака», «тапор», «кура» — іранскага пахаджэння. Прадметы-аздобы — шыйныя грыўні, званочкі, бранзалеты — гэтаксама вынік іранскага ўплыву.

**Гоцкі ўплыў.** Ад готаў славяне навучыліся вырабляць зброю і розныя металічныя рэчы. Ад іх жа запазычаны словы «князь», «меч», «пенязь», некаторыя тэрміны земляробскага і жывёлаводчага быту — «скаціна», «асёл», «яблыка», «вярблюд», «піла». Готы пазнаёмілі славян са шклом.

**Грэцкія пісьменнікі аб культуры славян.** Пракопій і імператар Маўрыкій Мудры, якія мелі магчымасць пазнаёміцца са славянамі ў VI ст., апісваюць іх як вельмі некультурных. Лінгвістычныя даныя, якія былі пададзены вышэй, даюць поўнае права лічыць культуру славян больш высокай.

## 4. СЛАВЯНЕ Ў ЭПОХУ КАЛАНІЗАЦЫІ

**Усходнеславянская каланізацыя.** Другі перыяд усходнеславянскай каланізацыі пачынаецца з VII ст. і цягнецца да канца X і пачатку XI ст. Каланізацыя развівалася ў трох кірунках: на паўночны захад у Палессе і Задняпроўе, поўдзень, паўночны ўсход і паўднёвы ўсход Усходне-Еўрапейскай раўніны. Праваднікамі каланізацыі былі рэкі, якія далі магчымасць славянам дабрацца да Дняпра і перабрацца ў вадазборы суседніх рэк. Упадак аварскае магутнасці, калі тэрыторыя Паўднёва-Усходнееўрапейскай раўніны асвабадзілася ад насельнікаў, дапамог развіццю тэмпу самой каланізацыі. Вялікая моц лясоў, што спатыкаліся на шляхах славянскае каланізацыі, прыпыняла працэс каланізацыі. Недахват крыніц не дазваляе намаляваць дакладны абраз славянскае каланізацыі. Даныя «Начальнага летапісу», весткі арабскіх і візантыйскіх пісьменнікаў X—XI стст. падаюць каштоўны матэрыял аб пазнейшай славянскай каланізацыі.

**Паўночна-заходняя каланізацыя.** Славянскія плямені, што знаходзіліся на сярэднім Дняпры, падняліся на поўнач да верхняга Падняпроўя, а адтуль — да Заходняй Дзвіны, заняўшы сярэднюю і верхнюю Дзвіну. Сярэдзінай Дзвіны цераз раку Вялікую славянскія каланісты дайшлі да Чудскага возера, а з верхняга Дняпра, дайшоўшы да вышнявіны Ловаці, уніз па апошняй спусціліся да возера Ільмень. Гэта тэрыторыя была занята *крывічамі*, якія ў пазнейшым часе каланізавалі паўночна-ўсходнюю частку еўрапейскай раўніны і гэтым самым з'явіліся асноўным ядром ва ўтварэнні велікарасійскага племення. Крывічы раздзяліліся з часам на дзве галіны: заходнюю падзвінскую, з Полацкам у асяродку, і ўсходнюю, у якой асяродкам стаў з часам Смаленск.

**Палессе.** Тэрыторыя на поўдзень ад крывічоў на правым баку Дняпра паміж Прыпяццю і Дзвіной была занята *дрыгавічамі*. Правы бераг ракі Прыпяці быў заняты *драўлянамі*, якія жылі тут здаўна. Суседзямі дрыгавічоў на захадзе былі *ліцвіны*, пацiснутыя на захад прыйшоўшымі каланістамі, а суседзямі драўлян былі дулебы па рацэ Заходні Буг.

**Задняпроўе.** З верхняга Дняпра славянскія каланісты пасунуліся на ўсход у вадазбор рэк Дзясны, Сейма, Сулы і Сожа. Гэтыя плямені называліся *северанамі* і *радзімічамі*. Заняўшы вадазбор верхняй Волгі і верхняга Дняпра, славянскія плямені пасунуліся на паўночны ўсход да верхняй Акі. Каланісты верхняй Акі сталі называцца *вяцічамі*.

**Сярэдняе і ніжняе Падняпроўе.** Сярэдняе Падняпроўе было занята *палянамі,* якія жылі ў стэпах. Спушчаючыся ўніз па Дняпры, славяне дайшлі да вусця Дняпра і пачалі называцца «ўлічанамі». З ніжняга Дняпра ўлічы, перайшоўшы Буг, занялі Днестр. Але адтуль раён іх пасялення дасягаў Дуная. Другая група чарнаморскіх усходніх славян называлася *ціверцамі,* якія занялі раку Днестр і даходзілі сваімі паселішчамі да самага мора.

**Паўднёва-ўсходняя каланізацыя.** Арабскія пісьменнікі адзначаюць, што славянскія паселішчы знаходзіліся на ўсход ад Дняпра і на поўдзень ад Сулы. Падымаючыся ўверх па рацэ Сейм, славянскія каланісты праз раку Сасну маглі прабрацца на Дон, а вышнявінамі Псёла і Ворсклы дайсці да вышнявіны Данца. У X ст. севяране дабраліся да вусця ракі Кубані, якое з'яўлялася выдатным гандлёвым пунктам паміж грэцкімі гарадамі і волжскімі хазарамі, і залажылі на месцы старой калоніі — Фанагорыі — новую, вядомую пад назовай *Тмутаракань.* Пашырэнне каланізацыі на паўднёвы ўсход было магчыма толькі дзякуючы таму, што хазары, заняўшыя ніжнюю Волгу, ахоўвалі шляхі ад азіяцкіх вандроўнікаў.

**Тры групы славянскіх пляменняў.** Усходнеславянскія плямені дзеляцца на тры групы: на заходнюю і паўночна-заходнюю (крывічы, дрыгавічы, радзімічы), паўднёвую (паляне, драўляне) і паўночна-ўсходнюю, якая каланізавала міжрэчча Акі і Волгі ўжо ў пазнейшыя гістарычныя часы — X—XIII стст. Гэтыя тры групы з'яўляюцца ядром трох народаў — беларускага, украінскага і вялікарускага. Самы працэс утварэння нацыянальнасцей адносіцца да пазнейшых часоў, але ўжо ў момант каланізацыі існавалі асаблівасці ў мове і звычаях паасобных пляменняў.

**Матэрыяльная культура славян.** Даныя мовы сведчаць аб значным матэрыяльным і культурным развіцці славян эпохі да рассялення. Зробленыя археалагічныя раскопкі і прадметы, знойдзеныя ў курганах, пацвярджаюць даныя мовы. На падставе гэтага матэрыялу трэба адмовіцца ад погляду некаторых гісторыкаў, галоўным чынам нямецкіх, аб малым культурным развіцці славян. На новых месцах славяне займаліся ральніцтвам, гадоўляй жывёлы, рыбацтвам, пчалярствам. Прамысловасць здабываючая была пануючай, і сама гаспадарка дзякуючы вялікай прасторы і малой залюдненасці тэрыторыі адзначалася надзвычайнай экстэнсіўнасцю. У драўлянскіх і дрыгавіцкіх магілах археолагі знаходзілі жалезныя сярпы і рэшткі збожжа (жыта, ячменю і пшаніцы). Абрабляючая прамысловасць была слаба развіта. Славяне былі знаёмы з ткацкім, ганчарным і бандарскім рамяслом. Найбольш былі пашыраны два апошнія. Вельмі пашыраны былі вёдры са срэбнымі ручкамі, знойдзеныя ў дрыгавіцкіх магілах, якія ўжываліся як чары для напояў, а гэтаксама глінянае начынне, якое, аднак, даволі рэдка спатыкаецца ў курганах дрыгавічоў і радзімічаў і надта часта ў крывічоў. Апрача гэтага апошнім былі вядомы металы: бронза, жалеза, срэбра, медзь і золата. У курганах спатыкаецца шмат металёвых рэчаў: цвікоў, жалезных клямраў, спражак, нажоў, астрог, сякер, сковак, стрэл, шпілек, звычайна жалезных. Спатыкаюцца гэтаксама срэбныя бранза-

леты, пярсцёнкі, спражкі, срэбная аздоба з падвескамі. Медзь і жалеза трапляюцца ў злітках. Мабыць, у крывічоў было пашырана кавальскае рамясло. На тэрыторыі радзімічаў і крывічоў былі знойдзены бурштыновыя і шкляныя пацеркі. Нямнога знойдзена аружжа, за выняткам крывічоў, як то: пік, мячоў, шчытоў, кальчуг, шоламаў, сковак і стрэл.

**Гандаль.** Крывічы, радзімічы і дрыгавічы не жылі замкнёнымі пляменнямі. Яны падтрымлівалі гандлёвыя зносіны з суседзямі. У курганах археолагі знаходзілі вагі і вагавыя каменні. Відавочна, ужо паспела выдзеліцца асобная грамадская група, якая спецыяльна займалася гандлем. Балтыйскае мора і вусці рэк, што ўліваюцца ў яго, былі багаты бурштынам. Гэта было ўжо вядома фінікіянам, а затым грэкам і рымлянам; аб гэтым сведчаць знаходжваныя манеты афінскія, егіпецкія, кірэнскія, сіракузскія, македонскія і рымскія. Арабскія манеты — дырхемы, знойдзеныя ў Віцебскай губерні VIII—IX стст. і ў Віцебску X ст., сведчаць аб гандлі з арабамі. Ёсць знаходкі дырхем на водападзеле паміж сістэмаю рэк Дняпра і Заходняй Дзвіны, а гэтаксама ў самой Смаленшчыне — VIII, IX, X стст. Гандаль з усходам адбываўся па Дзвіне, Каспіі, Дняпры, Вязьме, Маскве, Ацэ, Волзе, Каме. Гандлёвымі зносінамі з азіяцкімі культурнымі краямі тлумачыцца прысутнасць у курганах радзімічаў і крывічоў бронзавых лямп усходняга стылю, ядвабных тканін і каштоўных каменняў. Тэрыторыя крывічоў была, мабыць, асяродкам усходняга гандлю, пасрэднікамі якога былі валожскія балгары. Можна спадзявацца, што крывічы гэтаксама рана наладзілі гандлёвыя зносіны з Грэцыяй. Не падлягае сумненню, што ў пачатку IX ст. зносіны крывічоў з грэкамі на Дняпры зусім наладзіліся. І заходні гандаль мае вельмі ранняе пахаджэнне. На тэрыторыі крывіцкага пляменння былі знойдзены ў значнай колькасці манеты англасаксонскія, ангельскія, дацкія, нямецкія. Знойдзеныя на гэтай жа тэрыторыі мячы скандынаўскага пахаджэння сведчаць аб гандлёвых зносінах з Захадам.

**Унутраны гандаль.** Заграмічны гандаль дапамагаў развіццю ўнутранага гандлю. Пашыранасць аздобаў срэбных, бронзавых (пярсцёнкі, шпількі, завушніцы), фарфоравых і шкляных сведчыць аб унутраным гандлі.

**Дамовы быт. Павярхоўны выгляд славян.** Арабскі пісьменнік Ібн Фадлан апісвае славян як народ дужы, спрытны, высокі, з светлымі валасамі, з загарэлым, але прыгожым тварам. Адзенне мужчын вызначалася прастатою і складалася з кашулі, падпяразанай поясам, і нагавіц. Канечнай прыналежнасцю вопраткі былі раменныя паясы з жалезнымі або бронзавымі спражкамі. Жаночая вопратка была больш багатай. Тут мы бачым каралі з пацерак шкляных, карнеолевых, аметыставых, бронзавых, срэбных. На руках насілі бранзалеты і пярсцёнкі, якія часамі вызначаліся надта далікатнай работаю. Бяднейшыя жанчыны насілі пацеркі з гліны. Усходні і візантыйскі гандаль даваў магчымасць багатым апранацца ў дарагія тканіны, ядвабы і златаліты, што ў гэту эпоху не было яшчэ надта пашырана. Звычайна на адзенне ўжывалася льняная тканіна. У курганах захаваліся рэшткі футраных і войлачных шапак.

**Характар славян.** Славяне былі жыццярадасным народам, любілі спевы, музыку і танцы, надта густавалі віно, якое пілі ўдзень і ўночы, як піша аб гэтым арабскі пісьменнік Ібн Фадлан. Гасціннасць і пашана да чужаземцаў звярнулі на сябе ўвагу як усходніх арабскіх, гэтак і нямецкіх пісьменнікаў.

**Сямейны быт.** Славянская сям'я стала патрыярхальнай яшчэ перад рассяленнем. Гэткай яна засталася і пасля рассялення. Улада мужа і бацькі была вельмі значнай. Становішча жанчыны было залежнае. На яе глядзелі як на ўласнасць мужа, і бывалі выпадкі, калі жонак пасля смерці мужа забівалі. Распаўсюджанне мнагажонства гэтаксама сведчыць аб тым, што кабета была ў залежным стане. У эпоху панавання радавога ладу ў часе ігрышч «умыкалі» (хапалі) нявест, і гэта форма шлюбу была пераважнай. Летапісец адзначае, што такая форма шлюбу была ў радзімічаў, вяцічаў і севяран. Трэба, аднак, ведаць, што такая форма шлюбу ў пэўныя эпохі мела месца ўсюды. Адначасна з тым як радавы лад развальваўся, «умыканне» нявест адбывалася са згодай жаніха і нявесты, і пры гэтым выплачваўся пасаг бацька́м нявесты. Нарэшце, калі радавы лад зусім адмёр, звычайнай формай шлюбу былі ўводзіны нявесты ў дом жаніха. Летапісец адзначае, што такая форма шлюбу была ў палян.

**Грамадскі быт.** Славяне перад рассяленнем жылі родамі, утворанымі з некалькіх праславянскіх сем'яў. Апошняя будавалася на прынцыпе патрыярхату. Словы «бацька», «маці», «брат», «сястра» і г. д. утварыліся яшчэ ў эпоху сумеснага жыцця ўсіх арыйцаў. Род супольна ўладаў усёй рухомай і нерухомай маёмасцю і кіраваўся сваім старшым у родзе: прадзед, дзед, бацька, старшы брат або старшы па выбары. Адносіны ўнутры роду вызначаліся звычаямі. Пастановы роду прымаліся на радавым сходзе — вечы. Пад уплывам каланізацыі распаліся старыя радавыя сувязі і замяніліся адносінамі па суседстве. Асновай грамадска-палітычнага быту славян стала *грамада,* якая злучала некалькі патрыярхальных сем'яў, звязаных суседствам і супольнымі эканамічнымі інтарэсамі. Утварэнне грамадскіх саюзаў не знішчожыла радавых перажыткаў. Радавыя сувязі і адносіны захавалі сваю моц на працягу вельмі доўгага часу. У Беларусі, у Падзвінні і Прыдняпроўі радавыя сялянскія аб'яднанні захавалі сваю сілу яшчэ ў другой палове XVI ст. Славянскія каланісты былі ўзаемна злучаны геаграфічна, этнаграфічна і палітычна. Крывічы, дрыгавічы і радзімічы мелі поўную магчымасць падтрымліваць узаемныя зносіны і гэтым самым падрыхтоўваць будучае этнаграфічнае аб'яднанне. Еднасць мовы, быту, рэлігіі, заняткаў гэтаксама падрыхтоўвала аб'яднанне славян у этнаграфічныя камплекты. Супольныя ўмовы палітычнага жыцця паасобных груп усходняга славянства павінны былі мець значны ўплыў на далейшы працэс палітычнага аб'яднання ў адзіны этнаграфічна-палітычны арганізм.

**Культура славян пасля рассялення.** Грамадская арганізацыя магчыма толькі тады, калі маецца тэрыторыя, з якою звязаны беспасярэдна ці пасярэдна сельскія грамады. У цэнтральных месцах грамад утварыліся ўмацаваныя паселішчы, якія называліся гарадамі або гарадзішчамі. Асабліва шмат такіх ёсць на Украіне. Горад у простым сэнсе гэтага слова азначае месца, агароджанае або

землянымі валамі, або дзеравяннымі сценамі, прызначанае для прытулку і абароны. Канечнасць захоўваць гарадскія фартыфікацыі ў добрым стане спрыяла ўтварэнню пэўных сувязей паміж грамадамі. Паступова гарады сталіся асяродкамі жыцця насялення ўсёй наўкольнай тэрыторыі. Гэткім чынам утварыўся ў палян Кіеў, у падзвінскіх крывічоў — Полацк, у прыдняпроўскіх — Смаленск, у севяран — Чарнігаў і Любеч, у дрыгавічоў — Тураў і Пінск. Сельскія грамады, звязаныя з тым або іншым горадам эканамічнымі і палітычнымі інтарэсамі, паволі пачалі выліваццa ў тэрытарыяльныя аб'яднанні, якія выходзілі за межы грамадскай арганізацыі. Утварыліся гэтак званыя гарадавыя воласці, якія былі першапачатковай стадыяй у пераходзе ўсходнеславянскіх пляменняў да больш развітых дзяржаўных арганізмаў, краін-земляў XI—XIII стст.

**Духоўная культура. Рэлігія.** Рэлігійныя погляды ўсходняга славянства былі агульнаарыйскага пахаджэння, і яны складаліся пад уплывам тых сіл прыроды, якія дапамагалі славяніну ў яго гаспадарчай дзейнасці. Фетышызм быў першай формай рэлігійнае свядомасці славянства і выражаўся ў агульным распаўсюджанні культу лесу і вады. Славяне пакланяліся азёрам, балотам, студням, гаям і дрэвам. Другім момантам у рэлігійнай свядомасці славянства было развіццё анімістычнага погляду на прыроду. Славянам пачало здавацца, што ўся прырода ажыўлена. Кожны прадмет, кожная праява прыроды былі адухоўлены, і ў кожным з іх бачылася прысутнасць жывога духа. Гэтыя духі маглі перасяляцца ў іншыя формы. Духі маглі прыняць форму звяроў, людзей або мяшаную. Да ліку духаў прадметаў або праяў прыроды адносяцца русалкі, лесавікі, вадзянікі. Адначасна з развіццём культу продкаў і прадстаўлення аб душах памерлых паяўляюцца духі радавыя або сямейныя. Дамавы род, раджаніца — былі духамі радавымі і сямейнымі. І матэрыяльная культура мела сваіх духаў-апекуноў. Жытні дзед і палявік былі апекунамі ральніцтва і жывёлаводства. Маюцца і злыя духі, якія прыносяць людзям няшчасці: упыры, ваўкалакі, дэманы, трасцы. З працягам часу рэлігійнае развіццё славян значна пасунулася наперад. У славян паявіліся свае вышэйшыя боствы. Агульнараспаўсюджаным культам быў культ Перуна — бога грому і бліскавіцы, уладара неба, Дажбог і Вялес, якія ўвасабляюць сабою бога сонца як крыніцу жыцця на зямлі людскога і жывёльнага, Сварожыч — бог агню. Вышэйшыя боствы — гэта богі паганскай інтэлігенцыі-арыстакратыі. Славянская народная маса знаходзілася на ніжэйшым стопні рэлігійнага развіцця. Палітычнае аб'яднанне ўсходняга славянства ў X ст. было прычынай таго, што культы мясцовых вышэйшых боствaў былі перанесены ў Кіеў.

**Культ.** Паганскі культ не атрымаў глыбокага развіцця. У славян не было ні святынь, ні духоўнікаў, ні балваноў. Апошнія паяўляюцца ў Кіеве толькі ў палове X ст., безумоўна пад уплывам хрысціянства. Паганскі культ быў вельмі просты і складаўся з прынясення ахвяр дзе-колечы ў лесе або каля рэчак ці азёр. Прыслужнікамі культу выступалі ад імя сям'і бацькі, ад імя грамады, воласці — прадстаўнікі апошняй. У X ст. паяўляюцца пракокі-чараўнікі, якія мелі вялікі ўплыў на грамадства: ім прыпісваецца асаблівая моц у зносінах з боствам.

**Замагільнае жыццё.** Славяне былі перакананы, што жыццё чалавека не канчаецца адначасна са смерцю: душа пераносіцца ў невядомую краіну. Адгэтуль утварыўся звычай пакідаць пры нябожчыку ўсе тыя рэчы, якія асабліва былі яму дарагі; на магіле наладжваліся памінкі, у часе якіх нябожчыка пацяшалі ядою, пітвом і песнямі. Культ продкаў — гэтаксама вынік веры ў замагільнае жыццё. Аднак гэтае рэлігійнае прадстаўленне ў паганскую эпоху не дасягнула значнага развіцця. Замагільнае жыццё прадстаўлялася славянам як зямное.

**Пахавальныя абрады.** Славянам былі вядомы дзве формы пахавання сваіх нябожчыкаў: трупаспаленне і трупапахаванне. Першая форма была пераважнай у крывічоў, радзімічаў, вяцічаў, северан, якія, паводле слоў летапісу, наладзіўшы памінкі па нябожчыку, «творяху краду веліку», клалі на вогнішча нябожчыка, а потым, сабраўшы рэшткі, укладвалі іх у урну і ставілі іх над магілаю. Разам з нябожчыкам палілі і яго дамовы скарб, калолі коней і жывёлу, а часамі і людзей. Арабскі пісьменнік Ібн Фадлан, апісваючы пахаванне багатага славяніна, кажа, што разам з нябожчыкам была спалена забітая нявольніца (рабыня), якая згадзілася памерці разам са сваім гаспадаром. На тэрыторыі дрыгавічоў пераважнай формай было трупапахаванне. Нябожчыка ў труне або проста без труны клалі на зямлю, пасыпаную попелам і белаю глінаю, а пасля над ім будавалі драўляны зруб.

**Паганскія святы.** Славяне мелі свае святы, якія ўтварыліся пад уплывам прыроды, а дзеля гэтага былі злучаны з кругазваротам года. Пачатак сонечнага года адзначаўся святам, вядомым пад назовай Каляды. У палове зімы святкаваліся провады зімы — Марэны, якія супадаюць цяпер з масляніцай. Увесну святкавалася Радуніца — «Красная горка», у часе якой вадзілі на зялёнай свежай траве карагоды, пелі песні, «умыкалі» нявест. Заканчываліся веснавыя святы «Русаліямі», ахвярованымі ўшанаванню дрэваў, траў, красак, калі і душы нябожчыкаў выходзілі з магілы, каб павесяліцца з жывымі. У канцы чэрвеня, калі летні дзень дасягаў найбольшай даўжыні, адбывалася свята ў чэсць Купалы і Ярылы, у аснове якіх было пакланенне богу кахання. Дзяўчаты плялі вянкі і кідалі іх у ваду, гадалі аб сваім лёсе, вадзілі карагоды, спявалі песні, скакалі праз агонь.

## 5. КАЛАНІЗАЦЫЯ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ І ЎТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

**Рассяленне падзвінскіх крывічоў.** Славянскае племя крывічы, заняўшае сярэдні бег Заходняй Дзвіны, паволі рассялялася ў вадазборы ракі і межах той тэрыторыі, якая ў палітычных адносінах з часам утворыць Полацкую зямлю. Слядамі гэтага каланізацыйнага працэсу з'яўляюцца весткі аб населеных пунктах. Самым старажытным славянскім паселішчам быў горад Полтеск[1] (Полацк), аб якім успамінаецца ў летапісе пад 862 годам. Займаючы выгоднае

[1] Полотеск, Полотьск.

геаграфічнае палажэнне, Полацк стаў цэнтрам для падзвінскіх крывічоў. Адарваныя летапісныя весткі не даюць магчымасці адтварыць гістарычна дакладны малюнак каланізацыйнага працэсу. Каланізацыя з Полацка пайшла ў розных кірунках і перш-наперш уверх і ўніз па Заходняй Дзвіне. На верхняй Дзвіне пры ўтоцы рэчкі Відзьбы пабудаваўся Відбеск[1], аб якім успамінаецца ў летапісе пад 1021 годам. Падобліва, што адначасна з гэтым былі каланізованы і правыя прытокі Заходняй Дзвіны. Ранні ўспамін летапіса аб паселішчы Усвяч[2] пры возеры тае ж назовы (1021) і Еменец[3] (1186) пацвярджае выказаную вышэй дагадку. Забяспечваючы сабе вышнявіну Заходняй Дзвіны, падзвінскія крывічы каланізавалі і левыя прытокі Заходняй Дзвіны. У летапісе ўспамінаюцца Неклач[4] (1128) пры возеры тае ж назовы, з якога бярэ пачатак рака Палота, Стрыжаў[5] (1127) падобліва пры возеры Стрыжэва. К палове XI ст. каланізацыя на паўднёвы ўсход дайшла да Ршы[6] на Дняпры (1067) і Копыся (1059). Каланізацыйны рух на захад ад гэтых гарадоў завяршыўся пабудовай каля Лукомльскага возера горада Лукомля на рацэ Уле; аб гэтым успамінае Уладзімір Манамах у яго навучэнні. На поўдзень знаходзіўся Дрютьск[7]. К пачатку XII ст. увесь бег Бярэзіны быў захоплены крывіцкай каланізацыяй; тут пабудаваўся горад Барысаў, вядомы з 1127 г. На паўднёвы захад ад Барысава быў пабудован горад Менск (1067) і на паўночны захад ад Менска на вышнявіне Свіслачы — Заслаўе, вядомае з 1127 г. На захад ад Менска каланізацыя перакінулася на рэчку Бярэзіну, прытоку Нёмана. У летапісе пад 1162 г. спатыкаецца назова гарадка Гарадзец. На гэтай граніцы знаходзіўся Гарадзец[8] (Горадня), аб якім успамінаецца ў «Слове аб палку Ігаравым», але дзе ён знаходзіўся — невядома. Гэта быў пагранічны пункт на літоўскай граніцы. Быць можа, заходнія паселішчы, занятыя полацкімі крывічамі, былі яшчэ раней заснованы ліцвінамі, але ў X—XIII стст. гэтыя паселішчы мелі зусім славянскі характар. Літоўскія пляменні аславяніліся. Даволі рана пачалася каланізацыя крывічамі ніжняга бегу Дзвіны. Археалагічныя раскопкі сведчаць аб тым, што да XIII ст. каланізацыя паміж літоўска-латышскіх пляменняў ішла паспешна. Мажліва, што каланізацыя паміж латышоў была асабліва энергічнай у княжую эпоху, калі полацкім князям праз вусце Заходняй Дзвіны прыходзілася падтрымліваць гандлёвыя зносіны з Заходняй Еўропай. Герцыка[9], Куко-Нойс[10], здаецца, рана папалі ў сферу ўплыву крывічоў. Стаўшы асяродкам невялікае акругі, Полацк з часам зрабіўся цэнтрам цэлае краіны і ў той жа час быў ключом заходняга гандлю для ўсёй тэрыторыі. Займаючы сярэдні бег Дзвіны, полацкія крывічы на поўдні спус-

---

[1] Віцебск (Видебск), Витьбеск.
[2] Усвяты (Въсвяч).
[3] Емянец.
[4] Некалач (Неклоч).
[5] Стрэчаў (Стрежев).
[6] Орша.
[7] Друцк.
[8] Гарадзец (Городец).
[9] Герцыке (Герсіке, Гарцыке).
[10] Кукенойс (Кукейнос, Кокнесе).

ціліся да вышнявін Бярэзіны і Свіслачы па левым беразе сярэдняй Бярэзіны. У XII—XIV стст. крывічы спусціліся ўніз па Бярэзіне да Бабруйска (1387) і па Свіслачы да яе вусця, дзе быў пабудован горад Свіслач, які ўспамінаецца першы раз у 1349 г.

**Граніцы каланізацыі падзвінскіх крывічоў.** На захадзе крывічы гранічылі з ліцвінамі і немцамі. Крывіцкая каланізацыя пакіравалася за мяжу літоўскага плямення ўглыб яго тэрыторыі. На ўсходзе крывічы гранічылі са Смаленскай зямлёй. На поўначы каланізацыя дайшла да ракі Вялікай. На поўдні крывічы падышлі да дрыгавіцкай каланізацыі на сярэднім бегу Бярэзіны, вышнявінах Птыча, прытокі Прыпяці.

**Рассяленне дрыгавічоў.** Рака Прыпяць была занята дрыгавічамі, якія каланізавалі верхні і сярэдні яе бег. У «Начальным летапісе» маецца параўнаўча мала вестак аб заселеных цэнтрах той тэрыторыі, якая ў палітычных адносінах склала Турава-Пінскую краіну. Утварэнне гарадскіх паселішчаў адносіцца да вельмі ранняга часу. Цэнтрам дрыгавіцкай тэрыторыі быў Тураў — вядомы з 980 г. На вышнявінах Прыпяці, пры ўтоцы ў яе Піны, вырас Пінск, аб якім успамінаецца ў 1097 г. Абодва гэтыя гарады кантралявалі гандлёвы шлях, што злучаў Дняпро з прывіслянскай воднай артэрыяй праз Заходні Буг. На ўсход ад Турава знаходзіўся Мазыр на паўднёвым беразе Прыпяці, вядомы з 1155 г. У куце паміж Прыпяццю і Дняпром знаходзіўся гарадок Брагін на рацэ Брагінцы, вядомы з паловы XII ст. Паўночнымі гарадскімі цэнтрамі былі Клічэск і Случэск (Слуцк). Першы ўспамінаецца ў летапісе пад 1127 г., а другі — пад 1116 г. Дрыгавіцкая каланізацыя на захадзе стыкнулася з валынскай каланізацыяй, а на паўночным захадзе сваёй тэрыторыі пранікла і на ўласна літоўскую зямлю.

**Каланізацыя верхнедняпроўскіх крывічоў.** Дняпроўскія крывічы каланізавалі занятую фінскімі пляменнямі тэрыторыю. Цэнтрам крывіцкіх грамадскіх паселішчаў быў Смаленск, раскінуты на вялікім гандлёвым шляху, што цягнецца з краіны азёр у сярэдняе і ніжняе Падняпроўе, адтуль у Грэцыю. Другі гандлёвы шлях праходзіў з верхняга Падзвіння ў Паваложжа, і Смаленск стаў перадавальным пунктам для збыту тавараў Усходу на Захад і наадварот — для перадачы заходніх тавараў на Усход. З вышнявін Дняпра крывічы праніклі ў вадазбор Сожа — углыб зямлі радзімічаў. Блізасць вадазбораў Дняпра і Волжска-Окскага дала магчымасць развівацца каланізацыі крывічоў ва ўсходнім кірунку па рацэ Угры і яшчэ далей на ўсход. Паселішчы крывічоў маглі даходзіць ва ўсходнім кірунку да сярэдняга бегу ракі Масквы. Летапіс паведамляе аб вялікай колькасці гарадскіх паселішчаў на тэрыторыі дняпроўскіх крывічоў. Весткі аб апошніх маюцца і ў «Устаўной грамаце князя Расціслава Мсціславіча», дадзенай ім смаленскай епархіі ў 1150 г. Крывіцкая тэрыторыя, стаўшая тэрыторыяй Смаленскай зямлі, была, як відаць, даволі густа заселена. На тэрыторыі знаходзілася да 60 гарадоў. На поўначы краіны на галоўным гандлёвым шляху знаходзіўся Тарапец, які прызываўся ў старажытнасці Крывітэпск. На паўднёвы захад ад Тарапца, гэтаксама на вялікім водным шляху, — Жыж-

чы на беразе возера. На паўночны захад ад Смаленска знаходзілася Касплля, там, дзе пачынаецца заходні шлях. На гэтым жа шляху на паўднёвы захад ад Смаленска знаходзіліся Лодэйніцы. Дарога ў Суздальскую зямлю ішла або праз Вазузу-Волгу, або праз Вязьму. На гэтых гандлёвых шляхах знаходзіліся гарады Саладоўнічаў і асабліва важны ў гандлёвых і палітычных адносінах — Вязьма. Гэтаксама на волаках паміж вышнявінамі Масквы і Протвы знаходзіўся шэраг гарадскіх паселішчаў: Балонеск, Ветца і Вышняе-Глінска. Увесь бег Масквы быў даволі густа заселены. Цэнтральным пунктам гэтай часткі Смаленскай зямлі быў горад Мажайск на рэчцы Маскве, утрачаны смальнянамі ў 1303 г. На поўдні і на паўднёвым усходзе тэрыторыі выраслі Прапойск[1], Крычаў і Зара, які быў скрайнім пагранічным горадам. Тэрыторыя Смаленскай зямлі на захадзе гранічыла з Полацкай зямлёй, на ўсходзе і паўночным усходзе — з Роства-Суздальскім краем, на паўднёвым захадзе — з Турава-Пінскай зямлёй і на поўдні — з Северскай зямлёй.

**Утварэнне беларускага народа.** Беларускі народ утварыўся ў выніку ўзаемнага ўплыву некалькіх пляменняў. Падзвінскія і падняпроўскія крывічы, радзімічы, дрыгавічы, часткаю драўляне склалі асноўнае этнаграфічнае ядро беларускага народа. Гэтае выдзяленне продкаў беларусаў з агульнаславянскага жыцця і ўваход з часам паасобных беларускіх краін у склад Літоўска-Беларускае дзяржавы прычыніліся да ўтварэння асобнае беларускае мовы і беларускага народа, які зарадзіўся ў вадазборы Заходняй Дзвіны і Нёмана і ахапіў агромную тэрыторыю. Калі цэнтральная частка гэтае тэрыторыі (Віленшчына, поўнач Меншчыны, былая Магілёўская губерня, поўдзень Смаленскай губерні) з'яўляецца па мове чыста беларускай, то ў паўднёвай частцы Меншчыны адбываецца збліжэнне беларускае мовы з украінскай, у той час як у паўночнай паласе тэрыторыі (паўночны захад Смаленскай, паўднёвы захад Цвярской, Віцебская і поўдзень Пскоўскай губерні) беларускія гаворкі збліжаюцца з паўднёвавелікарасійскімі гаворкамі. Беларускі народ як выдзеленая этнаграфічная адзінка ўтварыўся ў перыяд XIII—XV стст. Тэрмін «Белая Русь» не атрымаў яшчэ зусім правільнага тлумачэння. Найперш ён спатыкаецца ў нямецкіх пісьменнікаў XIV ст. На нямецкай мове называлі тэрыторыю Weisse Russen, а на лацінскай у польскіх кроніках — Alba Russia. У суседняй Маскве тэрмін «Белая Русь» пачынае ўжывацца ў часы Івана III (1462—1505). Тэрмін «белы», паводле думкі адных вучоных, азначае «незалежны», «свабодны». Белая Русь — свабодная Русь, незалежная, не падбітая татарамі. Іншыя ставяць эпітэт Белая Русь у залежнасць ад павярхоўнага выгляду беларусаў. Белы колер — найбольш пашыраны колер у беларусаў, якія апраналіся ў старажытнасці ва ўсё белае. Акадэмік Ламанскі[2] лічыць, што тэрмін Белая Русь — агульнанароднага паходжэння і што ён ужываўся ў палове XIII ст.[3]

[1] Слаўгарад.

[2] Ламанскі У. І. (1833—1914), расійскі гісторык, славіст, прафесар Пецярбургскага універсітэта (1865—1899), акадэмік (1900), рэдактар (з 1890) часопіса «Живая старина» этнаграфічнага аддзялення рускага геаграфічнага таварыства.

[3] XV—XVI стст.

# 6. ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАГА ПЛЯМЕННЯ ДА ПАЛОВЫ XI СТАЛЕЦЦЯ

## А) Эпоха пляменных саюзаў

**Раздзельнасць пляменняў.** Славянскія пляменні, з якіх утварыўся беларускі народ, па свайму геаграфічнаму становішчу былі адасобнены адны ад другіх. Заходнія крывічы, заняўшы верхнюю і сярэднюю Заходнюю Дзвіну з яе прытокамі, пасоўваліся ў сваім каланізацыйным працэсе на захад і паўднёвы захад у бок Балтыйскага мора і сярэдзіны Нёмана. Усходнія крывічы з вышнявін Дняпра пасоўваліся на ўсход, захапіўшы з часам сваёй каланізацыяй вялізныя абшары аж да вышнявін ракі Волгі і ракі Масквы. Дрыгавічы, асеўшы на Прыпяці і яе левых прытоках, былі прывязаны да сярэдняга Дняпра і да вадазбору верхняга Нёмана і Заходняга Буга. Радзіміцкая каланізацыя не мела ніякіх самастойных вынікаў. Радзімічы папалі ў сферу ўплыву крывічоў, якія не спатыкалі ніякае перашкоды для сваёй каланізацыі ў вадазборы Дняпра і Сожа. Геаграфічная раздзельнасць вызначыла палітычную самабытнасць славянскіх пляменняў, якія былі незалежны адно ад другога: «Жывяху в міре поляне і деревляне і север і радімічі і вятічі». Кожнае племя мела свае звычаі і законы: «отец своіх і преданія, кождо свой нрав». У кожным племені быў свой цэнтральны горад, навокал якога адбываўся працяглы працэс пляменнага аб'яднання. Апрача старшых гарадоў на тэрыторыі існавалі і прыгарады. Арабскія пісьменнікі IX—X стст. называюць тэрыторыю, занятую славянамі, «краінай гарадоў». Нарвежская «Сага Ольва»[1] называе гэту тэрыторыю Гардарыкіяй.

**Шляхі зносін.** Праз тэрыторыю, занятую крывічамі і дрыгавічамі, праходзілі важнейшыя водныя шляхі, быўшыя і каланізацыйнымі дарогамі, і гандлёвымі шляхамі. Гэтак званы «вялікі водны шлях з вараг у грэкі» праз Няву, Ладажскае возера, Волхаў, возера Ільмень, раку Ловаць злучаў Ноўгарад з сярэднім Дняпром і яго эканамічным цэнтрам — Кіевам, а гэтаксама Балтыйскае мора з Чорным. З Падзвіння некалькі шляхоў цягнулася ў бок Пскова і Ноўгарада. Падзвінне праз Касплю злучалася з верхнім Дняпром, адкуль ішла дарога на ўсход праз Вязьму і раку Маскву да рынкаў сярэдняе і ніжняе Волгі. Гэтай дарогай азіяцкія тавары маглі беспасярэдна адпраўляцца на ўсход. Вялікая колькасць знойдзеных на гэтай дарозе арабскіх дырхем сведчыць аб ажыўленым тавараабмене Азіі з Еўропай. Падняпроўе праз Прыпяць і прытоку Ясельду злучалася з Заходнім Бугам і вадазборам Віслы. Палітычныя лёсы крывічоў і дрыгавічоў у значнай меры залежалі ад гэтых гандлёвых шляхоў на іх тэрыторыі.

**Гарадавыя краіны.** Пляменнае згуртаванне заходніх крывічоў навокал Полацка, усходніх — навокал Смаленска, дрыгавічоў — навокал Турава як гарадоў, раскінутых на галоўных гандлёвых шляхах, з працягам часу вылілася

[1] «Сага пра Хрольва Пешахода».

ў новую палітычную фармацыю, гэтак званую «гарадавую краіну». Па водных шляхах вёўся ажыўлены гандаль. У гарадах пачало збірацца шмат прышлага люду. Умацаваныя пляменныя асяродкі сталі эканамічнымі цэнтрамі. Эканамічныя сувязі злучалі цэнтр краіны з ускрайкамі. Прыгарады з'явіліся гэткімі злучальнымі сувязямі. Гэтак паўсталі Полацкая, Смаленская, Тураўская, Кіеўская, Ноўгарадская і іншыя краіны. Утварэнне гарадавых краін спрыяла распаду пляменных саюзаў, паасобныя часткі якіх цягнуліся да сваіх эканамічных цэнтраў з прычыны геаграфічнага палажэння, а не дзеля пляменнай прыналежнасці. Гэткім чынам заходнія паселішчы смаленскіх крывічоў і паўночная частка дрыгавічоў цягнуліся да Полацка. Частка радзімічаў увайшла ў склад Смаленскай краіны. Паўночныя паселішчы верхнедняпроўскіх крывічоў цягнулі да Ноўгарада. Паўночна-заходнія паселішчы драўлян цягнулі да Турава, а паўднёва-ўсходняя частка драўлян і паўднёвая частка крывічоў увайшла ў склад Кіеўскай краіны. Дзякуючы ўтварэнню гарадавых краін палітычная адасобненасць адной краіны ад другой стала яшчэ больш значнай. Побач з гэтым адбываўся працэс этнаграфічнага аб'яднання крывічоў і дрыгавічоў, крывічоў і радзімічаў, вызначыўшы ў далейшым падзел беларускага народа на дзве галіны — заходнюю і ўсходнюю; у той жа час намячалася эканамічная залежнасць Смаленскай і Полацкай краін ад Ноўгарадскай і Кіеўскай земляў, што мела ўплыў і на палітычныя лёсы першых дзвюх краін.

**Эканамічны быт.** Пераважным заняткам насялення было ральніцтва. У магілах славян гэтай эпохі знойдзены сярпы, зярняты жыта, аўса, ячменю і пшаніцы. Вяцічы на Ацэ (Оке) плацілі даніну хазарам па «шлягу от рала». Паводле дамовы Святаслава з Іванам Цімісхіем Візантыя павінна была дазволіць прывозіць да сябе збожжа. Гадоўля жывёлы мела другараднае значэнне. Багацце лясоў спрыяла распаўсюджанню пчалярства і паляўніцтва на пушных звяроў, дастарчаўшы футры. Геаграфічнае палажэнне ўцягвала славян у гандлёвыя зносіны з суседзямі. Вялікая колькасць на тэрыторыі скарбаў, у якіх мы знаходзім манеты і розныя прадметы мастацтва народаў паўднёвых, усходніх і заходніх, — сведчыць аб развіцці гандлю. Аб гэтым жа ўспамінаюць і арабскія пісьменнікі: Ібн Хордадбэ (IX ст.) — аб гандлі з Візантыяй; Ібн Фадлан (X ст.) — аб гандлі з балгарамі. Весткі летапісу аб рэчных шляхах у моры Каспійскае, Чорнае і Балтыйскае, паходы Аскольда і Дзіра на грэкаў (IX ст.), дамовы з грэкамі (X ст.) пацвярджаюць даныя аб значным развіцці гандлю славян з сваімі суседзямі.

**Грамадскі ўклад.** Сацыяльны лад вызначаўся прастатой свайго ўкладу, адсутнасцю няроўнасці, хаця ў параўнанні з папярэдняй эпохай ён стаў больш складаным. У гандлёвых гарадах спатыкаюцца «градскія старцы». Гэта былі людзі, якія паходзілі ад патомкаў радавых старшынь, або разбагацеўшыя купцы. Вольнае насяленне гарадоў, што займалася або рамяслом, або земляробствам, або гандлем, называлася людзямі. Нявольнае насяленне складалі рабы, «чэлядзь». Рабамі станавіліся палоннікі. Як сведчыць грэцкі імператар Маўрыкій (VI ст.), славяне не трымалі палоннікаў у вечнай няволі. Па ўплыве пэўнага тэрміну можна было выкупіцца на волю.

**Дзяржаўны ўклад.** У дзяржаўных адносінах кожнае племя складала асобнае пляменнае княжэнне. Летапіс паведамляе аб легендарных князях — Кію, Шчэку і Харыву, якія панавалі ў палян; гэта сведчыць аб тым, што і ў іншых пляменняў былі свае княжэнні «в Деревлех свое, а Дреговічі — свое, а Словене свое в Новогороде, а другое на Полоте, іже Полочане». У паходзе Алега на Канстанцінопаль (X ст.) прымалі ўдзел усе князі «под Олегом сущчі». Ігар пасылае князёў у Грэцыю «ад усіх князёў і ад усіх людзей рускае зямлі». Кожнае племя было незалежным у адносінах да сваіх суседзяў і магло завязваць з імі дабрахоць мірныя і ваенныя адносіны: «жывяху Поляне і Деревляне і Север і Радімічі і Вятічі і Хрвате. Поляне быша обідіма Деревлянамі і інемі окольнымі».

**Веча.** Найвышэйшая ўлада ў кожным пляменні прыналежала вечу — цэнтру пляменнай арганізацыі. Веча — старажытная ўстанова. Паводле слоў грэцкіх пісьменнікаў Маўрыкія, Пракопія (VI ст.) і Канстанціна Багранароднага (IX ст.), славяне вырашаюць усе справы на народных сходах. Летапіс паведамляе, што «Новгородцы бо із начала, і Смолняне і Кіяне і Полочане і вся властi (воласці) яко же на думу на вече сходятся». Веча вырашала і абгаварвала дзяржаўныя справы. Ва ўсіх важных выпадках звярталіся да веча. Аб такіх агульных пастановах летапісец адзываецца гэтак: «сдумавше поляне», «послаша древляне», «послаша ны деревска земля». Веча выбірала князёў. Пастановы веча пашыраліся і на прыгарады.

**Быт.** Славянскія пляменні мелі «обычаі своі і законы отець своіх і преданія, каждый свой норов». Найбольш культурнымі, паводле летапісу, з'яўляюцца паляне, якія мелі «стыденіе к снохам своім і сестрам і к матерям своім» і якія жаніліся, прыводзячы нявесту ў дом жаніха, а не «ўмыкаючы» яе. Драўляне, радзімічы, вяцічы, севяране, крывічы, што жылі сярод лясоў, былі культурна адсталымі: яны хапалі нявест у часе ігрышчаў і скокаў. Дазвалялася і мнагажонства. Нябожчыкаў палілі, а сабраны попел усыпалі ў начынне і ставілі яго на слупах пры дарогах. З прычыны слабасці дзяржаўнай улады была распаўсюджана крывавая помста. Летапісец паведамляе, што драўляне «убіваху друг друга». Паводле «Сагі Ольва», «у Холмградзе кожны, забіўшы другога чалавека без суду, караўся смерцю». Крывавая помста пачала замяняцца выкупам, і к палове XI ст. сістэма штрафу аканчальна ўсталявалася. Сыны Яраслава Ізяслаў, Святаслаў, Усевалад, сабраўшыся разам, «отложыша убіеніе за голову но кунамі ся выкупаті», гэта значыць адмянілі крывавую помсту, замяніўшы яе грашовым штрафам.

## Б) Утварэнне дынастычнае дзяржавы

**Суседзі славян VIII—IX стст. Нарманы.** Суседзямі славян на паўночным захадзе былі нарманы, вядомыя ў летапісе пад назовай «варагаў», — выхадцы са Скандынаўскага паўвострава. Розныя ўмовы прымушалі насяленне да эміграцыі. Перанаселенасць утварала невыгодныя ўмовы для жыцця, прымушала насельнікаў пакідаць бацькаўшчыну і шукаць шчасця ў іншых старонках. Дзя-

куючы ўтварэнню дынастычных дзяржаў у Швецыі, Нарвегіі, Даніі паасобныя ўладары сталі падданымі сваіх каралёў. Гэта прымусіла паасобных уладароў, якія не жадалі пагадзіцца з такім палітычным становішчам, пакінуць бацькаўшчыну. Прычынілася да гэтага і права першародства. Пакінутыя без зямельнага надзелу, малодшыя ў сям'і былі прымушаны шукаць сабе сродкаў у чужых краях. Нарманская каланізацыя развівалася ў двух кірунках: адна частка варажскіх выхадцаў накіроўвалася на захад, пераважна ў Англію і паўночную Францыю. Нарманы ў працягу двух сталеццяў наводзяць жудас на еўрапейскія землі сваімі разбойніцкімі набегамі. На сваіх вузкіх, але доўгіх лодках, аднолькава прыгодных да плавання на жаглях і на вёслах, яны падніміліся ўверх па рэчках і дашчэнту спусташалі наўкольныя мясцовасці. Другая частка пасоўвалася на ўсход Еўропы па рэчных дарогах і шляхах. Па вялікім водным шляху нарманы пасоўваліся ў бок славян і ў Візантыю. Паўночныя сагі добра ведаюць усходні шлях у Міклаград (Царград), Гордарык (Ноўгарад) і Холмград (Кіеў). Нарманы паяўляліся ў Візантыі то ў якасці ваяк на службе імператара, то ў якасці купцоў. Відавочна, па дарозе ў Канстанцінопаль пэўная частка нарманаў заставалася ў славянскіх гарадах, якія адчувалі патрэбу ў ваеннай сіле. Стычка славянскага і нарманскага светаў з'явілася пачаткам дынастычнага аб'яднання славянства.

**Хазары. Тэрыторыя хазараў.** Цюркскае племя хазары, заняўшы ніжнюю Волгу, пашырыла паступова сферу свайго ўплыву на ўвесь Каўказ. У VIII ст. арабы выцеснілі хазараў з Закаўказзя, і каўказскія горы былі на поўдні ўскрайнім пунктам іх уплыву. Хазары падбілі прамысловае насяленне Падоння і Прыазоўя і распаўсюдзілі свой уплыў на Крымскі паўвостраў. Сталіцай Хазарскага царства быў горад Ітыль, пабудаваны ля вусця Волгі.

**Эканамічны быт.** Хазары займаліся ральніцтвам і культурай вінаграду. Гадоўля жывёлы гэтаксама была значна пашырана. У іх руках быў згуртаваны ўвесь усходні гандаль. Апрача гэтага хазары гандлявалі з Балгарыяй, Крымам, Персіяй, Візантыяй. Крэпасць Саркел на тым месцы, дзе збліжаюцца Волга і Дон, была асяродкам візантыйскага гандлю. Нягледзячы на шырокае развіццё гандлю, галоўным чынам усходняга, хазары заставаліся напаўвандроўным народам. Рыба і рыс былі галоўнай іх жыўнасцю. Багатыя гарады ўлетку звычайна пуставалі. Жыхары, як толькі пачыналася вясна, высяляліся ў стэпы і толькі ўвосень вярочаліся назад у горад.

**Палітычны ўклад.** Начальнік дзяржавы называўся «каган». Улада яго была неабмяжованая і наследніцкая. Яго асоба лічылася святой. Кіраўніцтва дзяржавай знаходзілася ў руках намесніка.

**Рэлігія хазараў.** Спачатку хазары былі паганцамі. У VIII ст. ад крымскіх яўрэяў хазары пераняли іудзейскую веру, тады ж у Хазарыі пачало распаўсюджвацца і магаметанства, якое, аднак, не мела ваяўнічага характару. Гандлёвыя і палітычныя сувязі з Візантыяй і хрысціянскім усходам спрыялі пашырэнню тут хрысціянства. Хазары вызначаліся верацярпімасцю. У Ітылі для людзей кожнае рэлігіі былі асобныя суды, два для магаметан, два для іудзеяў, два для хрысціян і адзін для славян-паганцаў.

**Хазары і славяне.** Хазары, займаючы дарогу, па якой паасобныя пляменні пасоўваліся з Азіі ў Еўропу, з'явіліся абаронцамі славян ад знадворных ворагаў. Раннія гандлёвыя сувязі спрыялі ўзаемнаму збліжэнню. З працягам часу паляне, радзімічы, вяцічы і северане трапілі пад уладу хазарскага хана і пачалі плаціць яму дань. Хазарскі гандаль і палітычная залежнасць ад хана прычыніліся да палітычнага аб'яднання ўсходняга славянства. Славяне плацілі хазарам дань: паляне і северане — «по белке» з кожнага дома, радзімічы — «по шлягу», вяцічы — «по шелегу от рала». Славяне, што прыязджалі ў Хазарыю, карысталіся там свабодаю. Яны захоўвалі свае рэлігійныя абрады, свой суд.

**Заняпад Хазарскага царства.** Унутраныя няладзіцы спрычыніліся да аслаблення Хазарскага царства. У Хазарыі пачало бракаваць сіл спыняць націск азіяцкіх вандроўных ордаў. У палове IX ст. прарваліся ўглыб чарнаморскіх стэпаў венгры. У канцы IX ст. венгры прайшлі на захад каля Кіева і прынялі ўдзел у барацьбе грэкаў з балгарамі. У 70—80-х гг. гэтага ж стагоддзя прыйшлі і печанегі. Спыніўшыся ў чарнаморскіх стэпах, яны занялі абшары паміж Донам і Дунаем. Гэта прымусіла славянскіх каланістаў пакінуць вадазбор ніжняга Дона, ніжняга Дняпра, паўднёвага Буга, ніжняга Днястра. Частка славянскіх пасяленцаў была знішчана вандроўнікамі. Раён славянскай аселасці звузіўся. Толькі на Чарнаморскім і Азоўскім узбярэжжах засталося крыху заселеных месц. На Таманскім паўвостраве, на нізоўях Кубані захавалася славянская калонія Тмутаракань. У 915 г. печанегі прыйшлі «первое на рускую землю». Заняўшы стэпы, вандроўнікі перагарадзілі «вялікі водны шлях» і значна скарацілі паўднёвы гандаль.

**Нарманы і славяне.** Нарманы спачатку пранікні на тэрыторыю Біярміі — узбярэжжа Белага мора і Завалочча, што цягнулася ад ракі Анегі да Пячоры і далей да Уральскага хрыбта. Жыхары Біярміі гандлявалі з нарманамі футраным таварам у вымену на золата і серабро. Па рацэ Волзе скандынаўскія выхадцы пакіроўваліся на ўсход у бок Вялікіх Балгар, дзе мянялі свае металічныя вырабы на прадукты мясцовага краю. З пашырэннем эміграцыі нарманы пачалі пранікаць на тэрыторыю славян па рэчных шляхах, якія вялі з Балтыйскага мора. Адна частка варагаў пакіроўвалася ў чарнаморскія стэпы па дарозе ў Канстанцінопаль, водным шляхам «з вараг у грэкі». Другая частка пранікала на тэрыторыю славян па рацэ Заходняй Дзвіне. Готландская «Гутасага»[1] сведчыць аб тым, што адважныя готландскія маракі пранікалі ў Візантыю па Дзвіне. Готландскія выхадцы паехалі па вадзе, што завецца Дзвіна, і ўгору праз Русаландыю так далёка яны ехалі, што прыехалі ў Грыкландыю (Грэцыю). Тут прасіліся ў грэцкага консула дазволу пасяліцца. Першая стычка славян з нарманамі была няўдачнай для першых. Крывічы, ноўгарадскія славяне і фінскія пляменні былі прымушаны заплаціць дань заморскім выхадцам, накшталт таго, як паляне, северане і вяцічы плацілі дань хазарам. Толькі дрыгавічы былі пакуль што свабодны ад чужацкае няволі. Націск чужаземнай

---

[1] «Сага пра гутаў».

сілы прымусіў славянскія пляменні аб'яднацца дзеля адпору. Утвораны саюз, у які ўвайшлі фінскія і славянскія пляменні — крывічы, ноўгарадскія і пскоўскія славяне, вызваліў славян ад выплаты дані. Варагі былі прагнаны за мора. Пляменні пачалі «самі в себе володеті». Ваенны саюз распаўся, і пачаліся міжплямённыя няладзіцы: «Вста род на род, і быша усобіцы в ніх і воеваті самі на ся почаша». Спаткаўшы адпор з боку саюза паўночна-заходніх славянскіх плямёнаў, нарманы мелі большую ўдачу ў краіне палян, якія дзякуючы набегам вандроўнікаў адчувалі вялікія перашкоды ў сваім усходнім і паўднёвым гандлі і адчувалі патрэбу ў добра арганізаванай вайсковай сіле дзеля аховы гандлёвых шляхоў.

**Варажскія князі.** Унутраныя няладзіцы аслаблялі славян. Пры новым націску ворагаў атрымалі перамогу апошнія, і ў Ноўгарадзе, Ізбарску і Белавозеры з'явіліся варажскія князі Рурык, Сінявус і Трувар. Адначасна ў Кіеве аселі Аскольд і Дзір, якія звольнілі кіяўлян ад выплаты дані хазарам. Так утварыліся ў IX ст. два варажскія княствы: Ноўгарадскае і Кіеўскае. Паміж прадстаўнікамі гэтых княстваў не было ладу. Паўднёвыя варагі імкнуліся захапіць Полацк, а разам з гэтым захапіць важны гандлёвы шлях пад свой кантроль. Гэта, аднак, ім не ўдалося. Палачане ўсё-ткі мусілі перанесці на сабе ўвесь цяжар чужаземнага найсця. Барацьба за гандлёвыя шляхі прывяла да стычкі поўначы з поўднем. Прадстаўнік поўначы — Алег пакіраваўся водным шляхам на поўдзень. Паход быў удачны. Смаленск і Любеч прызналі ўладу Алега. Захапіўшы абманным спосабам Кіеў і забіўшы Аскольда і Дзіра, Алег пачаў кіраваць Кіевам. Полацкія крывічы і дрыгавічы ўвайшлі ў склад дзяржавы Алега. Крывічы прымалі ўдзел у паходах на «грэкі» Алега (907) і Ігара (944). Палітычнае становішча Полацка заставалася нязменным пры князях Ігару, Вользе і Святаславу, якія стараліся падчыніць усіх славян суверэнітэту кіеўскага князя. Паўстаўшыя пры Ігару драўляне былі зноў падбіты і абложаны данню вялікшай у параўнанні з тою, якую налажыў на іх Алег. Гэта выклікала новае паўстанне. У часе паходу Ігара па дань паўстаўшыя драўляне забілі Ігара; гэта выклікала крывавую помсту, якую ўчыніла жонка Ігара Вольга над драўлянамі за смерць мужа. Пры князю Святаславу ў склад Кіеўскае дзяржавы ўвайшлі вяцічы. Паўстанне пры Уладзіміру закончылася няўдачай. Павярхоўны працэс аб'яднання не датычыў унутранага жыцця славянства. Пляменныя князі засталіся на сваіх пасадах. Алег у 912 г. зрабіў дамову з грэкамі ад свайго імя і ад «всех, іже суть под рукою его светлых бояр».

**Выдзяленне Полацка.** Палітычнае становішча Полацка змянілася пры Уладзіміру Святаславічу (X ст.). У Полацку з'яўляецца князь Рагвалод, які прыйшоў з Замор'я. Умацаванню палітычнай самастойнасці Полацка спрыяла тое, што ўлада кіеўскага князя была аслаблена дзякуючы дамовым сваркам паміж сынамі Святаслава Уладзімірам, Яраполкам і Алегам. Спачатку пачалася няладзіца паміж Алегам і Яраполкам. Перамог Яраполк. Алег быў забіты. Уладзімір, які княжыў у Ноўгарадзе, уцёк за мора. Атрымаўшы дапамогу ад варагаў, Уладзімір прагнаў з Ноўгарада пасаднікаў Яраполка, і грамадзянская вайна распачалася. У гэтай барацьбе абодва бакі хацелі ўвайсці ў саюз з Рагвалодам праз шлюб з яго дачкой — красуняй Рагнедай. Сам Рагвалод схіляўся

на бок Яраполка. Але перамог Уладзімір, пасля чаго паспяшыў заняць Полацк. Рагвалод быў забіты. Уладзімір ажаніўся з Рагнедаю. Затым Уладзімір пасадзіў Яраполка ў Кіеве. Сам Яраполк быў забіты здрадзіўшым яго Блудам. Палітычная самастойнасць Полацка была немагчымай пры эканамічнай сувязі з Кіевам. У Полацку былі пасаджаны «мужы» Уладзіміра. З часам, яшчэ пры жыцці, Уладзімір аддаў Полацкую зямлю Ізяславу — сыну Рагнеды. Полацкае княства стала зноў самастойным. Ізяслаў заставаўся полацкім князем да самай смерці.

**Тураў і Смаленск.** Дрыгавічы знаходзіліся з самага пачатку ў сферы ўплыву кіеўскага князя. Аднак і тут меў месца працэс утварэння ў паасобныя княствы. Дрыгавічы, падобліва, выдзеліліся ў часе грамадзянскай вайны пасля смерці Святаслава. Пры Уладзіміру І Тураўская зямля зноў была далучана да Кіева. Уладзімір пасадзіў свайго старшага сына Святаполка, але гэтая акалічнасць сведчыла аб палітычнай сувязі дрыгавічоў з Кіевам, якія мелі да яго эканамічны нахіл. Смаленская зямля застаецца ў беспасярэднай залежнасці ад кіеўскіх князёў, якія кіравалі ёю праз свайго намесніка. Пасля таго як Уладзімір ахрысціўся, ён пасадзіў у Смаленску свайго сына Станіслава, але дзякуючы эканамічнай залежнасці ад Кіева смаленскі князь не меў ніякага палітычнага значэння, а быў проста тытулаваным пасаднікам кіеўскага вялікага князя.

**Новая грамадзянская вайна.** Па смерці Уладзіміра Святаславіча (1015) выбухнула новая грамадзянская вайна. У ёй прымалі ўдзел сыны Уладзіміра. Тураўскі князь Святаполк паспяшыў умацавацца ў Кіеве зараз жа па смерці бацькі. Супроць Святаполка выступіў яго брат Яраслаў, што сядзеў у Ноўгарадзе і пасварыўся з сваім бацькам за дань, якую трэба было ноўгарадцам плаціць Кіеву. Барацьба поўначы і поўдня вымагала напружання абедзвюх ваюючых старон. Святаполк апіраўся на ўласную партыю ў Кіеве, набіраючы войска з дрыгавічоў і драўлян. Яраслаў знайшоў падтрыманне з боку варагаў і ноўгарадцаў. Грамадзянская вайна закончылася на яго карысць. Перамога дынастычнага аднадзяржаўя прывяла да стычкі Яраслава з Мсціславам Тмутараканскім і Брачыславам Ізяславічам Полацкім.

**Згода з Брачыславам і Мсціславам.** Палітычнае ўмацаванне Яраслава не магло не адгукнуцца на становішчы Полацка. Жадаючы папярэдзіць заняцце Полацка Яраславам, Брачыслаў напаў на Ноўгарад. Шмат палонных і вялікая здабыча дасталася ў рукі Брачыслава, які паспяшыў вярнуцца дамоў. Па дарозе, аднак, Брачыславу прыйшлося сустрэцца з Яраславам на рэчцы Судоміры[1]. У гэтай стычцы Брачыслаў быў разбіты. Адбітыя палонныя і нагрhistorical рабленая маёмасць былі звернуты ў Ноўгарад. Брачыслаў уцёк у Полацк. Разбіўшы гэтак Брачыслава, Яраслаў пачаў шукаць з ім згоды. Палітычнае становішча Полацкае зямлі засталося без змены, але тэрытарыяльна яна павялічылася далучэннем Віцебска і Усвята. Дзякуючы гэтаму верхняе Падзвінне і волакі паміж Дняпром і Дзвіной знаходзіліся пад кантролем Брачыслава (1021). Мсціслаў распачаў барацьбу з Яраславам у саюзе з хазарамі і касогамі. Спа-

[1] Бітва на рацэ Судоме (Судаміры) — 1021 г.

чатку захапіць Кіеў не ўдалося. Мсціслаў мусіў здаволіцца Чарнігавам. Яраслаў, які знаходзіўся ў Ноўгарадзе, выступіў супроць брата ў саюзе з варагамі. Стычка братоў пры Ліствене (1026) закончылася перамогай на баку Мсціслава. Яраслаў быў прымушаны зрабіць згоду з братам. Кіеў застаўся за Яраславам, а землі на ўсход ад Дняпра былі аддадзены Мсціславу. Такая палітыка Яраслава, сведчачы аб яго ваеннай слабасці, узмацняла абодвух супраціўнікаў кіеўскага князя. Мсціслаў хутка захварэў і памёр (1032). Уся паўднёвая Русь ізноў была аб'яднана пад уладай аднае асобы. Становішча Полацкай зямлі засталося без змены. Брачыслаў памёр у 1044 г.

**Беларуская зямля ў складзе Кіеўскай дзяржавы.** Утварэнне варажскіх княстваў у Тураве і Полацку не мела вялікага ўплыву на ўнутраную пабудову славянскіх пляменняў. Увойсце беларускіх зямель у склад Кіеўскай дзяржавы прымусіла іх прыняць удзел у той замежнай і гандлёвай палітыцы, якую праводзілі кіеўскія князі. Гандлёвыя шляхі і гандлёвыя сувязі звязвалі самым цесным чынам беларускія княствы з эканамічным і палітычным асяродкам поўдня — Кіевам. Эканамічная залежнасць ад Кіева вызначыла палітычнае становішча паасобных земляў. Імкненне да самастойнасці з боку апошніх, напрыклад Полацка, прымушала князёў вызваляцца ад эканамічнай залежнасці ад Кіева і захапляць пад свой кантроль галоўныя гандлёвыя шляхі. З другога боку, князі не маглі дапусціць значнага палітычнага ўмацавання кіеўскага князя. Гэта прымушала полацкіх князёў пільна сачыць за тым, што робіцца ў Кіеве, і адпаведным чынам на гэта рэагаваць.

## B) Гандлёвыя сувязі Беларусі

**Замежная палітыка. Візантыя.** Варажскія конунгі ў Кіеве — Аскольд і Дзір пакіраваліся на поўдзень да Канстанцінопаля. З гэтага моманту паходы кіеўскіх князёў на Візантыю сталі звычайнай з'явай у палітыцы кіеўскіх князёў, бо непаразуменні гандлёвага характару паміж Візантыяй і Кіевам можна было развязваць толькі зброяй. Аснавальнік Кіеўскае дынастычнае дзяржавы — Алег адправіўся ў паход на Грэцыю з мноствам «вараг, славені, чуді і крывічы і мерю і поляне і северу і древляне і родімічы і хорваты і дулебы і тыверцы». Паход закончыўся ўдачна. Алег запатрабаваў «даті воем на две тысячі кораблей по двенадцать грівн на ключ і потом даяті уклады на рускіе города: первое на Кіев, также на Чернігов і на Переяславль і на Полтеск і на Ростов і на Любечі і прочая города, по тем бо городам седаху князья под Ольгом суще». У 912 г. Алег паслаў паслоў у Візантыю, каб наладзіць згоду паміж «хрістіаны і Русью», дзеля якой мэты было паслана спецыяльнае пасольства ад «Олега Велікого князя Руского і от всех, іже суть под рукою его светлых бояр». Мірныя адносіны з Візантыяй былі нарушаны пры Ігару (941). Паход закончыўся поўнай няўдачай. У 944 г. Ігар, сабраўшы вялікае войска ў складзе варагаў і Русі, «пойде на Греков в лодьях і на конех, хотя мстіті за себя». Паход закончыўся ўдачна. Ігар, «взем у Греков злато і паволокі на вся воя», вярнуўся дамоў. У 945 г. была зроблена новая дамова з грэкамі. Ігаравы паслы

былі прадстаўнікамі «от Ігоря Велікого князя Руского і от всея княжья і от всех людей Руское землі». У 967 г. вялікі князь Святаслаў па прапазіцыі Нікіфара Фокі распачаў барацьбу з балгарамі і перамог іх. Застаўшыся ў горадзе Пераяслаўлі, атрымліваў дань ад грэкаў. Дварцовы пераварот 10 снежня 970 г. аддаў уладу Івану Цымісхію. Апошні, каб вызваліць Візантыю з-пад уплыву славян, распачаў з Святаславам барацьбу, якая закончылася для кіеўскага князя няўдала. Святаслаў быў прымушаны зрабіць мірны дагавор з І. Цымісхіем у 971 г. Апошні паход у Х ст. быў наладжан Уладзімірам Святаславічам.

**Прычыны паходаў.** Паўтаральнасць паходаў на Візантыю была выклікана канечнасцю наладзіць гандлёвыя справы Кіева, якія спатыкалі шмат перашкод з боку Візантыі. Гэта акалічнасць папхнула Святаслава на барацьбу з балгарамі з той мэтай, каб заўладаць шляхам на Канстанцінопаль. Вынік гэтага паходу быў няўдачны. Грэкі выявілі сябе даволі сільнымі, каб адкінуць ад Канстанцінопаля адарванага ад Кіева Святаслава. Каб прымусіць грэкаў не перашкаджаць гандлёвым адносінам, Уладзімір уступіў у саюз з балгарамі для барацьбы з грэкамі. Злучанымі намаганнямі балгар і рускіх славян грэкі былі разбіты, а ў 989 г. Уладзімір адабраў ад Візантыі Корсунь — важны гандлёвы пункт на паўднёвым узбярэжжы Крымскага паўвострава. У ХІ ст. ваенных сутычак паміж Візантыяй і Кіеўскай дзяржавай не было. У 1043 г. рускія атрымалі права свабодна гандляваць з Грэцыяй.

**Паходы на ўсход.** Палітыка князёў у адносінах да камскіх балгар і Хазарыі гэтаксама вызначалася гандлёвымі інтарэсамі. Ужо Алег у 913 г. зрабіў свой знамяніты паход да Каспійскага мора і даволі паграбіў хазараў. Ігар, Святаслаў, Уладзімір не раз хадзілі паходам на камскіх балгар. У 1006 г. Уладзімір зрабіў з камскімі балгарамі дамову, паводле якой рускія купцы атрымалі права свабоднага праезду ў балгарскія гарады з пячацямі сваіх пасаднікаў. Балгарскія купцы атрымоўвалі права прыязджаць на Русь для гандлю толькі па гарадах. У 965 г. Святаслаў знішчыў Хазарскае царства і сталіцу Ітыль. Распачаўся яго заняпад, а разам з гэтым і заняпад усходняга гандлю.

**Унутраная палітыка.** Уваходзячы ў склад Кіеўскай дзяржавы, славянскія пляменні мусілі плаціць дань. Гэтак, драўляне плацілі Алегу «по черне куне», севяране сталі плаціць меншую дань, чымся хазарам. Радзімічы плацілі тую самую дань, што і хазарам. Пры Ігару драўляне паўсталі, але пасля гэтага на іх была наложана большая дань, чымся тая, якую яны плацілі Алегу. Пры Вользе «деревская земля» папала ў поўную залежнасць ад Кіева. Вольга ўстанаўляла свае «уставы і урокі». Святаслаў падбіў вяцічаў і налажыў на іх дань. Іх паўстанне пры Уладзіміру закончылася няўдачай. Княжая дань збіралася дваякім чынам: або насяленне само прывозіла належную дань, што называлася «повозом», або самі князі ездзілі па дань па гарадах. Гэткі спосаб збору дані называўся «полюдьем». Паездка Ігара за зборам дані ў драўлянскую зямлю закончылася для князя смерцю. Паяўленне вандроўнікаў у стэпах і напады іх на гандлёвыя шляхі прымушалі князёў прымаць меры да аховы гандлёвых шляхоў. Гэтак, печанегі, якія паявіліся ў 915 г., заняўшы ўсе стэпы ад Дона да Карпат, нападалі на

гандлёвыя караваны і затрымлівалі тавараабмен з Візантыяй. Ігар і Святаслаў не раз ваявалі з печанегамі. Калі Святаслаў, наладзіўшы мір з І. Цымісхіем, вяртаўся дамоў, на яго напалі печанегі на Дняпроўскіх парогах і забілі (972). Уладзімір «безперестані» ваюе з печанегамі. Ён будуе крэпасці па Дзясне, Остры, Трубежы, Суле і Стужы з мэтай абароны Кіеўскай дзяржавы ад печанегаў.

**Гандаль з Візантыяй.** Гандлёвыя зносіны Прыдняпроўя з Візантыяй — вельмі даўняга пахаджэння. Сярэднедняпроўскія славяне з даўных-давён гандлявалі з грэцкімі гарадамі на паўночным беразе Чорнага мора: Белгарадам — на Днястры; Корсунем, Танаісам — ля вусця Дона; Алешшам — на Дняпры; Таматархай — на Таманскім паўвостраве. Насяленне Прыдняпроўя з даўных-давён адчувала патрэбу ў солі, што здабывалася ў ліманах Чорнага мора. Пасля ўтварэння Усходняй Рымскай Імперыі славяне сярэдняга Дняпра наладжваюць беспасярэднія гандлёвыя зносіны з Візантыяй, якая дзякуючы свайму геаграфічнаму становішчу дасягнула значнага росквіту і багацця. Суседства з усходнім светам і развіццё гандлёвых сувязей з Усходам былі галоўнымі крыніцамі багацця Візантыі, якая ў VIII ст. была ядыным пасрэднікам усходнеазіяцкага гандлю з заходнімі народамі. У Візантыю прывозіліся індыйскія і кітайскія тавары праз Хазарыю, Дон, паўночнае ўзбярэжжа Чорнага мора і сярэднеазіяцкую гандлёвую дарогу. Праз Візантыю еўрапейскія вырабы накіроўваліся на ўсход на славяна-рускую поўнач. Візантыя была знаным спажывецкім рынкам, на якім быў асаблівы попыт на прадметы роскашы і markup рознага гатунку сырэц. Вырабы з слановай косці, золата, шкла, візантыйская мазаіка, кераміка, дасканалыя шаўковыя матэрыі знаходзілі збыт на захадзе і на поўначы. Індыйскія і кітайскія тавары, прыправы, каштоўныя каменні, жомчуг, каралі і шоўк у вялікай колькасці прывозіліся ў Візантыю па старых шляхах. Адзін з іх — ад Персідскае затокі праз Месапатамію, Егіпет і Сірыю — быў захоплены арабамі з канца VII ст. Другі шлях ішоў з Азіі праз Алтай, Туркестан, Хіву, Хазарыю і Басфор Камерыйскі, а адтуль морам у Візантыю. Сістэма візантыйскае гандлёвае і прамысловае палітыкі з часоў Юстыніяна (527—565) была пабудована на прынцыпе манаполіі і дробнай рэгламентацыі. Нягледзячы на існаванне апошняй, прамысловасць дасягнула значных вынікаў. Манаполія на збожжа, віно, масла, соль і іншыя прадметы першай неабходнасці вельмі цяжка адгукнулася на насяленні дзякуючы надужыццям з боку адміністрацыі. Вялікая колькасць налогаў, законных і незаконных збораў утварала шмат непрыемнасцей і перашкод для тавараабмену. Асабліва цяжка гэта адгукалася на чужаземцах, якім прыходзілася і на сушы і на моры плаціць мытныя налогі і падлягаць агляду з боку пільных мытныхураднікаў. Спачатку гандаль ва ўсіх кірунках знаходзіўся ў руках грэкаў. У IX ст. становішча змянілася. Гандаль трапіў у рукі к чужаземцам, галоўным чынам арабам і італьянцам. Паўночны гандаль знаходзіўся ў руках славяна-рускіх. Арабскі пісьменнік Масуды называе Чорнае мора Рускім. На тэрыторыі сярэдняга і ніжняга Дняпра знаходзяць у магілах шмат прадметаў візантыйскага мастацтва з золата, серабра, медзі і жалеза, з каштоўнымі каменнямі, якія адносяцца да IV—V стст. У паганскіх магілах VIII—IX стст. былі

знойдзены златаліты і залатыя шоўкавыя тканіны. Візантыйскія і арабскія пісьменнікі падаюць нямала вестак аб візантыйска-славянскім гандлі.

**Гандлёвыя дагаворы.** Гандлёвыя сувязі Прыдняпроўя з Візантыяй з працягам часу сталі гэтак значны, што паявілася канечнасць іх упарадкаваць паасобнымі дыпламатычнымі актамі. Можна лічыць, што гандлёвыя дагаворы былі ўпершыню заключаны ў палове IX ст., хаця тэксты дагавораў не захаваліся. Першымі гістарычнымі дакументамі, якія датычаць гандлю, з'яўляюцца дагаворы Алега і Ігара з грэкамі. Алег завязаў спачатку дагавор у 907 г. з царамі Левам і Аляксандрам. Дагавор быў пацверджаны ў 911 і 912 гг. Паводле першага дагавора прыязджаўшыя купцы павінны былі затрымлівацца ў прадмесці манастыра св. Маммы і мелі права ўваходзіць у горад партыямі па 50 асоб, але без зброі і пад кантролем царскага чыноўніка. Яны мелі права купляць тавары, «неплотяче мыта ні в чем же». У часе побыту ў Канстанцінопалі купцы атрымліваюць у працягу паўгода «месячное». Гандлёвы дагавор з 911 г. дапоўніў папярэдні трактат шэрагам артыкулаў, якія датычаць розных пытанняў грамадзянскага і крымінальнага права. Дагавор Ігара з Візантыяй, з царамі Раманам, Канстанцінам і Стэфанам (945) быў менш выгодным, чымся папярэднія трактаты. Дагавор пацвярджае права «вялікага князя і яго баяр пасылаць у Грэкі караблі з пасламі і гасцямі» «яко же ім установлено есть». Госці павінны мець адпаведныя вялікакняскія граматы. Прыехаўшыя без граматы могуць быць арыштаваны. Гасцям забараняецца зімаванне каля святога Маммы. Бязмытная купля тавараў адмяняецца. Купцы не маюць права купляць павалокі болей, чымся на 50 залатнікоў. У зваротную дарогу ад'язджаючыя атрымліваюць адпаведнае «брашно». Але рускі князь павінен быў адмовіцца ад правоў на Корсунь. Дагавор вялікага князя Святаслава з імператарам Іванам Цымісхіем быў завязаны пры такіх палітычных акалічнасцях, якія не спрыялі славянам (971). Дагавор пацвярджаў усе ранейшыя дагаворы, але Святаслаў павінен быў адмовіцца ад усякіх ваяўнічых намераў супроць Грэцыі, а гэтаксама ад пасягнення на Корсунь з наўкольнымі гарадамі і на Балгарыю. Паміж Святаславам і Візантыяй быў наладжаны аднабокі абаронны саюз. Святаслаў у выпадку нападу на Візантыю якога-колечы ворага быў абавязаны дапамагаць імперыі. Дагавор ставіў замежны гандаль у поўную залежнасць ад грэкаў. Спроба Святаслава захапіць сухаземную дарогу дзеля гандлю з Канстанцінопалем не ўдалася. Неспрыяльныя ўмовы гандлёвага дагавора павінны былі зрабіць уплыў на адносіны да Візантыі наследнікаў Святаслава. Пытанне аб вызваленні замежнага гандлю ад дыктатуры грэкаў стала чарговым заданнем замежнай палітыкі.

**Прадметы ўвозу і вывазу.** Прамысловая Візантыя дастарчала славянам прадметы сваёй індустрыі і ўсходняе прадукцыі. З Візантыі вывозілі золата, павалокі, агародніну, віны і «всяко узорочье». Вялікая княгіня Вольга, вярнуўшыся дамоў з паездкі ў Канстанцінопаль, прывязла з сабой «дары многы золото і серебро, поволокы с сосуды различныя» (963). Паводле другіх вестак, Візантыя дастарчала славянам каштоўнае начынне, багатыя вопраткі, дываны, сукны, саф'ян, перац, а пасля прышчаплення тут хрысціянства — прадметы рэлігійнага

культу: грэцкія кубкі, мармур, фарбы, мазаіку. Кіеўскія князі і купцы гандлявалі рабамі і прадметамі прамысловае гаспадаркі. Вольга абяцала візантыйскаму імператару прыслаць у падарунак «многы дары, челядь і воск і скору». Паводле слоў Святаслава, з Русі вывозіліся на Дунай «скора, воск, мед і челядь».

**Удзел беларускіх зямель у гандлі.** Беларускія землі прымалі ўдзел у паходах на Візантыю і ў гандлі з апошняй. Калі ў часе свайго паходу на Канстанцінопаль у 907 г. Алег патрэбаваў ад грэкаў дані «по 12 грывен на ключ» і «уклады» на гарады, то Полацк паміж пералічаных гарадоў займае трэцяе месца. Смаленск прымаў удзел у візантыйскім гандлі з IX ст. На тэрыторыі Смаленскай краіны візантыйскія манеты пападаюцца не раней IX ст. Паасобныя прадметы, што знаходзяцца ў курганах крывічоў, як то: залаты пазумент, прывескі бітай работы, шкляныя пацеркі з пазалотай, талеркі з вобразам грыфона — сведчаць аб грэцкім гандлі. Імператар Канстанцін Багранародны ў сваім творы «Аб кіраванні імперыяй» паведамляе, што людзі з таварамі прыходзяць у Канстанцінопаль з Ноўгарада, Смаленска, Чарнігава, Любеча і Вышгарада. На тэрыторыі верхняга Прыдняпроўя былі знойдзены візантыйскага пахаджэння якары, канаты і жаглі. Ажыўленыя гандлёвыя зносіны Смаленска з Візантыяй вызначаюцца перш-наперш яго геаграфічным палажэннем на вялікім гандлёвым шляху.

**Іншыя паўднёвыя гандлёвыя шляхі ад Кіева.** Кіеў знаходзіўся ў асяродку гандлёвага шляху. З Кіева цягнуўся вялікі гандлёвы шлях да Дона і Азоўскага мора, дзе пры вусці ракі Кубані ўтварылася Тмутараканскае княства на месцы ранейшай грэцкай калоніі. З Кіева ішла дарога і ў Крым, дзе знаходзіліся вялікія гарады — Херсанес (Корэ-сунь) і Судак (Сураж), адкуль купцы вывозілі соль, баваўняныя і шаўковыя тканіны, агародніну, віны, травы, прыпраўныя карэнні ў абмен на футры. Гэты шлях называўся саляным. Апрача гэтага з Кіева вёўся гандаль у Алешшы (Ольвіі). Значэнне Кіева як асяродка паўднёваславянскага гандлю вызначала яго палітычна пераважнае значэнне.

**Заходні гандаль.** Гандлёвыя дарогі звязалі Кіеў з Заходняй Еўропай. З Кіева гандлёвыя шляхі ішлі і на Валынь і ў Галіччыну, адкуль адны гандлёвыя дарогі вялі ў Візантыю праз прыдняпроўскія або прыдунайскія гарады, значэнне якіх было справядліва ацэнена вялікім князем Святаславам: «Не любо ме есть в Кіеве быті, — перадае летапіс думку Святаслава, — хоцу жіті в Переяславце на Дунае, яко то есть середа в земле моей, яко ту вся благая сходятся: от Грек — злата, паволока, віна, овошчеве разлічная, із Чех і Угор — серебро і камені, із Русі — скора, воск, мед і челядь». Іншыя гандлёвыя дарогі вялі ў Польшчу і ў Чэхію, куды рускія славяне вывозілі рабоў і коней, якія разам з валамі і авечкамі набываліся ў печанегаў. Заходнія гандлёвыя шляхі з Кіева праходзілі праз тэрыторыю дрыгавічоў. Яны ставілі апошніх у эканамічную і палітычную залежнасць ад Кіева. У сваю чаргу, гандлёвыя сувязі спрыялі матэрыяльнай і духоўнай культуры тэрыторыі Тураўскай краіны. Аб раннім развіцці заходняга гандлю сведчыць вельмі пашыраная назова старажытнай манеты «шэляг», якая ёсць не што іншае, як адменнік англасаксонскага шылінга. Росквіт заходняга гандлю Кіева адносіцца да пазнейшае пары. З беларускіх гарадоў падтрымлі-

ваў гандлёвыя сувязі з Захадам Полацк. Няўродлівая глеба і выгоднае геаграфічнае палажэнне на вялікім гандлёвым шляху спрыялі развіццю заходняга гандлю Полацка. Гандаль пачаўся, падобліва, яшчэ ў VIII ст. і вёўся ў двух кірунках: са скандынавамі і з Готландам. Скандынавы гандлявалі з палачанамі або беспасярэдна, або праз фінскія і латышскія пляменні, што жылі на рацэ Дзвіне і ўсходнім узбярэжжы Балтыйскага мора. Скандынавы дастарчалі прадметы з бронзы і серабра, асабліва гэтак званыя фібулы, мячы і стрэлы. З Полацка гэтыя прадметы накіроўваліся на ўсход. Цэнтрам гандлю на востраве Готланд быў горад Візбі, заложаны ў VIII ст. Вялікая колькасць скарбаў з нямецкімі і англасаксонскімі манетамі сведчыць аб гандлёвых зносінах Полацка з востравам Готланд, які быў пасярэднікам у гандлі паміж Усходам і Захадам. Колькасць арабскіх манет IX, X стст. і заходнееўрапейскіх манет з'яўляецца відавочным пацвярджальным фактам. І гандлёвыя сувязі Смаленска з Захадам вельмі даўняга пахаджэння. У смаленскіх крывіцкіх і радзіміцкіх курганах спатыкаюцца бурштыновыя пацеркі і нашыйнікі, мячы скандынаўскага пахаджэння, манетныя скарбы ў складзе манет: англасаксонскіх, ангельскіх, дацкіх і нямецкіх. Самыя старажытныя манеты адносяцца да IX, а пазнейшыя — да X ст. Падобліва, беспасярэдныя гандлёвыя сувязі да пачатку XII ст. былі нязначны, бо гандлёвыя інтарэсы Смаленска былі згуртаваны на паўднёвых і ўсходніх рынках.

**Усходні гандаль.** Гандлёвыя сувязі Прыдняпроўя і Падзвіння з Усходам — старажытнага пахаджэння. Яшчэ ў 1707 г. у Кіеве быў знойдзены скарб з 2380 куфіцкімі манетамі. У пазнейшым часе, асабліва ў XIX ст., археолагі ў далейшым цягу знаходзілі манеты ўсходняга пахаджэння, галоўным чынам арабскія. На тэрыторыі Полацкае зямлі гандаль з арабамі праз балгар наладзіўся ўжо ў VIII ст. Арабскія манеты, знойдзеныя на тэрыторыі Меншчыны і Віцебшчыны, адносяцца да VIII ст. У Смаленскай зямлі і Смаленску арабскія манеты адносяцца да VIII—X стст. Усе арабскія манеты былі знойдзены на берагах рэк Заходняй Дзвіны і Дняпра. Некаторыя манеты былі біты ў Афрыцы і Гішпаніі. Усе гэтыя манеты сваёй старажытнасцю не пазней 1012 г. Вялікая колькасць арабскіх манет у Смаленшчыне сведчыць аб тым, якое вялізнае значэнне меў для смаленскіх крывічоў арабскі гандаль. Перад ім на другі план адступаў гандаль з Захадам. Значная колькасць усходніх слоў у стараславянскай мове гэтаксама сведчыць аб значных гандлёвых сувязях з Усходам. Гандлёвыя сувязі з Усходам падтрымліваліся ў двух кірунках: па сярэдняй і ніжняй Волзе з балгарамі і хазарамі і праз Каспійскае мора — з Далёкім Усходам. Для прыдзвінскіх і прыдняпроўскіх славян гандаль з Паваложжам меў пераважнае значэнне. Гандаль з Далёкім Усходам з прычыны геаграфічных умоў не мог атрымаць шырокага развіцця. Гандлёвы шлях на Волгу ў Балгарыю і Хазарыю ішоў у двух кірунках: з Смаленска патраплялі на Аку або Волгу праз правую прытоку Волгі — Вазузу. Ноўгарадцы падтрымлівалі гандлёвыя сувязі з Усходам звычайна гэтай дарогай. Другі шлях, праходзіўшы праз зямлю радзімічаў, ішоў праз Дзясну і Сож у Паваложжа. Гандаль Прыдняпроўя і Прыдзвіння з хазарамі і балгарамі пачаўся адначасна, але гандлёвыя сувязі з балгарамі трывалі даўжэй,

чымся з хазарамі. У канцы X ст. пачынаецца заняпад хазарскага гандлю. Гандаль жа з балгарамі ў далейшым цягу развіваецца аж да татарскага найсця і гэтым самым спрыяе значнаму развіццю беларускага заходняга гандлю. Сталіца Хазарыі мела вялізнае гандлёвае значэнне ва ўсходнім сярэдневякоўі. Хазары падтрымлівалі гандлёвыя сувязі з Візантыяй і Крымам, а гэтаксама з персамі, арабамі і Туркестанам. Энергічныя балгары спушчаліся на купецкіх караванах да Ітыля і назад. У сталіцу балгарскага царства ішлі гандлёвыя караваны з Туркестана, Персіі і Арабіі. Балгары скуплялі ўсе тавары ад усходніх купцоў і не прапушчалі іх далей на Захад. Хазарскі і балгарскі гандаль з'явіліся пасярэднікамі паміж Усходам з аднаго боку і славяна-фінскімі пляменнямі з другога: славяна-балгарскія і хазарскія гандлёвыя зносіны вельмі ранняга пахаджэння, быць можа з паловы VIII ст. У першай палове IX ст., паводле вестак араба Хордадбэ, славянскія купцы часта наведваліся ў Хазарыю, што пацвярджаецца нумізматычнымі скарбамі VIII і IX стст. Знахаджэнне ў Прыбалтыцы і на тэрыторыі паўночна-ўсходняй Русі манет волжскіх балгар VIII—X стст. сведчыць аб старажытнасці славянскіх гандлёвых сувязей з сярэднім Паваложжам. Аб гандлі славян з Далёкім Усходам паведамляе арабскі пісьменнік Ібн Хордадбэ, які адзначае, што гандаль вёўся не толькі на ўзбярэжжы Каспійскага мора, але што славянскія купцы гэтаксама беспасярэдна ездзілі ў Багдад. Па гэтай дарозе славянскія купцы ў пазнейшую пару (XIV ст.) праніклі ў Індыю. Гандаль з Усходам меў караванны характар. Купецтва дзеля гандлю складала асаблівыя гандлёвыя грамады з супольным капіталам. Купцы выязджалі ў дарогу ўзброенымі і ў дарозе займаліся паляўніцтвам, рыбацтвам і грабежніцтвам фінскіх паселішчаў.

**Прадметы вывазу і ўвозу.** Праз хазараў і балгар прывозіліся да славян індыйскія і кітайскія баваўняныя і шаўковыя тканіны, дываны, перац, прыправы, каштоўныя каменні, залатыя і срэбныя рэчы, асабліва паясы і конскія ўбёры, дамаскія шаблі, нажы і інш. Смальняне і ноўгарадцы прадавалі арабскім, хазарскім і балгарскім купцам розныя футры: саболлі, вавёрчыны, кунічныя, гарнастаевыя, ліссі, бабровыя, заячыя, коззі скуры, баброваю струю, юхт, авец, рагатую жывёлу, бурштын, арэхі, бярозавы лес, мёд, воск і славянскіх нявольніц. У галодныя гады балгары дастарчалі смальнянам збожжа. Беларускія купцы асабліва цанілі перлы зялёныя, якія былі нацыянальнымі беларускімі ўбёрамі смаленскіх жанчын. У курганах Віцебшчыны і Смаленшчыны, а гэтаксама ў Даніі і Швецыі былі знойдзены ў вялікай колькасці: граненыя карніёлі акруглай формы, шкляныя пацеркі, нашыйныя бранзалеты, пярсцёнкі, запясці, нашыйнікі — усё вырабы ўсходняе арабскае культуры. Гэтаксама ў літоўскіх курганах было знойдзена шмат прадметаў усходняе работы, якія папалі туды праз гандаль са смальнянамі і сведчаць аб каланізацыі беларусамі-смальнянамі тэрыторыі, заселенай літоўскімі пляменнямі. Гэта каланізацыя мела зусім спакойны характар і не спатыкала з боку ліцвінаў ніякага актыўнага адпору.

**Значэнне ўсходняга гандлю.** Смальняне, з'яўляючыся пасярэднікамі паміж Усходам і Захадам ва ўсходнім гандлі, выдзяляліся ў складзе Кіеўскае дзяржа-

вы. Вялізнае эканамічнае значэнне Смаленска і яго гандлёвыя сувязі з Ноўгарадам паднімалі палітычную вагу Смаленскае зямлі і гэтым самым падрыхтоўвалі будучы эканамічны і палітычны росквіт Смаленскага княства.

**Печанегі і цюркі.** Хазарскае царства дзякуючы свайму геаграфічнаму палажэнню мела для славян вялізнае стратэгічнае значэнне. Хазары, стрымліваючы націск азіяцкіх народаў, далі магчымасць славянскім плямёнам каланізаваць узбярэжжа Чорнага і Азоўскага мораў, якое мела вялікае гандлёвае значэнне. Славянскія каланісты заснавалі на Таманскім паўвостраве славянскую калонію Тмутаракань, праз якую праходзіў гандлёвы шлях на Судак. Аслабленне Хазарскага царства і далейшы заняпад апошняга адчынілі свабодны доступ азіяцкім народам, у паасобку печанегам, якія ўжо ў IX ст. вандравалі паміж Волгаю і Уралам. Пад націскам хазараў яны падаліся на захад, адапхнулі венграў і занялі стэпы ад вусця Дона да Дняпра. Каланізаваўшы чарнаморскія і прыазоўскія стэпы, яны сагналі мясцовае славянскае насяленне, якое было прымушана падацца на поўнач. Прыблізіўшыся да межаў Кіеўскае дзяржавы, печанегі захапілі паўднёвыя гандлёвыя шляхі і гэтым самым прычынілі вялікі ўшчэрбак паўднёваму гандлю. Адначасна напады печанегаў на пагранічныя мясцовасці набылі пастаянны характар. Уладзімір Святаславіч быў прымушаны будаваць гарады па рэчках Дзясне, Астры, Трубежы, Суле і Стужы. Яраслаў Уладзіміравіч у далейшым цягу праводзіў палітыку свайго бацькі, умацаваўшы рэчку Рось. У пачатку XI ст. цюркі прагналі печанегаў з паўднёвых стэпаў. Барацьба з вандроўнікамі, якая вымагала вялікага напружання матэрыяльных і духоўных сіл, падарвала эканамічную моц і еднасць Кіеўскае дзяржавы і, змяншаючы палітычнае значэнне Кіева, падрыхтавала выдзяленне беларускіх краін са складу Кіеўскай дзяржавы. Набегі печанегаў і цюркаў зусім не закраналі ўсходняга гандлю смальнян і ноўгарадцаў, эканамічнае значэнне якіх усё павялічвалася. З свайго боку смальнянам удалося наладзіць зносіны з печанегамі, адкуль Смаленская краіна атрымлівала коней і рагатую жывёлу. Дзякуючы гэтаму смальняне сталі дастаўцамі рагатае жывёлы і коней для ўсёй Беларусі.

## Г) Грамадства ў эпоху дынастычнае дзяржавы

**Склад грамадства.** У эпоху дынастычнае дзяржавы не было станаў як групы асоб, якая сваімі правамі і прывілеямі адрознівалася б ад іншае групы. Грамадства дзялілася па месцы свайго замяшкання на дзве групы: на гарадское і на сельскае. З другога боку, усё грамадства ў юрыдычных адносінах падзялялася на вольных і нявольных. У свой чарод, у гарадскім грамадстве было дзве катэгорыі асоб. Адна катэгорыя складала княжае грамадства — дружыну. У другую ўвайшлі ўласна гарадскія элементы — гэтак званая земшчына.

**Дружына.** Княжая дружына складала вышэйшы стан у дынастычнай дзяржаве. З нацыянальнага боку склад дружыны быў даволі пярэсты. Асноўным ядром дружыны былі спачатку нарманы, да іх з часам далучыліся розныя аматары прыгодаў і пашукальнікі шчасця, як то: ліцвіны, фіны і славяне. Дамова

Алега з грэкамі, у якой пералічаны дружыннікі, пасланыя Алегам дзеля завязання дамовы, сведчыць аб нацыянальнай разнастайнасці ў асяроддзі дружыннікаў.

Усе гэтыя: Каралі, Фарлов, Інегелд, Верэмут, Рулаф, Туды, Руалд, Карн, Фрэлав, Руар, Актэву, Труон, Лідульфост, Стэнір — прыналежалі да нарман. У дагаворы Ігара спатыкаюцца паміж дружыннікаў славяне і яцвягі. У летапісе гэтаксама спатыкаюцца чыста славянскія іменні дружыннікаў: Вышата, Блуд, Сінько, Свянельд. У князя Барыса Уладзіміравіча ўлюбёнцам-дружыннікам быў «угрын». Князь Глеб Уладзіміравіч быў забіты дружыннікам «торчыном» па пахаджэнні. Дружыннікі — бліжэйшыя спадручныя князя, з якімі ён адбывае свае паходы і бароніць гандлёвыя шляхі. Спаміж дружыннікаў выдзяляліся асобы, якія былі найбольш блізкімі да князя: Свянельд — пры Ігару, Блуд — пры Яраполку, Дабрыня — у князя Уладзіміра. Спаміж дружыннікаў назначаліся пасаднікі ў падлеглыя князям гарады. Гэтак, пры заваяванні Смаленска і Любеча Алег пакінуў у іх сваіх пасаднікаў. Дружына харчавалася і жыла на кошт князя. Дружына дзялілася на дзве групы: старэйшую і малодшую. Першая, з'яўляючыся бліжэйшым дарадчыкам князя, складала яго асноўную ваенную сілу. Другія, вядомыя пад назовай «детскіе», «отрокі», «гріді», адбывалі розную службу пры княжым двары. Гэтак, калі Вольга частавала драўлянскіх старшын, то за сталом прыслужвалі «отрокі»; падарункі, прысланыя грэкамі князю Святаславу, былі схаваны «отрокамі». З малодшай дружыны з часам можна было перайсці ў старэйшую, у баярства.

**Земскія баяры.** Побач з дружыннікамі трэба паставіць земскіх баяр, вядомых у «Начальным летапісе» пад назовай «градскіх старцев», «нарочітых людей». Гэта прадстаўнікі гарадскога грамадства, магчыма, патомкі радавых старэйшын, асобы, якія карысталіся аўтарытэтам у грамадства або дзеля свайго становішча, або з прычыны свайго багацця, дзякуючы якому паасобныя разбагацеўшыя асобы маглі заняць у гарадскім грамадстве выдатнае становішча. Гэтая радавая або купецкая арыстакратыя мела вялікае значэнне, напрыклад драўлянская — у барацьбе з Кіеўскай зямлёй, «нарочітые люді» — у горадзе Белградзе ў часе яго аблогі праз печанегаў у 997 г., калі за парадаю аднаго старца была адложана здача горада печанегам. Уладзімір Святаславіч, абгаварваючы пытанне аб прыняцці хрысціянства, меў нараду з гарадскімі старцамі.

**Пачатак злучэння.** Дружынны і земскі баярскі элемент быў супроцьпастаўлены адзін другому. Адзін блізкі да князя, другі — да насялення. З працягам часу адбываецца працэс збліжэння дружынных элементаў з земскімі, якія пачалі ўваходзіць у склад княжай дружыны. Гэты паварот стаў асабліва прыметны пры Уладзіміру Святаславічу і яго сыну Яраславу.

**Гараджане.** Другую групу гарадскога насялення складалі «госці», купцы, якія прымалі ўдзел у замежным гандлі. У дагаворы Ігара купцы прыгадваюцца як члены пасольства, якія завязалі дагавор з грэкамі. Рэшта гараджан займаліся ральніцтвам, а часткаю — рамёсламі.

**Сельскае насяленне.** Вольныя насельнікі, што жылі ў вёсках, называліся смердамі; яны займаліся ральніцтвам і іншымі промысламі і плацілі дань князям.

**Рабы.** Нявольнае насяленне складалі рабы, аб якіх ужо ўспаміналася ў дагаворах з грэкамі. Палон з'явіўся галоўнай крыніцай рабства. Рабы, уцёкшыя ў Грэцыю, павінны быць выданы, калі іх знойдуць, і пры гэтым не вымагаецца ніякага судовага следства.

## Д) Дзяржаўны ўклад

**Княжая ўлада.** Улада князя мела аднаасабовы характар. Барацьбой за самаўладства тлумачацца ўсе княжыя ўзаемаадносіны ў перыяд IX—XI стст. Алег, Ігар, Вольга і Святаслаў кіравалі самаўладна Кіеўскай дзяржавай. Па смерці Святаслава засталіся тры сыны: Яраполк, Уладзімір і Алег. Грамадзянская вайна закончылася перамогай на баку Уладзіміра, які згуртаваў у сваіх руках кіраўніцтва ўсёй Кіеўскай дзяржавай. Барацьба, якая распачалася па смерці Уладзіміра Святаславіча паміж Святаполкам і Яраславам, закончылася перамогаю на баку апошняга. Новая барацьба з братам Мсціславам Тмутараканскім прымусіла Яраслава раздзяліць уладу з братам, па смерці якога кіраўніцтва ўсёй Кіеўскай краінай зноў было згуртована ў адных руках. Нарманскія князі, прыбыўшы ў славянскія гарады, засталі тут ужо асталяванае гарадское жыццё, з формамі якога яны не маглі не лічыцца.

**Веча.** У гарадах мы бачым народнае веча, якое разглядаецца летапісцам як форма славянскага жыцця, якая існавала «ізначала». Пры пэўнай слабасці княжае ўлады і пры нязначным аб'яднанні ў палітычных адносінах паасобных краін з Кіевам народнае веча павінна было іграць у жыцці краін вялікую ролю, хаця канечнасць абароны гандлёвых шляхоў ад нападу вандроўнікаў у значнай меры спрыяла палітычнаму ўмацаванню ўлады кіеўскага князя, нягледзячы на існаванне князёў і ў іншых землях.

**Кіраўніцтва дзяржавай.** Князь глядзеў на Кіеўскую дзяржаву праз вузкую прызму сваіх дынастычных інтарэсаў. Для кіеўскага князя гарады і землі з'яўляюцца крыніцай даходаў. Насяленне разглядаецца як аб'ект вызыску з боку княжай улады. Князь кіраваў землямі, назначаў у гарады пасаднікаў «своіх мужей» (Смаленск, Любеч, Полацк).

**Княжая дума.** Пры князю знаходзілася рада з дружыннікаў, гэтак званая «дума». Баяры-дружыннікі, што прымалі ўдзел у нарадах князя з баярамі, называліся «баярамі думаюшчымі». Уладзімір Святаславіч меў звычай раіцца са сваёй дружынаю, «думая о строе земленом і о ратех і уставе земском». Часамі ў склад «думы» ўваходзілі і пабочныя асобы: «градскіе старцы» — пры Уладзіміру, пасаднікі іншых гарадоў. Дума прымала ўдзел у вырашэнні розных пытанняў, запрапанаваных князем на разгляд. Гэтак, Уладзімір аддаў пад суд баяр сваю жонку Рагнеду за замах на забойства. Баяры параілі не забіваць Рагнеды, а адаслаць яе разам з сынам Ізяславам у Полацк. Зразумела, пастановы княжай думы мелі выключна дарадчы характар, але князь з імі не мог не лічыцца; гэтак, рада баяр адносна Рагнеды была Уладзімірам выканана.

**Крыніцы даходаў.** Галоўнай крыніцай княскіх даходаў была дань, якая або прывозілася выплатчыкамі дані («павоз»), або сам князь ездзіў па яе па гарадах («походы на полюдье»). Дані былі разнастайныя па велічыні. Гэтак, Ігар

вызначыў такія дані ў Драўлянскай зямлі, што яны выклікалі паўстанне. Гэтак жа паступала Вольга і сын Святаслаў. Па дань князі ездзілі ўзімку на санях. Апрача гэтага на карысць князя ішлі судовыя падаткі, розныя аброкі і даходы ад эксплуатацыі розных прамысловых рубрык.

## Е) Хрысціянізацыя Беларусі

**Пачатак хрысціянізацыі Кіеўскай зямлі.** Гандлёвыя сувязі паміж Візантыяй і Кіевам спрыялі пашырэнню хрысціянства, якое распаўсюджвалася спачатку паміж князёўскіх дружыннікаў. У часы князя Ігара ўжо ў Кіеве быў даволі значны лік хрысціян-варагаў. У дамове Ігара з грэкамі хрысціяне і паганцы разглядаюцца як раўнапраўныя староны. Пры завязанні дамовы з грэкамі частка паслоў прыносіла прысягу паводле хрысціянскага абраду. Пры княгіні Вользе хрысціянізацыя грамадства стала яшчэ больш значнай. Сама Вольга прыняла хрысціянства па сваёй уласнай ахвоце. Летапісныя драбніцы аб хрышчэнні Вольгі не заслугоўваюць увагі, бо ў іх шмат легендарнага. Візантыйскі імператар Канстанцін Багранародны, які пакінуў падрабязнае апісанне прыйма княгіні Вольгі ў Канстанцінопалі, нічога не кажа аб нібыта адбыўшымся хрышчэнні Вольгі ў візантыйскай сталіцы. Прыняцце хрысціянства было яе асабістай справай. Дзяржаўная ўлада фармальна прытрымлівалася паганства. Гандлёвыя зносіны Кіева з Тмутараканню, дзе хрысціянізацыя мела ўжо значныя вынікі, гэтаксама спрыялі пранікненню хрысціянства ў Кіеў.

**Паганская партыя.** Пашырэнне хрысціянства выклікала натуральна рэакцыю супроць яго. Князь Святаслаў, які доўга ваяваў з Візантыяй за гандлёвыя шляхі, адносіўся да хрысціянства больш чымся ўсяроўна. Нездаволенасць візантыйскай палітыкай прычынілася да ўзмацнення паганства і ўтварэння нацыянальнай паганскай партыі, на чале якой стаяў сам князь Святаслаў. Пасля смерці Святаслава паганская партыя ўскладала надзеі на Уладзіміра, у той час як хрысціянская партыя падтрымлівала князя Яраполка. Барацьба паміж братамі Уладзімірам і Яраполкам была не толькі барацьбою асоб, але і дзвюх рэлігійна-палітычных партый. Перамога Уладзіміра азначала адначасна і перамогу паганскай партыі. У Кіеве быў пабудованы балван-Пярун як знадворны адбітак сілы і магутнасці паганства. Аднак паганская партыя памылілася. Уладзіміру прыйшлося не толькі самому прыняць хрысціянства, але і афіцыяльна падтрымліваць і пашыраць апошняе. Грунт для прыняцця хрысціянства быў падрыхтаваны ўсім папярэднім ходам візантыйска-славянскіх адносін.

**Апавяданне аб хрышчэнні Уладзіміра.** Летапіснае апавяданне аб хрышчэнні Уладзіміра дае нам падрабязны малюнак самога факта. У гэтым працэсе апавяданне адзначае тры моманты. Спачатку да Уладзіміра прыйшлі паслы – казальнікі балгарскія, нямецкія, хазарскія і грэцкія. Кожны з іх хваліў сваю веру. Уладзімір застаўся нездаволеным ні іудзействам, ні магаметанствам; больш за ўсё яму спадабалася казанне грэцкага філосафа, асабліва калі апошні развінуў перад ім малюнак страшнага суда. Затым Уладзімір паслаў сваіх мужоў

для азнаямлення з рознымі рэлігіямі. Грэцкае праваслаўнае набажэнства больш за ўсё спадабалася паслам. Паслы раілі Уладзіміру прыняць хрысціянскую веру, падкрэсліваючы пры гэтым, што яе прыняла і яго бабка Вольга. Схіліўшыся на бок хрысціянства, Уладзімір адправіўся ў паход на Корсунь і аблажыў яго. Тут жа, пад Корсунем, дзякуючы цуду, адбылося хрышчэнне Уладзіміра, следам за якім адбыўся і шлюб Уладзіміра з сястрою візантыйскіх імператараў Васіля і Канстанціна — Ганнай. Гэтае апавяданне, у якое ўвайшлі тры легенды, падае толькі тры верыгодныя факты: хрышчэнне Уладзіміра, паход на Корсунь і шлюб з Ганнай. Гандлёвыя сувязі Кіева з Усходам, Захадам і Візантыяй рабілі з Кіева цэнтр, дзе сутыкаліся прадстаўнікі розных рэлігійных кірункаў, і кожны кіяўлянін меў поўную магчымасць пазнаёміцца ў Кіеве з сутнасцю тае ці іншае рэлігіі. Уладзімір хрысціўся па ўласнай ініцыятыве, і само хрышчэнне адбылося не ў Корсуні, а каля Кіева, за два гады да паходу на Корсунь.

**Паход на Корсунь.** Гандлёвыя зносіны, што існавалі паміж Кіевам і Візантыяй, былі аднака важны як для славян, так і для Візантыі. Аднак візантыйскі ўрад рабіў кіеўскаму гандлю розныя перашкоды. Асабліва гэта мела месца з тых часоў, калі князь Святаслаў панёс няўдачу на Балканскім паўвостраве. З гэтым не маглі пагадзіцца ні кіеўскі ўрад, ні кіеўскія купцы — дружыннікі. Уладзімір у 985 г., карыстаючыся барацьбою балгарскага цара Сымона з грэкамі, у саюзе з балгарамі выступаў супроць грэкаў. Пры дапамозе кіеўскіх войск грэкі былі разбіты пры Сардзіку, і дзякуючы гэтаму адчыніўся шлях за Балканы. Паход за Балканы не адбыўся з тае прычыны, што грэкі паспяшылі заключыць мір з Сымонам Балгарскім. Нягледзячы на гэта, становішча візантыйскага імператара было вельмі цяжкім. Вайскаводца Варда Фока падняў паўстанне. Імператар Васіль і яго брат не мелі магчымасці змагацца з мяцежнікам і звярнуліся за дапамогаю да кіеўскага князя. Уладзімір згадзіўся даць на дапамогу войска пры ўмове, што браты выдадуць за яго сваю сястру Ганну. Імператар згадзіўся, але з той, аднак, умовай, каб Уладзімір ахрысціўся. Кіеўскі князь выпаўніў усе прынятыя на сябе ўмовы. На дапамогу імператару быў пасланы шасцітысячны аддзел войска, які дапамог Васілю ўсмірыць паўстанне. Аднак імператар і яго брат адмовіліся выдаць за яго сваю сястру. Гэтая адмова прымусіла князя Уладзіміра паслаць ваенную экспедыцыю ў Крым на Корсунь — выдатнейшы цэнтр грэцкага гандлю на паўночным беразе Чарнаморскага ўзбярэжжа. Аблога Корсуня закончылася для Уладзіміра ўдачна. Корсунь быў узяты. Катастрафічнае становішча Візантыйскае імперыі прымусіла цара Васіля распачаць перагаворы з Уладзімірам і згадзіцца на выпаўненне раней падпісанага абавязання — выдаць за Уладзіміра сястру Ганну. Апошняя прыехала ў Корсунь, дзе і адбыўся шлюб яе з Уладзімірам. Заваёваны Корсунь быў звернуты імператарам «за вено», у якасці выкупу за жонку, а сам Уладзімір, забраўшы з сабою абразы і царкоўнае начынне, у таварыстве з грэцкім духавенствам пакіраваўся ў Кіеў.

**Хрышчэнне кіяўлян.** Калі Уладзімір вярнуўся з Корсуня, то ў Кіеве адбылося прымусовае хрышчэнне кіяўлян, якіх пазганялі на бераг Дняпра. Гэтае прымусовае хрышчэнне не спаткала з боку паганскай партыі ніякага афіцы-

яльнага пратэсту. Паганскія балваны былі паскіданы, а на месцы паганскіх святынь Уладзімір пачаў будаваць хрысціянскія цэрквы. Адначасна з прыняццем хрысціянства ў Кіеве была ўстаноўлена царкоўная іерархія. Прадстаўнікамі духавенства былі грэкі і балгары. У царкоўна-адміністрацыйных адносінах новая царква знаходзілася ў залежнасці ад канстанцінопальскага патрыярха, які імкнуўся праводзіць царкоўную палітыку ў інтарэсах візантыйскага ўрада. Афіцыяльнае засваенне хрысціянскай веры сведчыла аб слабасці арганізацыі паганскай партыі, якая не магла папхнуць народную масу на пратэст супроць учынкаў князя ў імя абароны паганства. Але прыняцце хрысціянства не азначала яшчэ адмовы ад прывычных паганскіх вераванняў і абрадаў, якія мелі і ў далейшым вялікі ўплыў на хрысціянскія абрады. Знішчожанае афіцыяльна паганства было яшчэ вельмі блізкім для насялення і рабіла вялікі ўплыў на ўспрыманне новых догматаў і царкоўных абрадаў, уносячы ў хрысціянскі культ нямала паганскіх прадстаўленняў і абрадаў.

**Царква і дзяржава.** Паяўленне новай грамадскай арганізацыі ў выглядзе царквы высоўвала пытанне аб яе юрыдычным палажэнні. З гэтай мэтай пры Уладзіміру быў апублікаваны «Устав о церковных судех», які хаця і не з'яўляецца помнікам афіцыйнага пахаджэння, але адбівае на сабе тое праўнае палажэнне, якое новая царква займала ў дынастычнай дзяржаве, як у адносінах да княжае ўлады, так і ў адносінах да грамадства. Царкоўны статут забяспечвае неўмяшальнасць княжае ўлады ў царкоўныя суды. Справы аб разводзе (роспуск), «смільнае» (валакіты аб пасагу), «заставанне» (блуд), «пашыбанне» (сваркі) паміж мужам і жонкаю з прычыны маёмасці, бойкі і лаянка бацькоў з дзяцьмі, выкапванне з магіл нябожчыкаў, высрубанне прыдарожных крыжоў — падлягаюць царкоўнаму суду. У гэтых справах (рэлігійных, сямейных і звычаёвых) царкоўнаму суду падлягае ўсё грамадства; але царкоўныя станы, як то ігумен, поп, дыякан і хто ў клірасе — чарнец, чарніца, пападдзя, праскурніца, паповіч, лечац, прашчэннік, задушны чалавек (вольнаадпушчаны па духоўнай), манастырэве, больніцы, гасцініцы «страннопрыімніцы», якія знаходзіліся пад апекай царквы, падлягалі суду мітрапаліта або біскупа. У царкоўным статуце знайшлі адбітак візантыйскія царкоўна-юрыдычныя погляды, якія пры пасярэдніцтве царкоўнай іерархіі пачалі пранікаць у свядомасць вярхоў хрысціянскага грамадства. На карысць царквы была ўстаноўлена дзесяціна.

**Асвета.** Побач з хрысціянствам паяўляецца ў Кіеве асвета і пісьменства візантыйскага пахаджэння ў балгарскім перакладзе. Паяўляюцца пераклады Святога Пісьма. Канечнасць мець граматнае рускае духавенства прымусіла Уладзіміра прыняць шэраг мер асветнага характару. Уладзімір пачаў збіраць дзяцей баярства, «нарочітые чаді», і аддаваў іх на адукацыю да грэцкіх настаўнікаў. Гэтакі быў пачатак граматнасці.

**Хрысціянізацыя Полацкай зямлі.** Хрысціянства пашыралася з Кіева па гандлёвых дарогах. Распаўсюджанне хрысціянства мела павярхоўна-прымусовы характар. Наколькі шпарка пасоўвалася знадворная хрысціянізацыя, сказаць цяжка, бо крыніцы аб гэтым не ўспамінаюць, але заснаванне Полацкай

епархіі адносіцца да часоў Уладзіміра Святаславіча. Ізяслаў Полацкі быў ахрышчаны яшчэ Уладзімірам. Падобліва, хрысціянізацыя Полацкай зямлі пасоўвалася вельмі павольна, бо ў «Начальным летапісе» ёсць успаміны аб нейкіх «валхвах», якія мелі ўплыў на народныя масы яшчэ ў XI ст. Тэрыторыя першапачатковага біскупства (епіскапіі) не выходзіла за межы горада, і ўся ўвага біскупскай і княжай улады згуртоўваецца пераважна на аздабленні і пабудове святынь, якія з'яўляліся знадворнымі паказчыкамі поспехаў новае рэлігіі. У царкоўна-адміністрацыйных адносінах Полацкае біскупства, захоўваючы сваю самастойнасць, залежала ад кіеўскага мітрапаліта.

**Хрысціянізацыя Смаленскай зямлі.** Павярхоўны працэс хрысціянізацыі Смаленскай зямлі адбываўся такім жа шляхам, як і ў Полацкай зямлі. Хрысціянства тут прышчаплялася з часоў Уладзіміра Першага. Уся розніца была ў тым, што ў Смаленску не было самастойнага біскупа. Смаленская зямля ў царкоўных адносінах залежала ад пераяслаўскага біскупа. Утварэнне ў Смаленску самастойнай епархіі адносіцца толькі да 1137 г.

**Хрысціянізацыя Тураўскай зямлі.** Паяўленне хрысціянства ў Турава-Пінскай зямлі гэтаксама адносіцца да часоў Уладзіміра Першага. Хрысціянства паяўляецца ў гарадах, але наколькі паспешна адбываўся працэс хрысціянізацыі — на гэта станоўчага адказу даць нельга. У Тураве з часоў Уладзіміра Першага была самастойная біскупская кафедра, якая знаходзілася ў царкоўна-адміністрацыйнай залежнасці ад кіеўскага мітрапаліта. Паяўленне ў Тураве самастойнага біскупа «Начальны летапіс» адносіць да часоў Уладзіміра Першага (1005).

**Характар хрысціянізацыі.** Прымаючы хрысціянства павярхоўна, народныя гушчы заставаліся вернымі традыцыям паганства. Яно жыве ў глыбіне свядомасці народа; само хрысціянства апаганьваецца і прыстасоўваецца да простага светаразумення. Царква з павярхоўнага боку перамагла народную масу, але дух гэтай масы застаўся непарушны. Царква, нават апіраючыся на свецкую ўладу, была бяссільна што-колечы зрабіць у гэтым кірунку, за выключэннем царкоўных пракляццяў і знадворна-фармальных забарон.

## Ж) Праўныя погляды

**Крыніцы права.** Славянскія праваадносіны вызначаліся звычаёвым правам. Славянскія юрыдычныя звычаі гэтай эпохі знайшлі сабе адбітак у дагаворах Алега і Ігара з грэкамі, у запісках арабскіх вандроўцаў (Ібн Даста), у кароткай рэдакцыі «Рускай Праўды», якая адносіцца да часоў Яраслава Мудрага.

**Панаванне крывавай помсты.** Істотнасць прастадушнае славянскае правасвядомасці вылілася ў формы крывавай помсты, але гэткая адплата ў эпоху дынастычнае дзяржавы ўжо не мела зусім свабоднага характару. Неабмяжаваная асабістая або грамадская помста ўжо адышла ў краіну мінулага. З развіццём пасярэдніцкай судовай чыннасці князёў крывавая помста замянялася сістэмаю кампенсацый, судовых штрафаў. Паводле кароткай рэдакцыі «Рускай Праўды», крывавая помста агранічваецца межамі сям'і. Пры адсутнасці мсціўцаў выплачваецца за галаву 80 грыўняў. Крывавая помста канчаткова знікла ў палове

XI ст. Пры сынах Яраслава мае пераважнае месца сістэма кампенсацый, штрафаў. Матэрыялізацыя погляду на карныя праступкі — безумоўна вялікі крок наперад у народнай правасвядомасці.

**Судовыя органы.** Найвышэйшым судовым органам было народнае веча. Ісландская «Сага аб Олафе, сыне Трыгвіевым», апавядаючы аб праступку, учыненым Олафам, падае наступнае: у Ноўгарадзе гэтак сурова захоўвалася грамадская бяспека, што кожны, забіўшы іншага чалавека, без суду караўся смерцю. Цяпер збегся народ, згодна з іх звычаямі і законамі, шукаць Олафа, дзе ён схаваўся, і хацеў пазбавіць яго жыцця, як загадваў закон. Ібн Даста падае весткі аб судзе племеннага князя, да якога зварачаюцца патрабуючыя суду асобы. Калі цар выносіць прыгавор, то тое, што ён загадае, выконваецца. З утварэннем дынастычнае дзяржавы побач з уладай племенных князёў трэба паставіць уладу кіеўскага князя і яго органаў, якія судзілі ў тым выпадку, калі да яго звярталіся заінтарасованыя асобы.

**Судовы працэс.** Калі ёсць даныя (відавочныя довады, прызнанне праступнікаў), якія сцвярджаюць факт праступлення, то не вымагаецца ніякіх дакументаў, пацвярджаючых праступленне. Гэтак, калі хто-колечы з'явіцца ў суд акрываўлены або з сінякамі ад пабояў, то ён можа не прадстаўляць сведак. Толькі пры адсутнасці адпаведных пераконваючых даных вымагаецца, каб на суд прыводзіліся сведкі. У шэрагу судовых довадаў выдатнае месца займала прысяга і судовы паядынак. Аб прысязе як форме судовага доваду гаворыцца ў дагаворы Алега з грэкамі. Ібн Даста адзначае, што паміж славян быў пашыраны судовы паядынак: у выпадку, калі бакі нездаволены з вынесенай пастановы, то, па прыгавору цара, аканчальная пастанова вырашаецца аружжам.

**Сістэмы злачынстваў.** У дагаворы з грэкамі праступленне называецца «проказой» і «согрешеніем»; праступнік называецца «татем» і «злодеем». У дагаворах прызнаецца кара за наступныя праступленні: забойства, цялесныя пабоі, кража, спроба на грабежніцтва, грабежніцтва і невыкананне распараджэнняў улады.

**Культурныя сувязі.** Геаграфічнае палажэнне і гандлёвыя шляхі вызначалі культурныя сувязі Беларусі да паловы XI ст. Вялікая колькасць арабскіх манет, якія былі знойдзены на тэрыторыі крывічоў, радзімічаў і якія адносяцца да VIII—IX стст., сведчыць аб ажыўленых гандлёвых сувязях з Усходам. Вялікая колькасць знойдзеных у курганах прадметаў усходняга пахаджэння сведчыць аб тым, як на тэрыторыю Беларусі пранікаў усходні ўплыў. Гэты ўплыў адбіўся не толькі на матэрыяльным быце ядра беларускага племення. Духоўная культура развівалася незалежна ад уплыву Усходу. Гандлёвыя сувязі і палітычныя адносіны з Кіеўскай зямлёй з'яўляліся правадніком візантыйскага ўплыву, які найбольш поўна адбіўся на рэлігійных вераваннях і больш познім росквіце духоўнага жыцця Беларусі. Праз гандаль з Захадам на тэрыторыю Полацкай і Смаленскай краін пранікала не толькі матэрыяльная, але і духоўная культура Захаду, якая знайшла свой адбітак у духоўным жыцці беларусаў у пазнейшую гістарычную пару. Культурныя ўплывы дзякуючы тэрытарыяльнаму палажэнню Беларусі закранали неглыбока асновы духоўнага развіцця беларускага народа. Адсутнасць на тэрыторыі Беларусі чужых славянству этнічных элементаў мела пэўны асноўны ўплыў на чыстату ў этнічных адносінах беларускага племення.

# II

# Беларускія землі ў XI–XIII стст.



## 1. УТВАРЭННЕ САМАСТОЙНЫХ ЗЯМЕЛЬ-КРАІН

**Тэрыторыя зямель.** Полацкая зямля займала значную тэрыторыю, раскінутую ў вадазборы верхняй і сярэдняй Заходняй Дзвіны і часткай — у вадазборы ракі Дняпра. Большай часткай тэрыторыя Полацкай зямлі з'яўляецца раўнінай, толькі ў паўднёвай і паўночнай частках перарэзанаю вялікімі ўзгор'ямі. Раўніннасць тэрыторыі і вялікая колькасць рэчак спрыялі шырокаму развіццю каланізацыі ўнутры самой зямлі. З IX ст. на тэрыторыі выраслі буйныя гарадскія асяродкі, як то: Полацк, Віцебск, Рша, Лукомль, Менск, Заслаўе, Друцк, Копысь, Барысаў, Няміга, Лагожск, Гарадзец. Разам з гэтым каланізацыя накіроўвалася і ў зямлю латышоў па ніжняму берагу Заходняй Дзвіны, дзе вырас шэраг гарадоў: Герцыка, Рэчыца, Куконойс. Уся тэрыторыя краіны была пакрыта лясамі і балотамі. З эканамічнага боку, дзякуючы геаграфічнаму палажэнню на гандлёвых шляхах да Балтыйскага мора, Полацкая зямля складала адно цэлае разам са Смаленскай зямлёй, тэрыторыя якой была раскінута на вышнявінах Волгі, Заходняй Дзвіны і Дняпра. Геаграфічнае палажэнне тэрыторыі Смаленскай зямлі было вельмі выгодным, бо тут знаходзіўся цэнтр скрыжавання гандлёвых шляхоў з поўначы на поўдзень, «з вараг у грэкі», і з усходу на захад ад Камскай Балгарыі да вусця Заходняй Дзвіны. Забяспечаная з усходу Чарнігава-Северскай і Ростава-Суздальскай землямі, Смаленская зямля не падлягала тым нападам, ад якіх так шмат цярпела Кіеўская краіна. Лясы, азёры, балоты, рэкі і рэчкі ў вялікай колькасці пакрывалі тэрыторыю Смаленшчыны. Па вялікіх рэках цягнуліся галоўныя гандлёвыя шляхі на поўдзень да Кіева па Дняпры і на захад да вусця Заходняй Дзвіны. Глеба ў Смаленскім княстве была няўродлівая. У лясах знаходзілася шмат розных звяроў: ласёў, вепрукоў, лісоў, курэй, барсукоў, баброў. З прычыны свайго геаграфічнага палажэння Смаленску прыходзілася падтрымліваць самыя цесныя зносіны з Кіевам. Апрача Смаленска — старажытнага цэнтра, крыху пазней выраслі гарады Дарагабуж, Тарапец, Белы, Мажайск, Клін, Вязьма. Ужо ў XII ст. у Смаленскай зямлі налічвалася да 25 гарадоў і 30 сёл. К палове XIII ст. іх стала значна болей. Смаленская зямля ў палове XII ст. мела ў сваім складзе ўсю сучасную Смаленскую губерню, часткі Пскоўскай, Віцебскай, Калужскай і Цвярской. Турава-Пінская краіна займала Прыпяць з яе левымі і правымі прытокамі і ў вялікай колькасці была пакрыта лясамі, рэкамі і балотамі. Тураўская зямля знахадзілася на водным гандлёвым шляху па Прыпяці з Кіева ў Польшчу. Апрача Турава, вядомага з канца X ст., у працягу XI—XIII стст. паявіліся

гарады Пінск, Мазыр, Рагачоў, Небль, Здзітаў, Случаск, Чартарыск, Рэчыца, Клечаск, якія сведчылі аб гаспадарчай культуры краю.

**Кіеўская дзяржава.** Полацкая зямля не ўвайшла ў склад Кіеўскае дзяржавы. Яраславу Першаму прыйшлося пайсці на пэўныя ўступкі князю Брачыславу (1029) і тым самым прызнаць самастойнасць Полацкае зямлі. Ад геаграфічнага палажэння залежалі далейшыя ўзаемныя адносіны паміж полацкімі і кіеўскімі князямі, якія ніяк не маглі дапусціць існаванне незалежнай ад Кіева краіны, раскінутай на важным гандлёвым шляху з поўначы на поўдзень. Барацьба за гандлёвыя шляхі вызначала ўсе ўзаемныя адносіны паміж Полацкай зямлёй і Кіеўскай дзяржавай. Абедзве стараны карысталіся ўсімі палітычнымі сродкамі, якія маглі прывесці даўнюю барацьбу Полацка з Кіевам да памысных вынікаў для аднае з ваюючых старон. Барацьба становіцца асабліва напружанай пры Усяславу Брачыславічу (1044—1100), які з'яўляўся ўвасабленнем ідэі незалежнасці Полацкае зямлі ад Кіева і палітычнага яе ўмацавання.

**Усяслаў Брачыславіч.** Аб асобе князя Усяслава захавалася няшмат летапісных і літаратурных вестак. Адзначаючыся вялікім розумам, энергіяй і працаздольнасцю, князь Усяслаў рабіў вялікае ўражанне на сучаснікаў. Яго праціўнікі ў асобе аўтара «Начальнага летапісу» папракалі полацкага князя крыважэрнасцю і лютасцю. Народная фантазія атуліла асобу князя Усяслава элементамі паэтычнага вымыслу. Захаваўшаеся ў летапісе паэтычнае паданне акружае пахаджэнне князя Усяслава цудоўнымі акалічнасцямі. Паданне кажа, што ён радзіўся ад чараўніцтва і што ў яго на галаве была пляма, якая за нарадай чараўнікоў была пакрыта павязкай. Сама пляма на галаве мела нейкую чароўную моц. Аўтар «Слова аб палку Ігаравым» дае дасканалую характарыстыку полацкага чарадзея: «Князь Усяслаў людзям суд даваў, князям гарады парадкаваў, а сам воўкам бегаў. З Кіева да петухоў ён дабягаў да Тмутаракані, воўкам перасякаючы шлях Вялікаму Хорсу. У Полацку звоняць завутраню ў святой Сафіі, а ён у Кіеве звон чуе. Хаця і вешчая душа ў целе, але часта беды пераносіць». Князь Усяслаў прадстаўляецца аўтару «Слова» ў такім выглядзе, што можа быць узорам для наследавання іншым. Насяленне Полацкай зямлі глядзела на князя Усяслава як на свайго абаронцу. Вось менчане, абложаныя Яраславічамі, доўга бараніліся, не жадаючы здавацца, і чакалі дапамогі ад полацкага князя. Энергія і спрытнасць князя Усяслава знайшла сабе адбітак у працяжнай гераічнай барацьбе з Яраславічамі. Гэтая барацьба высока падняла аўтарытэт полацкага князя і Полацкай зямлі, і ў той жа час яна не адпавядала тым рэальным сродкам, якія былі ў насялення. З гэтае прычыны тая працяжная барацьба, якую ўвесь час падтрымліваў князь Усяслаў, павінна была закончыцца поўнай няўдачай і прывесці Полацкую зямлю да эканамічнага і палітычнага заняпаду, ставячы яе на палажэнне ўтаразначнай краіны. Палітычным замыслам Усяслава адпавядалі і палітычныя адносіны да Кіеўскае дзяржавы.

**Кіеўская дзяржава пасля смерці Яраслава Першага.** Дынастычная дзяржава Яраслава Першага пасля яго смерці (1054) падлягае ўнутранаму раскладу. Кіеўская дзяржава, зложаная з паасобных зямель-краін, звязаных з Кіевам

толькі эканамічнымі адносінамі, была ўнутры вельмі слабай. Землі-краіны маглі вызваліцца з-пад уплыву Кіева, як толькі спыніцца ці аслабее эканамічны пацяг да Кіева. Гэтае з'явішча рэзка праявілася крыху пазней, але пачатак тут быў зроблен тады, калі сам Яраслаў падзяліў Кіеўскую дзяржаву. Гэты падзел меў такі характар: старшы сын Ізяслаў атрымаў Кіеў, Святаславу быў адданы Чарнігаў і Усеваладу – Пераяслаў, Вячаслаў атрымаў Смаленск і Ігар – Уладзімір-Валынск. Старэйшы ўнук Расціслаў Уладзіміравіч атрымаў Ростаў. Апрача гэтага ў руках Ізяслава знаходзіўся Ноўгарад. Святаславу была дабаўлена Мурама-Разанская зямля. А ўладанне Усевалада павялічылася Суздалем і Белавозерам. Паводле Яраслававага тэстамента Ізяслаў як старэйшы член княжай сям'і быў пастаўлены на «отца место», што павінна было забяспечыць Кіеўскую дзяржаву ад распаду. Тэстамент Яраслава сведчыць аб адасобненасці краін адна ад другой і аб самастойнасці іх унутранага жыцця. Паяўленне ў краінах мясцовых дынастый павінна было спрыяць яшчэ большаму замацаванню адасобненасці. Сама ідэя падзелу дзяржавы бярэ пачатак у нормах агульнаславянскага сямейнага права. Апошняму добра вядома непадзельная калектыўная ўласнасць, якая ў выпадку падзелу паміж суўласнікамі дзеліцца на роўныя долі. Кіеўская дзяржава разглядалася як супольная ўласнасць усёй княжай сям'і, на чале якой стаяў Яраслаў. Раз кожны член княжай сям'і мае права на долю ў спадчыне, то ўсе долі павінны быць роўныя, бо правы ўсіх членаў аднакія. Нарушэнне правоў аднаго з сунаследнікаў выклікае канечнасць узнаўлення нарушанага права. Адгэтуль бяруць свой пачатак непаразуменні ў княжай сям'і, якія прыходзіцца развязваць аружжам. Агульныя нормы славянскага права не выконваліся старшымі Яраславічамі. Ідэя адзінства княжай сям'і выявілася нежыццёвай. Пасля смерці братоў Вячаслава і Ігара Яраславічы далучылі іх часткі да сябе. Кіеўская дзяржава апынулася ва ўладанні брацкага трыумвірату: Ізяслава, Святаслава і Усевалада. Кааліцыя Святаслава і Усевалада прымусіла Ізяслава пакінуць Кіеў. Кіеўскай дзяржавай кіравалі два браты. У 1075 г. Святаслаў памёр. На чале Кіеўскай дзяржавы апынуўся Усевалад. Але часы самаўладства прамінулі. Усеваладу прыйшлося пагадзіцца з паяўленнем у Кіеве Ізяслава. Наследдзе Яраслава апынулася ў руках двух братоў – Ізяслава і Усевалада. Кіеўская дзяржава была падзелена наступным чынам: Ізяслаў атрымаў Кіеў, Ноўгарад, Валынь і Тураў – тэрыторыю, якая прылягае да вадазбору правага берага Дняпра, за выключэннем Ноўгарада як ключа ад шляху з «вараг у грэкі»; Усевалад атрымаў Пераяслаў, Чарнігаў, Смаленск, Растоў, Суздаль. Калі памёр Ізяслаў (1077), то Усевалад сеў «на столе отца своего і брата». Уся Кіеўская дзяржава была аб'яднана пад уладаю Усевалада (1079). Такая палітыка Яраславічаў, у паасобку Усевалада, парушала агульныя нормы славянскага права. Князі, пазбаўленыя сваіх айчын, не маглі з гэтым пагадзіцца і пачалі са зброяй у руках дабівацца, каб парушанае права было ўзноўлена. Алег Святаславіч у кааліцыі з полаўцамі і стрыечным братам Барысам Усяславічам пачаў барацьбу супраць Усевалада. Першы перыяд барацьбы быў няўдачны для кааліцыі (1079), але пляменнікі Усевала-

да не апускалі рук. Яны ў далейшым цягу вялі барацьбу з дзядзькам, і Усеваладу прыйшлося пайсці на значныя ўступкі — аддаць сваім пляменнікам тыя воласці, у якіх сядзелі іх бацькі. Смаленская зямля засталася ва ўладанні Усевалада, а Святаполк Ізяславіч атрымаў Тураў і Пінск. Пасля смерці Усевалада Святаполк Ізяславіч, Уладзімір Усеваладавіч, Алег і Давыд Святаславічы, Давыд Ігаравіч, Васілько Расціславіч сабраліся на з'езд у Любечы (1097), на якім прынялі пастанову, каб кожны князь трымаў сваю айчыну. Падзел Кіеўскай дзяржавы фактычна закончыўся. Краіны пачалі жыць сваім паасобным жыццём. Шэраг з'яў эканамічнага характару ў выглядзе скарачэння дняпроўска-візантыйскага гандлю прысяшылі працэс распаду.

**Барацьба з полаўцамі.** Знадворнае становішча Кіеўскае дзяржавы пасля смерці Яраслава было не надта добрым. Пры вялікім князю Ізяславу Кіеў стыкнуўся са стэпавымі драпежнікамі — полаўцамі, напады якіх станавіліся вельмі частымі. Уладзімір Усеваладавіч Манамах у сваім «Навучэнні» паведамляе, што полаўцы робяць набегі і забіраюць палонных «на всяко лето у веже своя».

**Барацьба Полацка з Кіевам.** Склаўшыеся ў Кіеўскай дзяржаве ўнутраныя і знадворныя акалічнасці былі прыняты пад увагу Усяславам. Спачатку Усяслаў і кіеўскія князі жылі згодна. Але гэтая згода была кароткачасовая. Старэйшыя Яраславічы — Ізяслаў, Святаслаў і Усевалад, стараючыся захапіць у свае рукі ўладу над усёй Кіеўскай дзяржавай, не маглі пакінуць без увагі Полацка, самастойнае палажэнне якога пагражала гандлёвым шляхам з «вараг у грэкі». Стычка Полацка і Кіева была абсалютна няўхільнай з прычыны палітычных і эканамічных супярэчнасцей паміж імі. Напады полаўцаў прымусілі Усяслава пачаць барацьбу з Яраславічамі. Каб задаць Кіеву хутчэйшы ўдар, Усевалад пачаў вайну супроць Пскова, але гэты паход закончыўся няўдачна (1065). У наступным годзе Усяслаў ідзе на Ноўгарад. На гэты раз паход быў удачны. Ноўгарад быў узяты. Было забрана шмат палонных, жанчын і дзяцей, абраблен Сафійскі сабор. Гэты факт не мог прайсці бяскарна для Усяслава. Яраславічы не маглі дапусціць умацавання Усяслава і паўтарэння набегаў на Ноўгарад, якія былі гэтак небяспечны для кіеўскага гандлю. Яраславічы ўтрох узімку (1067), калі палавецкія набегі фактычна былі немагчымыя, напалі на Полацкую зямлю. Яраславічы накіравалі свае сілы на Менск і аблажылі яго. Усяслаў не мог падаць у свой час дапамогі менчанам. Горад быў узяты, а насяленне было або перабіта, або забрана ў палон. Усяслаў, які спяшыў на дапамогу, сустрэўся з саюзнікамі-братамі на рэчцы Нямізе. У бойцы 3 сакавіка Усяслаў быў разбіты. Аўтар «Слова аб палку Ігараве» гэтак апісвае гэтую крывавую бойку: «На Немізе снопы стелют головамі, молотят хоролужнымі цепамі, на току жізнь кладут, веют душу от тела». «Крывавыя берагі Нямігі былі ўсеяны не жытам, але касцьмі рускіх сыноў». Пасля гэтай бойкі на рэчцы Нямізе разбіты Усяслаў, падобліва, папрабаваў сабраць новае войска. У чэрвені ён быў у Воршы. Яраславічы запрапанавалі Усяславу прыехаць да іх у стан дзеля перагавораў і цалавалі крыж у той знак, што яны яму не прычыняць ніякае шкоды. Аднак

Яраславічы не стрымалі свайго слова — яны задумалі пазбавіцца свайго небяспечнага праціўніка. Калі Усяслаў прыехаў у іх стан, Яраславічы яго звязалі і ў кайданах адаслалі ў кіеўскую турму.

**Кіеўская рэвалюцыя.** У той час, калі Усяслаў сядзеў у кіеўскай турме, Кіеў перажываў цяжкі момант. Полаўцы напалі на Кіеўскую дзяржаву. Яраславічы былі разбіты і кінуліся наўцёкі. Полаўцы перайшлі на правы бераг Дняпра і ўсё спусташалі агнём і мячом. Ізяслаў не рабіў нічога дзеля абароны і нават не выдаў кіяўлянам зброі. Тады ўзбураны натоўп сабраўся каля турмы Усяслава, вызваліў яго і апавясціў яго сваім князем. Ізяслаў уцёк у Польшчу да караля Баляслава. Святаслаў і Усевалад не прымалі ніякіх крокаў супроць новага кіеўскага князя (1068). Аднак Ізяслаў, атрымаўшы дапамогу ад караля Баляслава, пайшоў паходам на Усяслава, які гэтаксама выйшаў з войскам і затрымаўся ў Белгарадзе. Ізяслаў меў у Кіеве даволі значны лік саюзнікаў. Усяслаў не мог спадзявацца, што яго становішча ў Кіеве ўзмоцніцца. З гэтае прычыны ён пакінуў кіяўлян і ўцёк у Полацк. Кіяўляне вярнуліся дамоў. Ізяслаў падступіў да Кіева і прымусіў насяленне здацца на яго волю. Прагнаўшы Усяслава з Кіева, Ізяслаў пастанавіў праследаваць яго ў самой Полацкай зямлі. У выніку гэтага Усяслаў быў выгнаны з Полацка, а яго месца занялі сыны Ізяслава, спачатку Мсціслаў, а пасля Святаполк.

**Барацьба за Полацк.** Энергічны Усяслаў не мог пагадзіцца ні са сваім становішчам, ні з тым, што яго айчына папала ў залежнасць ад Кіеўскае дзяржавы. Усяслаў пачаў рыхтавацца да новае барацьбы. Сабраўшы войска, Усяслаў намерыўся ўдарыць Ізяслава па самым балючым месцы Кіеўскае дзяржавы — па Ноўгарадзе. Але паход на Ноўгарад закончыўся для Усяслава няўдачна (1069). Новая няўдача не паменшыла энергіі Усяслава. Яму зноў удалося сабраць войска, і на гэты раз ён прагнаў з Полацка пасаднікаў Ізяслава. Седзячы ў Полацку, Усяслаў сачыў за адносінамі паміж братамі. Няпэўнае становішча Ізяслава прымусіла Усяслава распачаць нейкія перагаворы з Ізяславам, якія дорага каштавалі апошняму. Святаслаў і Усевалад выгналі свайго брата з Кіева. Усё княжэнне Святаслава Усяслаў правёў спакойна ў Полацку. Аб'яднанне ўсёй Кіеўскай дзяржавы пад уладаю Усевалада было вялікай пагрозай для палітычнага існавання Полацкай зямлі. Канечна трэ было аслабіць кіеўскага князя. Унутранае і знадворнае становішча спрыяла гэтаму. Усяслаў зноў ухапіўся за свой выпрабаваны стратэгічны план — паход на Ноўгарад (1076). Усевалад адказаў двума паходамі на Полацк. Уладзімір Манамах разам з полаўцамі зрабіў летні паход супроць Полацка. А Святаполк Ізяславіч напаў на Полацк з Ноўгарада ўзімку ў гэтым жа годзе. Уся Полацкая зямля была спустошана. Тады Усяслаў накіраваўся на землі Манамаха ў Смаленск. Уладзімір Манамах са сваёй чарнігаўскаю дружынаю, не адкладваючы, пайшоў на выручку Смаленску. Але Усяслаў паспеў у час адысці. Тады Уладзімір Манамах пайшоў следам за ім, спустошыў Полацкую зямлю і спаліў гарады Лукомль, Лагойск і Друцк. Відавочна, Усяслаў на гэта адказаў нейкім зваротным манеўрам, бо Уладзімір Манамах падступіў да Менска з вялікім войскам з чарнігаўцаў і

полаўцаў. Уладзімір Манамах узяў горад Менск і паступіў надзвычай люта: «не пакінулі ні чалядзінца, ні скаціны, усё разграбілі, папалілі», — гэтак паведамляе аб гэтым сам Манамах у сваім «Навучэнні» (1083). Спустошыўшы Полацкую зямлю і пабіўшы менчан, Уладзімір Манамах вярнуўся ў Кіеў. Далейшая барацьба паміж Полацкам і Кіевам была немагчымай. Усевалад і Уладзімір Манамах былі заняты сваімі сваркамі са сваякамі і барацьбой з полаўцамі. Усяслаў быў занадта слабы, каб у далейшым цягу весці барацьбу. Абодва бакі змарылі сябе і не дасягнулі пажаданых мэтаў. Але перамога ўсё-ткі была на баку Усяслава, бо Полацкая зямля захавала сваю незалежнасць; але і Усяслаў не мог прычыніць істотнай шкоды Кіеўскай дзяржаве. Эпоха Усяслава — гэта вельмі выдатны момант у гісторыі Полацкай зямлі, калі яе магутнасць дасягнула вялізнага значэння. Зразумела, што барацьба Усяслава з кіеўскімі князямі вялася пры няўхільным падтрыманні з боку насялення Полацкай зямлі, бо ў праціўным выпадку Усяслаў не меў бы ні людзей, ні сродкаў на працяг вайны, у якой побач з удачамі былі і значныя няўдачы. Эпоха Усяслава — гераічны перыяд у гісторыі Полацкае зямлі. Пасля смерці Усяслава пачынаецца палітычны заняпад Полацкае зямлі (1101).

**Распад Полацкай дзяржавы.** Пасля смерці Усяслава Полацкая дынастычная дзяржава была падзелена паміж яго сынамі, якія мелі роўнае права на пэўную долю ў бацькаўскай спадчыне. Дзякуючы падзелу Полацкай зямлі паміж шасцю сынамі (Рагвалод, Давыд, Барыс, Расціслаў, Глеб і Раман) яна дзеліцца на ўдзелы, паміж якіх Полацк і Менск займалі першае месца. Еднасць замежнай палітыкі полацкіх князёў знікла. Полацкі Давыд кіруецца на Кіеў, прымае ўдзел не толькі ў паходзе супроць полаўцаў (1103), але і выступае ў саюзе з кіеўскімі князямі супроць свайго брата Глеба Менскага (1104). А апошні рабіў напады на смальнян і Тураўскую зямлю. Войска, якое паслаў Святаполк Ізяславіч, спачатку нічога не дабілася. Глеб у далейшым цягу праводзіў палітыку свайго бацькі. Нягледзячы на тое, што Кіеўскі пасад дастаўся Уладзіміру Манамаху, які быў заінтарасованы ў незачэпнасці кіеўскіх і смаленскіх сваіх уладанняў, і што полацкія князі былі выкінуты з Вялікага воднага шляху, — Глеб не пакідаў сваіх агрэсіўных намераў. У 1116 г. Глеб напаў на Тураўскую і Смаленскую землі, захапіў Смаленск і спаліў Слуцк. Тады Уладзімір Манамах арганізаваў кааліцыю князёў супроць Глеба. Вячаслаў Уладзіміравіч Смаленскі заняў Воршу і Копысь. Брат яго Яраполк разграбіў Друцк; сам Уладзімір, вызваліўшы Смаленск, пакіраваўся на Менск, дзе засеў Глеб. Не маючы сілы абараніць Менск, Глеб распачаў перагаворы з Уладзімірам Манамахам. Глеб згадзіўся быць «паслушным» Уладзіміру Манамаху і зноў атрымаў сабе на княжэнне Менск, але Ворша і Копысь засталіся за Смаленскам. Менск быў пазбаўлены магчымасці рабіць уплыў на кіеўскі гандаль. З такімі дамовамі Глеб не мог пагадзіцца. У 1119 г. пачынаецца новая вайна. Уладзімір Манамах зноў пайшоў на Менск і забраў горад. Сам Глеб, папаўшы ў палон, быў прывезены ў Кіеў. Менск падчыніўся Манамаху, які аддаў яго аднаму са сваіх сыноў. Падчыніўшы сабе Менск, Уладзімір Манамах не дабіўся згоды ў Полацкай зямлі. Давыд

Полацкі, трымаючыся кіеўскай арыентацыі, перастаў слухацца князя Мсціслава Уладзіміравіча, які ў жніўні 1127 г. арганізаваў карную княжую экспедыцыю супроць Давыда. Князі з войскам пакіраваліся ў розныя пункты Полацкае зямлі. На Заслаўе пайшлі чатыры князі на чале з Вячаславам Уладзіміравічам Тураўскім. Ізяслаў Мсціславіч пайшоў на Лагожск. Расціслаў Мсціславіч Смаленскі пакіраваўся на Друцк. Апрача гэтага на Полацкую зямлю напаў Усевалад Мсціславіч Ноўгарадскі. Полацкая зямля з усіх бакоў была акружана ворагам. Капітуляцыя была няўхільная. Полацкае веча пастанавіла прынесці ў ахвяру Давыда і прагнала яго з Полацка, пасадзіўшы на яго месца Рагвалода. Мсціслаў згадзіўся з гэткай пастановай і завязаў з палачанамі мір. Але і новы князь Рагвалод не лічыў барацьбу скончанай. Полацкія князі ў 1129 г. адмовіліся ісці на полаўцаў, як гэтага вымагаў ад іх Мсціслаў. Калі закончылася барацьба з полаўцамі, Мсціслаў пакіраваўся супроць полацкіх князёў. Князі Давыд, Расціслаў, Святаслаў Усяславічы, Іван і Васіль Рагвалодавічы з жонкамі і з дзецьмі былі захоплены і высланы ў ссылку ў Канстанцінопаль. Полацкая зямля была аддадзена Ізяславу Мсціславічу. Кіеўскі князь Мсціслаў святкаваў на сваім баку поўную перамогу. Зруйнаваная і спустошаная працяжнымі войнамі Полацкая зямля не магла даць ніякага адпору. Палітыка Уладзіміра Манамаха і яго сына Мсціслава, якія імкнуліся да таго, каб захапіць у свае рукі ўсю Кіеўскую дзяржаву, часова дала дадатныя вынікі. Пасля смерці Мсціслава, калі ўнутры Кіеўскай дзяржавы пачаліся няладзіцы, Ізяслаў Мсціславіч пакінуў свой Полацкі ўдзел і пакіраваўся на поўдзень. У Полацкую зямлю пачынаюць варочацца з Грэцыі ранейшыя князі. У выніку гэтага ўся Полацкая зямля, апрача Воршы і Копыся, была вызвалена з-пад кіеўскіх князёў. Прыбыўшыя князі падтрымлівалі прыяцельскія адносіны як з Манамахавічамі, гэтак і з Ольгавічамі Чарнігаўскімі, галоўнымі княскімі фаміліямі, паміж якімі ўвесь час вялася безупынная вайна навокал Кіева за ўладу і ўплыў. Барацьба Полацка і Кіева траціла сваё значэнне, бо Кіеўская дзяржава з прычыны заняпаду кіеўскага гандлю пачала паступова схіляцца да заняпаду. Змяншэнне аўтарытэту княскай улады спрычынілася да ўмацавання народнага веча.

**Выдзяленне Смаленскае зямлі.** Смаленская зямля дзякуючы свайму геаграфічнаму палажэнню была звязана з сярэднім Прыдняпроўем бліжэй, чымся Полацкая зямля, якая знаходзілася крыху далей. Уяўляючы сабой адасобненую тэрыторыю, Смаленская зямля знаходзілася ў залежнасці ад кіеўскіх князёў, для якіх Смаленск як гандлёвы і стратэгічны пункт меў вельмі важнае значэнне. Пры жыцці Яраслава Уладзіміравіча Смаленск атрымаў у князі яго сына Вячаслава, які фактычна быў пасаднікам кіеўскага князя. Вячаслаў застаецца ў Смаленску і пасля смерці бацькі на правах краіннага князя. Пасля яго смерці старшыя браты перадалі Смаленск Ігару Уладзіміра-Валынскаму, а пасля смерці апошняга Смаленскае княства апынулася ў руках старэйшых трох братоў, якія падзялілі паміж сабой даходы з багатае краіны. Пасля таго як Ізяслаў быў выгнаны з Кіева і кіеўскі пасад перайшоў да Святаслава, Усевалад атры-

маў у кампенсацыю Смаленск, куды паслаў у якасці пасадніка свайго сына Уладзіміра Манамаха. У часе барацьбы Святаполка Ізяславіча і Уладзіміра Манамаха з Алегам Святаславічам Смаленск пазбавіўся ўплыву Уладзіміра Манамаха і заклікаў да сябе князем брата Алега — Давыда, які быў да апошняга часу князем у Ноўгарадзе. Аднак Смаленск не доўга жыў самастойным жыццём. Любецкі з'езд вярнуў Смаленск Уладзіміру Манамаху, куды быў пасланы на княжэнне Святаслаў Уладзіміравіч. Калі кіеўскі пасад быў заняты Уладзімірам Манамахам (1113—1125), Святаслаў быў пераведзены ў Пераяслаў, а на яго месца быў пасланы Вячаслаў Уладзіміравіч. Аднак апошні княжыў нядоўга. Уладзімір Усеваладавіч лічыў за лепшае трымаць у Смаленску пасаднікаў, але наследнік Манамаха на кіеўскім стале, Мсціслаў Уладзіміравіч, быў прымушаны адправіць на княжэнне аднаго з сваіх сыноў — Расціслава (1127), які з'явіўся пачынальнікам роду паасобнай галіны смаленскіх князёў.

Смаленск меў важнае значэнне ў барацьбе з Кіевам Усяслава Полацкага, які імкнуўся захапіць гэтак важны з эканамічнага і стратэгічнага боку горад. У 1073 г. Усяславу ўдалося захапіць Смаленск, але паход Уладзіміра Усеваладавіча з Чарнігава на Смаленск прымусіў Усяслава пакінуць горад, спаліўшы яго перад тым. І ў барацьбе Глеба Усяславіча цэнтрам яго стратэгічнае ўвагі быў Смаленск, які яму ўдалося захапіць. Але Глеб быў прымушаны пакінуць горад з тае прычыны, што Уладзімір Манамах аблажыў яго. Вызваліўшы Смаленск з-пад улады менскага князя, Уладзімір Манамах адышоў да самага Менска. Не маючы сіл абараніць Менск, Глеб быў прымушаны прыняць усе ўмовы Манамаха. Дзякуючы гэтаму Смаленская зямля пашырылася праз далучэнне Воршы і Копыся, якія мелі вялікае стратэгічнае значэнне на заходняй мяжы Смаленскае зямлі (1112). Спроба полацкіх князёў далучыць Смаленск да сваіх земляў закончылася няўдачай. Але гандаль, які развіваўся з Захадам па Заходняй Дзвіне, у значным стопні спрыяў цеснаму эканамічнаму і палітычнаму збліжэнню з суседняй Полацкай зямлёй. Палітычнае выдзяленне Смаленскае зямлі з складу Кіеўскае дзяржавы было фактарам, які змяншаў ранейшы антаганізм паміж Смаленскай і Полацкай землямі.

**Выдзяленне Турава-Пінскай зямлі.** Тураўская зямля спачатку знаходзілася ў беспасярэдняй залежнасці ад Кіева. Геаграфічнае палажэнне Тураўскай зямлі прымушала кіеўскіх князёў не выпушчаць з сферы свайго ўплыву гэтак важную ў эканамічных і стратэгічных адносінах тэрыторыю. З гэтае прычыны Уладзімір Першы пасадзіў тут на правах пасадніка свайго старшага сына Святаполка. Гэтаксама паступіў і Яраслаў Уладзіміравіч, паслаўшы ў Тураў свайго старэйшага сына Ізяслава. Сам Ізяслаў кіраваў Тураўскай зямлёй праз сваіх пасаднікаў. Для Ізяслава Тураўская зямля мела вялізнае значэнне як простая дарога ў Польшчу, па якой ён мог падтрымліваць ажыўленыя зносіны з апошняй і ў важны момант атрымліваць ваенную дапамогу ад польскага караля. Усевалад не цікавіўся Туравам і аддаў горад на княжэнне Яраславу Ізяславічу, пасля смерці якога там асеў яго брат Святаполк, бліжэйшы кандыдат на кіеўскі пасад. Стаўшы вялікім князем, Святаполк пакінуў за сабою Тураў. Але

значэнне Турава змяншаецца з тае прычыны, што аслабелі культурныя і дыпламатычныя сувязі з Польшчай. Барацьба з вандроўнікамі, прыцягваючы да сябе ўвагу кіеўскіх князёў, якія гераічнымі стараннямі хацелі абараніць найважнейшыя інтарэсы Кіеўскае зямлі, адцягнула ўвагу кіеўскіх князёў ад Турава. Аднак Уладзімір Манамах трымаў Тураў у поўнай ад сябе залежнасці. Але на пачатку княжэння Мсціслава Уладзіміравіча на тураўскім пасадзе з'яўляецца малодшы яго брат Вячаслаў на правах самастойнага тураўскага князя, які зрабіўся зусім незалежным ад Кіева. Новае становішча Тураўскае зямлі ўмацавалася ў часе княжэння Мсціслава, замежная палітыка якога была пакіравана ў бок полаўцаў і Полацкае зямлі. Тураўская зямля знаходзілася воддаль ад пляцу барацьбы з палавецкімі і полацкімі франтамі, магла ўмацаваць сваё становішча, але страціла сваё даўнейшае эканамічнае і палітычнае значэнне.

**Вынікі.** У палове XII ст. усе тры беларускія зямлі канчаткова выдзеліліся са складу Кіеўскае дзяржавы. Кожная з іх пачала жыць сваім уласным палітычным жыццём.·Гэта выдзяленне ўжо было вызначана геаграфічным палажэннем кожнае краіны, але эканамічны і палітычны крызіс, які ў XII ст. перажывала Кіеўская дзяржава, прымусіў кіраўнікоў кіеўскага пасаду лічыцца з краіннымі арганізмамі і тым выдзяленнем, якое фактычна адбылося. Агульны ўклад эканамічнага і палітычнага жыцця ў Кіеўскай зямлі, гэтак балючы для яе ў другой палове XII і першай чвэрці XIII ст., утвараў цяжкія ўмовы жыцця для насялення Кіеўскай зямлі. Гэтая акалічнасць прымушала насяленне падацца ўгору па Дняпры ў Смаленскую зямлю. Гэты прыплыў насялення быў адной з крыніц таго эканамічнага і палітычнага росквіту, які гэтак характэрны для Смаленскае зямлі ў другой палове XII–XIII ст.

# III

# Беларускія землі ў эпоху самастойнасці



# 1. ГІСТОРЫЯ СМАЛЕНСКАЕ, ТУРАЎСКАЕ І ПОЛАЦКАЕ ЗЯМЕЛЬ

**Заняпад Кіеўскае дзяржавы.** К пачатку XII ст. Кіеўская дзяржава была аслаблена як унутры, князёўскімі спрэчкамі, гэтак і знадворку, асабліва барацьбою з полаўцамі. Пачынаўся заняпад Кіеўскае дзяржавы. Ратаваць Кіеў прабавала кіеўскае народнае веча, якое спачатку выбрала на кіеўскі пасад Уладзіміра Манамаха, а потым яго сына Мсціслава. Бацька і сын прытрымліваліся адной палітыкі. Яны імкнуліся адбудаваць палітычную еднасць Кіеўскае дзяржавы і звярнулі асаблівую ўвагу на барацьбу са стэпамі. Уладзімір Манамах, злучыўшы ў сваіх руках айчыну (Пераяслаў, Смаленск, Тураў) і наследдзе Святаполка Ізяславіча (Кіеў, Ноўгарад), меў даволі сілы, каб абараніць Кіеўскую дзяржаву ад унутранага і знадворнага распаду. Пры Уладзіміру Манамаху спыніліся спрэчкі паміж князямі. Упартая барацьба полацкіх князёў закончылася поўнай няўдачай. Валынскія князі дзякуючы крэўным сувязям з Уладзімірам Манамахам знаходзіліся пад яго пратэктаратам, а пасля таго як валынскі князь Яраслаў Святаполкавіч, які адважыўся падняць паўстанне супроць Манамаха, загінуў, Валынь і Кіеў злучыліся ў адных руках. Мсціслаў у далейшым цягу праводзіў палітыку свайго бацькі. Ён дабіў полацкіх князёў і паслаў у Полацк свайго сына Ізяслава. З чарнігаўскімі князямі бацька і сын жылі згодна і трымалі іх у пэўнай ад сябе палітычнай залежнасці. Еднасць Кіеўскае дзяржавы была адбудавана дзякуючы той ваеннай палітыцы, якой прытрымліваліся Уладзімір і Мсціслаў і якая дзякуючы перавазе рэальных сіл дала гэткія дадатныя вынікі. Але эпоха ранейшае тэрытарыяльнае еднасці ўжо мінула. Сам Мсціслаў павінен быў палічыцца з краіннымі настроямі. Адбіткам уплыву гэтых краінных настрояў было тое, што сын Расціслаў быў пасланы ў Смаленск, а брат Вячаслаў — у Тураў. Полацкім князям удалося вызваліцца з-пад уплыву Яраполка Мсціславіча (1132—1139). Унутры самой сям'і Манамаха пачаліся спрэчкі. Змагаліся дзядзькі Яраполк і Юры з пляменнікамі Мсціславічамі. Барацьбу Юрыя Уладзіміравіча з пляменнікам Ізяславам Мсціславічам выкарысталі чарнігаўскія князі. Усеваладу Ольгавічу ўдалося захапіць Кіеўскі пасад (1139—1146). Але брат яго Ігар не меў сілы ўтрымаць за сабою Кіеў. Кіяўляне перайшлі на бок Ізяслава Мсціславіча. Ігар быў забіты. Але Ізяслава Мсціславіча не хацеў прызнаць Юры Даўгарукі, якому ўдалося прагнаць пляменніка з Кіева і самому сесці на бацькаўскі пасад (1154—1159). Барацьба за Кіеў дасягнула незвычайнага напружання, калі сын яго Андрэй пайшоў пахо-

дам на Кіеў і, зруйнаваўшы яго, вярнуўся назад у Ростава-Суздальскую краіну (1169). Кіеў утраціў сваю панаднасць. На яго пасадзе паяўляюцца смаленскія, валынскія і чарнігаўскія князі. Кіеўская дзяржава развалілася. Захват Канстанцінопаля крыжакамі (1202) спыніў кіеўскі гандаль, а разам з гэтым скасаваў палітычны ўплыў Кіева. Але канчатковы ўдар Кіеву задалі татары (1240).

**Барацьба з полаўцамі.** Уладзімір Манамах і яго сын энергічна абаранялі Кіеўскую зямлю ад полаўцаў. Звычайна князі рыхтаваліся ў паход узімку і стараліся напасці на палавецкія землі ўвесну. Барацьба ў XII ст. была няўдачная. Левы бераг Дняпра безупынку падлягаў нападам. У 1223 г. полаўцы былі ўшчэнт разбіты татарамі на рацэ Калцы і ўцяклі на Каўказ, часткай у Венгрыю і за Дунай у Візантыю. Чарнігаўская, Кіеўская і Пераяслаўская землі найбольш цярпелі ад палавецкіх набегаў. Кіеўскія князі ўмацоўвалі левы і правы берагі Дняпра, будавалі гарады па Суле: Белая Вежа, Усевалаж, Бахмач, Гарадок, Прылук, Пераралока, Пірацін. Па Псёле і Ворскле аселае насяленне спатыкалася рэдка. На правым беразе Дняпра ўмацаванні будаваліся па рацэ Росі, на якой зусім не было паселішчаў к часам Яраслава Першага. Барацьба са стэпамі напружыла страшэнна фізічныя сілы насялення, аслабляючы яго вытворчую энергію; але адваяваць ад вандроўнікаў стэпы гэтак і не ўдалося.

**Эканамічныя вынікі.** Захват стэпаў праз вандроўнікаў меў нязмерна важнае значэнне як для эканамічнага жыцця Кіева, гэтак і для яго палітычнае вагі. Палітычныя ўдачы Кіева залежалі ад становішча замежнага гандлю, усе канцы якога перапляталіся ў Кіеве. Калі вандроўнікі занялі стэпы, то паўсталі значныя перашкоды для гандлёвых зносін з Візантыяй. Кіеўская зямля апынулася адрэзанай ад Тмутаракані — важнага цэнтра чарнаморскага гандлю. З прычыны скарачэння апошняга разрываліся эканамічныя сувязі краін з Кіевам. Эканамічнае выасабненне пацягнула за сабой палітычнае выдзяленне. Смаленск, Полацк, Тураў дзякуючы эканамічнаму аслабленню Кіева здабывалі сабе палітычную незалежнасць. Татарскае найсце на Кіеў у 1240 г., якое зруйнавала Кіеўскую зямлю, канчаткова пахіснула чарнаморскі гандаль. Кіеў утраціў усялякае эканамічнае і палітычнае значэнне.

**Гістарычныя лёсы Смаленскае зямлі.** Смаленская зямля, вылучыўшыся з Кіеўскае дзяржавы, эканамічна развівалася і палітычна ўзмацнялася ў меру таго, як слабела апошняя. Высоўваючы палітычнае існаванне Смаленскае зямлі, князь Расціслаў Мсціславіч (1127—1159) меў на ўвазе гандлёвую сувязь з Ноўгарадам і Кіевам і стараўся падтрымліваць самыя блізкія зносіны з гэтымі буйнымі палітычнымі і эканамічнымі асяродкамі. Шчаслівае геаграфічнае палажэнне і развіты гандаль далі князю Расціславу значныя сродкі. Прыплыў насялення з сярэдняга Прыдняпроўя каланізаваў паўднёвую частку Смаленскай зямлі, дзякуючы чаму яе залюдненасць значна павялічылася. Каб умацаваць самастойнасць Смаленскае зямлі, князь Расціслаў імкнуўся падтрымліваць добрасуседскія адносіны са сваімі сваякамі. Дзякуючы свайму геаграфічнаму палажэнню і разумнай палітыцы князя Расціслава Смаленская зямля амаль што зусім не падлягала варожым нападам. Яе эканамічнае развіццё нічым не

прыпынялася. Расціслаў слухаў свайго бацькі і сваіх старэйшых братоў, што сядзелі на кіеўскім пасадзе. Калі апошні перайшоў да Усевалада Ольгавіча, князь Расціслаў прызнаў і яго вялікім князем. У барацьбе Юрыя Уладзіміравіча з Ізяславам Мсціславічам Расціслаў стаў на бок апошняга, паколькі ён бараніў правы свайго дзядзькі Вячаслава. Уплыў смаленскага князя нагэтулькі быў значны, што без яго згоды ніхто з князёў не мог утрымацца ў Кіеве. Калі Юры Даўгарукі (1154) пасля смерці брата Вячаслава стаў кіеўскім князем, то ён паспяшыў наладзіць зносіны з Расціславам і здабыць яго давер'е. Нарэшце, пасля смерці Юр'я Расціслаў сам апынуўся на кіеўскім пасадзе (1159). Умешваючыся ў кіеўскія адносіны і паступова падгатаўляючы самому сабе шлях на кіеўскі пасад, князь Расціслаў стараўся пашырыць свой уплыў на Полацк і Ноўгарад. Калі полацкія князі вярнуліся на бацькаўшчыну з высылкі ў Грэцыю, тут палітычна ўмацоўваецца сям'я Глеба Усяславіча, які гэтак многа змагаўся за самастойнасць Полацкае зямлі. Гэткая палітыка не магла не выклікаць неспакою ў князя Расціслава. Ён пачаў падтрымліваць Рагвалода Барысавіча. Пачалася барацьба паміж дзвюма сем'ямі пры чынным удзеле князя Расціслава. Палітычныя замыслы яго ўдаліся. Полацкая зямля раздзялілася на два буйныя ўдзелы: Полацкі і Менскі. Абодва князі адчувалі на сабе руку Расціслава. У канцы княжэння Расціслава Віцебск адышоў да Смаленска. У XII ст. Ноўгарад залежаў ад Смаленска ў эканамічных адносінах. Ноўгарад атрымліваў патрэбнае для сябе збожжа са Смаленска. Расціславу ўдалося асталяваць у Ноўгарадзе свой уплыў, пасадзіўшы там сваіх сыноў — Святаслава і Давыда. Палітыка князя Расціслава дала дадатныя вынікі. Ні адзін з суседзяў не з'яўляўся небяспечным для Смаленскае зямлі. Захват Віцебска, ставячы Полацкую зямлю ў залежнасць ад Смаленскай зямлі, аддаваў у распараджэнне апошняй гандлёвы шлях з Захаду на Усход. Расціслаў, пакінуўшы Смаленск дзеля Кіева, пасадзіў у Смаленску свайго сына Рамана (1159—1181). Палітычная еднасць Смаленскае зямлі захавалася і па смерці Расціслава (1168). Яго сыны не атрымалі надзелаў у Смаленскай зямлі. Князь Раман стараўся трымаць Кіеў у палітычнай ад сябе залежнасці. Калі кіеўскі пасад захапіў Мсціслаў Ізяславіч, то князь Раман прыняў удзел у экспедыцыі Андрэя Багалюбскага супроць Кіева (1169). Стаўшы вялікім князем, князь Раман пачуў сваю залежнасць ад Андрэя Суздальскага. Пад уплывам пагроз з боку суздальскага князя князь Раман быў прымушаны пакінуць кіеўскі пасад. Іншыя Расціславічы перасталі слухацца князя Андрэя. Барацьба поўначы з поўднем рабілася няўхільнай. У ёй быў прымушаны прыняць удзел і Раман Смаленскі. У Расціславічаў не было сіл змагацца з такой моцнай кааліцыяй, і яны пакінулі Кіеў. Калі Андрэй быў забіты ва Уладзіміры, то Раман ізноў забраў Кіеў і паспяшыў захапіць кіеўскі пасад, але ўтрымацца на ім не патрапіў. Раман быў прымушаны вярнуцца ў свой Смаленск, адкуль насяленне выгнала яго сына Яраполка і запрасіла яго дзядзьку Мсціслава Ізяславіча. Цікавячыся больш Кіевам, чымся Смаленскам, князь Раман сваёй палітыкай дапамагаў умацаванню народнага веча, ад якога і Раман, і яго сын выносілі шмат «прыкрасцей». Князь Давыд

Расціславіч (1180—1197) усю ўвагу звярнуў на Кіеў, дзе сядзеў вялікі князь Святаслаў Усеваладавіч Чарнігаўскі. Спачатку барацьба за Кіеў закончылася для Давыда няўдачна. Толькі тады, калі князь Давыд завязаў блізкія зносіны з Усеваладам Юр'евічам, ён мог распачаць барацьбу з чарнігаўскімі князямі, захапіўшымі кіеўскі пасад, і ўмацавацца ў Кіеве, аддаўшы апошні свайму брату Рурыку. Барацьба з чарнігаўскімі князямі за Кіеў прымушала смаленскіх князёў трымацца збоку ад барацьбы з полаўцамі. Апошнія беспасярэдна не пагражалі Смаленску. Тым часам іх напады на Чарнігаўскую зямлю аслаблялі яе князёў і гэтым самым былі на руку смаленскім Расціславічам. У 1185 г. смаленскае войска адмовілася ісці на полаўцаў і вярнулася назад дамоў разам са сваім князем. Смаленская зямля, падпаўшы пад уплыў ростава-суздальскіх князёў, утраціла свой уплыў і ў Ноўгарадскай зямлі, на якую рабіў моцны націск Усевалад Юр'евіч. Дынастычная палітыка Давыда Расціславіча прывяла да таго, што смаленскі князь утраціў уплыў і ў Полацкай зямлі. Святаслаў Усеваладавіч Чарнігаўскі завязаў зносіны з групай полацкіх удзельных князёў. На баку Давыда застаўся толькі друцкі князь (1186). Пры такіх суадносінах сіл Полацкая зямля была ўтрачана для Давыда. Але ў 1196 г. уплыў Смаленска ў Полацкай зямлі часткай аднавіўся. Віцебск зноў адышоў да Смаленскае зямлі. Трымаючы ў сваіх руках вышнявіны Заходняй Дзвіны, смаленскі князь меў поўную магчымасць выяўляць свой уплыў і на сярэдні бег Заходняй Дзвіны.

**Аднаўленне палітычнага аўтарытэту Смаленскае зямлі.** З канца XII ст. Смаленская зямля паволі аднаўляе ўтрачанае палітычнае становішча. Князям Мсціславу Раманавічу (1197—1214) і Усеваладу Рурыкавічу (1214—1219) удалося перамагчы суздальскую партыю і падняць свой уплыў. Мсціславу Раманавічу ўдалося падчыніць сабе Кіеў, дзе ён і застаўся. Дамовая вайна ў князёўскай сям'і, якая распачалася пасля смерці Усевалада Юр'евіча (1216), дазволіла вызваліць Ноўгарад і Смаленскую зямлю з-пад уплыву суздальскіх князёў. Смаленскія князі становяцца галоўнымі абаронцамі Ноўгарада ў яго барацьбе з немцамі і фінамі. Палітычнае пяршынства перайшло да Смаленска. Нарэшце Мсціслаў Давыдавіч (1219—1230) зрабіў пачатак новай палітыцы смаленскіх князёў. Яго цікавілі толькі справы Смаленскай зямлі. Умацаваўшаяся Літва робіць напады на Смаленск, разбівае купцоў і нарушае правіловы гандаль. Літоўскаму націску падлягала і Полацкая зямля, тэрыторыя якой зменшылася пад уплывам немцаў, што аселі ля вусця Заходняй Дзвіны. У 1215 г. сам Мсціслаў Давыдавіч наведаўся ў Полацкую зямлю і выратаваў яе ад нямецкіх нападаў. Канечнасць абароны гандлёвых шляхоў прымушала смаленскіх князёў прыняць чынны ўдзел у барацьбе з немцамі і гэтым самым аблегчыць цяжкае становішча Полацкае зямлі. Смаленскія князі энергічна падтрымліваюць гэтаксама Пскоў і Ноўгарад у іх барацьбе з немцамі. Літоўска-нямецкія напады аслабілі Полацкую зямлю. З стратэгічнага боку аслабленне апошняй было вельмі небяспечным і для Ноўгарада, і для Смаленска. Гэта прымусіла Мсціслава Давыдавіча прыняць самыя рашучыя крокі. Смальняне ў 1229 г. узялі По-

лацк, дзе быў пасаджаны князем Святаслаў Мсціславіч. З гэтага моманту палітыка полацкіх і смаленскіх князёў, пакіраваная супроць немцаў, становіцца супольнай. Уся гандлёвая палітыка дыктуецца выключна адным смаленскім князем. Яго загады абавязковыя і для Полацка, і для Віцебска.

**Заняпад Смаленскае зямлі.** Унутраныя няладзіцы, якія пачаліся пасля смерці Мсціслава Давыдавіча, прычыніліся да палітычнага аслаблення Смаленскае зямлі. Святаславу Мсціславічу, што княжыў у Полацку, удалося супроць жадання народнага веча заняць Смаленск. Апіраючыся на прыйшоўшых з ім палачан, Святаслаў гаспадарыў у Смаленску як хацеў. Полацк паспеў выкарыстаць такое становішча і выдзеліцца. Літва ў далейшым цягу рабіла набегі. Нейкаму літоўскаму князю ўдалося нават захапіць Смаленск, які быў вызвалены ў 1239 г. Яраславам Усеваладавічам. Умяшанне апошняга ў смаленскія справы прывяло да таго, што партыі, якія змагаліся ў Смаленску, пагадзіліся. На княжы пасад быў пасаджаны брат Святаслава Усевалад, а затым вялікакняскі пасад перайшоў да Расціслава Мсціславіча, у сям'і якога ён захаваўся аж да самага канца смаленскае незалежнасці. Няладзіцы ў Смаленску прывялі да таго, што Расціславічы ўтрацілі Ноўгарад. Пасля смерці Расціслава Мсціславіча Смаленская зямля дзеліцца паміж яго трыма сынамі — Глебам, Міхайлам і Тодарам. Пачынаецца ў Смаленску ўдзельная сістэма: Глеб і Міхайла выдзелілі Тодару Мажайскі ўдзел, рэшту тэрыторыі падзялілі між сабою.

**Смаленск і татары.** Смаленск ухіліўся ад татарскага пагрому, хаця ў 1242 г. татары і зрабілі спробу захапіць Смаленск. У 1274 г. смаленскі князь падлягае загадам татарскага хана і разам з іншымі князямі адпраўляецца на Літву. У Смаленску жывуць татарскія чыноўнікі, якія грабяць і здзекваюцца над насяленнем. Але нямецкія купцы былі свабодны ад усякіх пастояў, якія адводзіліся для прыезджых у дамах купцоў. Захват Ростава-Суздальскае Русі татарамі і эканамічнае зруйнаванне апошняй цяжка адгукнуліся на загранічным гандлі. Гандлёвыя сувязі з Усходам павінны былі спыніцца. Набегі ліцвінаў перашкаджалі прыязджаць у Смаленск загранічным купцам. Гандаль скараціўся. Выдзелены Мажайскі ўдзел па свайму геаграфічнаму палажэнню выразна цягнуўся да Паваложжа і быў далучаны да Маскоўскага княства пры Юрыю Данілавічу. У канцы XIII ст. выдзяляецца асобны Вяземскі ўдзел. Дарагабуж і Бранск, які адышоў ад Чарнігава-Северскай зямлі, імкнецца да свабоды ў сваім унутраным кіраўніцтве. Літва робіць на Смаленск лютыя набегі. У Смаленску ўтварыліся партыі — маскоўская і літоўская, якія змагаліся паміж сабой. Гэта барацьба аслабляла Смаленск і паступова падрыхтоўвала грунт да заняпаду яго палітычнае незалежнасці і да пераходу пад уладу Літвы (1404), калі Полацка-Віцебская зямля ўжо ўвайшла ў склад новае Літоўскае дзяржавы.

**Смаленск.** Цэнтральным пунктам усёй зямлі быў Смаленск, які ў XIII ст. дасягнуў поўнага росквіту. Смаленск быў цэнтрам для прыязджаўшых сюды балгарскіх, хазарскіх, персідскіх, а затым і нямецкіх купцоў. Ён быў абгароджаны даволі высокім земляным валам з частаколам наверсе. Непраходныя

**Радаводная табліца смаленскіх князёў**




густыя лясы акружалі Смаленск. Горад дзяліўся на чатыры канцы, з якіх вядомы толькі два: Пятніцкі і Кліраханскі. Канцы дзяліліся на вуліцы і ў адміністрацыйных адносінах складалі паасобныя самастойныя грамады са сваімі старастамі і соцкімі, з канчанскім і вулічанскім вечам. У горадзе было некалькі прыгожых цэркваў: Іаана Багаслова і Архангела Міхаіла, аздобленых золатам і срэбрам і рознымі каштоўнасцямі, хараство якіх задзіўляла чужаземцаў. У царкве Успення перахоўваліся ўзоравыя вагі і гіры. Насяленне горада выступала на вайну пад кіраўніцтвам выбранага зямлёй тысяцкага. Вядомы і імёны іх: Унуць — пры Расціславу, Радзіла — пры Давыду і Міхалка (1195 г.). На рацэ Смядыні, прытоцы Дняпра, была пабудавана гандлёвая прыстань, дзе спыняліся тутэйшыя і заграннічныя купцы. У XII ст. у горадзе налічвалася да 35 000 насялення. Вялікая колькасць цэркваў і князёўскіх палацаў, мноства гасцінных двароў, крам і магазінаў, як тутэйшых, так і заграннічных, плаваючыя ўзад і ўперад судны, фруктовыя сады і гароды па ўскрайках горада — з'яўляліся не толькі паказчыкамі жыцця вялікага горада, але і прыдавалі Смаленску надзвычай прыгожы выгляд.

**Гісторыя Тураўскай зямлі.** Вячаслаў Уладзіміравіч сядзеў у Тураве ў працягу ўсяго княжэння брата Мсціслава. Калі ж на кіеўскі пасад сеў Яраполк, у Тураў быў пасланы Ізяслаў Мсціславіч, выведзены з Полацка, а Вячаслаў быў пераведзены ў Пераяслаў, дзе прыходзілася праяўляць нямала энергіі ў барацьбе з полаўцамі. Вячаслаў пакінуў Пераяслаў і апынуўся ў больш спакойным

Тураве, адкуль яму ўдалося прагнаць свайго пляменніка. Калі памёр Яраполк, Вячаслаў зрабіў спробу заняць кіеўскі пасад, але гэта яму не ўдалося. Усевалад Ольгавіч запрапанаваў яму вярнуцца ў свой Тураў. Але, стараючыся заакругліць свае ўладанні, Усевалад прагнаў Вячаслава з Турава ў Пераяслаў. У 1142 г. Вячаслаў зноў апынуўся ў Тураве, а Ізяслаў Мсціславіч атрымаў Пераяслаў. Пасля загубы Ігара Ольгавіча ў Кіеве часова асталяваўся Ізяслаў Мсціславіч. Тады Вячаслаў за нарадай баяр і біскупа пачаў далучаць да свайго Турава адабраныя ў яго гарады: Рагачоў, Бярэсце, Клечаск. Быў захоплены нават Уладзімір-Валынск. Тады Ізяслаў Мсціславіч у саюзе з Расціславам Смаленскім пайшоў на Тураў і, забраўшы яго, пасадзіў там свайго сына Яраслава. Калі ж Вячаслаў пры дапамозе Ізяслава Мсціславіча заняў кіеўскі пасад, то Тураў зноў папаў пад яго ўладу. Калі кіеўскі пасад быў захоплены Юрыем Даўгарукім, то ў Тураў быў пасланы яго сын Барыс; а калі пасля смерці Юрыя кіеўскім князем стаў Ізяслаў Давыдавіч Чарнігаўскі (1158), то Тураў быў захоплены Юрыем Яраславічам, унукам Святаполка Другога, які раней валодаў вышнявінамі Прыпяці і .Бярэсцем. Гэткім чынам да паловы XII ст. у Тураўскай зямлі не ўтварылася асобнае княжае дынастыі. Тураўскія землі праз увесь час знаходзяцца ў сферы ўплыву кіеўскіх князёў. Калі Юры Яраславіч захапіў Тураў, то ён меў намер замацаваць яго за сабою, у чым яму йшло насустрэч і насяленне зямлі. Яму ўдалося вытрымаць аблогу Ізяслава Давыдавіча. Расціслаў Мсціславіч, заняўшы кіеўскі пасад, у саюзе з уладзіміра-валынскімі князямі гэтаксама напаў на Тураў, але забраць яго не ўдалося. Расціславу прыйшлося пагадзіцца з Юрыем Тураўскім (1162). Гэткім чынам ва ўпартай барацьбе Тураўская зямля здабыла сабе поўную незалежнасць. Безупынная змена князёў Тураўскай зямлі сведчыць аб слабасці зямлі, аб адсутнасці энергіі і сілы бараніць сваю палітычную незалежнасць. Па смерці Юрыя Тураўскага зямля дзеліцца на ўдзелы паміж сынамі: Святаполкам, Глебам, Іванам, Яраславам і Яраполкам. Вялікім князем быў Святаполк. Спаміж удзелаў найбольш значнымі былі: Пінскі, Тураўскі, Дуброўніцкі. З'яўляючыся прадстаўнікамі самастойнай краіны, турава-пінскія князі імкнуліся падтрымліваць добрыя адносіны з тымі, хто ў даны момант іграў першую палітычную роль. Пад уплывам літоўскіх нападаў турава-пінскія князі збліжаюцца з галіцка-валынскімі і паступова падпадаюць іх уладзе. У 1248 г. ліцвіны заваявалі ўсю Пінскую зямлю і не раз давалі адчуваць ёй сваю сілу. У саюзе з галіцка-валынскімі князямі турава-пінскія князі адказвалі гэткімі ж нападамі на Літву. Падлегласць Турава-Пінскай зямлі ў выпадку палітычнага ўмацавання Літвы была няўнікнёнай.

**Полацкая зямля.** Агульныя палітычныя ўмовы моцна змяніліся к таму часу, калі полацкія князі вярнуліся з грэцкага палону. Аслабленыя патомкі Усяслава не маглі цяпер весці ніякай агрэсіўнай палітыкі. Яны стараліся падтрымліваць прыязныя адносіны з тымі дынастычнымі партыямі — Манамахавічамі і Ольгавічамі, паміж якімі вялася безупынная барацьба за Кіеў спрэс да таго моманту, калі Кіеў утраціў ранейшае эканамічнае і палітычнае значэнне. Калі

полацкія князі адмовіліся ад сваіх агрэсіўных намераў у стасунку да Кіева з прычыны склаўшыхся новых умоў і адносін, то ўсё-ткі гэта ніколькі не палепшыла тае палітычнае знадворнае сітуацыі, у якой прыходзілася жыць Полацкай зямлі. Заняпад Кіева пацягнуў за сабою эканамічны і палітычны ўзрост Смаленскай зямлі. Князі апошняй, пільнуючы гандлёвых шляхоў, з аднаго боку, уважна сочаць за тым, што адбываецца па суседстве ў Кіеве, з другога боку — яны стараюцца падчыніць свайму ўплыву ўсю Полацкую зямлю, праз якую па рацэ Заходняй Дзвіне праходзіў рэчны гандлёвы шлях да Балтыйскага мора. Пераход да Смаленска Воршы і Копыся сведчыў аб тым, што Смаленская зямля ўзмацняецца, а Полацкая хіліцца да палітычнага заняпаду. І пасля таго як полацкія князі вярнуліся, палітычнага аб'яднання зямлі не адбылося. Полацкая зямля раздзялілася на ўдзелы, спаміж якіх найбольшае значэнне маюць Полацкі і Менскі. Паміж уладарамі ўдзелаў пачалася барацьба, у якой чынны ўдзел прымала і насяленне зямлі. У гэтай грамадзянскай барацьбе князі шукалі саюзнікаў на баку. Рагвалод Барысавіч Полацкі, выгнаны ў Менск палачанамі (1151), якія заклікалі Расціслава Глебавіча Менскага, шукаў падтрымання ў смаленскага князя Расціслава і Святаслава Ольгавіча Чарнігаўскага. Рагвалоду ўдалося зарганізаваць у Полацку спрыяючую яму партыю. Палачане зноў запрасілі яго на пасад. Пры гэтым было дадзена абяцанне забыцца аб усім мінулым. Рагвалод пачаў сваё княжэнне з таго, што аднавіў барацьбу супроць Расціслава Глебавіча і яго братоў. Аднак захапіць Менск і аб'яднаць пад сваёй уладаю князю Рагвалоду не ўдалося. Сілы абодвух змагаючыхся бакоў былі аднолькавыя. Саюзнікі Рагвалода мала дапамагалі яму. Ваенныя ўмовы прычыніліся да таго, што была ўтворана варожая Рагвалоду партыя, якая і прагнала яго з Полацка. Палачане, жадаючы спынення грамадзянскай вайны, выбралі князем Усяслава Васільковіча Віцебскага, які знаходзіўся пад пратэктаратам смаленскіх князёў. З прыходам Усяслава ў Полацк Віцебск адышоў да Смаленскае зямлі (1165) і быў аддадзены Давыду Расціславічу. Палітычнае бяссілле Усяслава, які трымаўся толькі на Смаленску, заахвоціла Валадара Глебавіча падняць супроць яго рух. Барацьба закончылася ўдачна[1]. Усяслаў павінен быў уцякаць да Давыда[2], але ненадоўга. Давыд хутка пасадзіў назад у Полацк свайго пасадніка. Саюз са смаленскімі князямі ўцягвае Полацкую зямлю ў сферу смаленскае замежнае палітыкі. Полацку прыходзілася прымаць удзел у барацьбе Рамана Расціславіча за Ноўгарад. Полацкай зямлі прыйшлося вытрымаць наступленне Ноўгарада на чале з Раманам Мсціславічам, якому Полацк не мог даць ніякага адпору. Аднак удзел Полацка ў кааліцыях супроць Ноўгарада прыпыняў ноўгарадскі гандаль. Гэткая палітыка не магла быць падаравана Полацку. Толькі энергічная абарона з боку Рамана Смаленскага выратавала Полацк ад загубы (1178). Полацкая зямля вызваляецца з-пад уплыву Смаленскае зямлі дзякуючы зацікаўленасці Давыда Расціславіча кіеўскімі справамі. По-

[1] 1167 г.

[2] Давыд Расціславіч, князь віцебскі.




лацкія князі кіруюцца на прыхільнікаў смаленскіх князёў Ольгавічаў Чарнігаўскіх. Арыентацыя на Чарнігаў дала нікчэмныя практычныя вынікі. Аднак Давыду ўдалося хутка аднавіць свой уплыў у Полацкай зямлі, захапіўшы Віцебск і вышнявіны Заходняй Дзвіны. З канца XII ст. становішча Полацкае зямлі робіцца вельмі цяжкім з прычыны націску, які прыходзіцца пераносіць з боку немцаў і ліцвінаў. Поўная немагчымасць весці барацьбу ўласнымі сіламі і супольныя гандлёвыя інтарэсы са Смаленскай зямлёй прычыніліся да таго, што Полацк быў захоплен Мсціславам Давыдавічам (1222). Полацкая зямля падпала пад поўны пратэктарат Смаленска, і толькі палітычны заняпад апошняга даў магчымасць Полацкай зямлі вызваліцца ад Смаленска. Аднак узнаўленне незалежнасці не ўзмацніла становішча Полацка. Націскі немцаў і Літвы, няладзіца паміж князямі падрывалі самастойнае існаванне Полацкае зямлі.

**Чужаземцы і палачане.** Ніжні бег Заходняй Дзвіны, які быў заняты літоўскімі і латышскімі плямённямі — летголай па правым беразе Заходняй Дзвіны, курпамі — на паўвостраве паміж Балтыйскім морам і Рыжскаю затокай, фінскімі плямённямі — лівамі на захад і эстамі на поўнач ад летголы, — знаходзіўся ў сферы ўплыву полацкіх князёў. Насяленне плаціла дань і дастарчала князям дапаможнае войска. Полацкія князі пабудавалі ў зямлі латышоў і ліваў крэпасці Кукенойс і Герцыку, у якіх знаходзіліся полацкія залогі. Адносіны з тубыльцамі былі добрыя. Полацкі ўплыў не сустракаў актыўнага адпору. Гэтак цягнулася да канца XII ст., калі ў палачан з'явіўся новы вораг — немцы.

**Немцы.** Вусце Заходняй Дзвіны было гандлёвым шляхам для палачан, падзвінскіх латышоў і купцоў з горада Вісбі на Готландзе. У 1158 г. любецкія купцы вынайшлі вусце Заходняй Дзвіны. Крыху пазней (1186) манах Аўгустынскага закона[1] — канонік Мэйнгард накіраваўся ў новую краіну, каб пашыраць хрысціянства паміж тубыльцамі-паганцамі. Місіянерства закончылася

[1] Слова «закон» ужываецца У. І. Пічэтам у значэнні «ордэн».

няўдачай, але сам Мэйнгард атрымаў годнасць біскупа Лівоніі. Яго заступнік абат Гертольд, стаўшы біскупам, пачаў шырока ўжываць збройнае сілы, але ў адной з боек з тубыльцамі быў забіты (1197). Яго месца было занята Альбертам, канонікам брэменскім, які гэтаксама атрымаў біскупскую годнасць. Ён сабраў на востраве Готланд каля 500 ваяк і на 30 караблях прыбыў у красавіку 1200 г. да берагоў Заходняй Дзвіны. У 1201 г. на рацэ Рызе, рукаве Заходняй Дзвіны, быў закладзены горад Рыга, які разросся з месца, прызначанага для рынку. Рознымі прывілеямі біскуп прыцягваў сюды новых каланістаў, якія шукалі гандлёвых выгоднасцей у гандлі з мясцовым насяленнем. У 1202 г. быў заснаваны Закон братоў войска Хрыстовага, тае пастаяннае вайсковае сілы, на якую біскуп мог аперціся ў сваёй чыннасці. Закон падлягаў беспасярэдна біскупу. Азнакай прыналежнасці да новага Закона быў белы плашч з чырвоным крыжам і чырвоным мячом на левым плячы. Гэтак заснаваўся Лівонскі закон. Біскупскія казальнікі пранікалі ў глыб краіны ліваў і латышоў і пры дапамозе рыцараў наварочвалі апошніх да хрысціянства, не ганьбуючы ніякімі сродкамі. Але яны спатыкалі моцны адпор з боку латышоў і саюзных з імі полацкіх князёў. Крыху пазней паміж Нёманам і Віслай асталяваўся Тэўтонскі закон, які быў утвораны па ініцыятыве Конрада — князя мазавецкага для барацьбы з прусакамі, з якімі ён сам справіцца не меў магчымасці. Гэта дазволіла Тэўтонскаму закону думаць аб заваяваннях для сябе. Суседства з тэўтонамі мела вялікае значэнне для мечаносцаў. Палітычнае ўмацаванне мечаносцаў выклікала непрыязныя адносіны паміж Лівонскім касцёлам і Законам. Магістр стараўся падчыніць сабе Лівонскі касцёл. Не адчуваючы сябе даволі сільным, магістр распачаў перагаворы з гэтае прычыны з Тэўтонскім законам, просячы ў яго дапамогі, але гэта не дало пажаданых вынікаў. Толькі ў 1237 г., калі мечаносцы на зваротным шляху пасля свайго пераможнага паходу на Літву былі разбіты ліцвінамі і земіголамі, а адначасна з гэтым выбухла паўстанне жмудзінаў і куронаў, — адбылося аб'яднанне двух Законаў у адзін. Паўстанне літоўскіх пляменняў пагражала Закону поўным знішчэннем. Каталіцкія біскупы — рыжскі, дэрпцкі і эзельскі — звярнуліся да папы з просьбай даць згоду на аб'яднанне абодвух Законаў. Пад уплывам небяспекі папа даў на гэта сваю згоду.

**Палачане і немцы.** Захват вусця Заходняй Дзвіны немцамі ўтварыў для Полацкае зямлі паважныя эканамічныя перашкоды. Далейшая агрэсіўная палітыка з боку Закона мечаносцаў прывяла да стычкі яго з полацкімі князямі. Пачалася ўпартая і працяжная барацьба, але вынік яе быў няўдачны для палачан. Яны ўтрацілі свае калоніі ў краіне латышоў. Нават пратэктарат Смаленска не даў ніякае карысці. Полацкая і Смаленская землі, утраціўшыя сваю палітычную еднасць, не мелі сілы справіцца з тэхнічна лепш узброенымі і палітычна аб'яднанымі рыцарамі. Але саюз Полацка і Смаленска спыніў націск немцаў, аслабіў іх ваенную сілу і гэтым самым захаваў беларускія землі ад пагражаўшай германізацыі.

## 2. НАРОДНАЯ ГАСПАДАРКА

**Агульны характар гаспадаркі.** Прыродныя ўмовы беларускіх зямель спрыялі развіццю працоўнае энергіі ў насялення, хаця гэтае спрыянне было неаднолькавым у Полацкай і Тураўскай землях з аднаго боку і ў Смаленскай — з другога. Выгоднае геаграфічнае палажэнне мела вялікае значэнне для развіцця гандлю, які, у свой чарод, рабіў вялікі ўплыў на развіццё народнае гаспадаркі наогул. Гандаль у XI—XIII стст. з'яўляўся галоўным нервам у народнай гаспадарцы Беларусі. Яго становішча рабіла вялікі ўплыў на палітычны стан тае або іншае з беларускіх краін.

**Сельская гаспадарка.** Ральніцтва з'яўляецца старадаўнім заняткам усіх славян у эпоху да рассялення. Яно захавала сваё важнае значэнне і пасля каланізацыі, хаця атрымала далёка не аднолькавае распаўсюджанне. Прыродныя ўмовы Полацкае зямлі мала спрыялі развіццю ральніцтва. Магчымасць даставаць збожжа з Рыгі гэтаксама прыпыняла якасны і колькасны ўзрост ральніцтва. Попыт на хмель як на прадмет вывазу спрыяў развіццю хмелеводства. Выгаднейшымі для развіцця сельскае гаспадаркі былі ўмовы ў Смаленскай зямлі. Тут з даўных-давён сеялася жыта, пшаніца, ячмень, гарох, разводзілася капуста, хмель, лён, каноплі. Капуста, гуркі і буракі, культура якіх распаўсюдзілася ў Полацкай зямлі са Смаленска, былі запазычаны з Візантыі. Гандлёвыя зносіны з волжскімі балгарамі далі магчымасць атрымліваць і разводзіць грыку. У Смаленскай зямлі было значна пашырана садоўніцтва і гародніцтва. Сам Смаленск быў вельмі багаты садамі і гародамі. Полацкая зямля была бедная рагатай жывёлай і коньмі. Смаленская зямля пры адсутнасці рагатае жывёлы была багатая авечкамі і коньмі, якія набываліся ў вандроўнікаў. Віцябляне куплялі іх у смальнян. Каніна ўжывалася і дзеля яды. Тэхніка сельскае гаспадаркі была нізкая: панавала падсечная сістэма, але расчыстка лесу і меліярацыя балот пасоўвалася гэтак паспешна, што Смаленск вывозіў збожжа ў Рыгу, Ноўгарад і Полацкую зямлю. З прычыны нізкай тэхнікі і кліматычных умоў у Смаленскую зямлю часта наведваўся голад. Гэтак, быў голад паміж 1215—1220 гг., калі з прычыны засушша сады і нівы пазасыхалі. Але самым цяжкім часам быў двухлетні голад пасля Калкскага разгрому. У Смаленску памерла ад голаду да 30 тысяч чалавек. Паводле слоў летапісца, насяленне ўжывала чалавечае мяса, карысталася трупамі, ела каніну, сабачыну і кацячыну, а гэтаксама мох, сасну, крэйду, лісце. У гэты цяжкі момант «прыбыша немцы з-за морья с жытам і с мукою многа добра сотворіша». Адначасна з голадам пашыралася пошасць. Падобліва, голад і мор не раз наведваліся і ў Полацкую зямлю.

**Здабывальная прамысловасць.** Беларусь, багатая лясамі, давала шырокую магчымасць для заняткаў пчалярствам, прадукты якога паступалі на замежны рынак. У Смаленску было пашырана смалярства. Дзякуючы багаццю ў лясах розных звяроў насяленне займалася зверaлоўствам, прадукты якога паступалі гэтаксама на замежны рынак. У Смаленскай зямлі быў вялікі попыт на бабровыя футры, якія адсылаліся за граніцу. Для ўнутранай прадукцыі ў Беларусі было развіта рыбацтва і лоўля птушак, асабліва цецерукоў.

**Апрацоўчая прамысловасць.** Аб тым, ці мела месца ў Полацкай зямлі апрацоўчая прамысловасць, няма ніякіх даных. Апрацоўка прадуктаў прызначалася для ўнутранага спажыцця, калі не лічыць апрацоўкі фініфці ў Полацку. У смаленскіх курганах знаходзіцца многа рэчаў чужаземнага пахаджэння. Але і ўласная прамысловасць дала значныя вынікі. У XII ст. быў распаўсюджаны выраб жалезных і медных рэчаў: вагаў, гір, званоў, – які пашырыўся пад уплывам замежных майстроў. Катляры і кавалі выраблялі пікі, мячы, шчыты, кальчугі, шоламы, наканечнікі стрэл. Значна быў пашыраны саматужны выраб абрусоў, карунак, а гэтаксама палатняных тканін. Гэтым займаліся пераважна жанчыны. У XIII ст. смальняне ўмелі плавіць золата і серабро.

**Візантыйскі гандаль.** Развіццё гандлю з Візантыяй у XI–XIII стст. спатыкала сур'ёзныя перашкоды з тае прычыны, што стэпы былі заняты вандроўнікамі. З моманту татарскага найсця і пасля захвату Канстанцінопаля крыжакамі адпраўленне гандлёвых караванаў на поўдзень па Дняпры стала зусім немагчымым. Распачаўся заняпад гандлю. Кіеў утраціў сваё эканамічнае і палітычнае значэнне, але на Смаленску заняпад візантыйскага гандлю адгукнуўся карысна. Распачаў развівацца гандаль з Захадам, вынікам чаго з'яўляецца эканамічны і палітычны росквіт Смаленска. Прадметы вывазу і ўвозу былі тыя самыя, што і ў папярэднія эпохі, далучаючы сюды прадметы царкоўныя: царкоўнае начынне, свяшчэнныя вопраткі, абразы, ладан, грэцкія кубкі, мармур, фарбы, фініфць. На апошнюю быў асаблівы попыт, бо ёю аздабляліся абразы ў Смаленску і іншых гарадах. З Грэцыі прыязджалі гэтаксама майстры і архітэктары дзеля будавання мураваных цэркваў.

**Гандаль з Усходам.** Гандаль Смаленска з Паваложжам па гандлёвых шляхах праз Сож і Дзясну дасягнуў значнага пашырэння. Гандаль меў караванны характар. Удзельнікі арганізоўвалі таварыствы з супольным капіталам. Караваны ахоўваліся ўзброенымі людзямі. Смальняне прывозілі на продаж футры: саболлі, вавёрчыны, кунічыны, гарнастаевы, лісічыны, бабровыя, заяччы, козі скуры, рыб'і зубы, бабровую струю, юхць, авец, рагатую жывёлу, бурштын, кальчугі, арэхі, бярозавы лес, мёд, воск, нявольніц. Зброя перакуплялася ў скандынаваў, а бурштын у ліцвінаў. Балгары ў неўраджайныя для Полацкай і Смаленскай зямель гады прадавалі ў вялікай колькасці збожжа, а гэтаксама мускус, а звычайна – камфару, карыцу, паўднёвыя фрукты, баўняныя тканіны, жаночыя ўбёры і каштоўныя каменні: шмарагд, рубін, туркус і жомчуг. Тварнай менавой манетай з'яўлялася арабская дырхема. Пасярэднікамі ва ўсходнім гандлі былі яўрэі, якія жылі ў XII ст. у Смаленску. Дзякуючы гандлю яны патрапілі сабраць вялікую колькасць залатых і срэбных манет. Беспасярэдні гандаль з арабска-мусульманскім светам спыніўся ў XI ст. Балгары з'яўляліся пасярэднікамі паміж Еўропай і Азіяй. Паходы кіеўскіх князёў на «булгар» у XI–XII стст. прычынілі вялікую шкоду ўсходняму гандлю, але зусім яго не прыпынілі. Гандаль Смаленска з балгарамі фактычна спыніўся толькі ў палове XIII ст. з часоў найсця татар.

**Гандаль з Захадам.** Заходні гандаль для Полацка і Смаленска заўсёды меў нязмерна важнае значэнне. Але ён стаў пераважным з таго моманту, калі распачаўся заняпад дняпроўска-візантыйскага гандлю. Грашовыя скарбы, якія спатыкаюцца на тэрыторыі Полацкае зямлі, сведчаць аб развіцці гандлю з Скандынавіяй і Готландам. Калі немцы захапілі вусце Заходняй Дзвіны, гандлёвыя зносіны часова прыпыніліся, але энергічныя немцы пасляшылі іх зноў наладзіць. Ужо ў канцы XII ст. нямецкія купцы паяўляюцца ў Полацку і Смаленску. Барацьба палачан з немцамі не магла не перашкаджаць гандлю па Заходняй Дзвіне. З гэтае прычыны немцы стараліся заключыць з палачанамі гандлёвыя дамовы. Ужо ў 1210 г. была завязана гандлёвая дамова паміж Рыгай і Полацкам, быць можа, пры ўдзеле Віцебска і Смаленска. Калі Полацк папаў пад пратэктарат Смаленска, то пры ўдзеле смальнян, псковічаў і ноўгарадцаў зноў была зроблена спроба прагнаць засеўшых ля вусця Заходняй Дзвіны немцаў. Пачатак вайны быў вельмі ўдачны, але Калкскі пагром прымусіў як найхутчэй распачаць мірныя перагаворы. У 1229 г. Мсціслаў Давыдавіч Смаленскі паслаў у Рыгу і на Готланд «умна мужа Пантелея і своего лучшего попа Еремея» для завязання гандлёвае дамовы з немцамі. Дамова была завязана ад імя Мсціслава і ад імя полацкага і віцебскага князёў. Гандлёвая дамова пералічае пункты, з якімі Полацк, Віцебск і Смаленск мелі гандлёвыя сувязі: Рыга, востраў Готланд, Любек, Сест, Мюнстар, Грунінген, Дортмунд і Брэмен. Падобліва, тут у дамове пералічаны не ўсе пункты, з якімі прыдзвінскія гарады мелі гандлёвыя сувязі. «Таргова Праўда»[1] ў 1229 г. змяшчае ў сабе пастанову адносна гандлю, грамадзянскага і крымінальнага права. Гандлёвыя адносіны грунтуюцца на прынцыпе ўзаемнасці і раўнапраўя старон, а гэтаксама бязмытнасці. Немцы атрымліваюць права вольнага праезду па Дзвіне ў Смаленск, а гэтаксама і па тэрыторыі Смаленскае зямлі. У XIII ст. нямецкія купцы паяўляюцца ў Суздалі, але татарскі пагром у 1237 г. спыніў гандлёвыя наезды немцаў у Суздаль. Галоўным цэнтрам гандлю для смальнян быў горад Рыга. У канцы XIII ст. тут жыло да 80 рускіх сямей, якія займалі асобную вуліцу і мелі ўласную царкву і больніцу. Рускія карысталіся ў Рызе ўсімі грамадзянскімі правамі. Аналагічным было становішча немцаў у Смаленску. Рускія мелі права карыстацца берагамі Заходняй Дзвіны і Балтыйскага і Нямецкага мораў для гандлю сваім таварам. Немцы карысталіся такімі ж правамі па Дзвіне і Дняпры. Немцы і смальняне карысталіся правам вырубаць будаўнічы лес для напраўкі суднаў, а калі ад вышнявін Заходняй Дзвіны немцы пераязджалі на конях, то карысталіся выганамі для іх. Немцы спыняліся ля вусця рэчкі Смядыні, каля Барыса-Глебскага манастыра, а адгэтуль тавары перавозіліся на нямецкі двор, дзе знаходзілася нямецкая кірха. Немцы прывозілі прадукты апрацоўчай прамысловасці: серабро і золата ў злітках, начынне, рукавіцы, палатно, сукно іпрскае і трырскае, шкарлат, панчохі, імбір, мігдал, вандзоную сёмгу, траску, салодкія віны, соль, а часамі і збожжа. Са Скандынавіі смальняне атрымлівалі

[1] Смаленская «Гандлёвая праўда».

простыя металы і зброю. Полацка-Смаленская зямля вывозіла: лес, жывёлу, скуру, смалу, каноплі, збожжа, мёд, воск, коней, сала, дзёгаць, хмель, абрусы і палотны саматужнага вырабу. Гандлёвыя зносіны Полацка і Смаленска па Дзвіне цягнуліся да пачатку XIV ст., калі яны зрабіліся моцна варожымі; але ўжо ў другой палове XIII ст. гандаль адбываўся з перашкодамі. Немцы рабавалі па дарозе полацкіх і смаленскіх купцоў. Гэтае самае рабілі, зразумела, палачане і смальняне ў адносінах да немцаў. Гандаль з немцамі меў вялікае культурнае значэнне, бо нямецкія купцы з'яўляліся праваднікамі заходнееўрапейскае цывілізацыі.

**Унутраны гандаль.** У звязку з замежным гандлем значна пашырыўся і ўнутраны гандаль. Выдатнае месца ў Смаленскай зямлі займала Вязьма і Дарагабуж. Цвер і Смаленск падтрымлівалі паміж сабой гандлёвыя зносіны. Цвер пасылаў усходнія тавары і коні, а Смаленск — заходнія тавары. Гандлёвыя зносіны з Ноўгарадам таксама былі пашыраны. Смаленск з'яўляўся галоўным дастарчальнікам збожжа, у якім заўсёды адчуваў патрэбу Ноўгарад. На тэрыторыі Смаленскай зямлі было многа паселішчаў і пагостаў, пабудаваных па рэчных шляхах прамысловага і гандлёвага характару, якія мелі значныя гандлёвыя звароты.

## 3. ГРАМАДСКІ ЎКЛАД

**Склад насялення.** Насяленне беларускіх краін складалася з элементаў: вольных, напаўвольных, нявольных і чужаземцаў. Вольныя людзі дзяліліся на некалькі груп. Кожная з іх адрознівалася адна ад другой не правамі і абавязкамі, а спецыяльнымі заняткамі і маёмасным станам. Але паміж вольнымі і нявольнымі, вольнымі і чужаземцамі заўважвалася істотная розніца ў правах.

**Вольнае насяленне.** Вольнае насяленне называлася «людіе», «мужы» і дзялілася на некалькі катэгорый. Да вышэйшае катэгорыі прыналежалі людзі блізкія да князя — яго дружына. Яна дзялілася на старэйшую і малодшую. Княжыя мужы і баяры складалі старэйшую дружыну князя. Малодшыя дружыннікі называліся «грід'ю», «отрокамі», «детскімі». Дружына служыла князю і была звязана толькі з ім. Калі ў 1151 г. палачане былі нездаволены сваім князем Рагвалодам Барысавічам і паслалі яго ў Менск, то яны зрабавалі маёмасць як князя, гэтак і яго дружыны. Калі ў 1158 г. Расціслаў Глебавіч пакінуў Полацкую зямлю, то разам з ім пайшла і яго дружына. Адпраўляючыся прынесці пакорнасць Уладзіміру Манамаху, які аблажыў Менск, князь Глеб ідзе «с детьмі і с дружыной». У такіх самых адносінах да князя знаходзіліся баяры і ў Смаленску. Яны прымаюць удзел у княжай думе, пацвярджаюць дагаворы, адпраўляюцца пасламі, назначаюцца прадстаўнікамі княжай улады па гарадах. Доступ у княжую дружыну быў адчынены для ўсіх жадаючых. Дзякуючы цесным сувязям Смаленска з Заходняй Еўропай у складзе княжай дружыны было шмат чужаземцаў. Малодшыя дружыннікі жылі пры княжым двары і звычай-

на выпаўнялі розныя дробныя даручэнні. У меру таго як князі асядалі на адным месцы, дружыннікі станавіліся землеўласнікамі і рабаўласнікамі. Земскія баяры, не ўваходзіўшыя ў склад княжай дружыны, называліся «огнішчанамі». Да сярэдняе катэгорыі адносіліся госці, купцы, гандляры. Дзякуючы гандлёвым сувязям з Заходняй Еўропай і багаццю смаленскія госці былі найбольш адукаванай групай смаленскага насялення. Смаленская «Тарговая Праўда» 1229 г. падрабязна вызначыла ўмовы дзеля гандлю і праўнае палажэнне чужаземцаў у Смаленскай, Полацкай і Віцебскай землях і купцоў гэтых жа зямель за граніцай. Займацца гандлем меў права кожны вольны чалавек. Ніжэйшую катэгорыю насялення складалі смерды і людзі. Першыя сядзелі на княжай зямлі, плацілі князю дань і былі абавязаны адбываць вайсковую павіннасць. Рэшта насялення называлася тапаграфічнымі іменнямі: палачане,ástручане, смальняне і г. д. Гэтыя людзі і складалі асаблівае гарадское і сельскае насяленне, якое карысталася правам унутранага самасправавання, але было звязана кругавою парукаю і адказнасцю за праступленні. Жыхары гарадоў займаліся рамёствамі і дробным гандлем. Жыхары сёл займаліся рознымі промысламі і ральніцтвам.

**Напаўвольныя.** Вольны чалавек, які зрабіў пазыку і прымушаны з гэтае прычыны жыць на дварэ свайго крэдытора аж да выплаты гэтае пазыкі, — называўся «закупом». Апошнімі маглі стаць і рабочыя-ральнікі, атрымаўшыя наперад сваю заработную плату, якую яны былі абавязаны адрабіць. Калі ўтвораныя абавязальныя адносіны канчаліся, канчаўся і стан закупніцтва.

**Нявольнае насяленне.** Яно азначаецца тэрмінамі: чэлядзь, халоп, раб. Крыніцы рабства былі наступныя: палон, самапродаж у рабства, шлюб з рабою без умовы, паступленне ў цівуны «без ряду», пахаджэнне ад нявольных бацькоў, уцёкі закупа ад свайго пана, праступленні і неаплачаны доўг, злоснае банкроцтва, шлюб вольных з халопамі. Гэтыя крыніцы рабства мелі месца на тэрыторыі ўсёй Кіеўскай дзяржавы. Крыніцы рабства ў Полацкай зямлі невыразныя, за выключэннем палонных. На існаванне рабства ў Смаленскай зямлі паказвае смаленская «Тарговая Праўда». У якасці адной з крыніц рабства яна адзначае «гнев князя на своего человека», злучаны з канфіскацыяй маёмасці і адданнем яго самога, жонкі і дзяцей у халопства. Рабы спачатку выпаўнялі розныя хатнія работы, а ў меры развіцця прыватнага ральніцтва складалі галоўную рабочую сілу землеўласнікаў.

**Праўнае палажэнне вольных.** Усе вольныя людзі карысталіся ўсёй паўнатою грамадзянскай праваздольнасці і ўласнавольнасці. Яны мелі права прад'яўляць іскі і адказваць па іх, выступаць на судзе ў якасці сведак, завязваць розныя грамадзянскія ўгоды, як то: дагавор, куплю і продаж, пазычкі, перадачу маёмасці на захаванне, права пакідаць тэстамент і права наследавання па законе. Але права наследавання баяр і людзей крыху адрозніваецца ад гэткага права смердаў, маёмасць якіх у выпадку бяздзетнасці смерда пераходзіць да князя, а незамужнія дочкі атрымліваюць толькі пасаг з маёмасці смерда.

**Праўнае палажэнне закупаў.** Закуп — вольны чалавек, які часова апынуўся ў залежных адносінах да крэдытора. Яго грамадзянская правадольнасць і ўласнавольнасць крыху абмяжованы. Закупы могуць выступаць сведкамі толькі «по нуже», але закупы маглі прад'яўляць іск супроць свайго крэдытора. Асоба закупа была абаронена ад адвольных пакаранняў. Крэдытор не мог перапрадаць закупа трэцяй асобе. У такім выпадку закуп звальняўся ад усялякіх абавязальных адносін у стасунку да свайго крэдытора. Закуп мог мець сваю маёмасць. За патайныя ўцёкі ад свайго крэдытора закуп перадаваўся ў поўнае халопства.

**Праўнае палажэнне халопаў.** Рабы не мелі ніякай грамадзянскай правадольнасці і ўласнавольнасці. Яны з'яўляюцца толькі аб'ектам права. Забойства раба сваім панам не падлягае ніякаму пакаранню. Але за забойства раба або рабыні пабочны чалавек выплачвае ўласніку адшкадаванне за правапарушэнне маёмасці. Беглы раб падлягае звароту да свайго ранейшага пана. Смаленская «Тарговая Праўда» (1229) крыху падымае асобу раба. Княжыя рабы могуць рабіць пазычковыя ўгоды з чужаземцамі. Гвалт, учынены чужаземцам над рабыняй, падлягае пакаранню. Вінаваты плаціць штраф у ліку «грівны серебра».

**Чужаземцы.** Полацк і Смаленск былі ажыўленымі гандлёвымі цэнтрамі, у якіх было шмат чужаземцаў, прышлых людзей з іншых мясцовасцей і з-за граніцы. Смаленская «Тарговая Праўда» 1229 г. азначае правы чужаземцаў у простым значэнні гэтага слова. Чужаземцы-купцы ў Полацку і Смаленску склалі асобную карпарацыю, карысталіся свабодай веравызнання і мелі сваю ўласную царкву. Крымінальныя ўчынкі, зробленыя чужаземцам у Полацку, перадаваліся для разгляду на месца замяшкання праступніка. У Смаленску і ў Віцебску падобныя справы разглядаліся самім князем. Смаленская «Тарговая Праўда» 1229 г. азначае ўзаемныя адносіны жыхароў беларускіх гарадоў і чужаземцаў як у справах грашова-гандлёвых, гэтак і ў жыццёва-бытавых адносінах, якія будуюцца на грунце поўнае роўнасці. Чужаземцы карыстаюцца правам ад'езду дамоў і правам гандлю па ўсёй тэрыторыі Смаленска, звальняюцца ад вайсковае павіннасці, ад выплаты мытных збораў да прыезду ў Смаленск, выплачваюць мытныя зборы паводле вызначанай расцэнкі, не могуць быць пазваны на судовы паядынак вонках сваёй тэрыторыі. Выпыты жалезам як спосаб судовага дазнання дапушчаюцца толькі са згоды чужаземцаў.

## 4. ПАЛІТЫЧНЫ ЎКЛАД

**Агульны характар.** Палітычны ўклад у беларускіх землях быў пабудованы на прынцыпе суладдзя трох элементаў улады: народнага веча, князя і княжай думы; адносіны паміж імі будаваліся не на аснове якіх-колечы юрыдычных норм, а на моцы звычаю і жыццёвай практыкі, з перавагай, аднак, у гэтай сістэме дзяржаўнага будаўніцтва народнага веча.

**Народнае веча.** Народнае веча — фактар выяўлення волі ўсяго насялення зямлі, выступае ва ўсіх гарадскіх цэнтрах. Летапісы паведамляюць аб народных вечах у Полацку і Смаленску, быўшых старажытнымі агульнаславянскімі палітычнымі арганізацыямі. Летапісец падае паасобныя факты з жыцця народных веч Полацка і Смаленска. Права ўдзелу ў вечах прыналежала вольнаму насяленню не толькі стольнага горада, але і прыгарадаў. Да паловы XIII ст. на вечавых сходах у Полацку быў прысутны князь. У XIII—XIV стст. на вечах у Полацку быў прысутны гэтаксама і біскуп. Вечавыя сходы не былі перыядычныя. Яны скліканіся пад уплывам тых ці іншых чарговых дзяржаўных патрэб. Веча магло быць склікана князем, паасобнай асобай і цэлай партыяй. Пэўнага месца для сходу веча не было. Веча ў Полацку збіралася і пад голым небам, і каля Сафійскага сабора і царквы Багародзіцы. Усе паднятыя на вечы пытанні вырашаліся галасамі большасці, якая прымушала маўчаць усіх нязгодных з пастановаю веча. З надворнага выгляду вечавая пастанова была аднагалоснай. Самыя пастановы выконваліся або самім народам, або тымі асобамі, якім веча давала даручэнне выканаць вечавую пастанову. Прадметы, падлягаючыя вырашэнню веча, былі разнастайныя: веча мела заканадаўчую ўладу. Смаленская «Тарговая Праўда» 1229 г. была зацверджана вечам. Устаўная грамата князя Расціслава Мсціславіча 1150 г. была прынята вечам. Веча выбірала князя. Абранне князя народным вечам аднолькава было ўласцівым і Полацку, і Смаленску. Князі, якім не ўдавалася наладзіць сваіх адносін з вечам, павінны былі дабрахоць пакінуць свае пасады. У праціўным выпадку нездаволенае веча гэткага князя выганяла з горада. Веча завязвала шэраг дамоваў з князем. Веча мела права судзіць сваіх гараджан, але ці ўмешвалася веча ў Полацку і Смаленску ва ўнутраныя справы кіраўніцтва, як гэта было ў Ноўгарадзе, аб гэтым крыніцы нічога не кажуць. Веча ў Полацку і Смаленску мела права завязваць мір, вяло дыпламатычныя зносіны, уваходзіла ў разнастайныя палітычныя дагаворныя і саюзныя адносіны. Веча збіралася на водгалас вечавога звона. Прынамсі, устаноўлена, што ў палове XV ст. у Смаленску быў вечавы звон. Палітычная сітуацыя ўтварала партыі. Гэткія мелі месца і ў Полацку, і ў Смаленску. Утварэнне класавага падзелу на лепшых і чорных людзей спрыяла ўзнікненню і абвастрэнню палітычнае барацьбы, прадметам якой часамі бывала кандыдатура таго ці іншага прэтэндэнта на княжы пасад у Полацку і ў Смаленску. Умацаванне народнага веча ў Смаленску можа быць аднесеным да эпохі Расціславічаў.

**Князь.** Значэнне князя і яго адносіны да веча ў значнай меры залежалі ад стопню яго ўплыву і заслуг перад краінай. І ў Полацку, і ў Смаленску княжая ўлада была істотна абмяжована вечам. Князь з'яўляецца знадворным прадстаўніком зямлі. Ён пасылае і прымае пасольствы, прыкладвае пячаці да завязаных дагавораў, вядзе ваенныя справы, суд і ўнутранае кіраўніцтва, назначае ўрадовых асоб — пасаднікаў, якія ў Смаленскай зямлі дзяліліся на гарадскіх і сельскіх, «детскіх» чыноўнікаў для збору гандлёвых і іншых падаткаў, «купоемцев» у Смаленску. Органы ўнутранага кіравання былі прыладдзем княжай

палітыкі з той мэтай, каб падтрымліваць парадак і супакой на той ці іншай падуладнай князю тэрыторыі. На карысць князю паступалі судовыя зборы: віра і продаж, агульныя натуральныя і грашовыя подаці з усёй зямлі, гандлёвыя падаткі, палюддзе і пагароддзе ў Смаленску. Грамата Расціслава 1150 г. падрабязна пералічвае, што і ў якой колькасці павінен быў кожны горад аддаваць князю натураю, грашамі; апрача гэтага, на карысць князю паступала канфіскованая маёмасць праступнікаў, пастаўленых па-за законам, падарункі чужаземных купцоў і паслоў, даходы з прыватнае гаспадаркі князя.

**Княжая дума.** Княжая дума — рада пры князю. У яе склад уваходзілі старэйшыя княжыя дружыннікі — баяры. І ў Полацку, і ў Смаленску ў складзе дружыны былі чужаземцы. Баяры складаюць галоўную ваенную сілу князя. З іх асяроддзя назначаліся пасаднікі. Баяры былі прысутнымі, калі князь асабіста разглядаў судовыя справы, падпісвалі з князем дагаворы з суседнімі дзяржавамі, адпраўляліся ў пасольствы па даручэнні князёў. Князь павінен быў лічыцца з думкай баяр-дружыннікаў і без іх рады не мог нічога рабіць. З выдзяленнем Полацкай, Смаленскай і Турава-Пінскай зямель са складу Кіеўскай дзяржавы і ўзнікненнем у кожнай зямлі паасобных княжых фамілій — баярства-дружына асела на зямлю, пачало займацца ральніцтвам пры дапамозе рабскае працы і гэтым самым займала палажэнне пануючага класа, які з прычыны свайго эканамічнага становішча меў вялікае палітычнае значэнне і вагу.

## 5. ЦАРКВА І ДЗЯРЖАВА

**Арганізацыя Полацкай царквы.** Хрысціянізацыя Полацкай зямлі пачала адбывацца больш прыспешаным тэмпам пачынаючы з XI ст. Хрысціянізацыя выйшла за межы ўласна Полацкай зямлі. Пашырэнне палітычнага ўплыву полацкіх князёў на краіны латышоў і ліваў пацягнула за сабою паяўленне хрысціянства паміж апошніх. Хрысціянізацыя чужаземцаў і палачан адбывалася мірным шляхам. Першапачатковыя межы Полацкае епархіі агранічваліся тэрыторыяй аднаго Полацка. У перыяд з XI—XIII стст. межы епархіі значна пашырыліся. Хрысціянства распаўсюдзілася па прыгарадах і пачало пранікаць на вёску. Апрача гэтага ў XIV ст. праваслаўнае насяленне Рыгі знаходзілася ў сферы ўплыву полацкага біскупа. Апошні сам прабываў у Полацку. Зацвярджаў біскупаў кіеўскі мітрапаліт. Абранне кандыдатаў на біскупскую кафедру прыналежала Полацкай зямлі, а не кіеўскаму мітрапаліту. Полацкае біскупства было ў істоце аўтакефальным і толькі ў царкоўна-юрыдычных адносінах залежала ад кіеўскага мітрапаліта. Залежнасць ад апошняга не магла быць значнай з прычыны палітычнага аслаблення Кіеўскай дзяржавы, геаграфічнай аддаленасці Полацка ад Кіева і ўмацавання ў палітычных адносінах полацкіх князёў. Біскупы як асобы, падлеглыя кіеўскаму мітрапаліту, прымалі ўдзел у мясцовых саборах, якія склікаліся мітрапалітам як для вырашэння розных царкоўных пытанняў, гэтак і для назначэння біскупаў для іншых цэркваў. Унут-

ры сваёй епархіі полацкі біскуп карыстаўся поўнай незалежнасцю, кіруючыся пры гэтым царкоўнымі законамі і мясцовымі звычаямі. Першым вядомым біскупам быў Міна (1105—1116) з Кіева-Пячэрскага манастыра; затым успамінаецца ў летапісах Ілля каля 1129 г., Касьма — 1143 г., Дыянісій, памерлы ў 1183 г., Мікалай з 1183 г., Аляксей каля 1231 г., Сімяон каля 1274 г., паходзіўшы з князёў полацкіх. Агульнапалітычны ўклад жыцця ў Полацкай зямлі адбіваўся на парафіяльнай арганізацыі. Парафіяне арганізоўваліся ў брацтвы, якія, падобліва, карысталіся значным уплывам. Гэтак, у 1159 г. палачане, нездаволеныя з князя Расціслава Глебавіча, заклікалі яго на братчыну пры святыні Багародзіцы, каб аб'явіць яму там сваю пастанову.

**Пабудаванне цэркваў.** Полацкія князі падтрымлівалі хрысціянскую царкву і сваім палітычным аўтарытэтам, і матэрыяльна. Гандлёвыя зносіны далі ў рукі полацкім князям значныя матэрыяльныя сродкі, дзякуючы якім з'явілася магчымасць будаваць цэрквы. Брачыслаў Ізяславіч пабудаваў царкву Багародзіцы і мураваны Сафійскі сабор[1]. Адначасна з хрысціянствам паяўляюцца манастыры, закладчыкамі якіх з'яўляюцца прадстаўнікі княжай фаміліі. Ужо ў XII ст. быў у Полацку жаночы манастыр, куды паступіла Еўфрасіння, унучка князя Усяслава. У прыгараднай мясцовасці «Сельцэ» Еўфрасіння залажыла два манастыры: мужчынскі і жаночы, у якіх былі пабудаваны мураваныя цэрквы. У XIII ст. ужо існаваў мужчынскі манастыр у Віцебску, а ў XIV ст. жонка Альгерда, вялікага князя літоўскага, залажыла манастыр Святога Духа. Манастыры, як і ў Кіеўскай зямлі, былі цэнтрамі тагачаснай асветы і духоўнае культуры.

**Царкоўныя прыбыткі.** Царкоўны скарб складаўся з ахвяр і спецыяльных падаткаў. Князі давалі ў ахвяру на цэрквы і манастыры грошы, землі. Па прыкладу князёў ішлі багатыя прыватныя асобы. Апрача гэтага як чорнае, так і белае духавенства было аблажана спецыяльнымі падаткамі на карысць біскупскай кафедры.

**Вынікі хрысціянізацыі.** Да прыняцця хрысціянства ў Полацкай зямлі было моцным паганства. Прадстаўнікі апошняга нават у XI ст. карысталіся павагай у княжай сям'і, ужо фармальна стаўшай хрысціянскай. У XII ст. паганства яшчэ моцна трымаецца ў Полацкай зямлі. Хрысціянства прышчапляецца толькі павярхоўна. Для аўтара «Слова аб палку Ігаравым» Полацкая зямля прадстаўляецца краінай чараўнікоў. Народныя гушчы заставаліся вернымі рэлігіі дзядоў — паганству. Гэтая вернасць прыпыняла ўнутраную і знадворную хрысціянізацыю насялення Полацкае зямлі.

**Арганізацыя Смаленскае царквы.** Смаленская зямля доўгі час не мела асобнага біскупа. Яна складала тэрыторыю, падлеглую пераяслаўскаму біскупу. Гэткая залежнасць цягнулася да паловы XII ст. Толькі пры сыну Уладзіміра Манамаха — Мсціславу — Смаленск атрымаў асобнага біскупа ў асобе грэка

[1] Полацкі Сафійскі сабор пабудаваны паміж 1044 і 1066 гг. (паводле іншых звестак, 1050—1060 гг.) пры князю Усяславу Брачыславічу.

Мануіла, які шмат клапаціўся аб знадворным будаўніцтве свайго біскупства. Узнікненне Смаленскага біскупства звязана з выдзяленнем Смаленскае зямлі са складу Кіеўскае дзяржавы. Смаленская царква прыняла трывалую арганізацыю пры Расціславу Мсціславічу, які выдаў асобную Устаўную грамату (1150). Грамата Расціслава вызначыла як матэрыяльнае, гэтак і праўнае палажэнне Смаленскага біскупства. Біскупы ў Смаленскай епархіі большай часткай былі грэкі па нацыянальнасці.

**Пабудаванне цэркваў.** З утварэннем асобнай Смаленскай епархіі шпаркім тэмпам будуюцца святыні і закладваюцца манастыры. Пры Расціславу і яго сынах былі пабудованы цэрквы імя святых апосталаў Пятра і Паўла, апостала Іаана Багаслова, архістратыга Міхаіла. Самым старажытным манастыром можна лічыць Барыса-Глебскі на Смядыні (1138). Каля Смаленска быў пабудован Успенскі манастыр і Крэставаздзвіжанскі, якія мелі вялікае значэнне ў духоўным жыцці Смаленска. Следам за князямі цэрквы будавалі і біскупы, якія распараджаліся даволі значнымі сродкамі. Смаленскія святыні вызначаліся вялікай аздаблёнасцю. У цārквах чулася царкоўнае казанне, якое датычыла недахватаў грамадзянскага жыцця. Знакамітым прамоўцай быў Аўраам, іераманах Успенскага манастыра, які меў вялікі ўплыў на духоўнае развіццё смаленскага грамадства. У часе набажэнства прыгожа пяялі царкоўныя хоры. Смаленская царква высунула шэраг адукаваных дзеячаў: біскупа Мануіла, іераманаха Аўраама, «кніжніка» і філосафа Клімента, які быў чалавек вельмі асвечаны ва ўсіх галінах даступнага пазнання.

**Становішча духавенства.** Духавенства ў Смаленску карысталася вялікім уплывам. Біскупы прымаюць удзел у палітычным жыцці зямлі, адпраўляюцца ў пасольствы, прымаюць удзел у княжай думе. Духавенства мела вялікі ўплыў на грамадскую думу, але ў масах было малаадукаваным, не навучала народ і не ўмела пасвіць свой статак, адносячыся з зайздрасцю да прадстаўнікоў запраўднае асветы (Клімент Смаляціч, Аўраам). Звычаёвае (маральнае) жыццё духавенства і манахаў знаходзілася ў стане заняпаду. Чорнае і белае духавенства вельмі было прывязана да свайго грамадскага становішча, да матэрыяльных выгод, вызначалася пагардлівасцю, зайздрасцю, пышлівасцю, хцівасцю, бывала пастаяннымі ўдзельнікамі баляў і банкетаў, наладжваных князямі і багатымі баярамі.

**Юрыдычнае становішча царквы.** Правы і прывілеі смаленскага біскупа былі азначаны Устаўной граматай князя Расціслава Мсціславіча (1150). Паводле гэтай імунітэтнай граматы біскуп атрымліваў права чыніць суд у справах: 1) аб разводзе, 2) аб двужонстве, 3) аб шлюбе паміж сваякамі, 4) аб зладзействе, 5) аб паядынку паміж жанчынамі, 6) аб праступленнях духоўных асоб, 7) аб «умыканні» жанчын. Што датычыць спраў аб спадчыне, аб спрэчках паміж сваякамі, а гэтаксама суду над царкоўнымі людзямі, то гэта не падлягала біскупскаму суду. Гэтаксама Грамата вызначала царкве дзесяціну ад усіх «даней смоленскіх» і рад зямельных уладанняў з насяленнем, на іх «седяшчім, сеножаті,

огороды, бобровые гоны». У выпадку далучэння Смаленскае зямлі да Пераяслаўскае епархіі ўсе царкоўныя прывілеі трацяць сілу. Значэнне біскупа ў Смаленскай зямлі было надта вялікім. Біскупская пячаць была прыложана да дамовы 1229 г.

**Арганізацыя Тураўскай царквы.** Тураўская царква стала самастойнай епархіяй яшчэ пры Уладзіміру Першым. Нягледзячы на блізкасць да Кіева і залежнасць ад апошняга, асобная епархія ўтрымалася і пасля смерці Уладзіміра Першага. Месцам прабывання тураўскага біскупа быў Тураў. Як глыбока пранікла хрысціянізацыя ўнутр Тураўскае зямлі, за адсутнасцю даных няма магчымасці ўстанавіць.

**Вынікі хрысціянізацыі.** Народныя гушчы, прымаючы хрысціянства павярхоўна, заставаліся вернымі традыцыям паганства. Яно жыве ў глыбіне народнае свядомасці. Само хрысціянства апаганьваецца, прыстасоўваецца да прымітыўнага светаразумення. Царква з надворнага боку перамагла народную масу, але светаразуменне гэтае масы засталося незачэпленым. Царква, нават апіраючыся на свецкую ўладу, не мела магчымасці зрабіць што-колечы ў гэтым кірунку, за выключэннем царкоўных пракляццяў і павярхоўна фармальных забарон. Дваістасць веры складала істоту народнай рэлігіі. Хрысціянства стала рэлігіяй толькі пануючых класаў. Не дарма царква атрымлівае права разглядаць справы аб двужонстве, хапанні жанчын, шлюбе паміж сваякамі і інш. Усё гэта былі рэшткі паганства, якое жыло ў свядомасці народнае масы. Вера ў чараўніцтва, паганскія святы, «бубны», «сопелі» і «плясанія» былі шырока распаўсюджаны ў тагачасным двухрэлігійным грамадстве.

## 6. ЗАКАНАДАЎСТВА

**«Руская Праўда».** Да пачатку XI ст. славянскія праваадносіны вызначаліся звычаёвым вусным правам. З развіццём княжай улады побач са звычаёвым правам маюць месца судовыя пастановы князёў, паасобныя княжыя ўставы. З развіццём гандлёвых і культурных сувязей з Візантыяй пачало пранікаць у Кіеўскую зямлю і візантыйскае права. Грамадзянскія адносіны сталі больш складанымі. Паўстала канечнасць прывесці ў пэўны парадак і сістэму чыннае права. У XI ст. яно было запісана. Гэтак паявіўся «Устаў вялікага князя Яраслава Уладзіміравіча аб судах». «Руская Праўда» — помнік неафіцыяльнага пахаджэння, складзены ў перыяд XI—XIII стст. для патрэб бягучага судоўніцтва. «Руская Праўда» захавалася ў дзвюх рэдакцыях: кароткай і поўнай. Кароткая адносіцца да першай паловы XI ст. Поўная ўложана ў наступныя сталецці. Крыніцамі «Праўды» былі: звычаёвае права, уставы князёў, судовыя прыгаворы, візантыйскае права, пранікшае следам за хрысціянствам. Можна лічыць, што «Руская Праўда» была ўложана ў Кіеўскай зямлі.

**Змена правасвядомасці.** Панаваўшая крывавая помста як з'явішча самасуду к XI ст. абярнулася ў крымінальнае пакаранне, якое вызначалася судом. Пакрыўджаны або яго крэўныя выконвалі судовую пастанову. Крывавая помста ўжывалася пры забойстве, цяжкіх пабоях і параненнях. Ужо ў першай палове XI ст. крывавая помста магла быць заменена грашовым штрафам. Пры сынах Яраслава крывавая помста была адменена і заменена грашовым штрафам, які складаўся з дзвюх частак: грашовае ўзнагароды «віры» на карысць князя і «галоўнічества» на карысць пакрыўджанага або яго сваякоў. «Віра» выплачвалася ў тым выпадку, калі ненаўмысна быў забіты вольны чалавек. «Віра» была простая і падвойная. Апошняя, у ліку 80 грыўняў, выплачвалася за забойства баярына і княжага цівуна. У выпадку, калі на тэрыторыі «верві» было знойдзена цела забітага чалавека і праступнік не быў знойдзеным, то члены «верві» супольна выплачвалі «дзікую віру». Апрача гэтага насяленне «верві» магло прыняць удзел у выплаце «віры» і ў тым выпадку, калі праступнік быў знойдзены, але калі ён з'яўляўся членам грамады і не адмаўляўся ад выплаты «дзікай віры». Кругавая парука не пашыраецца на выплату «галоўніцтва». Па ўсіх іншых крымінальных праступках у карысць князя паступала «прадажа» і «ўрок» — у распараджэнне пакрыўджанага, вялікасць якіх залежала ад характару крымінальнага праступлення. Прыватныя адшкадаванні былі значна меншымі, чымся княжыя. Аднак за наўмыснае забойства, падпал і канакрадства вінаватая асоба выдавалася з жонкаю і дзецьмі на «поток» і разграбленне, гэта значыць абвяшчалася пазбаўленай правоў, а маёмасць падлягала канфіскацыі. Асноўны погляд на праступленне як на прычыненне матэрыяльнага ўшчэрбку адной стараной другой і на пакаранне як на адшкадаванне каштоўнасці панесенае страты захаваўся і ў дагаворы з немцамі 1229 г.

**Судоўніцтва.** Суд адбываўся на княжым двары. Князь чыніў суд асабіста ці даручаў у часе сваёй адсутнасці гэту справу цівуну. У краінах судзілі прадстаўнікі княжай улады — пасаднікі, якія часта надужывалі свайго права. На судзе князя былі прысутны розныя службовыя асобы для выканання распараджэнняў суддзі, як, напрыклад, «отрокі», або «детскіе», «метальнік», і для запісу чыста судовых пастаноў. На карысць княжыхураднікаў паступала частка з княжых судовых штрафаў — «вір» і «продаж».

**Судаводства.** Зварот да княжага суду і яго органаў меў для прыватных асоб факультатыўны характар. Княжы суд быў як бы трацейскім судом, да якога пакрыўджаная старана звярталася толькі тады, калі пакрыўджаны і адказчык самі не маглі прыйсці да той ці іншай згоды. Пакрыўджаная асоба — ісцец — звычайна сам праводзіў судовае следства, якое адбывалася такім чынам, што ісцец або «заклікаў на таргу», або збіраў гэтак званы «свод». У першым выпадку, калі праз тры дні пасля «закліча» абвешчаная рэч знаходзілася ва ўласнасці пабочнае асобы, то гэтая асоба прызнавалася адказчыкам. У другім выпадку, г. зн. пры дапамозе «свода», асоба, ва ўладанні якой быў знойдзены шуканы прадмет і якая не давяла законнае крыніцы яго пахаджэння, — прызнавалася злодзеем, і ёй трэ было адпаведным фармальным спосабам адкінуць ад сябе абвіна-

ваЧанне ў зладзействе. У выпадку, калі прыватная асоба шукала беглага халопа, то княжая адміністрацыя была абавязана прыйсці на дапамогу гэтай асобе тым, што прызначала ісцу «отрока» з той умовай, каб плаціць апошняму пэўнае вынагараджэнне. Пры разглядзе справы суддзя кіраваўся фармальнымі меркаваннямі — данасцю праступлення і яго відавочнасцю. У такім выпадку сведак не дапытвалі. Але калі справа датычыла праступленняў супроць здароўя і чэсці або забойства, калі праступнік быў схоплены на месцы, тады канечна трэ было дапытваць сведак, але паказанні сведак і ісца павінны былі быць зусім падобнымі. У выпадку калі адказчык прыцягваўся да адказу на падставе пабочных даных, то вінавачаны павінен быў адкінуць ад сябе абвінавачанне ў праступленні, выставіўшы сем сведак «добрага павядзення». Калі адказчык не мог выставіць гэтае колькасці сведак, то ён падлягаў выпытам жалезам і вадой або прыносіў прысягу, у залежнасці ад праступлення. Нарэшце, меў месца судовы паядынак. Існаванне апошняга ў XI і XII стст. не падлягае сумненню, хаця ў «Рускай Праўдзе» няма аб ім успамінаў. Судовы разгляд даваў фармальныя даныя для вынясення прыгавору, які прыводзіўся ў выкананне або стараной, якая выйграла справу, або прадстаўнікамі ўлады — князем і яго пасаднікам, якія тут жа спаганялі з адказчыка належныя ў іх карысць грашовыя штрафы.

## 7. ДУХОЎНАЯ КУЛЬТУРА

**Гістарычныя творы.** Самым старажытным гістарычным творам з'яўляецца гэтак званы «Начальны летапіс», які захаваўся не ў першапачатковым выглядзе, а ў спісках пазнейшага часу. Гэткімі з'яўляюцца спіскі Лаўрэнцеўскі і Іпацеўскі, абодва з канца XIV ст. Першы атрымаў сваё найменне ад імя яго пісца Лаўрэнта, які перапісаў свой спісак у 1377 г. для суздальскага князя Дзмітрыя Канстанцінавіча. Другі названы па месцы свайго пахаджэння ў Іпацеўскім манастыры ў Кастраме. Абодва спіскі ў пачатковай частцы падобныя паміж сабою, але затым істотна разрозніваюцца: Лаўрэнцеўскі летапіс складаецца з дзвюх частак — гэтак званай «Повесті временных лет», якая заканчваецца 1110 годам, другая частка заканчваецца 1308 годам і галоўным чынам змяшчае ў сабе апісанне падзеяў Ростава-Суздальскае зямлі; а Іпацеўскі летапіс складаецца з трох частак — «Повесті временных лет», «Кіеўскага летапісу» да 1260 г., «Галіцка-Валынскага летапісу» з 1201 па 1292 г. уключна. Першая частка абодвух спіскаў — «Се повесті временных лет, откуда есть пошла Русская земля, хто в Кіеве нача первее княжіті і откуда Русская земля стала есть» — прадстаўляе сабою складаны гісторыка-літаратурны твор. Спачатку былі пашыраны вусныя расказы аб мінулым. З паяўленнем пісьменства павінны былі паявіцца першыя пісьмоўныя запісы. Разам з гэтым у царкоўна-дружынных станах былі ў модзе і апавяданні царкоўнага характару, як, напрыклад, «Похвала благоверной княгіне Ольге», «Сказаніе об убіеніі Боріса і Глеба», якія адбівалі на сабе самастойнасць літаратурнае творчасці старажытнарускага княства. Гэта былі матэрыялы для

пазнейшага летапіснага апавядання. З прыняццем хрысціянства паўднёвыя славяне мелі магчымасць пазнаёміцца з гістарычнымі хронікамі візантыйскага пахаджэння, якія былі пераложаны спачатку на балгарскую мову. Дзякуючы гэтаму хроніка Іаана Малалы даволі рана зрабіла сабе доступ у кіеўскія царкоўна-дружынныя станы. З XI ст. творы грэцкіх пісьменнікаў ужо самастойна перакладаюцца на царкоўнаславянскую мову. З гістарычных хронік былі пераложаны дзве хронікі: Георгія Сінкела і Георгія Амартала. На падставе апошняй была ўкладзена новая гістарычная праца — гэтак званы «Хронограф по великому изложению», у якую былі ўстаўлены гэтаксама падзеі, якія мелі адносіны да гісторыі Русі. Існаванне ў эпоху Уладзіміра Першага і Яраслава адукаваных кніжнікаў, агульныя палітычныя і культурныя поспехі Кіеўскай дзяржавы спрыялі ўзнікненню «Повести временных лет» у першай рэдакцыі, у якой галоўнае месца было адведзена рускай гісторыі. Паяўленне гэткага летапіснага збору адносіцца да часоў Ізяслава Яраславіча, к пачатку другой паловы XI ст. Нацыянальнае летапісанне, якое з'явілася працягам першага летапіснага збору, звязана з імем Нестара — манаха Кіева-Пячэрскага манастыра, аўтара «двух житий»: «Жития Бориса і Глеба» і «Жития Феодосия». Нестар жа ўкладаў новую рэдакцыю «Повести временных лет», з якой ігумен Выдубіцкага манастыра Сільвестр у 1116 г. спісаў копію. «Повесть» у новай рэдакцыі змяшчае ў сабе матэрыялы разнастайнага характару: вусныя і пісоўныя апавяданні, запазычаныя з грэцкіх хронік, жыццё Уладзіміра, жыццё Кірылы і Мяфодзія, аповесць аб Барысу і Глебу, навучанне Феадосія, дагаворы кіеўскіх князёў з грэкамі і інш. Апавяданне ў летапісе вядзецца па гадах; спатыкаюцца гады пустыя. Падходзіць аўтар да здарэнняў, якія ён апісвае, з рэлігійна-маральнага пункту пагляду. На гэтых здарэннях адбіваецца то благаслаўляючая, то караючая рука Бога. Аўтар апісвае гістарычныя падзеі з той мэтай, каб даць рэлігійна-маральнае навучэнне і перасцярогу грамадству. «Начальны летапіс» выяўляе сабою матэрыял першазначнай важнасці для даследавання гістарычных лёсаў беларускага народа ў эпоху існавання зямель як самастойных палітычных адзінак. Мясцовыя беларускія летапісы гэтай жа эпохі не захаваліся, хаця няма ніякага сумнення ў тым, што яны існавалі. Цэлы шэраг даных аб падзеях у Полацкай і Смаленскай землях чыста мясцовага характару, і пры гэтым вылажаных з вялікай дакладнасцю, мог трапіць у першапачатковы збор і яго працяг — «Кіеўскі летапіс» — толькі з мясцовых летапісных крыніц.

**Новая культура.** Хрысціянізацыя Кіеўскай дзяржавы і ўваходзячых у яе склад беларускіх зямель палажыла пачатак новай культуры, адбіццём якой з'явілася пісьменства, шпарка развітае ў XI ст. Новая культура была рэлігійнай у сваёй істоце. Прадстаўнікамі яе былі асобы галоўным чынам спаміж чорнага духавенства, якія мелі магчымасць, дзякуючы матэрыяльнай забяспечанасці, цікавіцца літаратурнымі працамі. Адначасна з хрысціянствам паяўляецца ў вялікай колькасці перакладная візантыйская гістарычная і царкоўна-навучальная літаратура, паводле ўзораў якой пачалі ўзнікаць і арыгінальныя рускія царкоўна-літаратурныя творы.

**Княжна Еўфрасіння Полацкая.** Прадстаўніцай новае культуры ў Полацку была ўнучка князя Усяслава — княжна Прадслава, якая радзілася каля 1110 г. і пры хрышчэнні прыняла імя Еўфрасінні. Рана стаўшы манашкаю, княжна Еўфрасіння Полацкая пасялілася пры саборнай царкве, дзе займалася перапісваннем кніг. З прычыны вялікага попыту на царкоўныя кнігі княжна Еўфрасіння залажыла жаночы манастыр Св. Спаса[1], у якім сама была ігуменняй. Манашкі манастыра займаліся перапісваннем кніг і навучаннем дзетак. Разам з гэтым, дзеля падрыхтоўкі духавенства, Еўфрасіння залажыла і мужчынскі манастыр, які быў пабудованы крыху раней, чымся жаночы манастыр. Пад канец свайго жыцця княжна Еўфрасіння зрабіла вандроўку ў Ерусалем, дзе яна і памерла (у 1173 г.).

**Смаленская асвета.** Галоўным асяродкам беларускай асветы быў Смаленск. Яго культурнае значэнне трэба паставіць у цесную сувязь з яго геаграфічным палажэннем і выплываючымі адгэтуль эканамічнымі перавагамі. Візантыя і Захад са сваімі культурамі былі грунтам для смаленскае асветы. Ініцыятыва пашырэння апошняе выходзіла ад княжай улады. Смаленскі князь Расціслаў Мсціславіч і яго наступнікі прыкладалі шмат старанняў у кірунку пашырэння школьнае асветы. Асвета распаўсюджвалася не толькі паміж пануючага стану (баяр, духавенства і купецтва), але часткова і ў народных гушчах. Пры пабудованых Расціславам цэрквах і манастырах збіраліся рукапісы, перакладаліся і перапісваліся скарбы грэцкае і балгарскае мудрасці. Сам Расціслаў быў вельмі «учен всякіх наук, і к ученію своіх братьев і многіх людей понуждал», будуючы на гэта школы і ўтрымліваючы на свае княжыя сродкі грэцкіх і лацінскіх настаўнікаў, не жадаючы мець невучонага духавенства. Раман Расціславіч патраціў на школы ўсе свае сродкі. Давыд Расціславіч гэтаксама «любіў кнігі чытаць і памяць вострую меў». Асяродкамі асветы былі манастыры, багатыя сваімі кнігазборамі. Гэтак, у Смаленскім манастыры была багатая і разнастайная па сваім складзе бібліятэка. Гэткія ж кніжныя багацці знаходзіліся ў манастырах «Чэснага Крэста і Смаленскім Багародзіцкім». У бібліятэках Смаленска знаходзіліся ўсе кнігі Святога Пісьма, лічныя тлумачэнні на Святое Пісьмо, у паасобку Іаана Златавуста, творы святых айцоў: Васіля Вялікага, Яфрэма Сірына, Златавуста і інш., а гэтаксама разнастайная жыццёўная літаратура.

**Школа.** Манастыры з іх багатымі кніжнымі скарбніцамі былі рассаднікамі асветы. Яны з'яўляліся вышэйшымі школамі, дзе навучаліся грэцкае мове і тлумачэнням Святога Пісьма. Аб адным з вучыцялёў — Грыгору — успамінаецца ў лісце Клімента Смаляціча прасвітару Фаме. Былі гэтаксама і ніжэйшыя школы, куды бацькі прыводзілі сваіх дзяцей «кнігам учіці». Школьная асвета развівалася пад грэцкім уплывам. Гандлёвыя сувязі з немцамі і сужыццё з імі ў Смаленску, дыпламатычныя зносіны з Рыгай выклікалі канеч-

---

[1] Полацкі Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр.

ную патрэбу выкладаць у школах лацінскую мову. Дагавор 1229 г. быў пераложаны на смаленска-полацкую гутарку з лацінскага чарнавіка і нямецкага перакладу.

**Прадстаўнікі смаленскае асветы.** Асветніцкі рух XII—XIV стст. даў значныя вынікі. Ён высунуў з царкоўна-дружыннага асяроддзя шэраг выдатных дзеячаў, якія вызначаліся самастойнасцю і адвагаю думкі ў сваіх творах і выклікалі вялікае абурэнне паміж паасобных прадстаўнікоў царкоўна-дружыннага грамадства. Да больш ранніх прадстаўнікоў смаленскай асветы трэба аднесці Клімента Смаляціча, які ў 1147 г. быў выбраны саборам рускіх біскупаў на кафедру кіеўскага мітрапаліта без зацвярджэння яго канстанцінопальскім патрыярхам. На мітрапаліцкі пасад Клімента абрала нацыянальная партыя, нездаволеная з грэцкае іерархіі і жадаючая вызваліцца з-пад яе ўплыву. Вялікі князь кіеўскі Ізяслаў Мсціславіч падтрымліваў кандыдатуру Клімента. Палітычныя ўмовы прымушалі князя Ізяслава не раз пакідаць Кіеў. Разам з Ізяславам пакідаў мітрапаліцкую кафедру і Клімент, якая ўрэшце была занята прадстаўніком грэцкае партыі — кандыдатам патрыярха — Іаанам. Летапісец называе Клімента «кніжнікам і філосафам». Ліст Клімента да прасвітара Фамы малюе перад намі і асобу самога аўтара, і характар смаленскае асветы ў царкоўна-дружынных станах. Ліст Клімента быў напісаны ў адказ на ліст Фамы, які адносіўся адмоўна да таго, што Клімент заняў мітрапаліцкую кафедру, і абвінавачваў новага мітрапаліта ў хцівасці да славы. Клімент дапускаў магчымасць іншасказнага тлумачэння Святога Пісьма, тады як Фама ўпіраўся выключна на літаральным тлумачэнні тэксту. Клімент быў знаёмы з візантыйскай славеснасцю і не баяўся адсылацца на Гамэра, Арыстоцеля і Платона, хаця ў гэты час яшчэ самыя творы грэцкіх філосафаў не былі вядомы. Клімент мог пазнаёміцца з імі толькі з твораў айцоў царквы.

**Аўраам Смаленскі.** Выдатным прадстаўніком смаленскай асветы з'яўляецца Аўраам — манах смаленскага Багародзіцкага, а затым і Крэставаздзвіжанскага манастыроў. Ён выйшаў з той жа царкоўна-філасофскай школы, што і Клімент. Стаўшы духоўнікам, Аўраам прыцягваў сваімі казаннямі і тлумачэннямі Святога Пісьма вялікую колькасць слухачоў. Нездаволеныя з яго поглядаў прыходзілі да Аўраама, каб весці спрэчкі, але апошніяканчаліся заўсёды няўдачна для яго праціўнікаў. Тлумачэнне Святога Пісьма, якое дазваляў сабе Аўраам, для часткі духавенства паказалася ерэтычным. Аўраам быў прыцягнуты да суду на двары ўладыкі ў прысутнасці князёў, баяр, ігуменаў, папоў, царкоўнікаў. Свецкая партыя стаяла за Аўраама. Царкоўнікі былі супроць, і Аўрааму прыйшлося часова прыпыніць сваю навучальную дзейнасць. Аўраам быў добра знаёмы з творамі айцоў царквы, як то Яфрэма Сірына, Іаана Златавуста, жыццём Феадосія Пячэрскага. Ён быў знаёмы і з апакрыфічнай літаратурай — гэтак званымі галубінымі кнігамі. Калі Аўраам быў пастаўлены ігуменам гэтага ж Багародзіцкага манастыра, то тут шырока было наладжана перапісванне кніг.

**Кірыла Тураўскі.** Ураджэнец Турава, сын багатых бацькоў, Кірыла рана пастрыгся ў манахі ў тым самым Зарубскім манастыры, які быў у гэты час цэнтрам смаленскай асветы. Па сваім веку Кірыла з'яўляецца малодшым сучаснікам (радз. 1131—1134) Клімента Смаляціча. Кірыла прытрымліваецца аскетычнага погляду на жыццё. Прызнае сімволіка-алегарычнае тлумачэнне Святога Пісьма, выяўляе дасканалую знаёмасць з візантыйскаю літаратурай, якая ў перыяд XI—XII стст. перажывала эпоху свайго росквіту. Пры ўкладанні сваіх казанняў і навучэнняў Кірыла Тураўскі карыстаецца правіламі візантыйскае рыторыкі. Кірылу былі вядомы і ўзоры візантыйскае свецкае літаратуры. Ён быў дасканала знаёмы з творамі Іаана Златавуста, Кірылы Александрыйскага, Грыгора Багаслова, Епіфанія Кіпрскага. Добрая знаёмасць з царкоўнай літаратурай не перашкаджае, аднак, Кірылу заставацца таленавітым самабытным царкоўным казальнікам. Уся асветніцкая дзейнасць Кірылы адбылася ў Тураве, дзе ён займаў біскупскую кафедру. Мова Кірылы вобразная і паэтычная.

**Вынікі.** Беларуская духоўная культура ад XI—XIV стст. мела царкоўны характар, але яна была далёкай ад царкоўнае артадаксальнасці ў справе тлумачэння Святога Пісьма. Культурныя зносіны з Захадам, асабліва ў Смаленску, дзякуючы яго гандлёвым сувязям, з'яўляліся праваднікамі свежае крытычнае думкі, якая гэтак выразна выступае ў дзейнасці галоўных вучоных прадстаўнікоў беларускае асветы. Беларускія царкоўна-дружынныя станы, распараджаючыся вялікімі матэрыяльнымі сродкамі, маглі цалком аддаваць сябе культурнай працы і гэтым самым выяўляць свае багатыя духоўныя сілы і магчымасці.

## 8. ПАЛІТЫЧНЫЯ ТЭОРЫІ

**Візантыя і палітычныя ідэі.** Адначасна з прыняццем хрысціянства з Візантыі пачалі пранікаць на Русь і палітычныя ідэі. Галоўным праваднікам палітычных ідэй было духавенства, якое прывезла з сабой кнігі Старога і Новага Завету, а гэтаксама і працы айцоў царквы. Царкоўная літаратура навучала аб тым, што княжая ўлада ўстаноўлена Богам і што трэба слухацца зямное ўлады. З другога боку, з Візантыі пранікалі на Русь і творы візантыйскай палітычнай літаратуры, у якіх выкладаліся розныя погляды на характар улады візантыйскага імператара і на межы гэтае ўлады.

**Найбольш старажытныя палітычныя помнікі.** Першым помнікам палітычнае літаратуры з'яўляецца «Царкоўны ўстаў князя Уладзіміра». Адзначаючы юрыдычнае палажэнне царквы, устаў абмяжоўвае граніцы княжай улады неўмяшаннем апошняй у судовую юрысдыкцыю царквы, бо «сіх судов не подобает судіті князю, ні боярам, ні судіям іх». Адмаўленне ўмешвацца ў царкоўныя суды даецца ад імя самога князя, яго дзяцей, унукаў і ўсяго княжага роду.

**«Начальны летапіс».** Аўтар летапісу дае два ўзоры князёў: справядлівага і несправядлівага. Першы любіць праўду, рупіцца аб правасуддзі і аб кіраўніцтве. Справядлівы князь пасылаецца Богам на зямлю як довад прыхільнасці Бога да зямлі, «ашче бо кая земля управітся пред Богом». Несправядлівы князь пасылаецца Богам як пакаранне за грахі народа, калі людзі «злі і лукаві бывают». Гэткі князь знаходзіцца ў атачэнні дурных дарадчыкаў, «несмысленых» або «младых». Дарадчыкі захопліваюць уладу ў свае рукі і карыстаюцца ёю ў сваіх уласных інтарэсах. Скуткам такога кіраўніцтва з'яўляецца крыўда народа, для якога зачынены шлях да княжае праўды. Справядлівы і несправядлівы князі аднолькава адказны перад Богам за «погубленныі душі крестьянскі». Залічэнне князёў да тае ці іншае групы залежала гэтаксама і ад кіеўскага патрыятызму, які заўважваецца ў летапісца. Гэта перашкаджала аўтару быць адносна аб'ектыўным. Аўтар летапісу вельмі адмоўна адносіцца да Усяслава Полацкага, як да ўпартага і мнагалетняга ворага Кіеўскае дзяржавы. Тым часам аўтар «Слова аб палку Ігараве» прызнае яго разумным і энергічным: «людям судяша, князем угоды рядяша», годным узорам для наследавання сучаснікаў аўтара. Але смаленскія князі — Расціслаў і яго нашчадкі — справядлівыя князі. Кіеўскі летапіс выхваляе іх за разнастайныя маральныя якасці і цноты. Усе яны «ніщелюбівы, хрістолюбівы», любілі будаваць святыні, дапамагаць цэрквам і манастырам, шанавалі духавенства і манахаў.

## 9. КУЛЬТУРНЫЯ ЎПЛЫВЫ

Смаленскі царкоўна-дружынны стан развіваўся пад уплывам двух фактараў: культурнага ўплыву Візантыі і Захаду. Візантыя перадала разам з хрысціянствам увесь свой запас царкоўна-паўчальнай літаратуры, якая зрабіла вялікі ўплыў на светагляд, склад мыслі і духоўныя настроі прадстаўнікоў смаленскае інтэлігенцыі. Візантыйская царкоўная культура не магла пранікнуць у гушчы народу. Яна зачапляла толькі вярхі грамадства. Захад меў больш шырокі ўплыў. Зносіны з чужаземцамі мелі надта дадатны ўплыў на характар і звычаі смальнян, на развіццё культуры наогул. Існаванне ў Смаленску неправаслаўнае царквы сведчыць аб рэлігійнай верazноснасці. У дагаворы Мсціслава Давыдавіча мы заўважваем больш гуманнасці ў параўнанні з «Рускай Праўдай». Напрыклад, абраза жанчыны вольнай ці нявольнай караецца штрафам. У першым выпадку накладваецца штраф у 5 грывен серабра, а ў другім — толькі адна грыўня серабра. Чужаземцы карысталіся ў Смаленску вялікім аўтарытэтам. Калі разглядалася справа Аўраама, то яго абаронцай выступіў нехта Лука Прусін, падобліва, выходца з Заходняй Еўропы. Чужаземным уплывам агорнута легенда аб святым Меркурыю, ваяру-багатыру, які выратаваў Смаленск у 1239 г. ад татар. Для смальнян Захад з'яўляецца сімвалам культуры і асветы. Усход жа — сімвал гвалту і барбарства. Заходні ўплыў

ішоў гэтаксама з Скандынавіі. Сагі паўночных народаў знаходзілі сабе пашырэнне ў смаленскім насяленні. Быліны ж былі пашыраны на поўначы. Устаўная грамата 1150 г. была знойдзена ў адзіным экзэмпляры ў Швецыі. Заходні ўплыў праявіўся значна ў малярстве і рысаванні. Псалтыр Анежскага Крэснага манастыра, спісаны ў 1395 г. рукою нейкага Лукі Смаляніна, аздоблены ўласнаручнымі застаўкамі і мініяцюрамі, размалёванымі фарбамі і золатам ініцыяламі. Усе малюнкі вызначаюцца незвычайнай разнастайнасцю. Аўтару добра вядома як візантыйскае мастацтва, гэтак і заходнееўрапейскія арнаменты, як кельцкі, англасаксонскі, скандынаўскі і ламбардскі. Рысункі псалтыра надта выразна сведчаць аб тым, як высока стаяла ў Смаленску ў XIV ст. мастацтва перапісвання кніг і рысавання, а гэтаксама маляванне абразоў.

# IV

# Беларусь у складзе Вялікага княства Літоўскага



# 1. УТВАРЭННЕ ДЫНАСТЫЧНАЕ ДЗЯРЖАВЫ

**Тэрыторыя літоўскага племення.** Ліцвіны складаюць асобную галіну народаў, прыналежных да індаеўрапейскай групы моваў, гэтак званай літоўска-балтыйскай. Літоўскія племенні спачатку займалі вадазборы Нёмана і Заходняй Дзвіны, паўночныя прытокі Прыпяці, верхні бег Дняпра і Бярэзіны, узбярэжжа Балтыйскага мора, ад вусця Нёмана да Заходняй Дзвіны, і вадазбор верхняй Акі. Рух готаў ад берагоў Балтыйскага мора да Чорнага адсунуў ліцвінаў на захад і звузіў граніцы іх тэрыторыі. З XI ст. ліцвіны жывуць там, дзе іх застае гісторыя. У гэты час літоўскія племенні занялі ўсё Балтыйскае ўзбярэжжа ад Віслы да Заходняй Дзвіны, а гэтаксама ніжні бег Нёмана з правымі прытокамі. Уся гэта мясцовасць была пакрыта ў вялікай колькасці лясамі, балотамі, азёрамі, рэкамі і рэчкамі. Глеба была няўродлівая і мала спрыяла для развіцця ральніцкай культуры. Да канца X ст. няма простых даных аб ліцвінах. З гэтага моманту ў жыццях святога Вайцеха, у нямецкіх і польскіх хроніках і ў «Начальным летапісе» спатыкаюцца ўспаміны аб ліцвінах. Літоўскае племя дзялілася на шэраг этнаграфічных адзінак, жыўшых паасобку адна ад другой. Па правай прытоцы Нёмана — Віліі — размясцілася цэнтральнае племя — літва. На правым беразе Заходняй Дзвіны — летгола (латышы), а на левым — земігола. Паміж вусцямі Нёмана і Віслы жылі прусы. Жмудзь займала вадазбор ніжняга Нёмана. Паўвостраў паміж Рыжскай затокай і Балтыйскім морам быў заняты куронамі. Прытока Заходняга Буга — Нарва — была заселена яцвягамі.

**Культура ліцвінаў.** Ліцвіны, жывучы ў лясістых і водных мясцовасцях, займаліся паляўніцтвам, рыбацтвам і ральніцтвам, якое пад канец XII ст., асабліва ў яцвягаў, дасягнула значных вынікаў. Памяшканні ліцвінаў былі вельмі прымітыўны. Пераважнай формай памяшканняў была курная хата. З часам ліцвіны запазычылі ў суседзяў-славян цёплую хату і ў сваю чаргу пазнаёмілі з ёю фінаў. Апрача гэтага ліцвіны навучыліся ад смальнян ганчарніцтву, гарбарніцтву, вырабу войлаку, смалярніцтву, выкарыстанню воску, які яны звальвалі ў купы як зусім непрыгодную рэч. Рэлігійныя вераванні вызначаліся прымітыўнасцю і былі агульнаарыйскага пахаджэння. Яны складаліся пад уплывам сіл прыроды, якія дапамагалі ліцвіну ў яго гаспадарчай працы. Рэшткі рэлігійнага фетышызму выявіліся ў пашырэнні культу казулек і вужоў, у прынясенні ў ахвяру чорных курэй, парасят, кароў, белых коней. З працягам часу ў ліцвінаў складаецца культ продкаў, які захаваўся ў працягу доўгага часу і выяўляўся ў падтрыманні дамовага агню. З часам у ліцвінаў пашыраецца культ бога-гра-

мавіка — Перкуна. Ні святынь, ні спецыяльнага духавенства ў ліцвінаў не было. Набажэнства выяўлялася ў тым, што прадстаўнікі сем'яў і радоў прыносілі ахвяры. Замовы і заклінанні духаў, у якіх можна бачыць сляды фінскага ўплыву, былі надта пашыраны. Ліцвіны верылі ў несмяртэльнасць душы, спадзеючыся ў замагільным жыцці або нагароды, або кары. Жыццё кожнага чалавека ў паасобку знаходзіцца ў залежнасці ад лёсу, працівіцца якому лічылася грэхам. З верою ў замагільнае жыццё і надыход суднага дня цесна звязаны літоўскія пахавальныя абрады. Найбольш пашыранай формай пахаванняў з'яўляецца трупаспаленне. Разам з памёршым палілі і тыя рэчы, якія ў гэтым жыцці былі асабліва дарагія памёршаму. Сюды адносіцца зброя, а часамі жонка і слугі. Апрача гэтага, з нябожчыкамі палілі кіпцюры барса і кіпцюры мядзведзя, каб даць магчымасць нябожчыку хутчэй узабрацца на вяршыню гары, на якой усе памёршыя будуць рабіць справаздачу з пражытага на зямлі жыцця. Попел, які застаўся ад нябожчыка, збіраўся ў урну і закапваўся ў зямлю. Над ім насыпалі курган. У пэўныя дні пасля смерці наладжваліся памінкі, на якіх былі прысутны ўсе сваякі, у поўным маўчанні прымаўшыя памінальныя стравы. Другой формай пахавання было трупапахаванне. Гэта была горшая форма пахавання. Ёю карысталіся толькі бедныя ліцвіны. Радавы ўклад, які захаваўся ў працягу доўгага часу дзякуючы ўмовам геаграфічнага размяшчэння пляменняў, аддзеленых адно ад другога рэкамі і лясамі, быў першапачатковай грамадскай формай арганізацыі літоўскіх пляменняў. З радавым укладам звязана і існаванне крывавае помсты.

**Суседзі ліцвінаў.** Самымі блізкімі суседзямі ліцвінаў былі палякі, галіцка-валынскія і полацкія князі. Палякі пранікалі на тэрыторыю, занятую літоўскімі пляменнямі. Польская каланізацыя была значна пашырана ў зямлі прусаў. Разам з польскай каланізацыяй пранікала і хрысціянства. Каталіцкі місіянер Войцех, быўшы пражскі біскуп, каля 1002 г.[1] адправіўся на тэрыторыю прусаў. Навучанне святога Войцеха скончылася няўдачна — прусы забілі яго і яго спадручных. Гэты самы лёс спаткаў і другога місіянера — Бруна — арцыбіскупа саксонскага. Польскі кароль Баляслаў Храбры ў кару за гэта ў 1010 г. спустошыў тэрыторыю прусаў. Праз 100 год Баляслаў III зрабіў вялікі набег на прусаў і папаліў многа мястэчак і сёл. З гэтага моманту паходы палякоў на прусаў становяцца частымі. Славянскі элемент даволі рана пранік на тэрыторыю Літвы. Славянскія назовы рэк сведчаць аб ранняй славянскай каланізацыі. Да XII ст. уся мясцовасць паміж Віллёй і Прыпяццю была населена славянамі і называлася рускай. Побач з мірнай каланізацыяй мелі месца і ваенныя стычкі. Галіцка-валынскія і полацкія князі часта нападалі на ліцвінаў, робячы паходы ўглыб іх тэрыторыі. Асабліва часта былі паходы полацкіх князёў у працягу XI—XII стст. Следам за набегамі князёў па рэках і рэчках насоўвалася славянскае насяленне. Гэтак званая Чорная Русь, з гарадамі Горадня, Ваўкавыск, Слонім і Навагрудак, была заселена выходцамі з Полацкае зямлі. Са свайго боку

[1] 997 г.

і літоўскія князі рабілі набегі на сваіх суседзяў, асабліва ў канцы XII ст. і ў пачатку XIII ст. Ноўгарадская, Полацкая і Смаленская землі не раз пераносілі спусташальныя літоўскія набегі. Не ўхіліліся ліцвіны ад зносін і з нарманамі, якія ў IX ст. пранікалі ў Літву па Нёмане, спачатку як разбойнікі і грабежнікі, руйнуючы і спусташаючы ўсё тое, што ім пападалася на шляху. У другі перыяд нарманы паяўляліся як мірныя пасяленцы, жадаючы наладзіць з ліцвінамі гандлёвыя сувязі і адносіны. Скандынаўская сага VIII ст. перадае апавяданні аб конунгу Івару Відфаму, які з дружынай заваяваў паўднёвыя берагі Балтыйскага мора, а ўнук яго — Гаральд Златазубы заваяваў усходнія берагі Балтыйскага мора. З XIII ст. ліцвіны стыкнуліся з новым і пры гэтым вельмі небяспечным ворагам у асобе немцаў, паявіўшыхся ў канцы XII ст. Утвораны тут Закон мечаносцаў спачатку жыў самастойным жыццём і не імкнуўся да каардынавання сваіх дзеянняў з Законам тэўтонскім, які ўтварыўся паміж Нёманам і Віслай крыху пазней Закона мечаносцаў па запрашэнні Конрада Мазавецкага для барацьбы з прусамі, з якімі ён сам не быў у сілах справіцца. Гэта дало магчымасць Тэўтонскаму закону думаць аб заваяваннях для саміх сябе. Суседства з Тэўтонскім законам мела вялікае значэнне для мечаносцаў, палітычнае ўмацаванне якіх утварала напружаныя адносіны паміж Лівонскаю царквою і Законам з тае прычыны, што магістр стараўся падчыніць сабе Лівонскую царкву. Не адчуваючы сябе даволі сільным, магістр Закона звярнуўся за дапамогаю да свайго суседа, але гэта не дало пажаданых вынікаў. Толькі ў 1237 г., калі мечаносцы на зваротным шляху пасля свайго пераможнага паходу на Літву былі ўшчэнт разбіты ліцвінамі і земіголай[1] і калі за гэтым выбухла паўстанне жмудзінаў і куронаў, — толькі тады адбылося аб'яднанне абодвух Законаў. Паўстанне літоўскіх пляменняў пагражала Закону поўным знішчэннем. Каталіцкія біскупы — рыжскі, дэрпцкі і эзельскі — звярнуліся да папы з просьбай даць згоду на злучэнне абодвух Законаў. Пад уплывам небяспекі, пагражаючай Закону, папа Грыгоры IX даў на гэта сваю згоду. Разам з гэтым аб'яднаны Закон перастаў падчыняцца рыжскаму біскупу.

**Ліцвіны і немцы.** Злучэнне абодвух Законаў у хуткім часе дало дадатныя для немцаў вынікі. Паўстанне было ўсмірана. Закон атрымаў магчымасць у далейшым цягу праводзіць спыненую на час зачэпную палітыку. Пасля таго як Аляксандр Неўскі разбіў немцаў на лёдзе Пскоўскага возера[2] ў 1242 г., зараз жа выбухла паўстанне земіголы і куронаў. Перавага феадальна-ваеннай арганізацыі над ліцвінамі і ўнутраная слабасць апошніх дапамагалі немцам у іх барацьбе з ліцвінамі, у якіх рыцары адбіралі землі, абкладалі насяленне падаткамі і прымушалі гвалтам прымаць хрысціянства. Прыбалтыйскія і падзвінскія літоўскія племені папалі ў залежнасць ад Закона. Толькі Жмудзь і Літва захавалі сваю незалежнасць. Аднак падбітыя племені не раз паднімалі паўстанні, якія звычайна канчаліся няўдачаю і яшчэ пагоршвалі становішча пераможаных.

[1] У бітве каля Шаўляя ў 1237 г.

[2] Чудскае возера.

**Распад роду.** Барацьба з суседзямі, асабліва з немцамі, спрыяла распаду роду і ўтварэнню першасковых форм тэрытарыяльнага аб'яднання з мэтай самаабароны. Унутры роду адбываўся падобны ж працэс. Старыя радавыя арганізацыі распаліся. Эканамічна больш дужыя асобы, выдзеліўшыся з роду, падпарадкавалі сабе больш слабыя радавыя элементы, якія сталі да іх у асабіста залежныя адносіны. Такіх князькоў было вельмі многа паміж ліцвінаў, жмудзінаў і яцвягаў. Канечнасць абараняць падуладную краіну ад набегаў Закона прымушала радавых князькоў завязваць паасобныя дамовы. Але гэткія князёўскія федэрацыі гэтак шпарка распадаліся, як і ўтвараліся. Паміж гэтых князькоў з цягам часу паявілася палітычная няроўнасць. Адны сталі багацей, умацаваліся, другія зубожалі і апусціліся. Галіцкі летапіс і нямецкія храністы прыгадваюць аб існаванні паміж ліцвінаў нейкіх малодшых і старэйшых князёў.

**Пачатак аб'яднання.** Утварэнне больш буйных тэрытарыяльных аб'яднанняў пацягнула за сабой спробу палітычнага аб'яднання ліцвінаў, якая, аднак, закончылася няўдачна і звязана з імем Міндоўга, аднаго з найбольш значных тэрытарыяльных князькоў. Міндоўгу ўдалося паставіць у залежнасць ад сябе большую частку Літвы. Нямецкая хроніка называе яго каралём літоўскім. Аснаўным ядром, вакол якога вырасла Літоўскае княства, была этнаграфічная Літва, якая займала правыя прытокі Нёмана, асабліва раку Вяллю. Міндоўг захапіў гэтак званую Чорную Русь, краіну на левых прытоках Нёмана з галоўным горадам Навагрудкам, які стаў цэнтрам утворанага Літоўскага княства. Гэтак старажытная Полацкая калонія склала частку новага Літоўскага княства. З Чорнай Русі Літоўскае княства пашыралася ва ўсе бакі, галоўным чынам на паўднёвы ўсход. Геаграфічнае палажэнне Чорнай Русі спрыяла таму, што яна стала цэнтрам Літоўскага княства. Утворанае Літоўскае княства к 1250 г. стала даволі грозным і сільным для суседзяў, якія ў свой чарод не маглі дапусціць палітычнага ўмацавання Літвы. Супроць Міндоўга ўтварылася кааліцыя ў складзе галіцка-валынскіх князёў на чале з Данілам Раманавічам, палякаў і Закона мечаносцаў. Унутры княства, дзякуючы барацьбе Міндоўга са сваімі сваякамі, утваралася вельмі напружаная атмасфера. Яго дзядзька Выконт і пляменнікі Таўцівіл і Эдзівіл уцяклі да галіцка-валынскіх князёў з просьбай аб дапамозе. Калі апошняя была абяцана, Таўцівіл адправіўся да магістра Лівонскага закона, дзе прыняў каталіцызм і тым самым здабыў сімпатыю начальніка Закона. Галіцка-валынскія князі і нямецкі Закон знайшлі падтрыманне ў жмудзі і яцвягах, князькі якіх не хацелі падчыняцца цэнтралістычным імкненням Міндоўга. Каб аслабіць сваіх праціўнікаў, Міндоўг дабіўся асабістага спаткання з магістрам Закона і выказаў пажаданне ахрысціцца. Гэты палітычны манеўр, дзякуючы якому Міндоўг станавіўся пад апеку папы Інакенція IV, адхіліў стычку з грозным праціўнікам. Мала гэтага, па загаду папы кульмскі біскуп каранаваў Міндоўга каралеўскаю каронаю (1253). Пакуль вяліся перагаворы з Законам, галіцкі князь Даніла спустошыў значную частку Літвы і захапіў горад Горадню. Сама сталіца Літоўскага княства знаходзілася пад пагрозай. Аднак Міндоўгу ўдалося за пасярэдніцтвам сына Войшалка пагадзіцца з галіцкім

князем. Войшалк адправіўся ў Холм, дзе прыняў хрысціянства паволе праваслаўнага абраду. Умовы міру з галіцкімі князямі былі даволі цяжкія. Чорная Русь пераходзіла на васальных правах да сына галіцкага князя — Рамана. Найвышэйшы суверэнітэт заставаўся за Міндоўгам. Аслабленне кааліцыі прымушала яцвягаў і жмудзь падчыніцца Міндоўгу. Пагадзіўшыся з галіцкімі князямі, Міндоўг, які ў працягу 10 год быў прыяцелем аб'яднанага Закона і якому ён выдаў граматы на яцвяжскія і жмудскія землі, раптам змяніў фронт у адносінах да Закона і, з прычыны яго агрэсіўных крокаў супроць жмудзі і яцвягаў, пачаў супроць Закона вайну, вярнуўшыся перад гэтым да паганства. Апынуўшыся на чале паўсталых ліцвінаў, жмудзі, яцвягаў і прусаў, Міндоўг разбіў Закон. Нарэшце аслабленая Полацкая зямля падпала пад уплыў Міндоўга. Літоўскі летапіс, гэтак званы «Быхаўца», называе Міндоўга самаўладцам усёй Літоўскай зямлі. Аб'яднаўчая палітыка Міндоўга выклікала пратэст з боку групы нездаволеных князёў, якія не хацелі быць падручнымі Міндоўга. Нездаволеныя зрабілі змову і, выкарыстаўшы тое, што Міндоўг пасля смерці сваёй жонкі ажаніўся з жонкай князя Даўмонта, пастанавілі пазбавіцца яго. Увайшоўшы ўночы ў яго пакой, змоўнікі пасеклі яго на часткі (1263). Маладое княства па смерці Міндоўга палітычна развалілася. Пачаліся ўнутраныя няладзіцы, якія пацягнулі за сабою аслабленне замежнага ўплыву дзяржавы. Зноў распачаліся наезды немцаў на літву і латышоў. Літоўскаму пляменню пагражала новая небяспека нацыянальнага падняволення.

**Дамовая дынастычная барацьба.** Па смерці Міндоўга ў Літве ўтварыліся дзве партыі: адна нацыянальная, якая моцна трымалася літоўскае старасвеччыны і паганства, другая паддавалася беларускаму ўплыву. Прадстаўнік першае партыі — Транята, брат Міндоўга, быў хутка забіты[1]. На чале беларускай партыі стаяў сын Міндоўга Войшалк, які люта расправіўся з забойцамі свайго бацькі. Князь Даўмонт быў прымушаны эміграваць у горад Пскоў, дзе і быў у працягу трыццаці пяці год князем[2]. Каб умацаваць свой уплыў і забяспечыць сябе супроць немцаў, Войшалк стараўся аб'яднаць сваё княства з Галіцыяй і Валыншчынай. Аднак гэта палітыка не дасягнула сваёй мэты і прывяла Войшалка да барацьбы, які ў 1268 г. пасля смерці Шварна Данілавіча[3], былшага князем літоўскім з часоў удалення Войшалка ў манастыр, зноў вярнуўся на літоўскі пасад. Барацьба, якая распачалася паміж Левам Данілавічам і Войшалкам, скончылася забойствам Войшалка[4]. Пасля смерці апошняга перамога была на баку нацыянальнае партыі, прадстаўніком якой з'явіўся Трайдзень Рамундавіч (1270—1282), князь Альшанскі, які ў працягу трох год упарта змагаўся з галіцка-валынскімі князямі. Пасля таго як з апошнімі была заключана згода, Трайдзень ваяваў з палякамі і немцамі за прусаў. Гэтую барацьбу выкарыстаў Даўмонт і заняў часова Полацк. Калі Трайдзень быў забіты, Даўмонт з палачанамі і пскавіцянамі спрабаваў захапіць Літоўскае княства, але гэтая спроба закончылася няўдачаю. Распачалася анархія, якая спрыяла ўмацаванню немцаў.

---

[1] 1264 г.

[2] Даўмонт, у хрышчэнні Цімафей, князь пскоўскі (1265—1299).

[3] 1270 г.

[4] 9 снежня 1268 г.

**Утварэнне Літоўска-Беларускага княства.** Націск немцаў спрыяў адраджэнню аб'яднаўчых імкненняў паміж ліцвінамі. Ініцыятыва ішла ад жмудзінаў, найбольш цярпеўшых ад нападу тэўтонска-лівонскіх рыцараў, якіх падтрымлівалі палякі. Увасабленнем гэтага настрою з'явіўся Віцень (1295—1316), якому ўдалося аб'яднаць у сваіх руках Жмудзь, Літву і Чорную Русь. Дзякуючы гэтаму Віцень мог даць адпор немцам і гэтым самым умацаваць сваю маладую дзяржаву. З імем Віценя звязан шэраг паходаў супроць немцаў, у якіх перамогі змяняліся няўдачамі, узмацняўшымі еднасць Літоўскага княства. У 1314 г. мечаносцы выступілі супроць ліцвінаў і, спусташаючы ўсё на сваім шляху, дайшлі да Навагрудка, які спалілі, а жыхароў перабілі. У гэты момант ліцвінам удалося зайсці ў тыл немцам, якія дзякуючы гэтаму былі прымушаны адступіць. Пабачыўшы, што па дарозе ўсе склады зніштожаны, рыцары пачалі шпарка адступаць. Гэтае адступленне хутка перайшло ў навальныя ўцёкі. Пасля смерці Віценя, забітага громам, аб'яднаўчая палітыка не прыпыняецца. Дзякуючы спрыяючым знадворным умовам сыну Віценя — Гедзіміну (1316—1341) удалося не толькі ўмацаваць Літоўска-Беларускае княства, але і пашырыць яго на ўсход коштам суседніх беларускіх і ўкраінскіх зямель, у далучэнні якіх Гедзімін бачыў новую сілу дзеля барацьбы з тэўтона-лівонскімі рыцарамі. Пашырэнне тэрыторыі новага княства адбывалася даволі шпарка. Суседнія краіны, адчуваючы патрэбу ў больш дужых абаронцах, ахвотна прызнавалі над сабою верхаводства вялікага князя. Полацкая зямля была далучана да Літвы яшчэ да Гедзіміна[1]. Шлюб Альгерда з Марыяй, дачкой віцебскага князя, перадаў Літве Віцебскую зямлю (1320). Альгерд стаў княжыць у Віцебску. У хуткім часе і менскі князь стаў падручным літоўскага князя (1326). Гэткім чынам уся Полацкая зямля да пачатку XIV ст. увайшла ў склад тэрыторыі новага князя. Пры Гедзіміну турава-пінскія князі, якія стараліся вызваліцца ад галіцка-валынскіх князёў, наладзілі зносіны з літоўскім князем і прызналі яго суверэнітэт. Адначасна была далучана і Берасцейская зямля з гарадамі Бярэсце, Камянец, Кобрын, Дарагічын і Мельнік, князі якой стараліся вызваліцца ад галіцка-валынскіх князёў. Уплыў Гедзіміна пашырыўся і на ўкраінскія землі, Кіеў і Пераяслаў. У палове XIV ст. дзяржава Гедзіміна пашыралася на ўсход да Сожа, Бярэзіны і ніжняй Прыпяці. Гэткае пашырэнне вяло да немінуючай стычкі са Смаленскай зямлёй. Пры сыну Гедзіміна — Альгерду (1345—1377) пашырэнне тэрыторыі адбывалася ў далейшым цягу. Увага Альгерда была звернута на ўкраінскія землі. Альгерд выгнаў з Кіева князя Фёдара Святаславіча і пасадзіў у ім свайго сына Уладзіміра. Пераяслаўская зямля, якая цягнулася да Кіева, падпарадкавалася Літве. Скарыстаўшы з няладзіц у Ардзе, Альгерд задаў татарам вялікае паражэнне на Сініх Водах (1363), пасля якога ўсходняе Падолле было занята сынамі Карыята Гедзімінавіча. Няладзіцы ў Ардзе далі магчымасць Альгерду пашырыць сваю ўладу на Чарнігава-Северскія землі, унутры якіх адбываліся звычайныя бязладдзі (1356). Найбольш буйныя гарады — Чарнігаў і Труб-

[1] 1307 г.

чэўск, Бранск і Ноўгарад-Северскі былі перададзены сынам Альгерда, а Старадуб – аднаму з яго пляменнікаў. Рэшта гарадоў засталіся з ранейшымі князямі (Навасільскімі, Бельскімі, Адоеўскімі і г. д.). Нарэшце Валынская зямля была захоплена Любартам Гедзімінавічам, зяцем аднаго з валынскіх князёў. За Валынь распачалася працяглая барацьба з Казімірам, каралём польскім. Паводле дамовы 1366 г. Літве былі звернуты Луцкая, Уладзімірская, Бельская і Холмская землі, але літоўскія князі Холма і Бельза прызнавалі сябе васаламі польскага караля. Польска-літоўскія адносіны нядоўга былі мірнымі. Узнавілася барацьба за галіцка-валынскае наследдзе, якая закончылася толькі ў 1382 г., калі памёр Людовік Венгерскі, наследнік Казіміра, доўга і ўпарта ваяваўшы з Літвой. К гэтаму часу ўся Валынь, за выключэннем Холма і Бельза, увайшла ў склад уладанняў Любарта Гедзімінавіча. Нарэшце вадазбор верхняга Дняпра быў далучаны да Літвы пасля таго, як Вітаўт захапіў Смаленск (1404). Дзякуючы пашырэнню тэрыторыі новаўтворанае дзяржавы палітычным цэнтрам маладога княства стала Вільня, пабудованая пры ўтоцы Вяллі ў Нёман. Заснаванне Вільні легенда прыпісвае князю Гедзіміну. Палітычнае ўмацаванне Вільні – вынік яе геаграфічнага палажэння. З Вільні было выгадней і лягчэй сачыць за палітыкай Закона ў адносінах да Літвы. Праз Вільню праходзіць гандлёвы шлях да Балтыйскага мора, які меў вялікае значэнне для яе эканамічнага і палітычнага развіцця. Рака Вялля злучала ўсходнія прыдняпроўскія і прыдзвінскія краіны з заходняй часткай дзяржавы – уласна літоўскай. Вільня стала стольным горадам новае дзяржавы, у якім знаходзіліся ўсе ніці абароны граніц ад бліжэйшых суседзяў – немцаў і татараў. Палітычнае падвышэнне Вільні азначала заняпад Кіева як цэнтра эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця прыдняпроўскага і часткай прыдзвінскага славянства. Палітычнае ўмацаванне Вялікага княства Літоўскага знайшло свой адбітак у тытуле вялікага князя, які пачаў цяпер называцца «Літоўскім, Жмудскім і Рускім».

**Адносіны да немцаў.** Барацьба з немцамі, якая вылілася ў такія вострыя формы пры Гедзіміну і якая ў значнай меры спрыяла аб'яднанню паасобных краін, займала выдатнае палітычнае месца і пасля смерці закладчыка Літоўскага княства. Закон не мог пагадзіцца з умацаваннем свайго суседа і амаль не штогод рабіў набегі на літоўскія землі, дзе спатыкаў адпор з боку кіраўнікоў абароны княства. Барацьба з Законам адбывалася з пераменным поспехам, прыносіла то перамогі, то паражэнні для літоўскае стараны, але ўрэшце Літве пры дапамозе беларускага войска ўдалося спыніць націск Закона на Літву. Барацьба з Законам, узмацняючы палітычна Цэнтральную Літву, самым цесным чынам злучала акраіны з цэнтрам. Асабліва цяжкім было становішча маладое дзяржавы пасля смерці Гедзіміна, калі Вільня знаходзілася пад уладай яго малодшага сына Яўнута. У 1345 г. Закон задумаў вялікі паход на Літву. У гэтым паходзе павінны былі прыняць удзел і ваенныя сілы Заходняй Еўропы ў асобе каралёў венгерскага і чэшскага, а гэтаксама і іншых герцагаў і графаў. Становішча Літвы пры слабым вялікім князю было вельмі цяжкім. Канечна трэба было прыняць надзвычайныя крокі супроць пагражаючай небяспекі. Усе гэтыя ўмовы

спрычыніліся да дынастычнага перавароту — Яўнут быў выгнаны з Вільні Кейстутам і стольны горад перададзены Альгерду. Абодва браты пачалі энергічна рыхтавацца да адпору наезнікаў-рыцараў. Абарона граніц удалася, а ўсё нямецкае і саюзнае войска было разбіта[1]. Спроба Закона падбіць сабе Літву закончылася поўнай няўдачай. Закону прыходзілася змяняць сваю тактыку ў адносінах да Літвы і спрабаваць дабіцца свайго павольным паступовым пранікненнем у глыб Літвы. Закон распачаў энергічна будаваць замкі з тою мэтай, каб адсюль нападаць на Літву. Са свайго боку і Літва пачала будаваць крэпасці. Былі пабудованы замкі ў Вільні, Троках, Крэве, Лідзе. Уся абарона заходніх краін ад немцаў знаходзілася ў руках Кейстута — брата Альгерда.

У працягу 1345—1382 гг. тэўтонскія рыцары зрабілі шэсцьдзесят шэсць нападаў на Літву, а ліцвіны — трыццаць шэсць нападаў на Прусію. У гэты ж перыяд часу лівонскія рыцары нападалі трыццаць разоў на Літву, а ліцвіны — дзесяць разоў на Лівонію. У часе аднаго з такіх нападаў Кейстут трапіў у палон і быў адвезены ў замак Марыенбург, адкуль яму ўдалося ўцячы. Удалая барацьба Кейстута з немцамі павялічвала палітычны ўплыў новае дзяржавы і ўзмацняла аўтарытэт вялікага князя літоўскага.

**Літва і Паўночна-Усходняя Русь.** Утварэнне Літоўска-Беларускай дзяржавы адбывалася адначасна з утварэннем Вялікарускае дзяржавы — Маскоўскага княства, умацаванне якога не адпавядала інтарэсам Вялікага княства Літоўскага. Інтарэсы абедзвюх дзяржаў стыкаліся на верхнім Дняпры, куды пакіроўвалася маскоўская палітыка, у Ноўгарадзе, дзякуючы гандлю якога Літва магла падтрымліваць гандлёвыя сувязі з Захадам. Умацаванне ў Ноўгарадзе маскоўскага ўплыву істотным чынам павінна было адгукнуцца на гандлёвых сувязях Літвы з Захадам. Каб аслабіць Маскоўскае княства, Літва старанна шукае сабе саюзнікаў, падтрымлівае ўсе супроцьмаскоўскія сілы, не заўсёды лічачыся з іх геаграфічным палажэннем і запраўднай магчымасцю даць істотнае падтрыманне.

**Літва і Ноўгарад.** Пасля таго як Кіеўская дынастычная дзяржава развалілася, Ноўгарад стаў незалежнай гарадской рэспублікай, у якой арыстакратыя буйнога капіталу мела вялікае палітычнае значэнне ва ўнутранай палітыцы гарадской рэспублікі. Развіццё замежнага гандлю і каланізацыя ноўгарадскім баярствам вялізных абшараў, дасягаўшых за Урал, спрыяла награмаджэнню гандлёвага капіталу ў руках зямельнай і грашовай арыстакратыі і пацягнула за сабою пагаршэнне ў сацыяльных адносінах. Сацыяльная барацьба аслабляла палітычнае значэнне Ноўгарада і адчыняла шлях для чужаземнага ўплыву на палітыку ноўгарадскага ўрада. Маскоўскае княства, якое паступова палітычна ўмацоўвалася, у сваёй тэрытарыяльнай экспансіі і барацьбе з Цвер'ю немінуча павінна было стыкнуцца з Ноўгарадам. Масква старалася рабіць уплыў на ноўгарадскую ўнутраную палітыку. Масква старалася папаўняць княжы скарб

[1] Перамога беларуска-літоўскага войска над крыжакамі на рацэ Стрэве (прыток Нёмана) 2 лютага 1348 г.

тым спосабам, што накладвала на Ноўгарад кантрыбуцыю, што ўпершыню зрабіў князь Сымон Горды. Гэткая палітыка Масквы выклікала ў Ноўгарадзе апазіцыю, у склад якой уваходзіла зямельная і грашовая арыстакратыя. Не разлічваючы на свае ўласныя сілы, ноўгарадская арыстакратыя шукала падтрымання і дапамогі ў літоўскага князя, хаця геаграфічная аддаленасць Ноўгарада ад Літвы з'яўлялася істотнай перашкодай да актыўнага ўмяшання ў ноўгарадскія справы, нягледзячы на зацікаўленасць літоўскага купецтва ў падтрыманні з Ноўгарадам беспасярэдніх гандлёвых сувязей. Праціўнікі багатых класаў, трымаўшых у эканамічнай ад сябе залежнасці гарадскую беднату — «чорных людзей», арыентаваліся на Маскву, спадзеючыся зменшыць сваю эканамічную залежнасць. Літоўская арыентацыя не дала ноўгарадскім пануючым класам якіх-колечы палітычных пераваг. Сымон Горды, уступіўшы на тэрыторыю Ноўгарада, сабраў з некаторых краін дань, і літоўская партыя не мела сілы перашкодзіць Маскве пажывіцца коштам суседняй Ноўгарадскай рэспублікі. Маскоўская інтэрвенцыя павялічыла палітычны ўплыў маскоўскае партыі. Тады літоўская партыя звярнулася за дапамогай да Альгерда, які ўступіў на тэрыторыю Ноўгарада з вялікім войскам. Літоўская інтэрвенцыя абнадзеіла літоўскую партыю. Ноўгарад захваляваўся, партыйная барацьба незвычайна напружылася. Літоўская партыя святкавала на сваім баку перамогу. Прадстаўнік маскоўскае партыі — пасаднік Яўстафі Дваранiцаў быў забіты. Тады літоўская партыя распачала перагаворы з Альгердам. Атрымаўшы вялікую нагароду за інтэрвенцыю, Альгерд вярнуўся ў Літву. Палітычны ўплыў часова заставаўся на баку літоўскае партыі.

**Літва і Цвер.** Цверскае княства, раскінутае на верхнім бегу Волгі, на вялікім гандлёвым шляху з Ноўгарада на ўсход, у момант палітычнага ўмацавання Масквы было адным з найбольш эканамічна сільных і палітычна ўплывовых княстваў Суздальскае Русі. Палітычнае і эканамічнае ўмацаванне Масквы дало ноўгарадскаму гандлю іншы кірунак на Маскву, што, зразумела, аслабляла Цверскае княства. Барацьба Масквы і Цверы за вялікакняскі ярлык немінуча вяла да стычкі адной стараны з другой. Інтэрвенцыя Івана Каліты ў цверскія справы палітычна абяссіліла цверскага князя і эканамічна зруйнавала Цверскую зямлю. Агрэсіўная палітыка Масквы ў адносінах да Цверы набыла яшчэ вастрэйшы характар пры Дзмітрыю Данскім (1361—1389), які ўмяшаўся ў цверскія ўдзельныя спрэчкі і падтрымліваў князя Васіля Міхайлавіча Кашынскага ў яго прэтэнзіях на цверскі пасад. Супарам Кашынскага князя ў барацьбе за цверскі пасад быў Міхаіл Аляксандравіч, князь Мікулінскі, стаўшы цверскім князем пасля Васіля Міхайлавіча (1368). Дзмітры Іванавіч запатрабаваў ад Міхаіла Аляксандравіча, каб той пакінуў цверскі пасад, але на гэта атрымаў катэгарычную адмову. Пачалася барацьба Масквы з Цвер'ю. Цверскі князь звярнуўся за дапамогаю да свайго зяця Альгерда, які, не адкладваючы, з вялікім войскам уступіў у межы Маскоўскага княства і стаў спусташаць апошняе. Літоўская інтэрвенцыя закончылася разгромам Масквы. Войска князя Дзмітрыя было разбіта ў дзвюх крывавых бітвах. Дарога на Маскву была ад-

чынена. Альгерд свабодна заняў Маскву і размясціўся пад сценамі Крамля. Аднак Альгерд хутка пакінуў Маскву з прычыны стратэгічных меркаванняў. Праз год князь Дзмітры Іванавіч зноў распачаў барацьбу за Цвер, а гэта пацягнула за сабою новую стычку з Альгердам, гэтаксама хутка падышоўшым да Маскоўскага Крамля. Паход да Масквы князя Уладзіміра Андрэевіча Серпухоўскага прымусіў Альгерда завязаць мір з Масквой на ўмовах неўмяшання літоўскага князя ў цверскія справы (1371). Тады цверскі князь пастанавіў арыентавацца на Залатую Арду і дабіўся ад хана ярлыка на Уладзімірскае вялікае княжэнне. Але гэтая перамога над Масквой была кароткачасовай. Дзмітры Маскоўскі паспеў задобрыць хана і атрымаць ад яго вялікакняскі ярлык. Пачалася новая барацьба з Цвер'ю, у якой браў удзел князь Альгерд з братам Кейстутам. На гэты раз літоўская інтэрвенцыя закончылася няўдачна. Саюзнікі былі разбіты пры сяле Любуцеку (Калужская губ.), і Альгерду прыйшлося завязаць мір на ўмовах папярэдняе згоды (1372). Перамога ў Цверы засталася за Масквой.

**Літва і Масква.** Няўдалая інтэрвенцыя Альгерда ў маскоўска-цверскія адносіны не аслабіла напружаных адносін паміж Масквой і Літвой. Палітычнае ўмацаванне Масквы было небяспечным для Літоўскага княства. З гэтае прычыны, калі Маскве пагражала небяспека ад Мамая, то Ягайла запрапанаваў сваю дапамогу хану, які і прыняў гэту прапазіцыю. Але Ягайла спазніўся к моманту рашучай стычкі князя Дзмітрыя Маскоўскага з Мамаем на Кулікоўскім полі. Вялікі князь літоўскі знаходзіўся толькі ў пяцідзесяці вёрстах ад месца стычкі. Даведаўшыся аб тым, што Мамай разбіты, Ягайла паспешна адступіў (1380). Масква, разбіўшая татар, пакінула за сабой беларускія гарады Старадуб і Трубчэўск, захопленыя маскоўскім князем з прычыны ўцечкі ў Маскву князя Андрэя Альгердавіча і пераходу да маскоўскага князя Дзмітрыя Альгердавіча, які не пажадаў даць ваеннага адпору маскоўскаму націску. У рэзультаце барацьба Літвы з Масквою дала маладой Літоўска-Беларускай дзяржаве адмоўныя вынікі.

**Структура новае дзяржавы.** Літоўскае княства, пашырыўшы свае тэрытарыяльныя граніцы коштам суседніх беларускіх і часткаю ўкраінскіх зямель, разраслося ў вялікую Літоўска-Беларускую дзяржаву, якая абымала вадазборы верхняй і сярэдняй Заходняй Дзвіны, Нёмана, Заходняга Буга, Дняпра і верхняй Акі (гэта знача ўсю Літву і Беларусь, значную частку Украіны і невялікую частку Велікаросіі). Агульны працэс далучэння беларускіх і ўкраінскіх зямель у склад Вялікага княства Літоўскага вызначаў узаемныя адносіны Літвы і далучаных краін. Літоўскія вялікія князі абмяжоўваліся толькі павярхоўным прызнаннем сваёй улады. Ва ўнутраным кіраўніцтве далучаныя землі захоўвалі сваю самастойнасць. Князі дома Рурыкавічаў большай часткай засталіся на сваіх княжых пасадах, стаўшы толькі васаламі вялікага князя, абавязанымі яму ваеннай службай. Удзельныя князі кіравалі разам са сваімі баярамі, складаўшымі княжую раду. Паасобныя землі, як Чарнігава-Северская, Палессе і часткай Валынская, былі падзелены на дробныя

ўдзельныя ўладанні, але Полацкая, Віцебская і Кіеўская землі захоўвалі палітычную еднасць. Літоўска-Беларуская дзяржава выяўляла сабою федэрацыю краін, звязаных з цэнтрам вельмі нетрывалымі вузламі. Літоўская нацыянальнасць у новай дзяржаве з'яўлялася значнай меншасцю, распыленай у моры беларускага народа, хаця палітычная кіраўнічая роля ў гэту эпоху прыналежала ліцвінам.

**Эканамічны ўклад.** Літоўска-Беларуская дзяржава ў народна-гаспадарчых адносінах дзялілася на дзве часткі: заходнюю і ўсходнюю, што супадала і з ваенна-адміністрацыйным падзелам дзяржавы. Заходнія краіны былі звязаны з вадазборам Нёмана, а ўсходнія — з вадазборамі Дняпра і Заходняй Дзвіны. Славянская каланізацыя пакіроўвалася з усходніх краін у заходнія. Каланісты пасяляліся сёламі, супольнымі сіламі асвойваючы вольныя лясныя і зямельныя абшары. Распад радавых арганізацый паміж ліцвінаў спрыяў пашырэнню падобных паселішчаў і на літоўскай тэрыторыі. У эпоху ўтварэння Вялікага княства Літоўскага значна была пашырана княжая каланізацыя. Князі будавалі двары, заводзілі нівы, заклікалі для пасялення жыхароў, прыходзіўшых з Валыні і з Полацкае зямлі. Княжы двор становіцца цэнтрам дзяржаўнае гаспадаркі. Побач з княжай гаспадаркай існуе і прыватная панская гаспадарка, але права ўласнасці на зямлю пакуль што застаецца за вялікім князем. Нягледзячы на вольную княжую каланізацыю, сярэдзіна Літвы была слаба залюднена. Нязначная гушчыня насялення і вялікая колькасць лясоў прыпыняла паляпшэнне сельскагаспадарчае тэхнікі, хаця ў параўнанні з папярэдняй эпохай сельскае гаспадарства значна пасунулася наперад. Але і здабывальная прамысловасць, дзякуючы вялікай колькасці лясоў і рэчных вод, мела вялікае значэнне ў гаспадарчым жыцці краю. У мясцовасцях па Дзвіне і Дняпру пераважнае значэнне мела здабывальная прамысловасць. Бязмежныя лясныя пушчы і рэчныя воды давалі магчымасць насяленню займацца звералоўствам, пчалярствам, рыбацтвам. Ральніцтва тут мела ўтаразначны характар. У паўднёва-ўсходніх валасцях Валыншчыны і часткай Падолля сельскагаспадарчая культура ўжо пусціла глыбокае карэнне. Эксплуатацыя лясных промыслаў і рэчных багаццяў адступае на задні план. Дзякуючы геаграфічнаму палажэнню ў Літоўска-Беларускай дзяржаве значна быў развіты і гандаль. Гандлёвыя шляхі вызначаліся яе геаграфічным палажэннем. Дняпро звязваў Літоўска-Беларускую дзяржаву з рынкамі Крыма і Усходу. Вадазборы Заходняга Буга, Нёмана і Заходняй Дзвіны злучалі Літоўска-Беларускую дзяржаву з Захадам і ўцягвалі яе ў вір заходнееўрапейскіх эканамічных адносін. Гарады Вільня, Трокі, Бярэсце становяцца выдатнымі гандлёвымі цэнтрамі. Наданне гэтым гарадам у канцы XIV ст. гэтак званага магдэбургскага права, дзякуючы якому горад выасабняўся ад валасці і станавіўся самастойнай адміністрацыйна-гаспадарчай адзінкай, выключна звязана з развіццём замежнага гандлю. Галоўны гандлёвы шлях ішоў па Нёмане, хаця барацьба з немцамі і прыпыняла развіццё гандлю. Толькі пасля завязання з немцамі Торунскага міру (1411) гандлёвыя сувязі больш ажывіліся. Гандаль па Заходняй Дзвіне дзеля гэтых жа самых прычын меў дру-

гараднае значэнне. Паўднёвы літоўска-беларускі гандаль толькі зараджаўся. З Літвы, Беларусі вывозіліся футры, мёд, воск, дрэва, а прывозіліся з Еўропы прадукты заходнееўрапейскай апрацоўчай прамысловасці. Нягледзячы на развіццё замежнага гандлю, народная гаспадарка захоўвала свой натуральны характар. Наплываючы еўрапейскі капітал награмаджаўся пераважна ў руках князя, як самага багатага зямельнага ўласніка і галоўнага экспарцёра на еўрапейскі рынак. Навакол гаспадарскіх, княжых і панскіх двароў гуртавалася пэўная колькасць рамеснікаў, якія былі патрэбны для іх гаспадарак. Галоўнай сельскагаспадарчай рабочай сілай была «чэлядзь нявольная». Вольныя людзі, што жылі па-суседску з дваром, адбывалі павіннасці спецыяльнага характару. Гэтак паявіліся княжыя цяглыя людзі, якія выконвалі або якую-колечы спецыяльную павіннасць, або былі прамыслоўцамі, як, напрыклад, конюхі, канкаморцы, кабыльнікі, стаднікі, кухары, садоўнікі, рыбаловы, сакольнікі, бортнікі, баброўнікі, лаўцы, псарцы. Уся зямля разглядалася як гаспадарская айчына. Гаспадар быў адзіным правамоцным уласнікам. Удзельныя князі, стаўшыя з працягам часу буйнымі зямельнымі ўласнікамі, баяры, якія выдзеліліся з радавых арганізацый, дзяржалі зямлю пад гаспадаром, не маючы права ёю распараджацца. Сялянскае землеўладанне — старажытнага пахаджэння. Велічыня сялянскіх зямельных участкаў залежала ад складу рабочае сілы сялянскага двара. Гэткія зямельныя ўчасткі называліся «дворышчамі», «службамі», «печышчамі» і складаліся або толькі з адных сваякоў, або з сваякоў з чужымі элементамі. Члены гэткага тэрытарыяльнага саюзу называліся «сябрамі», «суседзямі», «таварышамі», «патужнікамі» і «дольнікамі».

**Грамадзянскі ўклад.** Літоўска-беларускае грамадства дзялілася на дзве групы: вольных і нявольных. Вышэйшую групу ў асяроддзі першых складалі гэтак званыя баяры, прадстаўнікі буйнога землеўладання, якія паспелі выдзеліцца з роду і падпарадкаваць сабе больш слабыя радавыя элементы. Гэта быў ваенны клас, звязаны з вялікім князем ваенна-павіннымі адносінамі. Літоўскае баярства было абавязана адбываць са сваіх зямель розныя натуральныя павіннасці, як то: пабудову новых гарадоў і направу старых, прывоз патрэбнага для пабудовы матэрыялу, каменняў, дроў, направа дарог, пабудаванне новых мастоў і направа старых. Апрача гэтага баяры былі абавязаны касіць сена ў княжых добрах, даваць стацыю ў выпадку прыезду князя і яго ўраднікаў і дастарчаць фурманкі. Баяры былі звязаны і натуральнымі павіннасцямі — давалі авёс і сена. У Літве і Жмудзі такія падаткі называліся «дзяклам». Рабочы клас, які складаў ніжэйшую групу вольных людзей, сядзеў на гаспадарскіх і часткаю ўласніцкіх духоўных і свецкіх землях. Рабочае насяленне выпаўняла са сваіх зямельных участкаў шэраг натуральных павіннасцей. На Беларусі і Украіне частка вольных людзей ужо ў XIV ст. папала ў эканамічную залежнасць ад дужэйшых і фактычна ўтраціла права пераходу. Гэта група насялення складала зародак паншчыны. Да рабочага класа адносіцца і «чэлядзь нявольная», «рабы». Крыніцамі рабства былі: палон, самапродаж, шлюб вольнага з нявольнай, праступленне і невыпаўненне прынятых на сябе матэрыяльных абавязан-

няў. Рабы не мелі ні грамадзянскай праваздольнасці, ні ўласнавольнасці. Нявольнае становішча было наследным і пераходзіла на патомства. Клас рабоў быў даволі значным і складаў асноўную рабочую сілу ў гаспадарскіх і прыватнаўласніцкіх маёнтках.

**Палітычны ўклад.** Літоўскія вялікія князі глядзелі на сваю дзяржаву як на айчыну. Грунтуючыся на айчынным праве, вялікія князі раздавалі паасобныя часткі тэрыторыі сваім сынам. Велічыня ўдзелу залежала выключна ад вялікага князя; аднак, нягледзячы на падзел дзяржавы на паасобныя тэрытарыяльныя адзінкі, князі, асеўшыя ў іх, не станавіліся ўдзельнымі князямі, бо падуладная ім тэрыторыя не з'яўлялася іх айчынай. Гэтак, Гедзімін яшчэ пры сваім жыцці падзяліў дзяржаву паміж сынамі: Монвідам, які атрымаў Кернаў і Слонім; Альгердам — Віцебск; Кейстутам — Бярэсце, Горадню і Жмудзь; Нарымунтам — Пінск, Тураў і Менск; Любартам — Валынь; Карыятам — Чорную Русь, але без Слоніма. Полацк знаходзіўся ў руках Воіна — брата Гедзіміна. Вялікім князем па смерці Гедзіміна стаў самы малодшы сын — Яўнут, які прымушаны быў ратавацца ўцечкай у Маскву (1345 г.). Яго вялікае княжэнне цягнулася нядоўга[1]. Кейстут і Альгерд, захапіўшы Вільню, учынілі дзяржаўны пераварот. На вялікакняскім пасадзе апынуўся Альгерд, а заходняя частка княства была перададзена Кейстуту. Вялікі князь Альгерд абавязваўся дзяліць з Кейстутам усё напалам, што яны здабудуць. Літоўска-Беларуская дзяржава фактычна раздзялілася на дзве паловы — заходнюю і ўсходнюю. На чале першай стаў Кейстут, на чале другой — уласна Літвы і Беларусі — стаў Альгерд. Адносіны паміж братамі да самай смерці Альгерда аставаліся прыяцельскімі. Удзельныя князі безадмоўна прызнавалі іх уладу. Кейстут бараніў княства ад нападаў мечаносцаў і сам не раз спусташаў рыцарскую тэрыторыю. У працягу 1345—1382 гг. тэўтонскія рыцары зрабілі шэсцьдзесят шэсць нападаў на Літву, а ліцвіны — трыццаць шэсць нападаў на Прусію. У той жа перыяд часу лівонскія рыцары трыццаць разоў нападалі на Літву, а ліцвіны — адзінаццаць разоў на Лівонію. У часе аднаго з такіх нападаў Кейстут быў захоплены ў палон і адвезены ў Марыенбург, адкуль яму ўдалося ўцячы. Увага Альгерда была пакіравана на ўсход, на суседнія беларускія і ўкраінскія землі. Удачная барацьба Кейстута з немцамі паднімала палітычны ўплыў новае дзяржавы, але вялікакняская ўлада заставалася ў руках Альгерда, як найбольш сільнага з усіх удзельных князёў. Альгерд пакінуў дванаццаць сыноў, якія атрымалі ўдзелы яшчэ пры жыцці свайго бацькі. Старшым у родзе заставаўся Кейстут, а старшым сынам Альгерда быў Андрэй, які княжыў у Полацку. Але вялікім князем па жаданні Альгерда стаў Ягайла, сын ад другой жонкі Юліяны Цвярской. Кейстут прызнаў найвышэйшую ўладу свайго пляменніка, але добрыя адносіны паміж імі трывалі нядоўга. Ягайла баяўся Кейстута і, каб пазбавіцца яго, завязаў зносіны з немцамі. Тады Кейстут захапіў Вільню і прагнаў свайго пляменніка. У распачатай барацьбе частка ўдзельных князёў становіцца на старану Ягайлы,

[1] 1341—1345 гг.

а другая — на старану Кейстута. У часе барацьбы Кейстут быў забіты, і Ягайла заняў віленскі пасад. У руках Ягайлы апынуліся Віцебск, Менск, Мсціслаў, Навагрудак, Літва і Жмудзь. Шмат з удзельных князёў было выгнана з іх пасадаў. Затое Ягайла зблізіўся з братам Скіргайлам, аддаўшы яму Трокскае княжэнне.

**Паміжкнязёўскія адносіны.** У перайманні вялікакняскага пасаду не было ніякай пэўнай сістэмы. Пасад даставаўся звычайна дужэйшаму князю. Літоўска-Беларуская дзяржава выяўляла сабой шэраг паасобных княжэнняў, падлеглых вялікаму князю. У руках апошняга знаходзілася значная тэрыторыя, складаўшая яго ўдзел, велічыня якога давала магчымасць князю трымаць у залежнасці ад сябе ўдзельных князёў; адносіны апошніх да вялікага князя вызначаліся княжымі ўмовамі і прысяжнымі граматамі і фактычна прымалі форму абяцання вернае службы і ваеннае дапамогі. Вялікія князі не цырымоніліся з удзельнымі князямі і адвольна пазбаўлялі ўдзелаў то адных, то другіх князёў. Становішча вялікакняскай улады пры Ягайлу было не зусім трывалым. Краінныя князі ў саюзе з немцамі імкнуліся аслабіць вялікакняскую ўладу. Асабліва быў небяспечны Вітаўт — сын Кейстута, які дабіўся таго, што яму былі вернуты адабраныя бацькаўскія воласці — Горадня і Бярэсце. Не атрымаўшы Трокскага княжэння, Вітаўт быў гатовы распачаць зносіны з немцамі, каб абараніць свае палітычныя правы. Небяспека з боку ўнутраных і знадворных ворагаў прымусіла Ягайлу прыняць прапазіцыю польскіх паноў — ажаніцца з каралеваю Ядвігай і падпісаць шэраг важнейшых абавязанняў, на моцы якіх Літва і Польшча злучаліся ў адну дзяржаву. Унія была спаткана ў Літве варажна. Увасабленнем гэтага настрою з'явіліся літоўскія баяры на чале з Вітаўтам, якому ўдалося замацавацца на вялікакняскім пасадзе і дагаворамі азначыць свае адносіны да Польшчы.

**Знішчэнне ўдзельнага ладу.** У адносінах да ўдзельных князёў Вітаўт у далейшым цягу праводзіў палітыку Ягайлы. Гэткім чынам Скіргайла, галоўная апора Ягайлы, прымушаны быў расстацца з Полацкім і Трокскім княствамі. Свідрыгайла Альгердавіч, што сядзеў на Віцебскай зямлі, павінен быў пакінуць княжы пасад. Уладзімірская зямля была адобрана ад Фёдара Любартавіча, Ноўгарад-Северская — ад Карыбута. З Кіева быў выгнаны Уладзімір Альгердавіч. Сыны Карыята Гедзімінавіча павінны былі расстацца з Падольскай зямлёй. Выгнаныя князі атрымалі ўдзелы ў іншых месцах, але ў часовае ўладанне. З князёў-айчыннікаў яны ператварыліся ў слуг вялікага князя, захаваўшы некаторыя княжыя правы. Самастойнасць удзельных княстваў знікла. Насяленне краін заставалася верным Вітаўту, бо краіны атрымалі ўстаўныя граматы, забяспечаўшыя ім унутраную аўтаномію. Гэтыя граматы атрымалі пацвярджэнне пры Казіміру, Аляксандру, Жыгімонтах. Аўтэнтыкі грамат Вітаўта не захаваліся. Улада вялікага князя была неагранічана і датычыла ўсіх бакоў жыцця гаспадарства. Каля вялікага князя знаходзілася «рада», як бы курыя васалаў, у якой прымалі ўдзел асобы са складу буйных землеўласнікаў. Рада мела дарадчае значэнне. Запрашэнне ў раду залежала ад волі вялікага князя. Адначасна

са знішчэннем удзелаў у краіны былі назначаны намеснікі вялікага князя, а ў лічныя гаспадарскія двары для загадвання гаспадаркаю, а гэтаксама для суду над мясцовым насяленнем і збору падаткаў былі пасаджаны намеснікі і цівуны. Эксплуатацыя гаспадарскіх двароў давала вялікаму князю значныя сродкі. Гэта ўзмацняла матэрыяльнае становішча і павялічвала ўладу і значэнне вялікага князя. Існаванне буйнога княскага і панскага землеўладання і паяўленне страціўшых права пераходу сялян спрыяла зараджэнню сацыяльнага феадалізму.

**Царква і дзяржава.** Паяўленне ў зямлі прусаў Тэўтонскага закона пацягнула за сабою гвалтоўнае пашырэнне хрысціянства. Паганская Літва моцна трымалася за веру продкаў і пры першай жа магчымасці варочалася зноў да старое веры. Паўстанцы забівалі каталіцкіх місіянераў, вырэзвалі каталіцкае духавенства, разбурвалі касцёлы. Літоўскія паганцы глядзелі на каталіцызм як на прыладдзе палітычнага і эканамічнага падняволення. З пашырэннем каталіцызму ўводзілася царкоўная дзесяціна як прымусовы збор, абавязковы для ўсіх. Кейстут увесь час заставаўся на чале паганскае партыі, якая бараніла нацыянальную незалежнасць. Пры Альгерду папа Грыгоры IX звярнуўся з лістом да літоўскіх князёў з мэтай пераканаць іх прыняць хрысціянства. Аднак каталіцызм усё-ткі хаця і паволі, але распаўсюджваўся паміж літоўскай арыстакратыі. Гэткім чынам прыняў каталіцызм ваявода Альгерда Гаштольд, які заложыў францішканскі манастыр, разбураны гарадской паганскай партыяй у часе паходу Альгерда на Маскву. Духавенства было замучана. Калі Альгерд вярнуўся дамоў, то, паводле слоў летапісца, было пакарана смерцю да пяцісот чалавек. Францішканскі манастыр быў зноў адбудованы, але не на старым месцы, а па-за горадам. Геаграфічнае суседства, эканамічныя і палітычныя зносіны з беларусамі спрыялі дабравольнай хрысціянізацыі Літвы. Праваслаўе пранікла ў сферу княжай і часткай баярскай арыстакратыі. Паводле слоў польскага храніста Стрыйкоўскага, ці не ўсе князі Гедзімінавічы прынялі хрысціянства паводле праваслаўнага абраду. Энергічнымі місіянеркамі былі абедзве жонкі Альгерда: Марыя Віцебская і Юліяна Цвярская. Палац князя стаў штабам праваслаўя. Пры падтрыманні ўлады і на яе сродкі будаваліся святыні. У царкоўных адносінах праваслаўная царква падлягала маскоўскаму мітрапаліту. Гэтая залежнасць пры напружаных адносінах з Масквой прымушала клапаціцца аб асобым мітрапаліту для Літвы. Альгерд пасылаў жалабу ў Канстанцінопаль на мітрапаліта Аляксея з просьбай назначыць асобнага праваслаўнага мітрапаліта для Літвы. У 1373 г. патрыярх Філафей паслаў інака Кіпрыяна, родам серба, каб выясніць непаразуменні паміж Альгердам і мітрапалітам Аляксеем. На просьбу Альгерда Кіпрыян атрымаў годнасць мітрапаліта і пасяліўся ў Кіеве (1374). Аднак пасля смерці мітрапаліта Аляксея Кіпрыян заняў маскоўскую мітрапаліцкую кафедру, пакінуў Кіеў і выехаў у Маскву. Літва апынулася зноў у залежнасці ад Масквы ў царкоўна-рэлігійных адносінах. Праваслаўныя цэрквы і манастыры надзяляліся багатымі зямельнымі фундацыямі.

# 2. МАГНАЦКАЯ ФЕАДАЛЬНАЯ МАНАРХІЯ

## А) Літоўска-польскія уніі

**Першая унія.** Літоўска-Беларуская дзяржава суседзіла з Польшчай, з якой літоўскія вялікія князі падтрымлівалі прыяцельскія сувязі. Паяўленне немцаў павінна было спрыяць яшчэ большаму збліжэнню гэтых дзяржаў з тае прычыны, што на іх тэрыторыі распачаўся націск з боку немцаў і што кожная ў паасобку дзяржава не магла ўстаяць супроць гэтага націску. Калі немцы захапілі вусце Віслы і Нёмана, то абедзве дзяржавы папалі ў поўную эканамічную залежнасць ад Тэўтонскага закона. Такім чынам, эканамічныя і нацыянальна-палітычныя чыннікі падымалі пытанне аб больш цесным палітычным збліжэнні абедзвюх дзяржаў. Палякі са свайго боку стараліся ажыццявіць свае даўнейшыя дыпламатычныя планы — далучыць да Польшчы Валыншчыну. Польскія дыпламаты вельмі добра разумелі, што літоўскі ўрад дабрахоць не аддасць Валыншчыны. Збліжэнне Літвы з Польшчай абяцала вярнуць Жмудзь, якую ўступіў Ягайла немцам, а гэтаксама знайсці ў Польшчы падтрыманне ў барацьбе з нездаволенымі ўдзельнымі князямі. З мэтай ажыццяўлення сваіх планаў дыпламаты запрапанавалі вялікаму князю Ягайлу ажаніцца з польскай каралевай Ядвігай і аб'яднаць дзве дзяржавы ў адну. Ягайла прыняў гэтыя ўмовы, і 14 жніўня 1385 г. у Крэве была падпісана першая унітарная дамова. Ягайла абавязваўся паводле гэтай дамовы прыняць каталіцызм і хрысціць сваіх братоў, баяр і свой народ; вярнуць адабраныя ад Польшчы землі, заплаціць дзвесце тысяч фларынаў няўстойкі былому жаніху Ядвігі і на «вечныя часы далучыць да Польшчы літоўскія і рускія землі». Акт Крэўскай уніі быў падпісаны Ягайлам і яго братамі за сябе і за тых удзельных князёў, якія адсутнічалі пры гэтай дамове. Пасля каранацыі Ягайлы ўдзельныя князі павінны былі прынесці прысягу ў вернасці польскай кароне.

**Востраўская дамова.** Крэўская унія юрыдычна спыняла самастойнае існаванне Літоўска-Беларускай дзяржавы, але фактычна ўсе ўмовы уніі з'явіліся толькі дэкларацыяй, ажыццяўленне якой было немагчыма ў той момант, калі апошняя была задумана. Літва захавала сваю самастойнасць і злучалася з Польшчай толькі персанальна праз вялікага князя Ягайлу, які адначасова стаў і польскім каралём. Літоўскія баяры — буйныя землеўласнікі на чале з Вітаўтам — распачалі барацьбу супроць уніі. Палякам прыйшлося палічыцца з гэтым нацыянальна-палітычным настроем літоўскіх магнатаў і пайсці на ўступкі. 5 жніўня 1392 г. у Востраве была заключана новая дамова. Вітаўт прызнаваўся вялікім князем і адначасна васалам польскага караля. Улада Вітаўта захоўвала часовы характар. Па смерці Вітаўта ўсе яго ўладанні пераходзяць да караля і яго наследнікаў і да кароны польскай. Аднак Вітаўт мала звяртаў увагі на свой васалітэт у адносінах да Польшчы і глядзеў на сябе як на самастойнага гаспадара.

**Унія 1401 г**[1]**.** Востраўская дамова з'яўляецца значнай перамогай літоўскіх сепаратыстаў. Барацьба за поўнае вызваленне ад Польшчы была прыпынена дзякуючы таму разгрому, які нанеслі Вітаўту татары на рацэ Ворскле (1399). Палякі выкарысталі гэтае становішча і запрапанавалі падпісаць новую унію, якая паўтарала ўмовы уніі 1392 г. Вітаўт ад свайго імя, князёў і баяр павінен быў даць абавязанне памагаць палякам ва ўсім і пасля смерці Вітаўта не шукаць новага гаспадара, паміма польскага караля. Палякі абяцалі не выбіраць новага караля без згоды Вітаўта і ліцвінаў. Дзеля большай трываласці уніі унітарны акт быў падпісаны князямі і баярамі.

**Замежная палітыка.** Вітаўту прыходзілася весці барацьбу на чатыры фронты: з палякамі, татарамі, немцамі і Масквой. Барацьба з палякамі вылівалася ў формы барацьбы за змену ўмоў Крэўскае уніі 1385 г. і дала дадатныя вынікі. Дамова з палякамі ў Гародле на Заходнім Бугу (1413) забяспечвала Літве ўнутраную аўтаномію пад суверэнітэтам Польскае дзяржавы. Няўдачнай была барацьба з татарамі. Тахтамыш, выгнаны кіпчацкі хан, звярнуўся да Вітаўта з просьбай аб дапамозе. Вітаўт даў на гэта сваю згоду з той умовай, што хан яму дапаможа супроць Масквы. Выйшаўшы з вялікім войскам на дапамогу Тахтамышу, Вітаўт сустрэўся з войскам Эдыгея на рацэ Ворскле (1399). Бітва закончылася поўным разгромам. Даволі складаныя і заблытаныя былі адносіны з суседнімі вялікарускімі землямі. Вітаўт думаў пры дапамозе татар захапіць Ноўгарад, Смаленск, нават Маскву. Барацьба на ўсходзе закончылася тым, што Смаленск быў захоплен Вітаўтам (1404). У 1405 г. былі спустошаны пскоўскія землі. Ноўгарадцы і пскавічане звярнуліся да Масквы за дапамогай. Вялікі князь Васіль Дзмітравіч выступіў супроць свайго цесця Вітаўта. У адказ на гэта ў Літве ўчынілі пагром над усімі рускімі[2]. Удзельныя князі, уцякаўшыя з Літвы, знаходзілі ў Маскве гасцінны прытулак і атрымлівалі гарады. Аднак ваеннай стычкі паміж абодвума князямі не адбылося. У 1409 г. на рацэ Угры быў завязаны мір. Пасля смерці Васіля Дзмітравіча (1425) Вітаўт распачаў зачэпныя крокі ў адносінах да Пскова і Ноўгарада. У 1426 г. была спустошана ўся Пскоўская краіна, галоўным чынам пры дапамозе татар. Спроба захапіць умацаваныя пункты Апочку, Вароніч закончылася няўдачай. У 1428 г. Вітаўт ваяваў з Ноўгарадскай зямлёй, дзе адбывалася якраз барацьба дзвюх партый — літоўскай і маскоўскай. Абапіраючыся на першую, Вітаўт утаргнуўся ў межы Ноўгарадскае краіны і аблажыў Порхаў, які быў узяты і павінен быў выплаціць 5 тысяч рублёў кантрыбуцыі і тысячу рублёў за палонных. Усходняя палітыка Вітаўта была не ажыццёўлена. Адносіны да немцаў заставаліся ўвесь час напружанымі. Жмудзь, аддадзеная Ягайлам крыжакам, безупынку паўставала. Жмудзіны, у якіх немцы адбіралі жанок, бралі заложнікаў, захаплялі рыбныя і звярыныя промыслы і забаранялі гандаль з суседзямі, чакалі дапамогі ад Вітаўта. Літве патрэбна была Жмудзь як шлях да мора, дзеля ўзнаўлення спыненых

[1] Віленска-Радамская унія.

[2] Гаворка ідзе аб маскоўскіх купцах.

гандлёвых сувязей, але першы перыяд вайны закончыўся няўдачна. Паводле дамовы з немцамі 1404 г. Жмудзь заставалася за імі. Паўстанні ў Жмудзі не спыняліся. Вітаўт насупроць сваіх абяцанняў увесь час дапамагаў гераічным жмудзінам. Вялікі магістр Ульрых фон-Юнгінген адзначаўся вялікай ваяўнічасцю і рыхтаваўся даць ліцвінам рашучы бой. Да 1409 г. Вітаўт стараўся ўхіляцца стычак з Законам. Згода з маскоўскім вялікім князем дазволіла Вітаўту распачаць больш смелыя крокі. 8 ліпеня 1410 г. пад асабістым верхаводствам Ягайлы і Вітаўта ўтаргнулася ў Прусію іх войска. Рашучая бойка адбылася пад Грунвальдам (Танэнберг), у якой Закон быў разбіты нашчэнт[1]. У часе бітвы быў забіты сам вялікі магістр. Беларускія палкі, асабліва смальняне, былі прычынай удачы гэтай бітвы. Закон атрымаў пад Грунвальдам рашучы ўдар. Торунскі мір 1 лютага 1411 г. перадаваў Жмудзь Літве і абавязваў Закон выкупіць палонных сумаю ў сто тысяч коп багемскіх грошай. У 1422 г. ваенныя дзеянні распачаліся нанова, але закончыліся поўнай няўдачай для немцаў. Мір у Велуне, заключаны ў маі 1423 г., быў невыгодным для Закона.

**Гарадзельская унія.** Перамога літоўска-беларускага войска пад Грунвальдам падняла палітычнае значэнне Вітаўта, які пачаў старацца, каб вызваліцца ад Польшчы. Каб перашкодзіць гэтаму, палякі павінны былі пайсці на ўступкі ў нацыянальна-палітычных адносінах і здаволіць вымаганні Вітаўта і мясцовага баярства. Увосень 1413 г. у Гародле на Заходнім Бугу быў падпісаны новы унітарны трактат, які цалкам змяняў умовы першых трох уній. Прысутнасць на з'ездзе літоўскага баярства і ваеннаслужылага класа падкрэслівала важнасць палітычнага моманту. Новая унія давала Літве права на самастойны дзяржаўны ўклад. Літва будзе мець свайго асобнага гаспадара, які знаходзіцца ў васальных адносінах да Польшчы. Аднак літоўскае магнацтва абавязвалася не выбіраць нікога гаспадаром, апрача таго, каго ім дасць Ягайла за парадай польскіх і літоўскіх прэлатаў і баяр. У свой чарод, у выпадку, калі б дынастыя Ягайлы перарвалася, новы кароль выбіраецца з ведама і ўдзелу Вітаўта, баяр і шляхты княства. Гарадзельская унія — вялікая палітычная перамога літоўскіх нацыяналістаў, якія, аднак, не маглі здаволіцца гэтай перамогай і яўна імкнуліся да поўнага разарвання з Польшчай.

**Праект каранацыі.** Барацьба з немцамі падняла аўтарытэт вялікага князя Вітаўта. Дабіўшыся ад палякаў новае, больш выгоднае для Літвы дамовы з Польшчай, літоўскае баярства і Вітаўт усё-ткі яўна імкнуліся да поўнага аддзялення ад Польшчы і пастанавілі каранаваць Вітаўта каралеўскай каронай. Каранацыя была назначана ў Луцку на лета 1429 г. Палякі, жадаючы перашкодзіць планам Вітаўта, прапанавалі яму польскую карону, бо Ягайла згаджаўся адмовіцца ад трона. Аднак каранацыя не адбылася. У 1430 г. Вітаўт памёр. У момант смерці Вітаўта Літоўска-Беларуская дзяржава была фактычна незалежнай ад Польшчы.

---

[1] 15 ліпеня 1410 г.

**Сацыяльна-палітычныя скуткі уніі.** Адным з палітычных скуткаў апошняй уніі было ўстанаўленне выбіральнасці вялікакняскай улады. Уніі спрыяла тое, што на Літву пачала пранікаць польская шляхецкая культура ў выглядзе шляхецкіх прывілеяў 1387—1413 гг., паводле якіх баярства, прыняўшае каталіцызм, атрымлівала вельмі важныя індывідуальныя правы і вольнасці. Умацаванне літоўскай арыстакратыі выклікала апазіцыйны рух з боку беларускіх і ўкраінскіх землеўласнікаў; гэты рух меў вялікае значэнне для палітычных зносін паасобных краін.

## Б) Нацыянальна-палітычная барацьба ў XV ст. і лёс уніі

**Барацьба культур і нацыянальнасцей.** Унія з Польшчай спрыяла пранікненню на тэрыторыю княства польскае культуры. Апошняя стыкнулася з культурай беларускай. Распачалася барацьба дзвюх культур, прычым станавілася відавочным, што вялікакняская ўлада становіцца на старану польскае культуры. Да барацьбы культур трэба далучыць і барацьбу нацыянальную. У Літоўска-Беларускай дзяржаве, у якой пануючай нацыянальнасцю была літоўская, большая частка насялення была беларускае нацыянальнасці. Тым часам прывілеі, наданыя літоўскім баярам у 1387—1413 гг., не былі распаўсюджаны на беларускіх і ўкраінскіх землеўласнікаў, а гэта выклікала з боку апошніх зусім справядлівае нездаваленне. Распараджэнне аб тым, каб ліцвіны прымусова прымалі каталіцкую веру, пацягнула за сабою забарону ўступаць у шлюб з рускімі. Беларуская або ўкраінская жанчына, якая выходзіла замуж за ліцвіна-католіка, пад пагрозай цялесных кар павінна была прыняць каталіцызм.

**Палітычныя партыі.** На нацыянальна-культурным грунце ў асяроддзі літоўскіх і беларуска-ўкраінскіх землеўласнікаў утварылася дзве партыі — літоўска-беларуска-ўкраінская і літоўска-польская, паміж якімі ў хуткім часе павінна была распачацца барацьба. Па смерці бяздзетнага Вітаўта Літоўска-Беларускі вялікакняскі пасад заставаўся вакантным. Палякі, забыўшы аб уніі 1413 г., хацелі забраць вялікае княжэнне ў свае рукі, а гэта пацягнула б за сабою тое, што Вялікае княства ўтраціла б дзяржаўную самастойнасць. Літоўскае баярства стаяла на сваім ранейшым палітычным поглядзе і з мэтай абароны самастойнасці княства старалася зблізіцца з беларускімі і ўкраінскімі князямі і баярамі. Абодва бакі сабраліся на з'езд і насупроць уніі 1413 г. выбралі брата Ягайлы Свідрыгайлу вялікім князем. Свідрыгайла ў гэты час княжыў у Бранску і Ноўгарад-Северску і быў перакананым праціўнікам уніі. З гэтага пункту погляду Свідрыгайла быў пажаданым і для ліцвінаў. Беларуска-ўкраінскія землеўласнікі бачылі ў новым вялікім князю прадстаўніка сваіх нацыянальных інтарэсаў і з гэтае прычыны яго падтрымлівалі. Пагаджэнне на асобе Свідрыгайлы не пагадзіла, аднак, літоўскай і беларуска-ўкраінскай нацыянальнасцей. Ліцвіны хацелі захаваць пры новым вялікім князю сваё пануючае становішча. Палякі павінны былі пагадзіцца з актам абрання Свідрыгайлы вялікім князем.

**Разарванне саюзу паміж ліцвінамі з аднаго боку і беларусамі і ўкраінцамі — з другога.** Саюз літоўскіх і ўкраінскіх землеўласнікаў быў нетрывалым. Ліцвінам не падабалася тая перавага, якую новы вялікі князь удзяляў беларуска-ўкраінскай арыстакратыі. Польскае духавенства баялася ўмацавання беларуска-ўкраінскага элементу, варожага да каталіцызму. Свідрыгайла ўсе пасады і ўрады пачаў раздаваць беларусам і ўкраінцам. Літоўскія баяры спалохаліся ўмацавання беларускае нацыянальнасці і ўтраты свайго палітычнага ўплыву. Гэта падпхнула іх на збліжэнне з палякамі, якія стараліся ўзнавіць унію і забраць у свае рукі Валыншчыну і Падолле, дзеля таго што Свідрыгайла не хацеў пушчаць у падольскія і валынскія гарады польскіх намеснікаў. Распачатая барацьба была спачатку выгодна для Свідрыгайлы.

**Абранне Жыгімонта Кейстутавіча.** Каб аслабіць беларуска-ўкраінскі элемент, ліцвінам прыйшлося пайсці на дзяржаўны пераварот[1], запрапанованы палякамі. Была зроблена змова, каб захапіць Свідрыгайлу. Кіраўніком змовы быў кандыдат літоўска-польскай партыі — Жыгімонт Кейстутавіч. Змова не ўдалася. Змоўнікам удалося затрымаць у Ашмянах толькі сям'ю Свідрыгайлы. Сам жа Свідрыгайла знайшоў сабе прытулак у Полацку. Жыгімонт Кейстутавіч быў абвешчаны вялікім князем, а літоўскія дзеячы павінны былі пайсці на ўступкі палякам і згадзіцца на аднаўленне уніі.

**Унія 1432 г.** Прапануючы ліцвінам унію, палякі мелі на ўвазе складзеную палітычную кан'юнктуру і запрапанавалі ліцвінам унію ў духу уніі 1401 г. Жыгімонт прызнаваўся дажывотным сукіраўнічым Ягайлы, да якога пераходзіць Вялікае княства пасля смерці Жыгімонта. Наследнікі Жыгімонта атрымлівалі толькі свае айчынныя ўладанні. Падолле ўступалася Польшчы. Далучэнне Валыні ставілася ў залежнасць ад смерці Жыгімонта. Унія 1432 г. з'яўляецца поўнай капітуляцыяй ліцвінаў перад палякамі. Уся папярэдняя барацьба літоўскіх сепаратыстаў была закасавана адным махам.

**Грамадзянская барацьба.** Існаванне дзвюх палітычных партый пры двух гаспадарах выклікала грамадзянскую вайну. Жыгімонт Кейстутавіч пачаў шукаць прыхільнікаў паміж беларускага элементу. У дзень завязання уніі, 15 жніўня[2] 1432 г., Свідрыгайла[3] і Ягайла апублікавалі прывілей, які пашыраў правы і вольнасці літоўскай шляхты і на беларускую арыстакратыю і баярства. Прывілей меў вузкае тэрытарыяльнае значэнне і не пашыраў свайго ўплыву на Полацкую, Віцебскую, Смаленскую, Чарнігава-Северскую, Кіеўскую землі, Валыншчыну і Падолле. Беларуска-ўкраінскія магнаты засталіся вернымі Свідрыгайлу. Буйныя магнаты Літвы і Жмудзі і дробны ваеннаслужылы клас Падляшша, ацаніўшы польскія прывілеі, сталі на старану Жыгімонта. Перавага ў бітвах была на баку Свідрыгайлы. Спачатку ваенныя дзеянні былі ўдалыя для Свідрыгайлы. Нават літоўскія магнаты пачалі вагацца ў сваёй вернасці Жыгімонту. Каб выратаваць сваю палітыку, Жыгімонт Кейстутавіч апубліка-

[1] 1 верасня 1432 г.
[2] Памылка, правільна — 15 кастрычніка.
[3] Памылка, правільна — Жыгімонт.

ваў 6 мая 1434 г. новы прывілей, які надаваў Літве і літоўскай Беларусі новыя правы і вольнасці. Гэта ўтрымлівала літоўска-беларускіх магнатаў на баку Жыгімонта. Беларуска-ўкраінскі элемент з працягам часу ахаладзеў да свайго верхаводцы. Свідрыгайла шукаў дапамогі ў немцаў, крымскіх татар, рымскага папы, якому абяцаў падчыніць праваслаўную царкву. Спаленне ў 1431 г. у Віцебску мітрапаліта Гарасіма, западозранага ў здрадзе, гэтаксама мела ўплыў на адносіны да Свідрыгайлы беларускіх магнатаў і землеўласнікаў. А пасля таго, як Свідрыгайла быў разбіты пад Вілкомірам у 1435 г.[1], ад яго адпала ўся Беларусь. Яму заставаліся покуль што вернымі ўкраінскія землі. Разумеючы сваё цяжкае становішча, Свідрыгайла ў 1437 г. з'явіўся ў Кракаў і запрапанаваў стаць палоннікам Польшчы з усімі сваімі падданымі, замкамі, местамі і сёламі. Па смерці Свідрыгайлы айчына і ўсе ўладанні яго павінны былі перайсці да Польшчы. Палякі не прынялі гэтай прапазіцыі, бо мелі Валыншчыну і Падолле ў сваіх руках паводле дагавору з Жыгімонтам. У 1439 г. Свідрыгайла быў зноў разбіты, і яму прыйшлося ўцякаць у Малдавію. Украінскія землі прызналі вялікага князя Жыгімонта. Грамадзянская вайна спынілася.

**Разарванне паміж ліцвінамі і палякамі.** Няўдача Свідрыгайлы і поўная перамога літоўскага нацыянальнага элементу рабілі непатрэбнай унію з Польшчай. Сам Жыгімонт Кейстутавіч быў лішнім. Магнаты яго ненавідзелі, як спадручнага Польшчы і як кіраўніка, які стараўся ў сваёй палітыцы апірацца на дробную шляхту. Літоўскія магнаты не маглі дараваць свайму вялікаму князю зробленых ім буйных тэрытарыяльных саступак і зрабілі супроць яго змову, у выніку якой Жыгімонт Кейстутавіч быў забіты[2]. Перад літоўскімі магнатамі адчыняўся новы шлях у справе барацьбы за аўтаномію і за вяртанне аддадзеных Польшчы ўкраінскіх зямель.

## В) Літва і краіны ў XV ст.

**Палітыка магнацтва.** Паміж магнатамі-змоўнікамі не было еднасці адносна найбольш пажаданага кандыдата на вялікакняскі пасад. Адны былі згодны прызнаць Свідрыгайлу, іншыя высоўвалі кандыдатуру Міхайлы — сына забітага Жыгімонта. Былі і такія, якія высоўвалі кандыдатуру Уладзіслава Трэцяга. Найбольш значная, аднак, партыя падтрымлівала кандыдатуру малалетняга сына Ягайлы — Казіміра, якому было толькі 13 год. Для магнатаў гэта кандыдатура была найбольш даспадобы. У выпадку абрання Казіміра на вялікакняскі пасад унія з Польшчай была б разорвана, а магнаты, апынуўшыся ля ўлады, маглі б надаць палітыцы ўрада пажаданы для сябе кірунак. Да караля Уладзіслава было паслана ўрачыстае пасольства, але польскі кароль згаджаўся паслаць брата ў Літву толькі намеснікам, апіраючыся ў гэтым на ўмовы уніі 1432 г. Калі Казімір прыбыў у Літву, то яго імя аб'яднала ўсё літоўскае маг-

---

[1] Бітва каля Вількаміра на рацэ Святой.

[2] 20 сакавіка 1440 г.

нацтва, якое абвясціла Казіміра вялікім князем літоўскім (1440)[1]. Унія была разорвана. Палякі адмовіліся прызнаць за Казімірам вялікакняскі тытул. Ліцвіны з гэтым зусім не лічыліся.

**Літва і беларуска-ўкраінскія землі.** Палітыка літоўскага магнацтва не выклікала спачування паміж магнатамі беларускімі і ўкраінскімі, якія не прымалі ўдзелу ў абранні вялікага князя. Гэта выклікала ва ўкраінскіх і беларускіх краінах нездаволенне, якое пагражала распадам дзяржавы. Апазіцыйны рух быў менш небяспечным, чымся пры Свідрыгайлу. Кожная краіна дзейнічала самастойна, і літоўскаму ўраду зусім лёгка было супакоіць паўсталыя землі. Перш за ўсё распачалося паўстанне ў Смаленску. Мясцовыя «чорныя людзі», сабраўшыся на вечы, прымусілі літоўскага намесніка — пана Андрэя Саковіча ўцякаць у Літву. Многа баяр было забіта. Веча заклікала да сябе гаспадаром мсціслаўскага князя Юрыя Лінгвеневіча, які прытрымліваўся дэмакратычнае палітыкі і тэрарызаваў смаленскіх баяр, садзячы іх у астрогі і раздаючы іх маёнткі сваім мсціслаўскім баярам. Гэткая палітыка князя Юрыя выклікала супроць яго моцную апазіцыю ў самім Смаленску. Літоўскі вялікі князь пайшоў на ўсмірэнне Смаленска. Першы паход закончыўся няўдачна. У часе другога паходу князь Юры ўцёк у Ноўгарад Вялікі, адкуль з часам зноў вярнуўся ў свой родны Мсціслаўль. Далучыўшы Смаленск, вялікі князь Казімір паспяшыў цясней прывязаць Смаленскую зямлю да ўласна Літвы, выдаўшы ёй пацвярджальны прывілей на правы і вольнасці, наданыя Вітаўтам (1442). Крыху пазней (1451) атрымалі гэткія ж прывілеі Полацкая і Віцебская землі. У гэты час і распачалося паўстанне на Жмудзі як пратэст супроць палітыкі жмудскага старасты — пана Кезгайлы. Жмудзіны прагналі свайго старасту і абралі свайго ўласнага ў асобе нейкага Даўмонта. Адначасна з гэтым яны зусім адарваліся ад Літвы, прызнаючы сваім князем Міхайлу Жыгімонтавіча. Паўстанне на Жмудзі не патрабавала ўмяшання ваеннай сілы. На Жмудзь быў пасланы настаўнік маладога вялікага князя — Ян Гаштольд, які ўмела ўгаварыў жмудзінаў прызнаць уладу вялікага князя літоўскага. Са свайго боку Казімір быў прымушаны даць Жмудскай зямлі пацвярджальны краінны прывілей. І Падляшская зямля гэтаксама адпала ад Літвы. Яе стараста паддаўся пад уладу Баляслава Мазавецкага, але з Баляславам была зроблена дамова, паводле якой ён адступаў Літве Падляшша за шэсць тысяч коп рускіх грошай. І ўкраінскія землі праявілі сепаратызм. Калі ўцёкшы ў Маскву Міхайла Жыгімонтавіч вярнуўся адтуль і з войскам падступіў да Кіева, то кіяўляне здаліся. Аднак адпаўшая зямля была хутка звернута пад уладу вялікага князя. Казімір паспяшыў даць Кіеўскай зямлі асобнага князя — Алельку, сына Уладзіміра Альгердавіча[2]. Алелька памёр у 1445 г. Наследнікам быў яго сын Сымон, па смерці якога (1471) удзельнае княжэнне было заменена намесніцтвам у асобе літоўскага пана М. Гаштольда. Тады ж Кіеўская зямля атрымала ад вялікага князя пацвярджальны краінны

[1] 29 чэрвеня 1440 г.
[2] У 1441 г.

прывілей. Валынская зямля і ўсходняе Падолле мелі асобнага князя — Свідрыгайлу, прызнаўшага суверэнітэт свайго пляменніка і атрымаўшага ад вялікага князя Валынскую зямлю ў дажывотнае ўладанне. Па смерці Свідрыгайлы Валыншчына паводле тэстамента Свідрыгайлы перайшла да Казіміра, які выдаў Валынскай зямлі ў 1452 г. краінны прывілей. Шляхам пацвярджэння мясцовай аўтаноміі Казіміру ўдалося аб'яднаць раскіданую Літоўска-Беларускую дзяржаву.

## Г) Літоўска-Беларуская дзяржава ў барацьбе супроць уніі

### *Часы Казіміра (1440—1492) і Аляксандра (1492—1506)*

**Абранне Казіміра на польскі трон.** Спачатку палякі не падымалі пытання аб уніі. Літва і Польшча жылі самастойным паасобным палітычным жыццём. У 1444 г. польскі кароль Уладзіслаў III загінуў у бойцы з туркамі пад Варнай. Палякі на Серадскім сойме абралі (1445) Казіміра польскім каралём і спадзяваліся актам абрання вярнуць назад украінскія землі і аднавіць ранейшыя унітарныя адносіны. На прапанову палякаў літоўскія магнаты адказалі адмовай; але калі палякі пачалі высоўваць кандыдатуру Баляслава Мазавецкага, то магнаты паспяшылі згадзіцца на абранне Казіміра польскім каралём, але не давалі згоды на унію, заснаваную на старых трактатах. Літоўскія паны баранілі незачэпнасць дзяржаўнай тэрыторыі і самастойнасць дзяржаўнага ладу. Пасля перагавораў ліцвіны далі сваю згоду, і вялікі князь Казімір адправіўся ў Кракаў для каранацыі, якая адбылася 24 ліпеня 1447 г. Перад гэтым магнаты ўзялі ад вялікага князя Казіміра запіс, у якім ён прызнаваў толькі абарончы саюз паміж Польшчай і Літвой, а Валыншчыну і Падолле лічыў літоўскімі землямі. Адпраўляючыся на каранацыю ў Кракаў, Казімір 2 мая 1447 г. выдаў прывілей, які пашыраўся на ўсе землі. Гэтым самым прывілеі 1387—1434 гг. распаўсюджваліся і на беларуска-ўкраінскую шляхту, але захоўвалі некаторыя абмежавальныя артыкулы рэлігійнага характару, паводле якіх права займаць вышэйшыя пасады прыналежала толькі католікам. У гэтым жа прывілеі Казімір даваў абяцанне трымаць Літоўскае княства ў тых граніцах, у якіх яно было пры Вітаўту, а гэтаксама і абараняць яго. Нягледзячы на абранне Казіміра польскім каралём, юрыдычныя адносіны паміж Літвой і Польшчай аставаліся ўвесь час нявызначанымі.

**Пытанне аб украінскіх землях.** На першым сойме ў Петракове 24 жнівеня 1447 г. палякі запатрабавалі ад Казіміра прысягі на аб'яднанне Літвы з Польшчай і на далучэнне Валыншчыны і Падолля да Польшчы. Казімір і літоўскія магнаты не згадзіліся на гэта. На Люблінскім сойме ў траўні 1448 г. палякі паднімалі зноў бесскутэчна гэтыя пытанні. На сойме ў Серадзе 24 жніўня 1452 г., калі літоўска-беларускае магнацтва выехала, палякі запатрабавалі ад Казіміра прысягі на аб'яднанне Літвы з Польшчай і на далучэнне Валыншчыны і Падолля да Польшчы. Казімір быў прымушаны даць сваю згоду, але прасіў

адлажыць прысягу на адзін год з тае прычыны, што канечна трэба прыняць перасцярожныя крокі для забеспячэння сваёй уласнай асобы. З чэрвеня 1453 г. адбыўся сойм у Парчэве. Літоўска-беларускія магнаты адмовіліся прыехаць і спыніліся ў Бярэсці і толькі на просьбу самога караля згадзіліся прыехаць. Сойм быў адложаны на 24 чэрвеня і адбыўся ў Петракове. Былі прысутны толькі адны палякі, якім удалося прымусіць караля прынесці прысягу, хаця ўмовы уніі заставаліся нявызначанымі.

**Літоўска-беларуская апазіцыя.** Каралеўская прысяга выклікала незвычайнае абурэнне паміж літоўска-беларускіх вяльмож. На чале руху стаяў Ян Гаштольд, былы выхаваўца караля. Магнаты мелі на ўвазе ўнутраныя непарадкі ў Польшчы і войны з нямецкім Законам і дзеля гэтага спадзяваліся, што задуманая барацьба супроць уніі дасць пажаданыя вынікі. Асабісты прыезд Казіміра ў Вільню супакоіў абураных ліцвінаў. Настала часовае спакойства. Калі ж каралеўскія абяцанні былі не выпаўнены, то магнаты на чале з тым жа Гаштольдам зрабілі змову на жыццё караля. Магнаты мелі намер пасадзіць на вялікакняскі пасад кіеўскага князя Сымона Алелькавіча. Смерць Яна Гаштольда (1462) не дазволіла здзейсніцца гэтай змове. На соймах у Бярэсці і ў Вільні (1461—1462) вялікаму князю Казіміру было запрапанована вярнуць Літве Валыншчыну і Падолле і адмовіцца ад польскага трона. Гэтыя самыя патрабаванні былі запрапанованы Казіміру на з'ездах у Петракове (17 мая 1463 г.) і ў Парчэве (15 кастрычніка). Нарэшце магнацтва, нездаволенае з уніі, хацела мець для Літвы асобнага князя ў асобе аднаго з сыноў Казіміра; аднак кароль не даў на гэта сваёй згоды.

**Змова ўкраінскіх князёў.** Прывілей 2 мая 1447 г. пагадзіў беларуска-ўкраінскую шляхту з палітыкай Казіміра. Але быўшыя ўдзельныя князі прынялі моцна варожую пазіцыю. Знішчэнне ўдзелаў і захаванне ў прывілеі 1447 г. канфесіянальнага артыкула прымушалі тытулованую арыстакратыю адмоўна адносіцца да палітыкі Казіміра. Яна выклікала апазіцыйны рух паміж украінскіх князёў, на чале якіх стаў брат апошняга кіеўскага князя — Міхайла Алелькавіч. Змоўнікі мелі намер захапіць вялікакняскі пасад і перадаць яго аднаму з украінскіх князёў. Аднак змова была выкрыта. Міхайла Алелькавіч і Альшанскі князь[1] былі публічна пакараны смерцю на пляцы ў Кіеве. Князь Фёдар Іванавіч Бельскі ўцёк у Маскву, на дапамогу якой змоўнікі мелі надзею. Удзельныя князі падтрымлівалі сувязь з Масквой, апіраючыся на якую яны спадзяваліся захаваць свае княжэнні (1481).

**Лёсы уніі па смерці Казіміра.** Па смерці Казіміра (1492) унітарныя адносіны Літвы з Польшчай былі зноў разорваны. Ліцвіны абралі на пасад яго сына Аляксандра, а палякі — яго брата Альбрэхта. Абранне на пасад Аляксандра было падмацавана апублікаваннем прывілея, які пацвярджаў наданыя раней правы і вольнасці. Гэты прывілей замацоўваў за магнатамі тое рашучае становішча, якое яны займалі дзякуючы частым ад'ездам Казіміра ў Польшчу, у сфе-

[1] Князь Іван Сямёнавіч Гальшанскі.

ры дзяржаўнага будаўніцтва. Прывілей 1492 г. істотна абмежаваў уладу вялікага князя, дазваляючы «гаспадарскай радзе» актыўны ўдзел у замежнай і ўнутранай палітыцы ўрада. Абранне на пасад вялікага князя Аляксандра і атрыманне магнатамі нібы «арыстакратычнай канстытуцыі» было вялікай перамогай з боку магнатаў — прыхільнікаў дзяржаўнае незалежнасці літоўска-беларускага княства. Аднак распачатая вайна з Масквой прымусіла звярнуцца да палякаў за дапамогай. Была падпісана новая унітарная дамова (1499); пры гэтым новая унія прызнавала за ліцвінамі права на самастойны дзяржаўны лад. Літва станавілася да Польшчы ў тыя самыя праўныя адносіны, у якіх яна павінна была знаходзіцца паводле унітарных дамоў 1413 і 1432 гг.

**Унія 1501 г.** У часе ваенных дзеянняў з Масквой памёр кароль Альбрэхт. Ліцвіны паднялі пытанне аб запрашэнні вялікага князя Аляксандра на польскі трон. Палякі выкарысталі цяжкае становішча ліцвінаў і запрапанавалі новыя, вельмі цяжкія для ліцвінаў умовы уніі. Паводле уніі Літва і Польшча злучаюцца ў адну дзяржаву з адным каралём, абраным на агульным польска-літоўскім сойме, з адною манетаю, але рознымі судамі і пасадамі. Унія 1501 г. прызнавала абавязальную сілу за ранейшымі дамовамі і абавязвала абедзве дзяржавы быць неразлучнымі як у шчасці, так і ў няшчасці. Умовы уніі, завязанай у Мельніку, былі для літоўскай арыстакратыі страшэнна невыгоднымі, але ліцвіны былі прымушаны яе падпісаць. Ліцвіны мала выйгралі ад уніі. Палякі слаба памагалі ліцвінам у іх барацьбе з Масквой. Унія фактычна не была ажыццёўлена[1]. У 1506 г. памёр вялікі князь Аляксандр. Ліцвіны адмовіліся ехаць на агульны літоўска-польскі сойм, а на ўласным сойме «едностойною волею» абралі вялікага князя Жыгімонта (1506—1547), брата нябожчыка вялікага князя. Палякі моўчкі зрабілі тое самае ў сябе. Пытанне аб уніі пакуль што не паднімалася, хаця адна з умоў уніі 1501 г. была ажыццёўлена: Літва і Польшча мелі аднаго караля.

## Д) Замежная палітыка Літоўска-Беларускае дзяржавы ў XV і першай палове XVI ст.

**Літва і Масква.** Адначасна з утварэннем Літоўска-Беларускае дзяржавы ўтваралася і ўмацоўвалася Маскоўская дзяржава, якая вырасла з маленькага ўдзельнага княства і займала вельмі выгоднае геаграфічнае палажэнне. Маскоўскае княства павялічвалася гэтак жа шпарка, як і суседняе з ім Літоўска-Беларускае княства. Масква ў канцы XV ст. аб'яднала вакол сябе ўсю Вялікаросію. Падлегласць Маскве паасобных краін замацоўвалася прызнаннем з боку насялення маскоўскае адміністрацыі. Вярхі грамадзянства, якія не асабліва імкнуліся ўзалежніць сябе ад Масквы і баранілі сваю феадальную самастойнасць, часта пазбаўляліся сваёй маёмасці і прымушаліся высяляцца на тэрыторыю Маскоўскае дзяржавы. Маскоўскае княства будавалася на прынцыпе цэнтралізацыі, гэта значыць на прынцыпе, процілежным таму, на якім будавалася Літоўска-Беларуская дзяржава.

[1] Акт дзяржаўнай уніі 23 кастрычніка 1501 г. (Мельніцкі акт) не быў ратыфікаваны соймам ВКЛ.

**Масква і літоўска-беларускія князі.** Суседства Літвы з моцнай Масквой спрыяла палітычным планам літоўска-беларускіх князёў. Яны шукалі ў маскоўскага князя дапамогі і знаходзілі ў Маскве ласкавы прыём, атрымлівалі там зямельныя фундацыі. Тое, што літоўска-беларускія князі звярталіся за дапамогаю да Масквы, давала повад маскоўскаму вялікаму князю ўмешвацца ва ўнутраныя адносіны Літоўска-Беларускай дзяржавы. Ускосны ўдзел Масквы ў дамове князёў 1481 г. не падлягае сумненню. Падтрымліваючы ўдзельных князёў і ўмешваючыся ва ўнутраныя справы княства нібыта з мэтай абароны рускай нацыянальнасці і праваслаўнай веры, Масква ўвесь час шукала повсаду, каб захапіць беларускія краіны, праз якія ішоў гандлёвы шлях да Балтыйскага мора, гэтак канечна патрэбнага для Масквы. Працяглая барацьба Масквы з Літвою за Беларусь — гэта барацьба за берагі Балтыйскага мора. Літоўска-беларускія князі спадзяваліся ў саюзе з Масквой захаваць свае ўдзельныя княжэнні. З гэтай мэтай яны паддаваліся пад уладу Масквы. Князі Варатынскія, Вяземскія, Бялеўскія, Мязецкія ў перыяд 1487—1493 гг. здрадзілі Літве, перайшоўшы на старану Масквы, якая з гэтага моманту глядзела на ўладанні паддаўшыхся ёй князёў як на айчыну маскоўскага князя.

**Літва і феадальныя князі ў Вялікаросіі.** Рост Маскоўскага княства прычыніўся да загубы феадальна-ўдзельнага ладу. Гандлёвая арыстакратыя Ноўгарада і ўдзельныя князі шукалі ў Літве дапамогі супроць цэнтралістычнае палітыкі маскоўскага князя. Панёсшы няўдачу ў сваіх планах, удзельныя князі знаходзілі сабе прытул пры двары вялікага князя, які ласкава спатыкаў усіх уцекачоў і надзяляў іх зямельнымі фундацыямі. Асабліва значным быў пацяг на Літву з боку ўдзельных князёў у эпоху тэрору Івана IV.

**Літва і Ноўгарад.** Паміж Ноўгарадам і Літвой былі даўнейшыя гандлёвыя сувязі. Літоўска-беларускае купецтва старалася праз Ноўгарад падтрымліваць беспасярэднія гандлёвыя зносіны з нямецкімі купцамі, мінаючы Закон, які займаў вусце Нёмана і Заходняй Дзвіны. Літоўскія вялікія князі не маглі дапусціць залежнасці Ноўгарада ад Масквы і не раз спрабавалі захапіць яго. У 1444 г. вялікі князь Казімір спрабаваў заняць Ноўгарад. Васіль Васільевіч звярнуўся за дапамогай да татар, якія спустошылі Смаленскую зямлю. Казімір быў прымушаны выйсці з Ноўгарадскай зямлі. Паходы на Ноўгарад Васіля Цёмнага (1441—1456), у часе якіх на Ноўгарад накладвалася значная кантрыбуцыя, прымусілі ноўгарадцаў звярнуцца за дапамогай да Літвы. У 1457 г. былі пасланы ў Кракаў паслы для перагавораў аб падданстве. Цэнтралістычная аб'ядналаўчая палітыка Івана III (1462—1505) прымусіла ноўгарадскую арыстакратыю звярнуцца за дапамогай да Літвы. На гэты раз дамова адбылася. Вялікі князь абяцаў бараніць ноўгарадцаў ад маскоўскага князя, а Ноўгарад далучаў да Літвы. Яму была пакінута ўнутраная аўтаномія і незачэпнасць праваслаўнае веры. Вялікакняскі намеснік павінен быў быць праваслаўным. У Ноўгарадскай зямлі забараняецца будаваць касцёлы і прымушаць прымаць каталіцызм. Казімір паслаў у Ноўгарад намеснікам Міхайлу Алелькавіча, будучага ўдзельніка змовы 1481 г. Саюз Літвы і Ноўгарада не даў апошняму пажаданых вы-

нікаў. Літва не магла даць ніякай рэальнай дапамогі ў барацьбе Ноўгарада з Масквою. Гэты саюз толькі прыспяшыў захоп Ноўгарада маскоўскім князем (1470).

**Літва і Масква.** Літоўскія князі з таго моманту, як распачаўся рост Маскоўскага княства, адносіліся да яго з пэўным падазрэннем. Казімір у далейшым цягу праводзіў палітыку Ягайлы і Вітаўта. Рост Масквы быў занадта небяспечным для Літоўскага Вялікага княства і пагражаў еднасці і цэласці дзяржавы. Ужо ў 1445 г. Казімір пасля няўдалага Ноўгарадскага паходу адправіўся на Маскву. У бітве з маскоўскім войскам Казімір быў разбіты і павінен быў вярнуцца дамоў. У 1449 г. абодва суседы завязалі мірную дамову і абавязаліся мець супольных ворагаў і прыяцеляў і жыць у згодзе. Абодва бакі не выпаўнілі гэтае дамовы. Сілы Масквы і Літвы покуль што ўраўнаважваліся. Іван III да самай смерці Казіміра не распачынаў вайны супроць Літвы. Аднак пытанне аб Беларусі становіцца чарговым пытаннем замежнай палітыкі Масквы з часоў Івана III. Масква пачынае выяўляць прэтэнзіі на Кіеў, Полацк, Віцебск як на «айчыны прабацькоў». Гэтая нацыяналістычная ідэалогія будавалася на матэрыяльным фундаменце. Маскве патрэбны былі гандлёвыя шляхі на Захад. Гэта выклікала барацьбу паміж Масквой і Літвой[1]. Іван III у саюзе з крымскім ханам Менглі-Гірэем напаў на Літву (1493). Былі захоплены гарады Мцэнск, Хлепня і Рагачоў. У 1494 г. былі захоплены Вязьма, Дарагабуж. Літва была прымушана пайсці на згоду з Масквой. Паводле дагавору да Масквы адыходзілі ўладанні пагранічных чарнігава-северскіх князёў: Новасільскіх, Адоеўскіх, Варатынскіх, Вяземскіх, Перамышльскіх, Бялеўскіх. Каб утрываліць мір, дачка Івана III павінна была выйсці замуж за вялікага князя Аляксандра, але гэта не наладжвала добрасуседскіх адносін; хутчэй наадварот, гэта давала повад для ўмяшання ва ўнутраныя справы з прычыны нібыта прымушання вялікай княгіні Алены да каталіцызму, хаця ў рэчаістасці гэткага прымусу не было. Апрача гэтага ліцвіны не прызнавалі новага тытулу вялікага князя «Всея Русі».

**Другая вайна (1501—1504)[2].** У 1500 г. перайшлі на службу ў Маскву шэраг князёў — патомкаў выхадцаў з Масквы. Гэта былі князь Сымон Іванавіч Бельскі, князь В. І. Шамячыч, князь С. І. Мажайскі, якія паддаліся з гарадамі Рыльскам, Ноўгарад-Северскім, Чарнігавам, Старадубам, Гомелем, Любечам. Уся Чарнігава-Северская зямля паддалася Маскве. Распачынаецца вайна. Казанскія татары былі на баку Масквы. Войска заняло Серпейск, Мцэнск, Масальск, Бранск. 14 ліпеня[3] літоўскае войска на рэчцы Ведрашы каля Дарагабужа пад верхаводствам князя Астрожскага было ўшчэнт разбіта, а 14 лістапада была разбіта пад Мсціслаўлем другая армія літоўская[4]. Нарэшце, Менглі-Гірэй утаргнуўся ў межы Вялікага Княства з поўдня. Тагды магістр Лівонскага закона Плетэнберг, баючыся найсця маскоўскіх войск, завязаў саюз з Літвой. Але

[1] Першая вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім (1492—1494).
[2] Другая вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім (1500—1503).
[3] 1500 г.
[4] Група войск князёў М. Іжаслаўскага і А. Дашковіча 14 лістапада 1501 г.

гэта не палепшыла замежнага становішча Літвы. І Польшча, насупроць дамовы 1501 г., не давала ніякай дапамогі. Пры такіх умовах Літва была прымушана завязаць мір з Масквой (25 сакавіка 1503 г.)[1]. Масква атрымала тэрыторыю верхняй Акі і частку Чарнігава-Северскай зямлі з гарадамі: Чарнігаў, Старадуб, Пуціўль, Рыльск, Ноўгарад-Северскі, Гомель і інш. Ад Смаленскай і Віцебскай земляў былі адцягнуты Дарагабуж, Белы, Тарапец. Усяго адышло 19 гарадоў, 70 воласцяў, 22 гарадзішчы і 13 сёл. Гэтак пачаўся падзел Беларусі.

**Трэцяя вайна з Масквою (1507—1508).** Калі маскоўскі пасад заняў Васіль III (1505—1533), вялікі князь Аляксандр паслаў пасольства, патрабуючы вярнуць адданыя Маскве гарады. Маскоўскі князь адказаў на гэта тым, што «он чужіх волостей не держіт, а держіт свої». У 1506 г. памёр вялікі князь Аляксандр. Зараз жа Васіль III напісаў сваёй сястры Алене ліст, у якім раіў, каб яна пераканала біскупаў, радных паноў і земскіх людзей, «что бы похотелі его государству служіть», абяцаючы пры гэтым захаваць каталіцкую веру. Алена адказала, што ў Літве абіраецца Жыгімонт Казіміравіч. Новы вялікі князь, знайшоўшы сабе саюзніка ў асобе новага крымскага хана — Менглі-Гірэя, які быў нездаволены з паходу маскоўскага князя на казанскіх татар, а гэтаксама другога саюзніка ў асобе лівонскага магістра, — са згоды сойма, быўшага ў Вільні, адправіў паслоў, патрабуючы, каб маскоўскі князь вярнуў забраныя Іванам III гарады. Васіль III адказаў, што ён трымае толькі тыя, «которымі его благословіл сам Бог і наш покойный родітель». Васіль выказваў пажаданне падтрымліваць згоду з Літвой, але так, як гэта яму будзе выгодна. Распачатыя перагаворы былі спынены, і ў канцы красавіка маскоўскае войска было ў межах Літвы. Жыгімонт І памыліўся ў сваіх саюзніках. Крым і Лівонія не падалі яму ніякай дапамогі. Васіль III знайшоў саюзніка ў асобе князя Міхайлы Васільевіча Глінскага, які займаў выдатнае месца пры двары нябожчыка князя[2]. Глінскі стаяў на чале беларускай партыі, варожай ліцвінам. Пры Жыгімонту І становішча яго пагоршала. Літоўская партыя зноў умацавалася. Князь Глінскі ўтраціў свой уплыў пры двары. Глінскі, выехаўшы ў свой маёнтак, распачаў перапіску з маскоўскім князем. Спадзеючыся на дапамогу апошняга, князь Глінскі падняў паўстанне, маючы на ўвазе ўтварэнне новае Беларускае дзяржавы. Паўстанне закончылася няўдачай. Беларуская шляхта засталася вернай Жыгімонту І. Тады Глінскі перайшоў на бок Масквы і пачаў спусташаць літоўскія землі. Бачачы бесскутэчнасць барацьбы, Жыгімонт І завязаў 19 верасня 1508 г. мір з Васілём III. Масква і Літва заставаліся пры сваіх ранейшых уладаннях.

**Чацвёртая вайна з Масквою (1512—1522).** Нягледзячы на перамір'е, абодва бакі рыхтаваліся да вайны. У 1512 г. маскоўскае войска ўрываецца ў Беларусь. Цэнтрам ваенных дзеянняў з'яўляецца Смаленск як ключ да шляху к Балтыйскаму мору. 30 ліпеня 1514 г. маскоўскае войска заняло Смаленск. Пасля

[1] 5 сакавіка 1503 г.
[2] Аляксандра.

Смаленска былі захоплены Мсціслаўль, Крычаў і Дуброўе[1]. Галоўныя ваенныя сілы Масквы пасоўваліся ў кірунку Воршы і Барысава пад верхаводствам Міхайлы Глінскага. Недалёка ад Воршы сустрэліся маскоўскае і літоўскае войскі. Князь Глінскі распачаў перагаворы з Жыгімонтам І і хацеў перайсці на яго бок, але яго ўцечка не ўдалася. 8 верасня 1514 г. адбылася крывавая бойка. На гэты раз маскоўскае войска было разбіта літоўскім гетманам князем К. Астрожскім. Гэта спыніла далейшы рух Масквы ўглыб Беларусі, але не магло вярнуць Літве захопленых Масквою гарадоў. Дапамога крымскага хана Махмет-Гірэя не дала ніякай карысці з тае прычыны, што ён быў разбіты недалёка ад Тулы князямі Адоеўскім і Варатынскім. У літоўска-маскоўскія адносіны ўмяшаўся германскі імператар Максіміліян І, які прыслаў у Маскву ў якасці пасла Герберштэйна. Пасрэдніцтва гэта закончылася нічым з тае прычыны, што Васіль III не хацеў аддаваць Смаленска. Вайна зноў распачалася. Уся Беларусь ад Смаленска да Вільні была спустошана. Жыгімонт І звярнуўся ізноў за пасрэдніцтвам да Карла V. У 1522 г. было завязана перамір'е на пяць год. Смаленск заставаўся за Масквою. У 1526 г. перамір'е было працягнута яшчэ на пяць год.

**Пятая вайна (1534—1537).** У 1533 г. па смерці Васілія III зноў распачалася вайна, якая цягнулася каля чатырох год. Ліцвіны спадзяваліся выкарыстаць партыйную барацьбу ў Маскве і захапіць Смаленск. Ім удалося толькі захапіць Гомель і Старадуб, але маскоўскае войска 27 лютага 1537 г.[2] разбіла літоўскае войска каля Себежа. Жыгімонт адправіў пасольства ў Маскву. 25 сакавіка 1537 г. быў завязан мір на пяць год. Абодва бакі засталіся ў даваенным становішчы.

**Літва і татары.** На паўднёвай граніцы Літоўска-Беларуская дзяржава суседзіла з татарамі. З распадам Залатой Арды і ўтварэннем Крымскага ханства паўднёвая граніца часта пераносіла набегі з боку крымскіх татар. Асабліва цяжкімі для Літоўска-Беларускае дзяржавы былі наезды Менглі-Гірэя пачынаючы з 1482 г. Апошні захапіў Кіеў і спаліў яго[3]. Уся Украіна была спустошана. Граніцы дзяржавы пасунуліся значна на поўнач. Крымскі князь быў верным саюзнікам Івана III і ў сваіх дзеяннях кіраваўся радай апошняга. Кіеўшчына, Валыншчына і Падолле падлягалі спусташэнням ад татар. Насяленне разбягалася. Мясцовасці з надзвычай урадлівай глебай фактычна былі выкрэслены з межаў дзяржавы. Урад не меў сілы арганізаваць абарону граніц. Татары цэлымі грамадамі забіралі палонных і прадавалі іх на рынках Усходу. Рускія рабы паяўляліся нават на рынках Фларэнцыі. Каб адкупіцца ад гэтых руйнуючых наездаў, вялікі князь выплачваў хану «дані і выезды», траціў вялікія грошы на прыём інагародных ханскіх паслоў. З 1511 г. літоўскі князь выплачвае татарам штогод тры тысячы коп літоўскіх грошай. Вялікі князь стаў фармальным татарскім даннікам. Нягледзячы на акуратную выплату дані, і пры наступніку Менглі-Гірэя — Махмету-Гірэю літоўска-татарскія адносіны ўвесь час заставаліся напружанымі.

---

[1] Дуброўна.
[2] 1536 г.
[3] 1 верасня 1482 г.

## Е) Нацыянальны склад Літоўска-Беларускай дзяржавы

**Беларусы і ліцвіны.** Склад насялення Вялікага княства Літоўскага з нацыянальнага боку адзначаўся вялікай разнастайнасцю. З далучэннем да ўласна Літвы беларускіх і ўкраінскіх зямель літоўская нацыянальнасць у дзяржаве складала значную меншасць і распылялася ў масе славянскага насялення. Юрыдычнае становішча абедзвюх нацыянальнасцей было далёка не аднолькавым. Літоўскія і беларуска-ўкраінскія землеўласнікі аж да прывілея 2 мая 1447 г. не былі раўнапраўны. Прывілей 1447 г. ураўняў у правах літоўскую і беларуска-ўкраінскую шляхту, але захаваў канфесіянальны артыкул, якім істотна абмяжоўваліся палітычныя правы беларуска-ўкраінскіх землеўласнікаў.

**Палякі.** Палякі былі прышлай нацыянальнасцю і ў агульнай масе насялення складалі мізэрную меншасць. Найбольшай паланізацыі падлягала Падляшша. Літоўскія нацыяналісты баяліся эміграцыі ў Літву іншых нацыянальнасцей і патрабавалі ад сваіх вялікіх князёў адпаведных гарантый. Артыкулы прывілеяў 1447 і 1492 гг., увайшоўшыя ў Статут 1529 г. і забараняўшыя раздаванне пасад і зямель нетубыльцам, былі пакіраваны супроць палякаў. Вельмі значны працэнт польскіх выхадцаў давала каталіцкае духавенства.

**Вялікарасійцы.** Паяўленне вялікарасійцаў у Літве звязана з умацаваннем улады маскоўскіх цароў і іх супроцьфеадальнай палітыкай. Пакрыўджаныя і нездаволеныя феадалы-князі ўцякалі ў Літву і знаходзілі тут сабе прыпынак. Асабліва быў значны наплыў эмігрантаў-феадалаў у эпоху Лівонскае вайны, калі тэрор Івана Грознага прымушаў значную колькасць феадальных князёў і баяр пакідаць родную зямлю. Гэтыя вялікарасійскія феадальныя элементы распыляліся ў моры беларуска-ўкраінскай шляхты, падлягаючы культурнаму ўплыву апошняй. У часе Лівонскай вайны і акупацыі Беларусі тут асела значная колькасць вялікарасійцаў, атрымаўшых зямельныя надзелы ад Івана Грознага. З выхадам маскоўскіх войск былі прымушаны выйсці і новыя землеўласнікі, але пэўная частка вялікарасійцаў усё ж такі засталася.

**Яўрэі.** Яўрэі гэтаксама нацыянальнасць прышлая. З'яўленне іх у Літве трэба аднесці да XIV ст. Яўрэі прыйшлі з Нямеччыны праз Польшчу. Галоўным рухоўнікам яўрэйскай эміграцыі з'яўляўся гандлёвы капітал, які прымушаў іх пасоўвацца на ўсход па сырыя прадукты для еўрапейскага рынку. Яўрэі аселі перш-наперш у гарадах: Бярэсці, Троках, Горадні. Вялікія князі, адчуваючы патрэбу ў прышлым яўрэйскім капітале, выдалі яўрэйскім грамадам прывілеі, якія вызначалі іх праўнае становішча ў Літоўска-Беларускай дзяржаве. У 1388 г. ад Вітаўта атрымалі прывілей трокскія і берасцейскія яўрэі, а ў 1389 — горадзенскія. Пры вялікім князю Аляксандру Казіміравічу адбыўся грандыёзны яўрэйскі пагром, які прымусіў Жыгімонта I выдаць яўрэям у 1507—1514 гг. пацвярджальныя прывілеі, знайшоўшыя адбітак і ў Статуце 1529 г. Яўрэі займалі ўпрывілеяванае становішча. Складаючы паасобны стан, выасаблены ад літоўскай і беларускай нацыянальнасцей, яўрэі мелі шэраг правоў і вольнас-

цей. Незачэпнасць асобы яўрэя забяспечваецца тым, што за забойства яўрэя хрысціянін падлягае пакаранню, а яго маёмасць канфіскуецца. У выпадку забойства яўрэя, калі маецца падазрэнне, а няма сведак, гаспадар выступаў абаронцам яўрэя. За забойства хрысціяніна яўрэй падлягае кары смерці. «Обліченіе» яўрэя в «забітіі дітяті хрістіянскіе» павінна быць даведзена шасцю сведкамі: трыма з хрысціян і трыма з яўрэяў. Яўрэі мелі права ўладаць рухомай і нерухомай маёмасцю, маглі вольна наладжваць свае набажэнствы. Зборы яўрэяў абаронены законам ад нападаў з боку хрысціян. Яўрэі мелі права займацца гандлем без усякіх агранічэнняў.

**Татары.** Татарскі элемент паяўляецца ў Літве з часоў няўдачнае бойкі Вітаўта на рацэ Ворскле. Вялікакняскія прывілеі вызначылі праўнае і павіннасцевае палажэнне татар. Усе паасобныя прывілеі былі аб'яднаны ў прывілеі Жыгімонта II Аўгуста (1568). Татары мелі права ўладаць зямлёю і адбываць ваенную службу, не мелі права займаць адміністрацыйныя і судовыя пасады, не прымалі ўдзелу ў соймікавых нарадах, не мелі права мець хрысціянскіх падданых.

**Немцы.** Немцы з'яўляюцца на тэрыторыі Беларусі з XIII ст., калі пасля заснавання Рыгі былі завязаны прамыя гандлёвыя зносіны з Віцебскам і Смаленскам. З утварэннем Літоўска-Беларускае дзяржавы і ўпадкам Тэўтонскага закона нямецкія каланісты асядалі ў гарадах, дзе займаліся гандлем і рамёсламі, а гэтаксама станавіліся арандатарамі гаспадарскіх лесных добр і падрадчыкамі па іх распрацоўцы. Нямецкі элемент быў нязначны, і да паловы XIV ст. ён не рабіў на шляхецкі стан ніякага культурнага ўплыву.

## Ж) Краінныя канстытуцыі

**Апублікаванне прывілеяў.** Беларускія і ўкраінскія землі, уваходзіўшыя ў склад Літоўска-Беларускай дзяржавы, атрымалі ад вялікіх князёў прывілеі, якія астаўлялі за краінамі іх унутраную аўтаномію і вызначалі адносіны краін да цэнтральнае ўлады, што распараджалася фармальным суверэнітэтам над усімі краінамі дзяржавы. Прывілеі ў той жа час ахоўвалі мясцовае права. Публікацыя прывілеяў злучана са знішчэннем палітычнага феадалізму праз Вітаўта. Нацыянальна-палітычная барацьба пры Казіміру прымушала яго выдаваць пацвярджальныя прывілеі, якія не аднакроць пацвярджаліся аж да самай Люблінскай уніі 1569 г.

**Чатыры групы прывілеяў.** Краінныя прывілеі дзеляцца на чатыры групы. Да першай прыналежаць прывілеі Полацкай, Віцебскай і Смаленскай земель. Прывілеі Жмудскай зямлі, Дарагічынскага і Бельскага павета складаюць другую і трэцюю групу. Да чацвёртай трэба аднесці прывілеі Кіеўскай і Валынскай земель.

**Прывілеі першай групы.** Прывілеі Полацкай і Віцебскай земель амаль што тыя самыя як па свайму зместу, гэтак і па аб'ёму тых праў, якія надаюцца землям. Прывілеі Смаленскай зямлі значна вузей па свайму зместу. Пацвярджаль-

ныя прывілеі былі выданы тром беларускім землям па просьбе насялення ўсіх паасобных зямель. Беларускія краінныя прывілеі бароняць правы ўсяго насялення. Яны носяць усестанавы характар. Найвышэйшым кіраўніком усёй зямлі з'яўляецца ўсестанавы краінны збор. На ім прысутнічаюць духоўная і свецкая арыстакратыя, дробныя землеўласнікі, «чорныя людзі» і ўсё паспольства. Склад краіннага збору аднакі ва ўсіх землях. Ён дэмакратычны. Станавасць покуль што да пачатку XVI ст., к моманту выдачы прывілеяў, яшчэ не пранікла глыбока ў нетры грамадзянства. Ад імя ўсёй зямлі краінны збор мае права звярачацца з просьбай да вялікага князя. Віцебскі і Полацкі краінныя зборы маюць права абіраць кандыдатаў на пасаду ваяводы, які павінен быць зацверджаны самім гаспадаром. Апошні абавязаны ўхіліць ваяводу ад пасады, калі яго «обмовят» перад гаспадаром. У Смаленскай зямлі ваявода назначаецца па волі гаспадара, але ўсё правінцыяльнае кіраўніцтва знаходзілася ў руках тубыльчага баярства — «по старому». Гэта ахоўвала краіны ад наплыву чужаземцаў. Прадстаўніком усёй зямлі з'яўляўся князь. У яго адсутнасць функцыі вялікага князя выпаўняюць ваяводы, якія кіруюць судовымі справамі і абавязаны ў сваіх судовых пастановах меркавацца мясцовым правам. Суд адбываецца на месцы. Не дазваляецца выклікаць на суд гаспадара ў Літву. На судзе ваяводы Віцебскай зямлі прысутнічаюць князі, баяры і мяшчане, «досмотревшы с которымі» ваявода выносіць судовую пастанову. У Смаленскай зямлі ваявода судзіць з «окольнічімі і іншымі вряднікамі». Усе гэтыя прысутныя на судзе асобы з'яўляюцца абаронцамі мясцовага права і звычаяў. Краінныя прывілеі забяспечваюць насяленню асабовую незачэпнасць. Справа павінна разглядацца «на явном суде хрістіанском». Ніхто не можа быць пазбаўлены маёмасці, як толькі па суду. Жонка і дзеці не адказны за праступленні мужа, і наадварот, калі толькі яны самі не былі паведамлены аб праступленні і не прымалі ў ім удзелу. Жыхары зямлі маюць права выязджаць у Літву (Віцебская), і «куды кто хочет без кождое зачепкі» (Полацкая). Выезд павінен быць яўны, а не тайны. Выязджаючы грамадзянін мае права распараджацца сваёй маёмасцю як яму даспадобы. Гаспадар не можа «вступатіся» ў зробленыя распараджэнні. Віцебскі, Полацкі і Смаленскі краінныя прывілеі забяспечваюць насяленню права свабоднага распараджэння сваёй маёмасцю. Вымарачныя маёмасці «безадшчіна» і «отмершчіна» зусім не спадаюць на гаспадара (Полацкая і Віцебская). Па смерці мужоў удоў нельга па няволі выдаваць замуж. Запісаная мужам маёмасць застаецца ў распараджэнні ўдавы нават у тым выпадку, калі яна выходзіць зноў замуж. Краінныя прывілеі забяспечвалі насяленню старадаўнае працэсуальнае права, гандлёвы суд, асобу і маёмасць ад уціску мясцовай адміністрацыі і вызначалі абавязкі насялення па адбыванню дзяржаўных падаткаў. Прывілеі пацвярджалі правы царквы і духавенства і замацоўвалі паасобныя грамадзянскае і крымінальнае права. Краінныя прывілеі разглядаюць воласць-зямлю як асобную частку ў дзяржаве, звязаную публічна праўнымі адносінамі з літоўскімі вялікімі князямі, якія абяцаюць не раздаваць нікому валасцей і гарадоў па прыватнаму праву. Краінныя прывілеі сведчаць аб актыўным палітычным жыцці беларускіх

краін. Крыніцы высвятляюць існаванне краінных збораў у Полацку, Віцебску, Смаленску. Склад гэткіх збораў далёка не аднолькавы, але веча заўсёды выступае як верхаводца зямлі. На краінных зборах заўважваецца партыйная барацьба «лучшіх і меншіх людей». Фактычна адносіны паміж гэтымі двума элементамі былі наступныя: «меншіе люді меж себе раду чінят, а старшіе науку дают». Часамі партыйная барацьба вымагала ўмяшання ўлады. Толькі партыйнай барацьбой можна вытлумачыць тое, што ў Полацк была паслана ў 1456 г. грамата з запатрабаваннем, каб мясцовыя баяры, мяшчане, шляхта і ўсё паспольства былі паміж сабою «в раде, а дела бы наші городскіе вершілі все с обшчего согласія». Асабліва была значна партыйная барацьба ў Смаленску ў палове XV ст. у момант сепаратыйнага руху, ахапіўшага беларускія землі. Яшчэ ў XVI ст. «Полоцк по старому справовал, як велікій Новгород і Псков».

**Прывілеі другой групы.** Жмудскі краінны прывілей, пацверджаны вялікім князем Аляксандрам 14 жніўня 1492 г., замацоўваў усе правы і звычаі, наданыя Жмудзі Вітаўтам і вялікім князем Казімірам, вызначаў Жмудзь у складзе Вялікага княства як тэрыторыю, далучаную да дзяржавы не «през меч, альбо через валкі, але з добрею волей», даваў зямлі права выбіраць старасту, абяцаў ад імя гаспадара не пасылаць дзецкіх за межы Жмудзі, забяспечваў асабовую незачэпнасць, вызначаў станавыя правы і вольнасці, бараніў насяленне ад надужыццяў з боку органаў мясцовай адміністрацыі, забараняючы цівунам браць «посулы», даваў дакладныя пастановы адносна дзяржаўных падаткаў і натуральных павіннасцей насялення, замацоўваў за насяленнем права займацца леснымі і рэчнымі промысламі, вызначаў маёмасныя правы насялення і нормы крымінальнага права.

**Прывілеі трэцяй групы.** Прывілеі, выданыя вялікім князем Аляксандрам бельскай шляхце ў 1501 г. і дарагічынскай шляхце ў 1516 г., маюць выключна станавы характар. Прывілей замацаваў за шляхтаю права карыстацца польскім правам, устанавіў для сялян аднадзённую паншчыну і чатыры талакі на год з аднае валокі. Рэгуляваў права выхаду сялян шляхам выплаты паўкапы грошай з кожнай валокі, вызначыў велічыню грашовага штрафу, што выплачваецца памешчыкам, якія далі сялянам больш лёгкія ўмовы з мэтай прыцягнуць апошніх на зямлю, уводзіў мясцовае самасправаванне паводле польскага права, вызначыў характар натуральных павіннасцей, падаўшых на шляхецкую масу, урэгуляваў грамадзянскія праўныя адносіны, бараніў крымінальнымі карамі нерухомасць землеўласнікаў, вызначыў велічыню падаткаў і судовых штрафаў, паступаючых у распараджэнне судовых органаў. Дарагічынскі прывілей змяшчае ў сабе ўрачыстую дэкларацыю вялікага князя аб распаўсюджанні на ўсю Дарагічынскую зямлю польскага права з ліквідацыяй старых судовых парадкаў. Апошні прывілей, падгатовіўшы далучэнне Дарагічынскай зямлі да Польшчы, вельмі аднабокі па свайму зместу, і яго можна толькі з вялікімі абмежаваннямі аднесці да гэтак званых краінных прывілеяў.

**Прывілеі чацвёртай групы.** Кіеўскі і Валынскі прывілеі, пацверджаныя Жыгімонтам I па просьбе ўсяго мясцовага землеўласніцкага класа, пранікнуты такім самым станавым пачаткам, які яшчэ ў гэты час не адчуваецца ў бела-

рускіх прывілеях. Зямля прадстаўлена толькі ў асобе шляхецкага стану. Кіеўскі прывілей пацвярджае права шляхты на выключнае кіраванне валасцямі, а гэтаксама і ўсе мясцовыя правы і звычаі, наданыя ранейшымі вялікімі князямі; забяспечвае асабістую незачэпнасць і індывідуальную адказнасць за праступленні; дае шляхце права часовага выезду за граніцу, зроўнівае кіеўскую шляхту з літоўскаю ва ўсіх правах і абавязках, вызначае грашовыя падаткі і натуральныя павіннасці, забараняе свабодны пераход сялян з гаспадарскіх зямель на прыватнаўласніцкія і наадварот, звальняе ўласніцкіх сялян, жывучых у гарадах, ад мясцовай юрысдыкцыі і гарадскіх налогаў, забяспечвае царкве неўмяшанне ў царкоўныя справы. Валынскі прывілей пацвярджае ўсе правы і вольнасці, якімі ўжо карысталася Валынская зямля, вызначае станавыя правы шляхты, забяспечвае асабістую незачэпнасць, бароніць насяленне ад самаўпраўства мясцовае адміністрацыі, вызначае працэсуальныя нормы, забараняе назначаць і збіраць новыя падаткі, вызначае склад і кампетэнцыю старасцінскага суда, змяшчае ў сабе некалькі пастаноў, датычных крымінальнага права.

## 3) Народная гаспадарка ў XV і першай палове XVI ст.

**Паўднёвы гандаль.** Заходняя Дзвіна, Нёман і Заходні Буг злучалі Літоўска-Беларускую дзяржаву з рынкамі Захаду, у той час як па Дняпры наладжваецца гандаль з Усходам. Паступовае ўмацаванне тавараабмену з Захадам і змена ў структуры гаспадаркі апошняга адбіваліся на становішчы і развіцці народнае гаспадаркі ў Літве-Беларусі. Паўднёвы гандаль, які меў гэткае вялізнае значэнне для эпохі Кіеўскае дзяржавы, спыніўся пасля таго, як татары захапілі прычарнаморскія стэпы. Гэты гандаль крыху ажывіўся ў палове XV ст., але пагромы Менглі-Гірэя рабілі немагчымым развіццё тавараабмену з Усходам. У XVI ст. гандаль зноў ажыўляецца, але для народнае гаспадаркі ён меў другараднае значэнне. Цэнтрам гандлю быў Кіеў для купцоў, прыязджаўшых з Персіі, Індыі, Арабіі, Сірыі. Адтуль усходнія тавары пакіроўваліся на Маскву, Пскоў, Ноўгарад і далей у Данію і ў Швецыю. Літоўска-татарскія напружаныя адносіны ў значнай меры паралізавалі развіццё паўднёва-ўсходняга гандлю.

**Гандаль з Ноўгарадам і Масквой.** Літва ў працягу XV ст. падтрымлівала гандлёвыя сувязі з Ноўгарадам. Ноўгарадскія купцы прывозілі ў Вільню ўсходнія тавары і вывозілі адтуль сырэц. Дагавор 1431 г. дазваляў прыязджаць ліцвінам у Ноўгарад. Прызнанне Ноўгарадам суверэнітэту Вялікага княства Літоўскага павінна было звязаць Літву з Ноўгарадам яшчэ цясней. Упадак ноўгарадскай незалежнасці спыніў гандаль з Ноўгарадам. Уласныя гандлёвыя сувязі з Захадам рабілі лішнімі гандлёвыя адносіны з Ноўгарадам. Літоўска-маскоўскія войны XV і першай паловы XVI ст. перашкаджалі развіццю пастаяннага тавараабмену паміж Літвой і Масквой. Для Масквы літоўскі рынак быў вельмі важны дзеля скупкі серабра. Вялікі адплыў апошняга з Літвы выклікаў забарону вывазу серабра ў Маскву. І маскоўскія купцы трымаліся ў адносінах да літоўскіх такіх жа забарончых мер.

**Гандаль з Захадам.** Нягледзячы на варожыя адносіны Літвы з Законам, апошні павінен быў даць Літве права свабоднага гандлю на сваёй тэрыторыі. Разгром 1410 г. спрыяў развіццю тавараабмену з Захадам па Нёмане. Яшчэ мацнейшымі сталі сувязі з Захадам пасля таго, як Гданьск адышоў да Польшчы (1466). Адначасова з гэтым умацоўваецца тавараабмен па Дзвіне, дзеля таго што агульны заняпад Закона прымушаў магістра моцна трымацца Літвы і Польшчы. К пачатку XVI ст. выяснілася пераважнае значэнне заходняга і паўночна-заходняга гандлю. Літва вывозіла прадукты свайго краю: мёд, воск, футры, скуры. Захад адсылаў сукно, цукар, жалеза, селядцы, розныя металічныя вырабы, каланіяльныя прадукты. Літоўска-беларускі сырэц знаходзіў вялікі попыт на еўрапейскім рынку. Развіццё тавараабмену прыцягвала ў краіну вялікую колькасць металічнае манеты. Паніжэнне каштоўнасці грошай у першай палове XVI ст. і падвышэнне таварных цэн было скуткам ажыўленага тавараабмену з Захадам. Гэтыя самыя гандлёвыя сувязі прымушалі Літву і Беларусь трымацца саюзу з Польшчай, што падрыхтавала грунт для канчатковага аб'яднання Літвы з Польшчай. Гандлёвыя зносіны з Рыгаю высоўвалі на першы план пытанне аб лёсе Лівоніі, якое ў другой палове XVI ст. стала супольным для Літвы і Польшчы.

**Унутраны гандаль.** Развіццё замежнага тавараабмену і распад натуральна-гаспадарчага ўкладу жыцця дзяржавы спрыялі паяўленню ўнутранага тавараабмену. Цэнтрамі ўнутранага гандлю былі гарады, атрымаўшыя магдэбургскае права. У іх бывалі штотыднёвыя таргі і наладжваліся кірмашы па некалькі разоў у год — два або тры разы. Наданне гарадам права склада і пабудова пастаялых двароў сведчаць аб тавараабмене ўнутры краіны. Гаспадарская дворная гаспадарка ўжо ў першай чвэрці XVI ст. знаходзіць збыт сваіх прадуктаў на старане. І прыватныя землеўласнікі будавалі мястэчкі з таргамі і кірмашамі, хаця ў XV ст. гэтае з'явішча яшчэ не было пашырана. На праезджых дарогах-«гостінцах» будаваліся карчмы, у якіх прадавалася хмельнае пітво. З мэтай развіцця ўнутранага гандлю ўрад надаваў купцам палёгкі мытнага характару. Віленскія купцы былі звольнены ад выплаты ўнутраных мытных падаткаў. Гэта спрыяла абагачэнню віленскага купецтва. За Вільняй ішлі Бярэсце, Коўна, Горадня. Павелічэнне мясцовых даходаў і велічыня «серэбшчыны», прыпадаўшае на той ці іншы горад, сведчаць аб развіцці ў ім унутранага гандлю, які, аднак, у XV і пачатку XVI ст. усё яшчэ быў нязначны. Перавага натуральнае гаспадаркі не магла ўтварыць унутранага рынку вялікай ёмасці. Унутраны гандаль быў асабліва развітым у заходніх краінах, у раёне замежнага гандлю.

**Сельская гаспадарка.** Літва-Беларусь заставалася краінай сельскай гаспадаркі. Спачатку сельская гаспадарка мела на ўвазе здавальненне ўласных патрэбаў, але ў меру развіцця замежнага гандлю гаспадарскія і прыватнаўласніцкія сёлы пачалі вырабляць прадукты, прызначаныя для ўнутранага і замежнага рынку. Пераход да такое гаспадаркі пацягнуў за сабою перамену і ў тэхніцы гаспадаркі. Пануючая пераложная сістэма паступова замяняецца трохпольнай у заходніх дварах і ў Полацкай і Смаленскай землях. Пераход да новае тэхнікі

звязаны з ростам насялення. Сеялі жыта, ячмень, авёс. З развіццём сельскае гаспадаркі паншчына даходзіць да двух дзён на тыдзень. Велічыня панскай заворкі спачатку была нязначнай. Яна абслугоўвалася працаю «чэлядзі нявольнай», і толькі ў другой чвэрці XVI ст. яна ўступае месца «цяглым людзям», асноўнай рабочай сіле двара. Сельская гаспадарка ў XV ст. вялася па-старому. Канечнасць падняцця прадукцыйнасці гаспадарскае сельскае гаспадаркі вымагала весці гаспадарку больш рацыянальна. Пад уплывам гэтага ўрад з 1514 г. пачаў выдаваць гаспадарчыя ўставы, маючы на ўвазе найбольш рацыянальнае наладжанне на гаспадарскім двары сельскае гаспадаркі. Слабае развіццё грашовае гаспадаркі покуль што не патрабавала пашырэння дворнай заворкі за кошт сялянства. Значная колькасць зямлі знаходзілася ва ўладанні сялян як у гаспадарскіх, гэтак і прыватных уласніцкіх маёнтках. Слабае развіццё гадоўлі жывёлы сведчыць аб адсталасці сельскай гаспадаркі з тэхнічнага боку. У кожным маёнтку былі сенажаці і розныя даходныя крыніцы. Прамыслоўцы-сяляне эксплуатавалі апошнія. Спецыялісты-рамеснікі працавалі на гаспадарскі і прыватнаўласніцкі двор, здавальняючы сваёй працай яго патрэбы. Спецыялісты — дворныя слугі адбывалі пры двары розныя спецыяльныя службы. Вялікая колькасць лясоў і попыт на літоўска-беларускі лес за граніцай прымушалі звярачаць асаблівую ўвагу на развіццё леснае гаспадаркі, але апошняя покуль што адзначалася такой жа самай прымітыўнасцю.

**Землеўладанне.** Натуральна-гаспадарчы ўклад дзяржавы асабліва праявіўся ў зямельнай палітыцы вялікіх князёў. Буйныя магнаты і ўдзельныя князі ў звязку з шляхецкімі прывілеямі здабылі сабе права ўласнасці на свае ўладанні. У адносінах да гаспадара яны былі звязаны толькі абавязкам вайсковай павіннасці. Буйное землеўладанне пашырылася ў заходніх краінах. Велічыню ўладанняў можна вызначыць па колькасці коннікаў, якіх выстаўлялі магнаты ў часе вайны: Гальшанскія — 154, Радзівілы — 621, Гаштольды — 461, Кезгайлы — 768 і г. д. Гэта былі феадалы, выходзіўшыя на вайну пад сваёй уласнай харугвай са сваімі коннікамі. Побач з буйным землеўладаннем развіваецца сярэдняе і дробнае. Яно было ўмоўнага характару. Гэткія ўмоўныя наданні называліся «данінамі», «поместьем», «держаніем», «выслугою хлебокормленія», «жалованіем», «пожівеніем». Землі дарыліся «до волі і ласкі господарской», «до живота», «до двух животов». Уладальнік мог звярнуцца да гаспадара з просьбай замацаваць за ім зямлю на правах вечнасці. Гэткія просьбы пачалі падавацца асабліва часта з канца XV ст. І прыватныя землеўласнікі раздавалі ад сябе ў часовае карыстанне землі. Такія асобы, сядзеўшыя пад уладай буйнога ўласніка, былі звязаны ў адносінах да яго вайсковай службай. Сялянскае землекарыстанне развівалася навальным парадкам праз прылажэнне сваёй працы да тых вялізных лесных абшараў, якія нікім не былі заняты. Сялянскія зямельныя ўчасткі былі рознай велічыні і называліся дворышчамі, печышчамі, службамі. Гэткія землі былі большай часткай уласнасцю сямейнага або арцельнага калектыву, члены якога ў адносінах адзін да другога былі «сябрамі», «дольнікамі», «участнікамі», «братьей неделеной», «суседамі», «потужнікамі». Формы старасвецкага земле-

карыстання захоўваліся незачэпна на гаспадарскіх землях. Перадача зямель у прыватныя ўладанні незалежна ад умоў уладання разрывала валасныя сувязі і адносіны, хаця формы землеўладання заставаліся і ў гэтым выпадку без змены.

**Гаспадарскі скарб.** Даходы з гаспадарскіх маёнткаў складалі асноўную крыніцу скарбовых даходаў. Да паловы XV ст. гаспадар меў права збіраць ардынарны падатак «серебшчыну», але прывілеем 1447 г. вялікі князь Казімір адмовіўся ад яго. Мытныя падаткі з прычыны слабага развіцця ўнутранага гандлю былі нязначныя. Раздаванне зямель у вечнае і часовае карыстанне памяншала даходы скарбу. Дзякуючы цяжкаму становішчу скарбу вялікі князь аддаваў у заставу гаспадарскія маёнткі. З сялян усходніх краін паступалі падаткі натурай і грашамі. З сялян, сядзеўшых на чыншы, паступалі «осадные пенезі». У гарадах без магдэбургскага права на карысць скарбу паступалі «прутовое, поворотное, мыто, мостовое, перевоз, бочечное, померное, вага, торговые пенезі, карчомныя пенезі» і інш. Некаторыя з гэтых збораў аддаваліся ў арэнду. Мыта з прадаваных тавараў збіралі спецыяльныя мытнікі: салянічыя (з солі) і васкаўнічыя (з воску), часамі браўшыя гэтыя зборы ў арэнду або атрымліваўшыя іх «к верной руце».

**Яўрэі ў народнай гаспадарцы.** Яўрэйства ў народнай гаспадарцы Беларусі іграла вялізную ролю. Яўрэйства выступала ў якасці пасрэднікаў у замежным гандлі паміж Літвой-Беларуссю з аднаго боку і Заходняй Еўропай з другога. Гандаль спрыяў награмаджэнню ў руках яўрэяў гандлёвага капіталу. Апошні ўтвараў у яўрэйскіх грамадах класавы падзел, аддаваў бедных у поўную эканамічную залежнасць ад багатых членаў грамад. Дзякуючы награмаджэнню гандлёвага капіталу яўрэі становяцца дзяржаўцамі і арандатарамі. У XVI ст. усе арэнды мыт знаходзіліся ў руках яўрэяў. Поступ награмаджэння капіталу ў шляхецкім стане, эканамічна ўзмацняючы апошні, прымушаў шляхту імкнуцца да захопу даходных крыніц у свае рукі. Шляхта патрабавала перадачы ў свае рукі водкупаў і арэнд. Але ўрад даваў хрысціянскай шляхце поўную магчымасць браць у свае рукі арэнды, калі яна дасць больш, чым даюць «жыдове». Звычайна арэнда мыт і даходных крыніц была кароткатэрміновай — ад аднаго года да трох. Імкненне шляхты вырваць з рук яўрэяў даходныя крыніцы дало пачатак антысеміцкаму настрою ў шляхце. Але ў XVI ст. антысемітызм у Літве і Беларусі знаходзіўся пакуль што толькі ў зародку. Складаючы асобную грамаду, яўрэі падлягалі асобнаму ападаткаванню; раскладка ж падаткаў унутры грамады рабілася самою яўрэйскай грамадой.

## І) Грамадзянскі ўклад

### *1. Ваеннаслужылы клас*

**Развіццё станаў.** Ні Літва, ні Беларусь не маглі спыніцца на тых формах сацыяльна-праўнага жыцця, якія былі выпрацаваны ў старажытны перыяд. У працягу XIV–XVI ст. у Літве-Беларусі ўтвараюцца станы. Эканамічна найбольш дужыя і надзеленыя рознымі правамі сталі на чале грамадзянства. Эка-

намічна слабыя сяляне паступова трацілі сваю грамадзянскую правадольнасць і ўласнавольнасць, пападаючы ў паншчыну. Прамежнае месца паміж абодвума станамі займалі мяшчане са сваім асаблівым становішчам у дзяржаве.

**Утварэнне шляхецтва і яго склад.** З распадам роду ў літоўска-беларускіх землях выдзелілася землеўласніцкая арыстакратыя. Яна прымала чынны ўдзел у кіраванні дзяржаваю і засядала ў думе князя. Удзельна-феадальныя князі захавалі свой тытул, але ўтрацілі сваю выключную палітычную вагу. Яны ўвайшлі ў склад літоўска-беларускага магнацтва, хаця часткова захавалі за сабой і ўладальніцкія правы адносна да сваіх уладанняў. Аб'яднанне ўдзельных князёў са старой літоўска-беларускай арыстакратыяй і зраўнанне князёў і арыстакратыі ў праўных адносінах адносіцца да часоў публікацыі прывілея 2 мая 1447 г., які пашырыў шляхецкія вольнасці і на князёў. Прывілеі вялікага князя Аляксандра 1492 г. і Жыгімонта I — 1506 г., прызнаваўшыя за князямі і панамі раўнапраўны ўдзел у кіраўніцтве дзяржавай, спрыялі канчатковаму аб'яднанню панства з патомкамі ўдзельных князёў. Гэтыя дзве групы склалі «высшій стан» літоўска-беларускай шляхты. Княжыя і панскія фаміліі былі раскіданы па тэрыторыі дзяржавы вельмі нераўнамерна. Яны сядзелі цэлымі гнёздамі на Валыншчыне. У іншых частках прадстаўнікі буйнога землеўладання распыляліся ў масе сярэдніх і дробных землеўласнікаў. У Кіеўшчыне буйных землеўласнікаў і зусім не было. Барацьба вялікіх князёў з удзельнымі князямі, а гэтаксама знадворнае палажэнне княства спрыяла ўзнікненню і ўтварэнню ваеннаслужылага класа. Першапачатковы яго склад адзначаўся вялікай разнастайнасцю. У яго ўваходзілі прадстаўнікі сярэдняга землеўладання, пусціўшыя глыбокае карэнне ў большай або меншай ступені ва ўсіх частках Літоўска-Беларускае дзяржавы, падупаўшыя знатныя фаміліі, ваенныя слугі буйнога магнацтва, а гэтаксама дворныя цяглыя людзі, якія звальняліся ад усялякіх цяглых павіннасцей. Спачатку склад ваеннаслужылага класа не вызначаўся пэўнай трываласцю, бо ў яго пастаянна ўваходзілі і выходзілі новыя элементы. Той пераводзіўся з службы цяглай на службу баярскую. З другім паступалі якраз наадварот. З канца XIV ст. пачынаецца павольны працэс арганізацыі шляхецкага стану, які закончыўся ў XVI ст.

**Шляхецкія прывілеі.** Пачатак арганізацыі звязан з прывілеямі Ягайлы (1387—1413). Абодва прывілеі давалі літоўскаму каталіцкаму магнацтву права ўладаць і распараджацца нерухомаю маёмасцю, права выхаду замуж удовам, дочкам і сёстрам баяр свабодна без усякага прымусу або ўдзелу гаспадара. Прывілеі звальнялі і ад натуральных павіннасцей за выключэннем вайсковае службы і замкавае павіннасці — пабудовы новых замкаў і направы старых, а гэтаксама пабудовы ваенных дарог. Прывілей 1413 г. пашыраў правы і вольнасці польскае шляхты на католікаў-землеўласнікаў, атрымаўшых ад палякаў «гербы і клейноты» і прынятых у гербовыя брацтвы. Прывілей вызначаў вышэйшыя пасады паводле польскіх узораў, даючы права займаць апошнія толькі католікам. Прывілей устанаўляў соймы для нарады аб дабрабыце і бяспецы абедзвюх дзяржаў з правам удзелу паноў, прэлатаў і шляхты Каралеўства

Польскага і зямель літоўскіх. Прывілеі Жыгімонта Кейстутавіча (1432–1434) пашыралі свой уплыў і на ўласна беларускіх князёў, паноў і баяр, раўняючы іх у правах з асобамі каталіцкага веравызнання, і давалі права браць ад ліцвінаў тыя самыя гербы, якія яны атрымалі ад палякаў. Прывілей 1434 г. забяспечыў асабістую незачэпнасць. Гаспадар абяцаў нікога не караць па тайнаму або яўнаму даносу, а толькі па суду, праведзенаму паводле мясцовых звычаяў. Прывілеі Казіміра Ягелончыка ад 2 мая 1447 г. пашырылі ўсе правы польскае шляхты на ўсё шляхецтва – як на літоўскае, гэтак і на зямель-анексаў. Прывілей звольніў шляхту ад выплаты штогоднай грашовай падаці (сярэбшчыны), дазволіў выезд за граніцу, аддаваў у рукі ўласнікаў суд над падданымі, абавязваўся не прымаць на свае землі прыватнаўласніцкіх падданых, абяцаў раздаваць урады, дзяржанні і ўладанні толькі тубыльцам Вялікага княства. Прывілеі 1492 і 1506 гг. не далі шляхце ніякіх новых правоў, за выключэннем толькі артыкула аб непавышэнні людзей нізшага стану над шляхтай. Для азначэння тэрміна «шляхецтва» ў XV ст. былі раўназначны «баярын», «земянін» і «шляхціц». Паступова тэрмін «шляхта» выцесніў іншыя найменні. Шляхецкія прывілеі выасабнілі шляхту ад другіх грамадскіх груп. Невыразнасць азначэння, хто ўласна з'яўляецца правадольным шляхціцам, выклікала на практыцы шмат непаразуменняў. Адны незаконна карысталіся шляхецкімі правамі. Другія, наадварот, незаконна пазбаўляліся гэтых правоў і распачыналі судовы працэс для ўзнаўлення сваёй чэсці.

**Довады і катэгорыі шляхецтва.** Спрэчкі за прыналежнасць да шляхецтва прымусілі сойм апублікаваць ухвалу 1522 г. Шляхецтва даводзілася пасведчаннем двух шляхціцаў пад прысягай у тым, што той, хто дабіваецца шляхецтва, ад прадзеда аднаго з імі роду і брат ім па крыві. Ухвала 1522 г. дапушчае і аднаго сведку. У гэткім выпадку і сам зацікаўлены ва ўзнаўленні шляхецтва абавязан зложыць адпаведную прысягу. Пры адсутнасці сведак старадаўнасць баярскае службы можна было давесці адпаведнымі дакументамі. Статут 1529 г. дапушчае ў якасці сведак баяр-шляхты пабочных. Чужаземцы маглі апірацца на афіцыйныя дакументы, якія пацвярджаюць іх шляхетнае пахаджэнне. У 1528 г. баяры-шляхта, абавязаныя адбываць вайсковую службу, былі перапісаны; пры гэтым адсылка на «попіс» з'яўлялася падставай доваду шляхецкага пахаджэння для наступнага пакалення. Шляхецтва здабывалася пахаджэннем ад шляхетных бацькоў, наданнем шляхецкае годнасці праз вялікага князя за тыя ці іншыя заслугі як самой асобы, гэтак заслугі яе братоў і сваякоў. Шляхецкі стан мог быць утрачаны дзеля розных прычын, азначаных законам. Каб больш выразна адмежаваць шляхціца ад простых людзей, гаспадарская ўстава 1529 г. аблажыла баяр-слуг цяглымі службамі. Шляхецтва дзялілася на дзве катэгорыі – вышэйшую і ніжэйшую. Да першае прыналежалі прэлаты, князі і паны «хоруговные», да другое – рыцарства-шляхта. Усе шляхецкія правы і вольнасці былі аб'яднаны ў Статуце 1529 г., у якім яны былі больш дэтальна акрэслены і развіты.

**Правы шляхецтва.** Заканадаўства Статута 1529 г. аб шляхецтве дзеліцца на два віды: агульнашляхецкае і пакатэгорнае. Да агульных правоў шляхетна-

га стану адносіцца: права землеўладання, гарантыя асабістай незачэпнасці, індывідуальная адказнасць за праступленні, права ўладання нерухомай маёмасцю і распараджэнне ёю ў рамках, азначаных законам, права свабоднага выхаду замуж удоваў і дачок, свабода ад натуральных павіннасцяў, права выязджаць за мяжу для навукі рыцарскіх вучняў, права адыходу разам з рухомай маёмасцю ад паноў, якім яны прыналежаць, суд над падданымі. Да палітычных правоў шляхты адносіцца: удзел у заканадаўчай дзейнасці вальнага сойма, права ўдзелу двух шляхціцаў на судзе княжыхураднікаў па абранні апошніх, права ўдзелу ў абранні гаспадара, вырашэнне розных дзяржаўных пытанняў у дзядзіне замежнай і ўнутранай палітыкі.

**Правы магнатаў.** Магнацтва вызваляецца ад падсуднасці правінцыяльнай адміністрацыі, прымае ўдзел у гаспадарскай радзе, мае права выступаць на вайне пад уласнай харугвай, выстаўляе аддзелы ўзброеных баяр і слуг, карыстаецца правам позвы на суд гаспадара за 4 тыдні да тэрміну. Жалабы на радных паноў падаюцца не ваяводзе, а гаспадару або панам-радзе.

**Правы рыцарства-шляхты.** Шляхціц прыцягваецца да суду толькі судовымі позвамі. Пасылка «дзецкага» для прыводу на суд магчыма толькі пасля адпраўкі двакраць позвы. Шляхціц непадсудны дзяржаўцам, якія нядаўна былі цівунамі. На суд правінцыяльны апеляцыя падаецца гаспадару і панам-радзе, калі адміністрацыйныя ўрады былі заняты асобамі спаміж паноў-рады. У праціўным выпадку апеляцыя падаецца ваяводзе. Шляхціцы маюць права на павялічаную ўзнагароду за пасягненне на іх жыццё і здароўе.

**Павіннасці шляхецтва.** Усе землеўласнікі былі абавязаны адбываць земскую вайсковую службу. Ухвала 1528 г. пастанавіла, што адзін конь выстаўляецца ад васьмі сялянскіх служб. Усе павінны станавіцца пад сваёй павятовай харугвай, за выключэннем толькі паноў харугаўных, якія выступалі пад сваёю харугвай. Ад службы шляхціца вызваляла хвароба, з той, аднак, умовай, што на сваё месца ён выстаўляў сына або слуг. Нез'яўленне на вайну або самастойнае пакіданне яе цягнуць за сабой страту маёнтка. Духавенства павінна было адбываць асабіста службу з «закупного імені». Пры данасці ўладання «дадзізным» маёнткам духавенства звальнялася ад асабістай вайсковай службы.

**Беларуская шляхта.** Беларуская шляхта — важны фактар у палітычным жыцці беларускіх зямель. Нягледзячы на існаванне прывілеяў, у працягу XV і ў пачатку XVI ст. у Беларусі шляхта не выдзелілася значна ад рэшты грамадскіх груп. Згодна попісу 1528 г. у Беларусі зусім не было буйнога землеўладання. Пераважвала дробнае і сярэдняе. У Полацкай зямлі самым багатым быў Д. Б. Корсак, які выстаўляў на вайну 33 коннікаў.

## 2. Мяшчане

**Два тыпы мяшчанскіх паселішчаў.** Развіццё народнае гаспадаркі ў Літве-Беларусі ўтварыла два тыпы гарадскіх паселішчаў. Адны гарады кіраваліся гаспадарскімі ўраднікамі і не карысталіся асаблівымі правамі і вольнасцямі.

Іншыя атрымалі ад вялікага князя прывілей, гэтак званае магдэбургскае права, і карысталіся шэрагам важных правоў і вольнасцей. Гаспадарскія гарады, якія не мелі магдэбургскага права, былі цясней звязаны з валасным насяленнем. Гарады з магдэбургскім правам, складаючы асобную адміністрацыйна-гаспадарчую адзінку, адасобніліся ад воласці. Мяшчане ў гарадах уладалі сядзібамі, агародамі, нівамі і пасбішчамі. За мяжой горада паасобныя мяшчане набывалі землі ў баяр-шляхты і былі абавязаны адбываць з іх вайсковую службу.

**Мяшчане неўпрывілеяваныя.** Насяленне гарадоў без магдэбургскага права адносна павіннасцей мала чым рознілася ад сельскага насялення. Яно плаціла дань, дзякла, чынш, сярэбшчыну і ардыншчыну ў падняпроўскіх гарадах, давала стацыю і фурманкі праязджаўшаму гаспадару і яго паслам,ураднікам, адбывала звычайную паншчыну. Мяшчане маглі быць аддаваны ў прыватнае ўладанне нараўне з паасобнымі катэгорыямі сельскага насялення.

**Гарады з магдэбургскім правам.** Заходняя частка Літоўска-Беларускае дзяржавы была пакрыта гарадамі, якія мелі вялікае гаспадарчае значэнне для жыцця краю. З мэтай развіцця гандлю і прамысловасці вялікія князі давалі гарадам самасправаванне ў выглядзе гэтак званага магдэбургскага права. Спачатку атрымалі магдэбургскае права гарады, што знаходзіліся ў заходняй частцы дзяржавы на рэчных шляхах. У другой палове сталецця магдэбургіі пачалі раздавацца і ва ўсходняй палове дзяржавы. Вільня атрымала магдэбургскае права ў 1387 г., Бярэсце — 1390 г., Горадня і Коўна — 1391 г., Дарагічын — 1429 г., Бельск — 1430 г., Луцк-Каменец — 1438 г., Полацк — 1498 г., Менск — 1499 г. і інш. Гарады з магдэбургскім правам выдзяляліся са складу воласці і набывалі асобнае гаспадарча-адміністрацыйнае значэнне. Мяшчане вызваляліся ад розных валасных павіннасцей, набывалі права атрымліваць некаторыя даходы для ўласна гарадскіх патрэб, звальняліся ад суда ваявод, стараст і дзяржаўцаў, мелі ўласную юрысдыкцыю па магдэбургскаму праву, атрымлівалі права клапаціцца аб гарадскім дабрабыце, развіцці гандлю і прамысловасці. На чале горада стаяў войт, прызначаны гаспадаром, з правам перадачы свайго ўраду па наследстве і перадачы за грошы ў іншыя рукі. З працягам часу ўрад войта стаў выбарным. Гарадам удалося яго выкупіць. Побач з лаўнікамі, дажывотнымі прысяжнымі з мяшчан, войт судзіць насяленне ў крымінальных справах. Справы ж аб гвалце, падпаленні, разбоі, чыннай абразе шляхціца і гвалце над жанчынай былі падсудны гаспадарскімураднікам супольна з радцамі. На суд войта можна было апеляваць да вялікага князя. Бягучае кіраўніцтва знаходзілася ў руках гарадской рады і бурмістраў. Члены рады назначаліся войтам з кандыдатаў паспольства. Бурмістры абіраліся спаміж членаў рады. Яны былі старшынямі рады. Усё бягучае кіраўніцтва знаходзілася ў руках рады і бурмістраў. У веданні рады знаходзіліся: паліцыя, суд па грамадзянскіх справах, гарадская маёмасць; яна ж наглядала за гандлем, правільнасцю мер і вагаў, сачыла за маральнасцю. На суд рады можна было апеляваць да войта. У некаторых гарадах лава і рада не былі раздзелены. Калі пасада войта была выкуплена мяшчанамі, калі выдзелілася багатае мяшчанства, то і рада пачала ўкладацца

інакш. Паспольства было адсунута ад удзелу ў яе папаўненні. Рада сама выбірала членаў на месца выбыўшых. І выбар лаўнікаў перайшоў да рады. Пры гэткім становішчы гарадская грамада была адсунута ад удзелу ў кіраўніцтве. Уся ўлада апынулася ў руках буржуазіі, значэнне якой значна павялічылася пад уплывам росту грашовае гаспадаркі. Магдэбургскае права пашырала свой уплыў на ўсё насяленне, якое знаходзілася на тэрыторыі горада. Каб звольніцца ад гарадскога прысуду, патрэбна была гаспадарская пастанова. Наданыя гарадам магдэбургіі не ўхілялі іх ад непаразуменняў з гаспадарскімі ўраднікамі, якія часта прычынялі «крыўды вялікія». Магдэбургскае права дакладна вызначыла характар тых павіннасцей, якія насяленне гарадское павінна было адбываць. Мяшчане мелі свае даходныя крыніцы: крамніцу, збожжавыя яткі, камору пастрыгальную, бочку мерную, мядніцу медную. У некаторых гарадах існавала манапольнае права гарадоў на збожжавыя яткі і мясныя клеткі. Апрача гэтага горад атрымліваў даходы ад важніцы, васкабойні і капніцы, паспалітых лазень, млыноў, паспалітых кухань. Часамі гарады бралі ў арэнду ў гаспадара карчмы, якія ў свой чарод здаваліся прыватным асобам. Гарады мелі права адчыняць некалькі разоў у год кірмашы і мець штотыднёвыя тарговыя дні. Найбольш буйныя гарады карысталіся правам склада, куды памяшчаліся тавары прыехаўшых у горад купцоў. Магдэбургскае права рэзка адасобіла гарадское насяленне ад іншых катэгорый насялення воласці. Мяшчане ў пачатку XVI ст. захавалі права землеўладання і адбывалі са сваіх зямель вайсковую службу. Гарадам не ўдалося заваяваць палітычнага прадстаўніцтва на вальных соймах, на якіх прымала ўдзел шляхта; гэта апошняя, выдаючы вузкастанавыя пастановы, падрывала горад як гандлёва-прамысловую адзінку. Следам за гаспадаром і прыватныя землеўласнікі надалі сваім гарадам самасправаванне.

**Беларускія гарады.** Да канца XV ст. гарады Беларусі не былі адасоблены ад воласці. Гарадское насяленне было аб'яднана з воласцю супольнымі гарадскімі павіннасцямі. З канца XV ст. пачынаецца працэс выдзялення горада ў асобную адміністрацыйна-судовую адзінку, дзякуючы таму што гарады атрымліваюць магдэбургскае права. Вялікі князь Аляксандр 4 кастрычніка 1498 г. даў прывілей Полацку на магдэбургскае права, а 14 сакавіка 1499 г. атрымаў прывілей і горад Менск. Выдаючы прывілей, вялікі князь Аляксандр кіраваўся агульнадзяржаўнымі інтарэсамі і хацеў «положеніе места нашего Полоцкого і Менского в мере лепшей поставіті, штобы люді нашi там жывучі і через вряд добрый а справедлівый былі размножені». Правы і вольнасці Полацка і Менска маюць гэткі выгляд: на чале горада стаіць войт, які атрымлівае ў сваё распараджэнне пэўную колькасць даходаў з розных крыніц. Гарадскому войту павінна быць паслушна ўсё насяленне горада, якое «на вечные часы» звальняецца ад судоў і ад «моцей» усіх ваявод, паноў і стараст, намеснікаў, суддзяў і іх ураднікаў, ад права гарадскога і баярскага. Судовыя справы разглядаюцца войтам і бурмістрамі, на пастанову якіх падаецца апеляцыя самому гаспадару. І Менск, і Полацк атрымалі шэраг фінансавых прывілеяў. Для развіцця тавараабмену з Рыгай у Полацку павінна было штогод наладжвацца тры кірмашы. Полацк

атрымлівае спецыяльныя вольнасці для заграцічнага гандлю. Рыжскія купцы пад пагрозай утраты сваёй маёмасці не маюць права ездзіць ні ў Віцебск, ні ў Смаленск. Аднак прывілей забараняе выязджаць толькі для закупу тавараў, а не для выплаты даўгоў. У гаспадарскі скарб Полацк быў абавязаны выплачваць 400 коп грошай, тады як Менск выплачваў толькі 20 коп грошай. Прывілей на магдэбургскае права, выданы Полацку, злучаў моцнымі эканамічнымі сувязямі сярэднюю Заходнюю Дзвіну з вышнявінамі яе і Дняпра. Само развіццё Менска было магчыма толькі пры ўмове пашырэння тавараабмену з Захадам. Менск быў гандлёвым цэнтрам для ўсёй усходняй Беларусі. Асаблівымі вольнасцямі карысталіся віленскія купцы, якія маглі купляць і прадаваць тавары, не лічачыся з прынятымі ў прывілеі мерамі. Магдэбургскае права пашыралася на Беларусі вельмі павольна.

### *3. Сельскае насяленне*

**Нявольнае насяленне.** Рабочыя нявольныя людзі — «чэлядзь нявольная», «парабкі», «рабы» — жылі пры гаспадарскіх і прыватнаўласніцкіх дварах, выпаўнялі розныя гаспадарчыя работы, атрымлівалі ўтрыманне ад уласнікаў або былі пасаджаны на невялікія зямельныя ўчасткі. Крыніцы рабства былі замацаваны Статутам 1529 г. Чэлядзь нявольная ў XV ст. складала асноўную рабочую сілу гаспадарскіх і прыватнаўласніцкіх маёнткаў, але ў першай чвэрці XVI ст. яна ўтраціла сваё пераважнае гаспадарчае значэнне.

**Сялянства.** Сельскае насяленне называлася «мужыкамі» і «падданымі» і дзялілася на дзве групы па сваім юрыдычным палажэнні — на прыватнаўласніцкае і гаспадарскае. Падзел сялянства на групы вызначаўся тымі павіннасцямі, якія адбывалі тыя ці іншыя групы сельскага насялення. Першую групу складалі людзі, адбываўшыя паншчыну і плаціўшыя аброк. Яны называліся цяглымі людзямі. Часамі аброк «дзякла» і «мезлева» пераводзіўся на грошы. Цяглыя людзі адбывалі яшчэ і фурманачную павіннасць. Другую групу складалі сяляне, якія абслугоўвалі патрэбы дворнае гаспадаркі і адбывалі спецыяльныя службы. Да яе адносяцца: конюхі, конюхі-сядзельныя, машталеры, кабыльнікі, стаднікі, пастухі, свінары, бортнікі, падлазнікі, рыбаловы, неваднікі, баброўнікі, асочнікі, лаўцы, мысліўцы, стральцы, псарцы, сакольнікі, пташнікі, буднікі, смаляры, садоўнікі, млынары і інш. Да наступнай групы адносяцца рамеснікі: кухары, пекары, півавары, медасытцы, калёснікі, саннікі, бондары, краўцы, рымары, скурнякі і інш. Сяляне-даннікі складалі значную масу насялення. Да іх адносяцца ўсе тыя сельскія элементы, хто плаціў гаспадару дані з даходаў ад эксплуатацыі мясцовых добр. Дань была мядовая, бабровая, кунічая. Асобную групу складалі асадныя сяляне, што сядзелі на зямельных надзелах і плацілі чынш. Чыншавае сялянства перш за ўсё з'явілася на Падляшшы і Жмудзі. Вышэйшую катэгорыю сельскага насялення складалі слугі путныя, шчытныя, конныя. Яны адбывалі вайсковую службу, выпаўнялі розныя даручэнні, а гэтаксама адбывалі і паншчыну пэўнага характару.

**Юрыдычнае становішча.** Прыватнаўласніцкае сялянства дзялілася на дзве групы: перахожых і непахожых. Першыя мелі права пераходу ад аднаго землеўласніка да другога. Да XVI ст. гэта група паступова змяншаецца. Затое павялічваецца лік непахожых людзей. Людзі, утраціўшыя права выхаду, называліся гэтаксама «отчічамі». Гэта падданыя людзі. Паншчына — ранняга пахаджэння. Ужо прывілей 1447 г. «ізвечных людей» выдзяляе ў асобную катэгорыю. Насяленне, што знаходзілася пад паншчынай, падлягала юрысдыкцыі свайго пана, які меў права на працу і на маёмасць свайго падданага. Паншчына ўтварылася на падставе эканамічнай запазычанасці. Эканамічна слабыя, прасядзеўшыя на адным участку зямлі дзесяць год, станавіліся «засядзелымі людзьмі». Статут 1529 г. замацаваў земскую даўнасць. Вотчыцаў можна было купляць без зямлі, перадаваць іх па наследству. Сяляне гаспадарскія не былі прымацованы да сваіх зямельных участкаў. Гэтак званыя гаспадарскія вотчыцы маглі пакінуць свой зямельны ўчастак, пасадзіўшы на сваё месца другога чалавека, з пералажэннем на яго ўсіх сваіх служб. Цяглае сялянства складала асноўную масу сельскага насялення ў гаспадарскіх дварах заходніх воласцей. Усходнія прыдняпроўскія і падзвінскія воласці былі населены даннікамі, якія складалі валасное грамадства і карысталіся самаспраўваннем. Выяўнікам волі даннікаў з'яўлялася веча, а старасты, выбраныя на вечах, выпаўнялі пастановы веча, збіралі з насялення дані для перадачы адміністрацыі, якая зносілася з насяленнем беспасярэдна, толькі праз выбарных валасных старцаў. Апошнія сачылі за тым, каб адносіны паміж валаснымі грамадамі і ўрадовымі агентамі будаваліся па-старому, і не дапускалі нарушэння старасвецкіх традыцый.

## К) Палітычны ўклад

**Вялікі князь.** Увасабленнем дзяржаўнай улады быў вялікі князь. Акт Гарадзельскай уніі 1413 г. прызнаў за Вялікім княствам права на самастойнае ўнутранае кіраўніцтва і пры існаванні уніі з Польшчай. Спачатку вялікі князь быў толькі намеснікам польскага караля, але з паловы XV ст. Літва мае асобных вялікіх князёў, якія з'яўляюцца ў той жа час і польскімі каралямі. Гарадзельская унія 1413 г. устанавіла парадак абрання вялікага князя, але гэты парадак ніколі не быў ажыццёўлены. Вялікі князь абіраўся аднабочна — толькі Вялікім княствам Літоўскім. Такімі абраннікамі былі: Казімір, Аляксандр, Жыгімонт I і Жыгімонт II Аўгуст. Да канца XV ст. улада вялікага князя юрыдычна была не абмяжована, але фактычна яна знаходзілася ў сферы ўплыву літоўскіх магнатаў. Прывілеі 1492 і 1506 гг. замацавалі за радай яе фактычнае палажэнне. Улада гаспадара была абмяжована арыстакратычнай установай. У адносінах да зямель-анексаў улада вялікага князя абмяжоўвалася мясцовымі канстытуцыямі. У адносінах да іншых зямель вялікі князь з'яўляецца князем-айчыннікам. Кола дзейнасці вялікага князя абымае ўсе праявы дзяржаўнага жыцця як у галіне загранічнае, так і ўнутранае палітыкі. Вялікі князь клапаціцца аб абароне краю, выдае заканадаўчыя акты, прызначае на ўрады, вырашае

спрэчныя справы, наглядае за кіраўніцтвам дзяржаўных маёнткаў, вырашае пазямельныя спрэчкі, справы аб рабаваннях, гвалтах, вядзе дыпламатычныя зносіны, абвяшчае вайну і завязвае мір.

**Гаспадарская рада.** Гаспадарская рада – установа старажытнага пахаджэння. Кожны ўдзельны князь меў каля сябе ўласную раду. Вітаўт у барацьбе з Польшчай заўсёды абапіраўся на мясцовых землеўласнікаў. Пры Вітаўту рада складалася з каталіцкіх біскупаў, прыдворных вяльможаў, краінных уладароў. У канцы XV ст. склад рады канчаткова вызначыўся. У яе ўваходзілі каталіцкія біскупы, вышэйшыя земскія і дворныя ўраднікі, ваяводы і старасты. Членамі рады маглі быць толькі каталікі. З XVI ст. у раду пачынаюць пранікаць і праваслаўныя вяльможы. Рада знаходзіцца пры гаспадару. Яна працуе разам з ім. У палове XV ст. яна адасобілася ад гаспадара. З прычыны частых ад'ездаў Казіміра ў Польшчу рада вырашала самастойна шмат якія дзяржаўныя справы. Правы рады былі азначаны прывілеямі 1492 і 1506 гг., надаваўшымі ёй заканадаўчыя функцыі. Дзейнасць рады была разнастайнай. З прычыны разнастайнасці і складанасці спраў была ўтворана пры вялікім князю і радзе канцылярыя з канцлерам на чале і скарб з падскарбіем земскім. Рада ў поўным складзе магла збірацца параўнаўча рэдка. З XV ст. функцыянуе асобная «передняя рада», куды ўваходзілі асобы, найбольш блізкія да гаспадара, з ліку вяльмож, меўшых права засядаць у гаспадарскай радзе.

**Вялікі вальны сойм.** Зараджэнне вялікага вальнага сойма можна аднесці да моманту завязання трэцяй уніі з Польшчай (1401). Спачатку на з'ездах прымалі ўдзел толькі літоўскія князі і паны. На сойме 1413 г. была прысутна і шляхта, але пануючая роль засталася за магнатамі. У выніку нацыянальна-палітычнае барацьбы пры Казіміру на соймах паяўляюцца беларускія і ўкраінскія землеўласнікі. На соймах прымалі ўдзел князі і паны пагалоўна, а з шляхты – толькі «старшыя шляхцічы». На соймах XV ст. займаліся пытаннямі замежнай палітыкі, завязаннем уніі з Польшчай, абраннем гаспадара. У XVI ст. кампетэнцыя вялікага вальнага сойма пашыраецца. Соймы прымаюць меры па абароне дзяржавы, вырашаюць пытанні аб вайне і міры, назначаюць новыя налогі, выдаюць новыя законы, укладаюць Статут 1529 г., крытыкуюць дзейнасць бягучае адміністрацыі. На соймах першай чвэрці XV ст. змяняецца склад шляхецкага прадстаўніцтва. На сойме ў 1512 г. прысутнічалі прадстаўнікі па 2 ад кожнага павета. Разам з пасламі прыязджалі на сойм знатныя асобы па запрашэнні гаспадара. Сойм падзяляўся на два колы: рыцарскае ў складзе дэпутатаў ад паветаў і асоб, атрымаўшых запрашэнне ад гаспадара, і паноў-рады. Умацаванне палітычнага значэння сойма памяншала аўтарытэт рады, а гэта сведчыла аб тым, што значэнне сярэдняга і дробнага землеўладання павялічваецца. Пастановы сойма не звязваюць волі гаспадара, але фактычна яны з'яўляліся абавязковымі.

**Цэнтральная адміністрацыя.** Пахаджэнне органаў цэнтральнае адміністрацыі злучана з пашырэннем урадовай дзейнасці вялікага князя і размежаваннем паміж інтарэсамі прыдворнае гаспадаркі і інтарэсамі дзяржаўнымі. Новыя

заданні ў галіне замежнай і ўнутранай палітыкі былі невыканальны без пасярэдніцтва адпаведных урадовых асоб. Такім чынам, з ліку прыдворныхураднікаў выдзяляліся ўрадовыя асобы, якім падлягалі пытанні дзяржаўнага характару. Да агульназемскіх органаў адносіцца: падскарбі земскі, які загадваў усімі даходамі ў гаспадарскі скарб; канцлер — начальнік дзяржаўнай канцылярыі; гетман найвысшы, які камандаваў арміяй у часе вайны, калі армія не знаходзілася пад беспасярэдным камандаваннем вялікага князя. У руках гетмана быў суд над вінаватымі ў нарушэнні службовай дысцыпліны, а гэтаксама над усімі, што знаходзіліся пад яго камандай, па жалабах адзін на другога і па жалабах на іх з боку мясцовых грамадзян. Усе гэтыя ўрадовыя асобы падлягалі прыказам гаспадара. Яны не маглі праяўляць ніякай ініцыятывы ў сферы іх ведамства.

**Прыдворныя ўраднікі.** Спачатку колькасць прыдворных ураднікаў была нязначнай, але з працягам часу лік іх павялічыўся. Да іх адносяцца: маршалкі земскі і дворны, якія загадвалі прыдворным цырыманіялам, прыёмам гасцей, прыязджаўшых да гаспадара, назначалі кватэры станам сойма, прыехаўшым на сойм, публікавалі абавязковыя пастановы на месцы прабывання гаспадара; падчашы, у веданні якога знаходзілася пітво; чашнік, які наліваў пітво; кройчы, які разрэзваў стравы; стольнік і падстолі, якія загадвалі накрываннем стала; кухмістр, які загадваў кухняю; канюшы — прыдворнымі стайнямі; лоўчы — паляўніцтвам; падкаморы — абсталяваннем унутраных пакояў; ложнічы — гаспадарскай супачывальняй; мечнік, які трымаў гаспадарскі меч у часе цырымоніяў; падскарбнік дворны, загадваўшы спецыяльна гаспадарскімі даходамі.

**Правінцыяльнае кіраўніцтва.** У пачатку XV ст. Вялікае Літоўскае княства дзялілася на два ваяводствы: Віленскае і Трокскае. З пачатку XVI ст. ваяводствамі пачалі называцца і паасобныя землі: Кіеўская, Полацкая, Віцебская і Смаленская. Жмудская і Валынская землі называліся староствамі. Ваяводства дзялілася на паветы і дзяржавы. У краінах-ваяводствах сядзелі намеснікі, з часам — ваяводы і старасты. Гэта прадстаўнікі вялікакняскае ўлады. На свае ўрады яны назначаліся вялікім князем, згодна адпаведным артыкулам краіннай канстытуцыі. Урады былі дажывотныя. У руках адміністратараў была вышэйшая судовая ўлада. Яны з'яўляліся начальнікамі над ваеннаю сілаю краіны. Кіравалі гаспадарскімі маёнткамі, клапаціліся аб абароне краіны, раздавалі пустую зямлю пры ўмове, што дзяржаўцы павінны адбываць земскую службу. Прадстаўнікі ніжэйшае правінцыяльнае адміністрацыі называліся намеснікамі, дзяржаўцамі і цівунамі. Дзяржавы раздаваліся «до волі і ласкі господарской» або «до живота». Дзяржаўцы карміліся коштам сваіх дзяржанняў. У іх карысць паступалі і некаторыя судовыя падаткі.

## Л) Царква і дзяржава

**Становішча праваслаўнай царквы і ўтварэнне самастойнае мітраполіі.** Імкненне Альгерда ўнезалежніць праваслаўную царкву ад Масквы ў царкоўна-рэлігійных адносінах не збылося, дзякуючы таму што літоўска-беларускі

мітрапаліт Кіпрыян заняў мітрапаліцкую кафедру ў Маскве. Залежнасць літоўска-беларускай праваслаўнай царквы ад маскоўскага мітрапаліта пры дзяржаўнай самастойнасці княства была ненармальнай. Варожыя адносіны паміж маскоўскім і літоўскім урадамі не маглі пагадзіцца з такой залежнасцю. Умяшанне маскоўскага мітрапаліта ў царкоўныя справы Літвы і Беларусі было ўмяшаннем улады, варожай Літве. Вітаўт вельмі добра гэта разумеў. Па смерці Кіпрыяна Вітаўт хацеў бачыць на мітрапаліцкай кафедры біскупа полацкага Феадосія, але патрыярх на гэта не згаджаўся. Тады Вітаўт збірае ў Навагрудку сабор літоўска-беларускіх біскупаў: полацкага, чарнігаўскага, смаленскага, холмскага, тураўскага і ўладзімірскага (1416), – на якім быў выбраны мітрапалітам Грыгоры Цамвлак[1]. Але незалежнасць праваслаўнай царквы ўстанавілася не адразу. Казімір адзін час прызнаваў уладу маскоўскага мітрапаліта Іоны. Толькі ў 1467 г. патрыярх Грыгоры Мамма паставіў Грыгорыя Балгарына мітрапалітам кіеўскім, літоўскім і ўсёй Ніжняй Русі. Маскоўская царква не прызнала Грыгорыя кананічна пастаўленым мітрапалітам і пастанавіла «к тому Грігорію не пріступаті, ні грамот нам от него не прініматі нікакіх, ні совета с нім не іметі ні о чем же». Аддзяленне літоўска-беларускае царквы ад вялікарасійскай было поўнае. Імкнучыся да аддзялення праваслаўнае царквы ад юрысдыкцыі маскоўскага мітрапаліта, літоўскі ўрад апекаваўся над уніяй. Гэтак, Герасім – біскуп смаленскі, стаўшы мітрапалітам, прыняў унію, але ў 1435 г. быў спалены ў Віцебску Свідрыгайлам. Пасля таго як з Масквы быў выгнаны Ісідар, які падпісаў акт Фларэнтыйскай уніі (1439), літоўскі ўрад прызнаў яго. Грыгоры, пастаўлены ў мітрапаліты пры Казіміру, гэтаксама быў уніятам, але яго не прызнавалі біскупы, а яго наступнік Місаіл аднёсся да яе[2] зусім адмоўна. Унітарныя спробы скончыліся няўдачай.

**Праўнае становішча праваслаўнае царквы.** Літоўска-беларуская царква ў царкоўна-юрыдычных адносінах падлягала канстанцінопальскаму патрыярху. Галава царквы або абіраўся саборам, або назначаўся вялікім князем. Граматы вялікіх князёў, пачынаючы з Вітаўта, зацвердзілі за царквой права духоўнага суда, згодна Номаканону і гэтак званаму «Світку Яраслававу». Пастановы мясцовых сабораў былі абавязковы для царквы. Правы праваслаўнае царквы, як духоўныя, гэтак і маёмасныя, былі зацверджаны граматай 1511 г., выданай мітрапаліту Іосіфу Солтану.

**Праўнае становішча праваслаўных.** З 1387 г. праваслаўныя ў грамадзянскіх праўных адносінах былі пастаўлены не ў аднолькавыя ўмовы. Прывілей Ягайлы 1387 г. меў на ўвазе толькі католікаў. Гарадзельскі прывілей 1413 г. меў канфесіянальны артыкул, забараняўшы асобам некаталіцкага веравызнання займаць вышэйшыя ўрады і засядаць у гаспадарскай радзе. Гэты артыкул захоўваўся і ў пазнейшых прывілеях, але яго моц пашыралася ўласна на Літву. У Полацку, Віцебску, Смаленску, Кіеве, Валыні праваслаўныя мелі права займаць усе ўрады. Толькі рада заставалася юрыдычна недаступнай, але і ў ёй у

[1] Грыгор Цамблак, балгарын паводле паходжання.
[2] Да уніі.

канцы XV і першай чвэрці XVI ст. паяўляліся асобы грэцкага закона, нягледзячы на пратэст радных паноў. У грамадзянска-праўных адносінах каталікі і праваслаўныя былі зраўнаны прывілеем 1432 і 1434 гг. і 2 мая 1447 г., калі праваслаўная царква афіцыйна лічылася ва унітарных адносінах з рымска-каталіцкай. Першыя два прывілеі мелі на ўвазе ўласна Літву. Прывілей Казіміра пашыраў сваю моц на ўсю тэрыторыю княства. Аб канфесіянальным артыкуле прывілея не прыгадваецца ў прывілеях вялікага князя Казіміра, Аляксандра і Жыгімонта I у год уступлення апошняга на пасад. Пазней, у 1522 г., прызначэнне князя Астрожскага ў раду разглядаецца як нарушэнне Гарадзельскага прывілея.

**Права патранату.** Паасобныя цэрквы і манастыры знаходзіліся пад апекай прыватных асоб, у тым ліку і вялікага князя. Цэрквы і манастыры, што знаходзіліся пад патранатам, складалі як бы прыватную ўласнасць сваіх патронаў. З перадачай або прадажай «айчыны» другому ўладару пераходзіла да яго і права патранату, даваўшае повад свецкім асобам умешвацца ў царкоўныя справы. Цэрквы і манастыры, не меўшыя патронаў, знаходзіліся ў беспасярэднім веданні біскупа.

**Каталіцызм у Літве.** З часоў аб'яднання Літвы і Польшчы каталіцызм шырока распаўсюдзіўся паміж літоўскага баярства, але на тэрыторыі беларускіх і ўкраінскіх зямель каталіцызм пакуль што не пусціў значных парасткаў. На чале касцёла стаяў біскуп віленскі. У 1317 г. было заснавана Медніцкае біскупства на Жмудзі. У 1429 г. было заснавана каталіцкае біскупства ў Луцку. Каталіцкі касцёл займаў упрывілеяванае становішча. Прыналежнасць да яго баярына-шляхціца нагараджалася шэрагам істотных правоў і вольнасцей. Кароль меў права патранату над каталіцкім касцёлам.

**Агульны характар царкоўнай палітыкі.** Рэлігійная палітыка вялікіх князёў літоўскіх адзначалася дваістасцю. Афіцыяльна вялікія князі павінны былі мець на ўвазе толькі інтарэсы каталіцызму. Але пераважная маса насялення трымалася праваслаўя. Гэта прымушала вялікіх князёў падтрымліваць праваслаўе, асабліва ў беларускіх і ўкраінскіх краінах, дзе правы царквы былі забяспечаны краіннымі прывілеямі. Наогул, палітыка была верaзноснай. Разам з каталіцкімі святынямі і праваслаўныя святыні атрымлівалі землі і правы суда над пасяліўшымся насяленнем і збору падаткаў на сваю карысць. Незачэпнасць мітрапаліцкіх правоў і суда, а гэтаксама царкоўнае маёмасці і даходаў была пацверджана граматай Жыгімонта I у 1511 г.

## М) Заканадаўства

**Судзебнік Казіміра Ягелончыка.** Адсутнасць пісоўнага права прычыняла мноства невыгод. Пры панаванні звычаёвага права мелі месца частыя надужыцці. Каб унікнуць апошніх, быў выданы Судзебнік, апублікованы 29 лютага 1468 г., пасля папярэдняе нарады «з князьмі і з паны-радаю нашаю Вялікага княства Літоўскага і з усім паспольствам». Судзебнік вельмі кароткі. У ім толькі

25 артыкулаў, якія датычаць большай часткай крымінальнага права і крымінальнага працэсу і вызначаюць галоўным чынам кару за крадзеж. Абараняючы маёмасныя правы землеўласніцкага стану, Судзебнік замацаваў за землеўласнікамі юрысдыкцыю над сваімі падданымі.

**Статут 1529 г.** Мноства заканадаўчых помнікаў (шляхецкія прывілеі, краінныя прывілеі, гаспадарскія пастановы і г. д.) выклікала нямала непаразуменняў пры разглядзе судовых спраў. Канечнасць кадыфікацыі права была відавочнай. Новы заканадаўчы зборнік павінен быў аб'яднаць усе правы і вольнасці, наданыя шляхце. Складанасць эканамічных і грамадзянскіх праўных адносін падкрэслівала няўхільную канечнасць дакладнага азначэння нормаў грамадзянскага права. Распачатая барацьба паміж магнацтвам і звычайнай шляхтай настойна вымагала кадыфікацыі права з той мэтай, каб задаць магнатам палітычны ўдар, які пазбавіў бы іх магчымасці надужыцця пры судовых справах. У 1514 г. сойм звярнуўся да гаспадара з просьбай аб выданні Статута. У 1522 г. на Віленскім сойме гаспадар выдаў загад укласці новы Статут. 6 снежня 1522 г. адбылася публікацыя Статута, але дзейнасць яго пачалася толькі з 29 верасня 1529 г., калі Статут быў апублікованы ў канчатковай рэдакцыі. Статут складаецца з 13 раздзелаў і датычыць грамадзянскага і крымінальнага права, судаўніцтва і судаводства, шляхецкага права, вайсковай службы, гаспадарскіх правоў. Статут 1529 г. замацаваў заканадаўчым парадкам за магнатамі тое становішча, якое яны фактычна займалі ў дзяржаве. Статут 1529 г. стаўся падставай для шляхты ў яе барацьбе з магнатамі за пашырэнне сваіх палітычных правоў. Статут пашыраў сваю моц на ўсю тэрыторыю Літоўска-Беларускай дзяржавы. Крыніцы Статута былі: звычаёвае права, судовыя прыгаворы, соймавыя пастановы, гаспадарскія распараджэнні, шляхецкія і агульназемскія прывілеі, нацыянальныя прывілеі, помнікі польскага шляхецкага права. Статут — права землеўласнікаў. У ім адбілася пануючая роль у дзяржаве землеўласніцкага стану. Статут з'яўляўся відавочным паказчыкам таго, што беларуская культура была асновай у дзяржаве. Літоўска-беларускае права мела індывідуалістычны характар. Абарона правоў шляхетнае асобы і індывідуальная адказнасць за праступленні — асноўныя прынцыпы Статута 1529 г.

**Суд наместнікаў-дзяржаўцаў.** Дзяржаўцы — кіраўнікі гаспадарскіх маёнткаў мелі ў сваіх руках права суда над сялянамі, неўпрывілеяванымі гарадамі, баярамі-шляхтай і рэштай насялення гаспадарскіх маёнткаў. У справах крымінальных, як то гвалт, разбой, падпаленне, гвалт над жанчынай, шляхецкая рана, суду дзяржаўцы падлягалі і мяшчане гарадоў з магдэбургскім правам, уласніцкія сяляне і іншыя падданыя. Ад суда дзяржаўцы былі свабодны асобы, якія мелі асаблівыя прывілеі, аддаваўшыя іх пад юрысдыкцыю вялікага князя або яго паўнамоцных. Усе падсудныя маглі перавесці сваю справу на суд гаспадара, але заявіўшы аб гэтым да разгляду справы. Статут 1529 г. забараняе апеляцыі да гаспадара. Суд дзяржаўцаў стаў ніжэйшай інстанцыяй. Дзяржаўца судзіў у прысутнасці прадстаўнікоў мясцовага грамадства: баяр, мяшчан, а часамі і сялян. Статут 1529 г. дазваляе дзяржаўцу выбіраць спаміж мясцовай

шляхты для прысутнасці на судзе. Суд ваявод і стараст быў судом першай інстанцыі ў той акрузе, якая прылягала да гаспадарскага маёнтка, што знаходзіўся беспасярэдна ў гаспадарчым веданні ваяводы або старасты. Сяляне прыватнаўласніцкія падлягалі юрысдыкцыі сваіх уласнікаў. У выпадку адмовы апошніх справа паступала на суд дзяржаўцы. Пры адпраўленні суда на карысць дзяржаўцы паступаў шэраг падаткаў: пераезд, павіннае, выметнае, пакалоднае, зарукі.

**Суд ваяводы.** Ваявода быў суддзёй у тым старостве, дзяржаве, якімі ён кіраваў на такіх самых асновах, як намеснік-дзяржаўца. Ваявода судзіў асоб, патрабуючых яго суда, і разглядаў скаргі, пададзеныя на дзяржаўцу. Ваявода смаленскі судзіў у прысутнасці ўладыкі, скарбніка, акольнічага, старасты места Смаленскага, канюшага, чашніка, лоўчага, князёў і баяр Смаленскай зямлі. Ваявода віцебскі — з гараднічым, ключнікам, канюшым, лоўчым, сакольнічым, кухмістрам, князямі і баярамі Віцебскай зямлі. Накшталт гэтага судзіў і ваявода Полацкай зямлі.

**Суд вялікага князя.** Вышэйшым судом быў суд вялікага князя. Ён быў першай інстанцыяй для тых грамадзянскіх груп, якія не былі падсудны мясцовым уладам, і для ўсіх патрабуючых гаспадарскага суда. Па Статуце 1529 г. адозва на суд гаспадара без папярэдняга разгляду справы ў адпаведнай інстанцыі была забаронена. Насяленне Полацкае і Віцебскае зямель падлягала суду вялікага князя толькі ў часе побыту яго на тэрыторыі зямель. Вялікі князь судзіў у прысутнасці асэсараў, паноў-рады, дворныхураднікаў і іншых урадовых асоб. Асэсары дапамагалі гаспадару ў вядзенні судовага працэсу, але сам прыгавор выносіўся аднаасабова вялікім князем. Суду вялікага князя падлягалі князі, паны-рада, чужаземцы, а гэтаксама шляхта, непадсудная цівунам-дзяржаўцам. Для ўсіх іншых грамадзянскіх груп, па Статуце 1529 г., суд вялікага князя быў судом трэцяй інстанцыі.

**Суд паноў-рады.** Гаспадарская рада пачала цікавіцца судовымі справамі яшчэ пры вялікім князю Казіміру Ягелончыку з прычыны яго частых выездаў у Польшчу. Суд паноў-рады быў раўназначны суду вялікага князя. На судзе прысутнічалі радныя паны, што знаходзіліся ў гэты момант у Вільні. Для судоў паноў-рады прызначаліся пэўныя тэрміны два разы ў год.

**Агульны характар судаўніцтва.** Судовая арганізацыя была пабудована на прынцыпе асаблівай упрывілеяванасці магнатаў, падсудных толькі вялікаму князю. Для звычайнага пражываючага ў павеце шляхціца немагчыма было судзіцца з магнатам. Гэтае засілле магнацкае было замацована Статутам 1529 г. і мела вялізны ўплыў на развіццё сацыяльна-палітычнага настрою шляхты.

## Н) Культурныя ўплывы

**Перавага беларускае культуры.** Літоўскае Вялікае княства ў культурных адносінах з'яўлялася беларускім. Беларуская мова была мовай дзяржаўнай. Гаспадарскія лісты, граматы, соймавыя ўхвалы публікаваліся ў беларускай мове.

Беларуская мова ўжывалася ў гаспадарскай канцылярыі і ў судаўніцтве. Судзебнік 1468 г. і Статут 1529 г., краінныя прывілеі былі апублікаваны на беларускай мове. На гэтай жа мове пісаліся беларускія летапісы, хронікі, жыцці святых, свецкія белетрыстычныя творы. Росквіт беларускае культуры абымае ўсё XVI ст., калі багацце і сіла беларускага духоўнага жыцця знайшлі поўнае выяўленне. Пануючыя класы ў XV ст. і ў першай палове XVI ст. заставаліся вернымі нацыянальнай культуры.

**Польская культура.** З заключэннем літоўска-польскай уніі ў Літву стала пранікаць і польская культура. Праваднікамі яе былі ўрад і духавенства. Літоўскае магнацтва, прыняўшы каталіцызм, гэтым самым прышчапіла ў сябе і польскую культуру. Праз гандаль ліцвіны азнаёміліся з еўрапейскай культурай. Аднак польская культура робіць нязначныя поспехі, яе развіццё прыпыняе нацыянальна-палітычная барацьба XVI ст. Майскі прывілей 1447 г., надаўшы прывілеі ўсёй шляхце незалежна ад рэлігійнай прыналежнасці, прыпыніў пашырэнне каталіцкай і польскай культуры. І ўсё-ткі літоўскае магнацтва паступова ўцягвалася ў сферу ўплыву польскае культуры. Пад уплывам апошняй пачала ўжывацца лацінская мова ў зносінах з Захадам і часткова з Польшчай. Прывілеі рымска-каталіцкага касцёла пісаліся на лацінскай мове, а часткова і прывілеі на магдэбургскае права, пераважна на тэрыторыі Літвы. Акты, прызначаныя для Падляшша, публікаваліся на лацінскай мове. Літоўскія паны-католікі пачалі ездзіць вучыцца ў Кракаўскі універсітэт: Гаштольд, Гедройцы, князь Свірскі. Паасобныя паны вандруюць па Заходняй Еўропе, і прывілей 1447 г. дазволіў гэтыя паездкі за граніцу.

# V

# Пачатак шляхецкае феадальнае дзяржавы



## 1. ЛІТОЎСКА-ПОЛЬСКІЯ АДНОСІНЫ

**Абранне Жыгімонта I.** Унія 1501 г. фактычна не была ажыццёўлена. Адносіны паміж Літвой і Польшчай засталіся без змены. У 1506 г. памёр вялікі князь Аляксандр. Літоўскія магнаты не паехалі на супольны з палякамі сойм і «одностайною волею» абралі на пасад брата нябожчыка вялікага князя Жыгімонта. Палякі са свайго боку абралі яго каралём, не паднімаючы пытання аб умовах уніі. Нягледзячы на гэта, фактычна ўмовы Мельніцкага трактата былі ажыццёўлены. Літва і Польшча мелі аднаго гаспадара. Літоўскія магнаты не маглі пагадзіцца з гэтым. У сваім імкненні да самастойнасці магнаты хацелі дабіцца ад Жыгімонта згоды на тое, каб яго сын Жыгімонт, шасцігадовы хлопчык, быў абвешчаны вялікім князем. Абранне адбылося на сойме ў 1526 г. Гэткі ўчынак магнатаў сведчыў аб іх адмоўных адносінах да уніі Літвы з Польшчай. Жыгімонт спачатку адхіліў просьбу магнатаў; толькі ў 1529 г. Жыгімонт згадзіўся здаволіць просьбу літоўскіх магнатаў. Яго сын прыехаў у Вільню, дзе адбылася яго каранацыя. Каранацыя маладога Жыгімонта Аўгуста — гэта вялікая перамога літоўскіх магнатаў у іх барацьбе за незалежнасць княства. Гэта быў момант найвышэйшага палітычнага ўплыву магнатаў, уплыву, які затым пачынае падаць і змяняецца ўзвышэннем шляхецкага стану.

**Жыгімонт Аўгуст, вялікі князь.** Сууўрадаванне Жыгімонта II з бацькам цягнулася да 1547 г., да смерці яго прастарэлага бацькі. Малады літоўскі вялікі князь выяўляў у дзяцінстве незвычайныя здольнасці. Але прыдворная сфера і ўплыў на Жыгімонта Аўгуста яго маткі — каралевы Боны — не давалі магчымасці маладому вялікаму князю паважна аддавацца працы. Магнатам удалося вырваць яго з прыдворнага жыцця і аддаць на выхаванне гнезненскаму кашталяну Пятру Асалонскаму. Але карысны ўплыў выхаваўцы трываў нядоўга. Жыгімонт II не любіў ніякае паважнае працы і аддаваўся розным забавам. Просты, даступны, пазбаўлены ўсялякага фанатызму і рэлігійнага шавінізму, Жыгімонт II Аўгуст быў папулярны паміж літоўска-беларускіх магнатаў і шляхты. Паважныя адносіны да дзелавых пытанняў хутка змяніліся закаханнем да забаваў, баляў, маскарадаў, паляўніцтва. Жыгімонт II Аўгуст стаў пакорным прыладдзем тых грамадзянскіх груп, якія стаялі за ім. Спачатку ён быў у сферы ўплыву літоўскіх магнатаў, дасягнуўшых найвышэйшага свайго ўплыву, калі ўдава Барбара Гаштольд, сястра Мікалая Радзівіла, таемна пашлюбіла вялікага князя. Польская партыя на чале з каралевай Бонай пастаралася пазбавіцца ад непажаданай каралевы, каранаванай у 1550 г. і ў наступным годзе

раптоўна памерлай. Смерць Барбары Радзівіл супала з момантам палітычнага ўмацавання шляхты, якая, змагаючыся з магнатамі, адносілася вельмі прыхільна да літоўска-польскае унітарнае праблемы. Толькі унія з Польшчай магла прыспяшыць перамогу шляхты над магнатамі, а гэта павінна было змяніць сацыяльную і палітычную структуру Вялікага княства. Знадворныя мтрэнгі прыспяшылі працэс усведамлення шляхтай сацыяльна-палітычнага значэння уніі, якая і была ажыццёўлена толькі пры дапамозе літоўска-беларускае шляхты.

**Унітарная праблема пры Жыгімонту Аўгусту.** Барацьба за унію і супроць яе была барацьбою двух розных палітычных светаглядаў. Магнаты, баронячы самастойнасць Літвы, стараліся захаваць для сябе пануючае сацыяльна-палітычнае значэнне і не жадалі дапусціць распаўсюджання польскага элементу ў Літве. Шляхта не цікавілася пытаннем аб самастойнасці Вялікага княства. Ашляхечванне дзяржавы, якое магло быць ажыццёўлена толькі пры ўмове уніі з Польшчай, адчыняла шлях да ўлады, да ўрадаў, да дзяржаўных маёнткаў, значная частка якіх была ў заставе ў магнатаў. Канечнасць абароны граніц, якая ўсім цяжарам падала на шляхту, і, нарэшце, Лівонская вайна прымусілі шляхту заняць баёвую пазіцыю ў адносінах да уніі, патрабуючы на соймах яе ажыццяўлення. Магнаты працівіліся покуль маглі. Але яны былі прымушаны прызнаць унітарную праблему чарговай і паслаць дэлегацыю для завязання уніі на Варшаўскі сойм 1563 г., згаджаючыся на такія ўмовы уніі, якія б зусім не змянялі ўнутранай аўтаноміі Літоўска-Беларускай дзяржавы і забяспечылі б незачэпнасць усёй тэрыторыі Літоўска-Беларускай дзяржавы. Палякі не маглі згадзіцца на гэтыя ўмовы, бо іх галоўнай мэтай былі ўкраінскія землі; каб ажыццявіць гэтую мэту, палякі дабіваліся уніі з Літвой на прынцыпе інкарпарацыі.

## 2. ЗНАДВОРНЫЯ АДНОСІНЫ

**Лівонская вайна (1558—1582).** Масква ў сваім імкненні да берагоў Балтыкі пачала вайну з Лівонскім законам, спадзеючыся на яго слабасць і ўнутранае бязладдзе. У 1558 г. маскоўскае войска спустошыла Лівонію, захапіла Нарву, Дэрпт, Нойгаузен і пасоўвалася далей углыб Лівоніі. Лівонскі закон не мог ніадкуль атрымаць дапамогі. Тагды магістр Кетлер звярнуўся за дапамогай да Літвы. 31 жніўня 1559 г. была завязана дамова, на моцы якой Закон паступаў пад пратэктарат вялікага князя. Жыгімонт II Аўгуст паслаў Івану Грознаму ультыматум, каб той спыніў ваенныя дзеянні. Ультыматум застаўся без выніку, і Літве прыйшлося ўмяшацца ў лівонска-маскоўскія адносіны. Ваенныя дзеянні спачатку складваліся няўдачна для Літвы. Полацк, Веліж, Невель, Себеж былі захоплены маскоўскім войскам. У 1566 г. Жыгімонт II Аўгуст прапанаваў Івану IV завязаць дамову з уступкай Беларусі[1]. Але Іван IV, апі-

[1] Недакладнасць. У маі вялікае пасольства ВКЛ у Маскве (Ю. Хадкевіч, Ю. Тышкевіч, М. Гарабурда) патрабавала вяртання Полацка і Смаленска. Масква адхіліла гэта патрабаванне, намагалася атрымаць Рыгу.

раючыся на думку Земскага сабора, даў адмоўны адказ. Ваенныя дзеянні зноў распачаліся і цягнуліся да 1570 г., калі Жыгімонт II Аўгуст быў прымушаны завязаць перамір'е з Масквою, пакінуўшы за ёю Полацк і ўсю Лівонію. Пад уплывам утварыўшагася становішча на тэатры ваенных дзеянняў Лівонія была прымушана прызнаць спачатку неабмежаваныя паўнамоцтвы старасты Жмудскага – Яна Хадкевіча, «гетмана і адміністратара», а затым завязаць унію з Літвою на гэткіх умовах: Лівонія прызнае ўладу вялікага князя, які абіраецца супольна; аўгсбургскае вызнанне веры застаецца непарушана; забараняецца прапаганда іншых рэлігій; застаюцца ўсе старыя вольнасці; будуюцца школы і цэрквы для народа; замкавыя і гарадскія ўрады замяшчаюцца мясцовымі ўраджэнцамі; адміністратарам назначаецца асоба, якая ведае нямецкую мову, з правам хадайніцтва аб яго змяшчэнні (1566). Гэткім чынам Лівонскі закон перастаў самастойна існаваць. Лівонская вайна напружыла ваенныя і грашовыя сродкі шляхты да апошняга. Ураду прыходзілася вельмі часта збіраць вальныя соймы, якія ўмацоўвалі палітычную вагу шляхты. Пад уплывам няўдачнае вайны беларуская шляхта схіляецца да уніі з Польшчай, спадзеючыся пры дапамозе апошняй разбіць маскоўскае войска і вызваліць свае землі ад чужацкай акупацыі.

**Літва і татары.** З пачатку XVI ст. літоўскі вялікі князь абавязаўся выплачваць крымскаму хану штогодную дань і выхад. Аднак своечасная выплата дані не ратавала памежныя ўкраінскія мясцовасці ад татарскіх набегаў. У барацьбе з Масквой крымскія ханы не прымалі ніякага ўдзелу. Выплата дані ў 3000 коп грошай пры ўбогасці гаспадарскага скарбу вельмі цяжка адгукалася на фінансах Вялікага княства.

**Арганізацыя абароны.** Безупыннае напружанае становішча на ўсходняй і паўднёвай граніцах дзяржавы прымушала прымаць шэраг крокаў па арганізацыі абароны. У барацьбе з Масквою адно паспалітае рушэнне не выстарчала; давялося звярнуцца да наёмных войск, лік якіх значна павялічыўся ў часе Лівонскае вайны. Утрыманне наёмнага войска абцяжала бюджэт дзяржавы. У 1545 г. урад Жыгімонта I распачаў рэвізію ўкраінскіх замкаў: Оўруча, Жытоміра, Луцка, Уладзіміра, Крэменца, Браслаўля і Вінніцы. Рэвізія знайшла, што становішча абароны замкаў нездавальняючае, а гэтаксама што мясцовыя землеўласнікі ўхіляюцца ад тых павіннасцей, якія ляжалі на іх па абароне краіны. У 1552 г. была зроблена новая рэвізія замкаў: Чарнабыльскага, Остэрскага, Любецкага, Мазырскага, Кіеўскага, Жытомірскага, Луцкага, Крэменецкага, Чаркаскага, Канеўскага, Вінніцкага і Браслаўскага. Замкі ахоўваліся наёмнымі людзьмі. Для ўтрымання апошніх шляхта была абложана «поконевскімі пенязьмі» і звальнялася ад выстаўлення аднаго каня. Гэтая пастанова была прынята на сойме 1552 г. і выклікала з боку шляхты вялікае нездаволенне з той прычыны, што яе прадстаўніцтва на сойме не было. Падатак збіраўся строга, не выключаючы канфіскацыі маёнткаў.

**Фінансавыя захады. Становішча скарбу.** Гаспадарскі скарб не мог вытрымаць усяго таго цяжару, які выпадаў на яго долю. Урад павінен быў учыніць надзвычайныя крокі: аддаваць у заставу гаспадарскія маёнткі, збіраць надзвы-

чайны падатак «сярэбшчыну» (1507, 1516, 1522, 1529, 1534, 1538, 1540, 1551). У часе Лівонскай вайны ўрад неаднакроць быў прымушаны збіраць сярэбшчыну. Сойм 1559 г. дэкрэтаваў яе збор на два гады. У 1563 г. быў устаноўлены збор сярэбшчыны ў працягу трох год. Сярэбшчына паступала нерэгулярна. Берасцейскі сойм 1566 г. пастанавіў выплату сярэбшчыны ў падвойным ліку ў выпадку, калі яна не выплачана ў час. У 1561 г. ваеннаслужылыя землеўласнікі былі абложаны «поконевскімі пенязьмі». Гародзенскі сойм 1566—1567 гг. пастанавіў выплату новай сярэбшчыны на два гады. Пад уплывам убогасці скарбу тавары, што вывозіліся за мяжу і прывозіліся адтуль, былі абкладзены спецыяльнымі паборамі (1561). Вінаватыя ва ўкрыванні тавараў трацілі сваю маёмасць. На гэтым жа сойме быў вызначаны збор «помолу» з усіх тых, хто будзе малоць пшаніцу, жыта, солад і крупу на млынах ці хатніх жорнах на продаж. Матэрыялы вырабу піва, мёду і гарэлкі гэтаксама былі абложаны. Памол у маёнтках землеўласнікаў ішоў на карысць уласнікаў з той умовай, каб ён ішоў на мэты лепшага ваеннага ўзбраення. Усе гэтыя фінансавыя захады ўрада ўсім сваім цяжарам падалі на шляхту. Самі падаткі дэкрэтаваліся на соймах пры ўдзеле шляхты. Ваеннае і фінансавае значэнне шляхты зусім змяніла яе палітычнае становішча.

## 3. АГРАРНАЯ РЭФОРМА

**Гаспадарчая палітыка ў заходніх краінах.** Распад натуральнае гаспадаркі і пераход да грашовае адбіўся на становішчы сельскае гаспадаркі ў заходніх дварах вялікага князя. Канечнасць павелічэння прыбыткоўнасці і прадукцыйнасці гаспадарскіх маёнткаў прымушала ўрад умешвацца ў вядзенне дзяржаўнай гаспадаркі і рэгуляваць яе. Гаспадарскія ўставы 1514—1529 гг. залажылі фундамент для новага гаспадарання ў інтарэсах рынку і арганізацыі кантролю над дзейнасцю дзяржаўцаў, каб пазбавіцца магчымых з іх боку надужыццяў. Але ўставы не чапалі з даўных-даўна склаўшыхся форм сялянскага землеўладання. Наказ старастам і дзяржаўцам, апублікаваны незадоўга да валочнага ўстава, мае на ўвазе выключна прадпрыемчую гаспадарку, развіццё якой не павінна было змяняць сялянскія пазямельныя адносіны. Наказ не закранаў гэтае стараны.

**Гаспадарчая палітыка ва ўсходніх краінах.** Слабае развіццё сельскай гаспадаркі і крыху іншы склад насялення адносна павіннасцей ставілі літоўска-беларускую адміністрацыю па-за сферай уплыву новае эканамічнае палітыкі. Але і тут прынцып валасной старасвеччыны непрыметна нарушаўся. Адміністрацыя пачала выстаўляць новыя патрабаванні адносна павіннасцей. Непаразуменні паміж насяленнем і адміністрацыяй вырашаў урад, які ў апублікаваных уставах захоўваў старасвеччыну; але пад выглядам апошняй пранікалі ва ўставы і «навіны». Дзякуючы гэтым уставам старасвеччына была замацована і адносіны валаснога насялення да ўрадовай адміністрацыі былі больш дакладна азначаны.

**Неабходнасць аграрнай рэформы.** Становішча літоўска-беларускага скарбу было безнадзейнае. А тым часам становішча дзяржавы вымагала новых і новых сродкаў. Атрымаць апошнія было магчыма толькі падняўшы прыбытковасць і прадукцыйнасць гаспадарскіх маёнткаў, а гэта магло быць ажыццёўлена толькі пры ўмове пераходу да трохпольнай сістэмы ральніцтва і поўнага знішчэння старасвецкіх формаў землеўладання. Аб'ектыўныя ўмовы спрыялі гэткай рэформе. На еўрапейскім рынку заўважваўся асаблівы попыт на літоўска-польскія сельскагаспадарчыя прадукты: жывёлу, збожжа, скуру рагатае і дробнае жывёлы. Ёмасць замежнага рынку паступова павялічвалася. Карыстаючыся старой гаспадарскай тэхнікай, Літва не магла павялічыць прадукцыйнасці сваіх гаспадарак. Гэта разумелі некаторыя ўрадовыя дзеячы, паміж якіх першае месца займаў стараста кнышынскі пан Станіслаў Фальчэўскі. Спроба гэткай новай аграрнай палітыкі была часткова і ўдала ажыццёўлена каралевай Бонай у Пінскім і Клецкім княствах.

**Прынцыпы рэформы.** Сутнасць аграрнай рэформы замыкалася ў больш дакладным вызначэнні велічыні сялянскіх участкаў, раўнамерным іх размеркаванні паміж сялян і дакладным вызначэнні тых павіннасцей, якія ляжалі на ўчастках. Да аграрнай рэформы сялянскія ўчасткі былі нераўнамерныя і не было ніякай пэўнай сістэмы ў выплатах. Сама гаспадарская ніва была параўнаўча невялікая. Для ажыццяўлення аграрнай рэформы была ўкладзена «ўстава на волокі», якою павінны былі кіравацца дзеячы рэформы. Для вымеру зямель пасылаліся ў гаспадарскія двары рэвізоры і мернікі, якія павінны былі, выдзеліўшы пэўную колькасць зямлі на дворную ніву, рэшту зямлі раздзяліць на валокі. Аграрная рэформа павінна была знішчыць цераспалосіцу. З гэтай мэтай прыватнаўласніцкія землі адбіраліся на гаспадара, а ўласнік атрымліваў «слушную отмену», калі праверка правоў на зямлю пацвердзіла, што дзяржаўца зямлі карыстаўся ёю на законнай падставе. Праверка правоў на зямлю выкрыла лічныя захваты гаспадарскіх зямель. Уласнікі, нездаволеныя адменай, мелі права падаваць гаспадару жалабы на чыннасць яго ўраднікаў. Дворнай гаспадаркай кіраваў дзяржаўца пад сваёй адказнасцю. Дворная зямля абраблялася працаю цяглых сялян, абавязаных працаваць на гаспадарскім двары два дні на тыдзень. Рэшта сялян была пасаджана «на осаде». Чэлядзь нявольная была пераведзена ў катэгорыю агароднікаў. Павіннасці цяглых сялян, апрача адбывання паншчыны, заключаліся ў выплаце чыншу ў залежнасці ад якасці зямлі і валокі і натуральных падаткаў у выглядзе курэй, гусей, яек, стацый, а гэтаксама сена і аўса. Усе гэтыя натуральныя падаткі маглі быць пераведзены на грошы. Апрача гэтага, цяглыя людзі выходзілі «на талаку» чатыры разы, «з чым укажут». Асадныя сяляне выплачвалі чынш, дробны даход, талаку, гвалт, авёс, сена, асаду; пры гэтым пры вызначэнні паасобных відаў падаткаў прымалася пад увагу якасць зямлі. Валочная сістэма знішчыла апошнія рэшткі валаснай арганізацыі. Яна паставіла сельскае насяленне ў беспасярэднія адносіны да дворнае адміністрацыі. Гаспадарскія дзяржавы дзяліліся на войтаўствы, у склад якіх уваходзіла пэўная колькасць валок. Войт назначаўся рэвізорам. На

яго абавязку знаходзіўся кантроль над сельскім насяленнем па адбыванні прыналежных ім павіннасцей, а гэтаксама беспасярэдняе выкананне гаспадарчых распараджэнняў урада. Апрача асаднага і цяглага сялянства, у кожнай дзяржаве была вышэйшая катэгорыя насялення — рамеснікі, прамыслоўцы, асобы, адбываўшыя пры двары якую-колечы службу. Гэтыя рабочыя элементы былі пасаджаны на зямлю. Звычайныя, цяглыя і асадныя людзі сядзелі на адной валоцы. Вышэйшая катэгорыя насялення — найчасцей на дзвюх, свабодных ад усялякіх падаткаў. Калі валокі заставаліся неразобраныя, то яны раздаваліся сялянам, якія ў залежнасці ад становішча сваёй сямейнай рабочай сілы маглі весці гаспадарку на дзвюх валоках. Аграрная рэформа зачапіла толькі заходнія краіны, не толькі воласці, але і гарады — як з магдэбургскім правам, так і без яго.

**Вынікі рэформы.** Аграрная рэформа дала магчымасць высвятліць данасць зямельнага фонду, які знаходзіўся ў распараджэнні гаспадара. Правільная пастаноўка гаспадаркі павінна была даць гаспадару патрэбныя грошы і вызваліць дзяржаву ад залежнасці ад шляхты. Гэтае вызваленне павінна было ўмацаваць вялікакняскую ўладу і аслабіць сацыяльны феадалізм. Аграрная рэформа мела на ўвазе ўтварыць індывідуальнае сялянскае землеўладанне і гаспадарку. Але рэформа не знішчыла калектыўных гаспадарак: на адной і той жа валоцы сядзелі групы асоб, звязаныя паміж сабою сваяцкімі адносінамі. У іх складзе бывалі і староннія людзі. Індывідуалізацыя гаспадаркі не дасягнула сваіх мэтаў. Старыя сямейныя арганізацыі не маглі быць адразу знішчаны. Нягледзячы на гэта, вялікаму князю не ўдалося ўтрымаць ва ўладанні дзяржавы вялікакняскія дамены. Жыгімонт Аўгуст і яго наступнікі былі прымушаны раздаваць землі за службу. Гэта аслабляла сілы дзяржавы і ўмацоўвала сацыяльна-палітычнае значэнне шляхты. Феадалізм не быў знішчаны.

**Усходнія краіны.** Аграрная рэформа не закранула ўсходніх краін. Для гэтага ў Прыдняпроўі і Прыдзвінні не было адпаведных аб'ектыўных умоваў. Непаразуменні паміж адміністрацыяй і валасным насяленнем прымусілі ўрад, не закранаючы істотных форм землеўладання і землекарыстання, прыступіць да вызначэння падаткаў і павіннасцей. Частка зямлі, што знаходзілася ва ўладанні «до волі і ласкі господарской», звычайна адбіралася на гаспадара.

**Лесная гаспадарка ў XVI ст.** Для заграмічнага гандлю ў другой палове XVI ст. лес меў першараднае значэнне. А тым часам лесная гаспадарка вялася без усялякага плана. Сяляне і прыватныя землеўласнікі ўваходзілі ў гаспадарскія пушчы і займаліся іх эксплуатацыяй, паляўніцтвам і рыбацтвам у азёрах. У сувязі з аграрнай рэформай урад ажыццяўляе «рэвізыю пушч і звярыных пераходаў». Гэтая рэвізія выявіла становішча гаспадарскіх пушч і выкрыла зробленыя ў іх захваты. З мэтай больш правіловай пастаноўкі гаспадаркі была выдана ў 1567 г. лесная ўстава, у якой падрабязна былі распрацаваны правілы аховы лясоў. Пушчы разбіваюцца на лясніцтвы, на чале якіх стаіць ляснічы; апошні супольна з асочнікамі, стральцамі, баброўнікамі, падлазнікамі ахоўвае пушчу. На карысць ляснічага паступала дзевяць валок зямлі. Ляснічыя былі

абавязаны наглядаць за тым, каб не было ніякай шкоды ні звярам, ні дрэвам бортным, ні іншым гатункам дрэў. Арганізаваўшы кантроль над пушчамі, урад не мог прыступіць да самастойнае эксплуатацыі пушч, якая знаходзілася пераважна ў руках чужаземнага капіталу.

**Вынікі рэформы.** Аграрная і лесная рэформы прыспяшылі працэс распаду натуральнае гаспадаркі і рост грашовай. Аб гэтым сведчыць шпаркае пашырэнне магдэбургскага права ў гарадах усходняе палавіны Беларусі. Павялічваецца значна ўнутраны гандаль, аб чым сведчыць павелічэнне мытных збораў. Прыватныя ўладары асаджваюць мястэчкі і ў іх наладжваюць штотыднёвы торг і кірмашы. На вялікіх гасцінцах адчыняюцца карчмы, дзе прадаецца хмельнае пітво. Замена натуральных павіннасцей грашовымі была скуткам гэтага ж працэсу. Аграрнай рэформаю Літоўска-Беларуская дзяржава цесна звязвалася з Захадам, асабліва з Польшчай, паколькі для літоўскага сырцу мела вялізнае значэнне Віслянская водная артэрыя, а гэтаксама з Гданьскам і польскімі кірмашамі ў Пазнані. Гэтыя ўмовы мелі вялікі ўплыў на далейшы лёс уніі Літвы з Польшчай. З развіццём грашовае гаспадаркі рабы паступова зліваюцца з цяглымі людзьмі. Утвараецца адзінае прыгоннае сялянства.

## 4. ПАЛІТЫЧНАЕ ЎМАЦАВАННЕ ШЛЯХЕЦТВА

**Умацаванне шляхты на соймах.** Знадворныя мітрэнгі змянілі суадносіны сіл у дзяржаве. У першай палове XVI ст. яшчэ адчуваецца ўплыў рады; гэты ўплыў асабліва выявіўся ў выданні Статута 1529 г. Перамены ў арганізацыі вялікага вальнага сойма сведчыў і аб умацаванні шляхецкай дэмакратыі. На соймах, якія збіраліся ў сувязі з Лівонскай вайною, шляхта падвышае свой голас, яе ўплыў становіцца пануючым, да яе голасу прыслухоўваецца вялікі князь. Адначасна з гэтым уплыў паноў-рады змяншаецца. Падвышэнне шляхты ў сацыяльна-палітычных адносінах было адбіткам тых перамен, што адбываліся ў народнай гаспадарцы. Уцягненне ў сферу грашовае гаспадаркі сярэдняга і дробнага землеўладання і павелічэнне значэння апошніх у агульнай структуры народнай гаспадаркі было прычынай сацыяльна-палітычнага ўзвышэння шляхты.

**Настрой шляхты.** Шляхта вельмі добра разумела сваё новае фінансава-палітычнае значэнне як ваеннаслужылага класса і як выплатчыка сярэбшчыны. Нягледзячы на трывожнае знадворнае палажэнне дзяржавы, шляхта займае бурлівую пазіцыю на соймах. Яна выступае з шэрагам скаргаў і пажаданняў. Шляхта нездаволена з арганізацыі суда, патрабуе агульнай падсуднасці, новага судаўніцтва, выпуску манеты са згоды сойма, змены ўрадовай палітыкі ў справе ажыццяўлення аграрнае рэформы, завязання уніі з Польшчай, рэформы адміністрацыі, паправы Статута. Беларуская шляхта выступала на соймах са сваімі асобнымі просьбамі. На Віленскім сойме 1559 г. полацкая шляхта просіць гаспадара паступаць «водле прывілеяў і вольнасцей» і не ўмешвацца ў дом Божы «Свята Софья і свят Спасе». Просьба шляхты была здаво-

лена. Шляхта выказала пажаданне, каб «памятное, віжовое і дзецковное» збіралася «водле прывілеяў і вольнасцей». Гаспадар адказаў, што падаткі будуць збірацца па-старому, але толькі часова, «калі Статут новы будзе ўсім землям выдан». Шляхта запатрабавала, каб з прыватнаўласніцкіх мяшчан не бралі падаткаў ад тавараў іх, «которые колі до Рыгі спускаті будут», а гэтаксама каб былі звольнены ад мыта тыя мяшчане, якія разам з гаспадарскімі мяшчанамі адбываюць замкавую павіннасць. Шляхецкае пажаданне не было здаволена. Затым шляхта прасіла, каб з іх падданых «ніколі не бралі сярэбшчыны», звольнілі ад выплаты мыта з тавараў, пасыланых у Рыгу. Гэтыя пажаданні не былі здаволены. Нарэшце, шляхта прасіла, каб былі ўстаноўлены суддзі і пісар прысяжныя «для борзейшей справедлівості». З падобнымі просьбамі выступала і віцебская шляхта. Беларуская шляхта выступала на соймах ад імя ўсёй зямлі. Гэта сведчыла аб станавасці і адасобненасці шляхты ад іншых грамадзянскіх груп.

**Рэформы 60-х гг.** Літоўска-беларускае магнацтва давала адпор націску шляхты да апошняе магчымасці. Але вайна з Масквой прымусіла пайсці на ўступкі. Вялікі князь даў сваю згоду на «поправу статута». На Бельскім сойме (1563) усе магнаты адмовіліся ад усіх сваіх судовых прывілеяў, прызналі агульную падсуднасць і юрысдыкцыю новых земскіх ураднікаў. Але ўсе абяцанні Бельскага прывілея былі ажыццёўлены толькі праз два гады. Новае судаўніцтва, канечна, вымагала новага падзелу на паветы. Віцебская зямля дзялілася на два паветы: Віцебскі і Аршанскі. У Полацкай зямлі — адзін Полацкі павет. Уласна Літва з беларускімі краінамі была падзелена на 15 паветаў. Палессе — на 5. У межах кожнага павета ўстанаўляліся соймікі для абрання чатырох кандыдатаў на судовыя ўрады, членаў земскага суда ў складзе суддзі, падсудка і пісара. Правам абрання карысталіся толькі аселыя шляхціцы. Крымінальныя справы: падпал, разбоі, зладзейства і абман, забойства шляхціца, гвалт над жанчынай — знаходзіліся ў веданні ўрадовага замкавага суда. Для «справ граічных і земляных» арганізоўваўся суд падкаморскі ў складзе падкаморага, назначанага каралём, і каморніка. Здавальняючы просьбу шляхты аб памнажэнні пасадаў, урад ажыццёвіў новы тэрытарыяльны падзел, устанавіўшы пяць новых ваяводстваў: Валынскае, Браслаўскае[1], Падольскае[2], Менскае, Берасцейскае, Мсціслаўскае. Новы судовы і адміністрацыйны ўклад абмежаваў уладу ваяводы. У веданні ваяводы засталося толькі начальства над усімі ваеннымі сіламі ваяводства. Адміністрацыйная ўлада вызначалася межамі толькі цэнтральнага павета. На чале паветаў былі пастаўлены старасты судовыя, меўшыя права суда над шляхтай у крымінальных справах. Статут 1566 г. замацаваў за соймам яго заканадаўчыя паўнамоцтвы і фактычна абмежаваў уладу вялікага князя вялікім вальным соймам. Для выбрання дэпутатаў на сойм былі ўстаноўлены павятовыя соймікі, на якіх прымаюць удзел паны, ваяводы, старасты, кашталяны, маршалкі, князі і ўся павятовая шляхта. Сабраўшыся ад кожнага судовага павета,

[1] У Падоллі.

[2] Недакладнасць. Магчыма, маецца на ўвазе Падляшскае, якое было створана ў 1513 г.

яны выбіраюць двух паслоў для прадстаўніцтва на сойме і даюць ім мандаты датычна пытанняў, якія маюць разглядацца на соймах. Соймікі павінны быць сабраны за чатыры тыдні да сойма. Устанаўленне шляхецкага прадстаўніцтва, рэформа суда і краіннага кіраўніцтва прыблізілі літоўска-беларускі дзяржаўны ўклад да польскага. Гэта падрыхтавала магчымасць ажыццяўлення парламентарнай уніі 1569 г. Але пры падабенстве да дзяржаўнага ўкладу Польшчы шмат у чым была і розніца: на вальных соймах побач з павятовымі пасламі засядалі асобы, запрошаныя на сойм вялікім князем.

## 5. ЦАРКОЎНА-РЭЛІГІЙНЫЯ АДНОСІНЫ

**Паяўленне пратэстантызму.** Гандлёвыя зносіны з Захадам спрыялі пранікненню на Літву-Беларусь заходнееўрапейскіх рэлігійных павеваў. Так, Геранім Пражскі – прыяцель Гуса – быў у 1413 г. у Літве, Вільні і Віцебску. Па смерці Гуса і Гераніма гусіцкі рух прасочваўся ўглыб Беларусі. З паяўленнем у Нямеччыне пратэстантызму гэты рух пачаў шпарка пашырацца на Беларусі, Валыні, Літве і Курляндыі не толькі з Польшчы, Усходняй Прусіі, а гэтаксама з Лейпцыга і Франкфурта. Галоўнымі праваднікамі пратэстантызму былі рамеснікі, купцы, маляры, што пражывалі ў Вільні і іншых гарадах. Першымі пашыральнікамі пратэстантызму былі: італьянец Лісманіні, Андрэй Кульва[1], доктар філасофіі германскіх універсітэтаў Ян Вінклер – каталіцкі духоўнік. Пры ім была пабудована ў Вільні лютэранская кірха. У 1545 г. Альбрэхт Прускі прысылае ў Літву казальнікаў пратэстантызму і ўстанаўляе стыпендыі для ліцвінаў у Кёнігсбергскім універсітэце. Сам Жыгімонт ІІ Аўгуст, акружаны пратэстанцкімі казальнікамі, выяўляў нахіл да пратэстантызму. Кальвінізм гэтаксама быў значна пашыраны. Перакананымі кальвіністамі была фамілія князёў Радзівілаў, асабліва ў асобе ваяводы і канцлера віленскага[2] Міколы Радзівіла. Свабодная прапаганда кальвінізму ў Вільні прыцягнула на яго бок шмат арыстакратыі. У 1565 г. Радзівіл пабудаваў абшырную кальвінскую царкву. Кальвіністычныя грамады ўтварыліся ў Полацку, Віцебску, Навагрудку, Біржанах, Менску, Бярэсці, якое зрабілася другім цэнтрам кальвінізму. Адначасна з памяркоўнымі пратэстанцкімі кірункамі пранікаюць у Літву і Беларусь скрайнія секты ў выглядзе сацыніянства, прадстаўнікі якога адкідалі асноўныя догматы пратэстантызму – боскасць Хрыста і навуку аб празначэнні. Сацыніянства распаўсюдзілася найбольш у Берасцейскім і Навагрудскім ваяводствах. Літоўскія магнаты Кішкі ў асобе Яна Кішкі – віленскага кашталяна – і Алесніцкія былі галоўнымі апекунамі сацыніянства.

**Сацыяльныя прычыны пашырэння пратэстантызму.** На старану пратэстантызму, асабліва кальвінізму, сталі прадстаўнікі літоўска-беларускага магнацтва, як Радзівілы, Хадкевічы, Глебавічы, Сапегі, Пацы, Валовічы, Вішнявецкія.

[1] Аўраам Кульва.

[2] Недакладнасць, правільна – канцлера ВКЛ і ваяводы віленскага.

Становячыся на сторану пратэстантызму, магнаты стараліся пазбавіцца каталіцызму, які з'яўляўся праваднікам польскага ўплыву і культуры. Спрыяльная для сельскай гаспадаркі эканамічная кан'юнктура штурхала арыстакратыю да пашырэння сваіх зямельных уладанняў шляхам секулярызацыі царкоўных маёмасцей. У гэтых адносінах магнаты паступалі зусім аднолькава ў стасунку да цэркваў абодвух веравызнанняў. Секулярызацыя царкоўнае маёмасці павінна была ўмацаваць палітычнае значэнне магнацтва, на якое напірала шляхта. Разам з магнацтвам прымала пратэстантызм і мясцовае насяленне. Дзякуючы гэтаму магнаты станавіліся верхаводцамі рэлігійнага жыцця пратэстанцкае грамады. Гэта павялічвала іх палітычнае значэнне. Адраджаўся феадалізм. Але гэты пратэстанцкі рух, ахапіўшы арыстакратыю і падуладнае ёй насяленне, не мог быць глыбокім; магнаты, захаваўшы за сабою секулярызаваныя землі і падуладнае ім насяленне, у хуткім часе вернуцца на лона каталіцкага касцёла.

**Рэлігійная палітыка.** Літоўска-беларускі ўрад прытрымліваўся веразноснай палітыкі. Пашырэнне пратэстантызму паміж магнацтвам і знадворныя мітрэнгі не дапушчалі іншай палітыкі. Стараючыся прыцягнуць на бок уніі беларускую і ўкраінскую шляхту, Жыгімонт II Аўгуст апублікаваў прывілей 1563 г., якім касаваўся канфесіянальны артыкул Гарадзельскага прывілея 1413 г. У істоце гэты артыкул неаднокраць ужо парушаўся ўрадам. Захаванне яго ставіла ўрад у двузначнае становішча ў адносінах да праваслаўнага і пратэстанцкага магнацтва, якое трэба было схіліць на бок уніі. Самастойнае палажэнне Літвы ў дзяржаўных адносінах не спрыяла пранікненню на Літву-Беларусь польскай шляхты, якая патрапіла сабраць значныя капіталы. Дзякуючы гэтаму пакуль што не было агрэсіўнага каталіцызму. Жыццё працякала ў атмасферы свабоды і рэлігійнага раўнапраўя ўсіх веравызнанняў. Каталіцызм яшчэ не меў сілы для барацьбы з праваслаўем і пратэстантызмам.

## 6. ЗАКАНАДАЎСТВА І СУД

**Статут 1566 г.** Першы літоўска-беларускі Статут 1529 г., уяўляючы сабой заканадаўчы зборнік, у якім атрымалі юрыдычнае афармленне ўсе палітычныя і грамадзянскія прывілеі магнатаў, не мог здаволіць шырокія шляхецкія колы, якія ўжо ўсвядомілі сваё палітычнае значэнне к палове шаснаццатага сталецця. Шляхецкая ідэалогія, высунуўшая мысль аб раўнапраўі ўсіх членаў шляхецкага стану, не магла пагадзіцца з такім становішчам і, заняўшы ваяўнічую пазіцыю, пачынаючы з 1540—1560-х гг. пачала падаваць вялікім князям «чалабітныя» аб папраўцы Статута. Упершыню з такой просьбай шляхта звярнулася да вялікага князя на Берасцейскім сойме 1544 г. Да гэтае просьбы Жыгімонт I аднёсся прыхільна. Жыгімонту I і літоўскім радным панам прыйшлося пайсці на ўступкі і, прызнаючы просьбу шляхты ў істоце зусім справядлівай, прыйшлося ўтварыць камісію з дзесяці асоб «яко з латінского, так і греческого закона», «людей добрых, поважных». Гэтай камісіі даручалася «тые артыкулы, вод-

луг патребы і водлуг Бога і речы справедлівое, поправіті, а іншыі прічініті і на першом сойме перед паны-радамі іх мілостью і всімі княжаты, паняты і всіх рыцерства іх оказать, где потом через посполітый сойм, на што вся земля зволіт, мают оныі артыкулы быть уфалены і пріняты з его мілості господарскім дозволеньем, што ся іх мілості слушного будет відеті». На Віленскім сойме 1551 г. шляхта зноў звярнулася да вялікага князя з паўторнай просьбай аб зменах у Статуце. На гэты раз Жыгімонт Аўгуст і магнаты былі прымушаны, у сілу гаспадарскага адказу на сойме 1544 г., утварыць камісію з дзесяці з яе месцапрабываннем у Вільні. Праца камісіі пасоўвалася наперад вельмі марудна. Укладанне праекта новага Статута было закончана ў 1563 г., але канчатковае зацвярджэнне Статут атрымаў у Вільні 11 сакавіка 1566 г. На Берасцейскім сойме 1566 г. і на Горадзенскім 1568 г. у Статут 1566 г. былі ўнесены папраўкі.

**Склад і змест Статута 1566 г.** Згодна з патрабаваннем шляхты ў Статут 1566 г. былі ўпісаны: а) тэкст агульназемскага прывілея 1551 г.; б) прывілей 8 чэрвеня 1563 г. аб раўнапраўі асоб шляхецкага пахаджэння праваслаўнае рэлігіі з рымска-каталіцкай шляхтай; в) Бельскі прывілей ад 1 ліпеня 1564 г., якім магнаты адмаўляюцца ад асобнай падсуднасці; г) Віленскі прывілей ад 13 снежня 1564 г. аб утварэнні павятовых соймаў; д) акт пацвярджэння Статута ад 11 сакавіка 1566 г. Статут другой рэдакцыі складаецца з 14 раздзелаў, падзеленых на артыкулы. Раздзел першы ахвярован «пэрсоне господарской»; раздзел другі — абароне земскай; раздзел трэці — шляхецкім вольнасцям і памнажэнню Вялікага княства Літоўскага; раздзел чацвёрты — арганізацыі судоў; раздзел пяты датыча пасагу і вена; раздзел шосты — аб апецы; раздзел сёмы — аб запісах і продажы; раздзел восьмы — аб тэстаментах; раздзел дзевяты — аб правах земскіх; раздзел дзесяты — «о ловы, о путы і о дереве бортнех»; раздзел адзінаццаты — «о кгвалтех і о головшчізнах шляхецкіх»; раздзел дванаццаты — «о головшчізнах і о павезках людей посполітых»; раздзел трынаццаты — «о грабежах і навезках»; раздзел чатырнаццаты — «о злодействе всякого стану». Галоўнай крыніцай Статута 1566 г. з'яўляецца Статут 1529 г., старадаўнія звычаі, соймавыя ўхвалы, польскае права, рымскае і нямецкае права. Апошнія крыніцы мелі павярхоўны ўплыў, знаёмілі са спосабамі кадыфікацыі. У Статуце 1566 г. уплыў польскага права ў параўнанні з Статутам 1529 г. больш значны.

**Значэнне Статута 1566 г.** Другі Статут падрахоўвае вынікі палітычнай і юрыдычнай мыслі шляхецкага стану. Ён сведчыць аб перамозе шляхты над магнатамі, закладвае фундамент пад дыктатуру шляхецкага стану. Новы Статут, з'яўляючыся развіццём праўных інстытутаў першага Статута і ў той жа час адбіваючы ў сабе ўплыў польскага права, уяўляе сабой знакаміты юрыдычны помнік, у якім адбіваецца культурнае становішча літоўска-беларускае шляхты.

**Асновы Статута 1566 г.** Статут 1566 г. распаўсюджвае сваю дзейнасць на прадстаўнікоў землеўласніцкага стану. Вялікі князь звязан у сваёй дзейнасці юрыдычнымі нормамі, змешчанымі ў другім Статуце. Правы Статута абавязковыя для ўсіх грамадзян Вялікага княства. Ніякія судовыя імунітэты не дзейны. Статут забяспечвае асабовую незачэпнасць і індывідуальную адказнасць за

праступленні. Уласнасць незачэпная. Нерухомая маёмасць падлягае канфіскацыі, калі яе ўласнік учыніць дзяржаўнае праступленне. Дзеці, якія ўладаюць маёмасцю асобна ад бацькі, учыніўшага дзяржаўнае праступленне, а гэтаксама жоны, нічаго не ведаўшыя аб праступках сваіх мужоў, але ўладаючыя асабіста ім прыналежнай нерухомай маёмасцю, захоўваюць сваю нерухомасць у незачэпнасці. Шляхта карыстаецца правам распараджацца сваёй рухомай і нерухомай маёмасцю ў межах статутнага заканадаўства. Права ўладання рухомасцю і распараджэння ёю прыналежыць і жанчынам. Праступленні супроць асобы і ўласнасці падлягаюць адпаведнаму пакаранню. Асоба шляхціца карыстаецца асаблівай апекай закона ў параўнанні з асобай простых людзей. Шляхціцы маюць права прымаць удзел у сойміках дзеля абрання паслоў на сойм і складу земскага суда. Шляхецкі стан карыстаецца правам удзелу ў вышэйшай заканадаўчай установе — вальным сойме праз сваіх паслоў, выбраных на сойміках. Уладанне ўсімі відамі зямельнага карыстання цягне за сабой абавязак вайсковае службы на ўмовах, пастаноўленых на вялікім вальным сойме. Асоба гаспадара незачэпна. Злачынствы, пакіраваныя супроць асобы гаспадара і дзяржавы, караюцца асаблівымі спосабамі пакарання. Да дзяржаўных праступкаў адносяцца: змова і бунт супроць асобы гаспадара; фальшаванне манеты; спроба гвалтоўным спосабам захапіць трон; бунт супроць гаспадара і дзяржавы; прывод у дзяржаву непрыяцельскага войска; дапамога непрыяцелю; здача замка; уцёкі з ліхімі замерамі за граніцу.

**Судаўніцтва.** Статут 1566 г. задаволіў жаданні шляхецкага стану мець суды на ўзор польскіх. Новым Статутам у Літве і Беларусі ўводзіліся тры катэгорыі судоў: земскі, падкаморскі і замкавы.

**Суд земскі.** Новы земскі суд складаецца з суддзі, падсудка і пісара, якія ў колькасці чатырох кандыдатаў абіраюцца на павятовых сойміках і падаюцца на зацвярджэнне гаспадара. Дзелаводства павінна весціся «по руску літэрамі і словы рускімі, а не іншым языком і словы». Новаму суду падсудны ўвесь шляхецкі стан у яго цэлым. Земскаму суду падсудны ўсе справы грамадзянскага і крымінальнага характару, за выключэннем толькі такіх спраў, якія падлягаюць кампетэнцыі замкавага суда. Суддзямі не могуць быць духоўныя асобы, урадовыя асобы ў павеце. Абранне гэткіх прымушае іх пакідаць адміністрацыйныя абавязкі. Суд адбываецца асабістым складам суда. Заступніцтва дазволена толькі ў выпадку хваробы і асабістай зацікаўленасці суддзяў у падлягаючай суду справе. Пры кожным судзе павінны быць заведзены спецыяльныя кнігі. Шляхціцы падлягаюць юрысдыкцыі суда на месцы знахаджэння іх маёнткаў. Асобы, уладаючыя маёнткамі ў некалькіх паветах, падсудны суду таго павета, у якім знаходзіцца большая частка іх нерухомасці. Судовыя сесіі бываюць тры разы на год. Судовыя сесіі не могуць адбывацца ў часе вялікага вальнага сойма, ваенных падгатаванняў і маравой пошасці. Апеляцыя на пастанову земскага суда падаецца на разгляд гаспадара. Суд вялікага князя адбываецца разам з панамі раднымі выключна на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага ў часе прабывання тут вялікага князя.

**Суд замкавы.** Стараста судовага павета, дзяржаўшы замак або гаспадарскі двор, які можна было лічыць цэнтральным у павеце, выступаў у якасці замкавага, або «градскага», суддзі; яму былі падсудны: «наезд кгвалтовный на домы шляхецкіе, кгвалт в местах нашіх, о пожогу і разбоі на дарогах, кгвалтованне панен і невест, о злодейство, о фалш, о голову шляхецкое». Апрача гэтага, замкаваму суду падлягалі ўсе чужаземцы, учыніўшыя праступленне ў даным судовым павеце, і мясцовыя шляхціцы па ўсіх справах. Справы, падлеглыя замкаваму суду, судзіў сам ваявода або стараста, а ў яго адсутнасць — намеснік суда разам з «градскім» суддзёю з ліку павятовых аселых шляхціцаў. Нездаволеныя з судовае пастановы намесніка і «градскага» суддзі падавалі апеляцыйную скаргу ваяводзе або старасце. На суд апошніх скарга паступала беспасярэдна гаспадару.

**Суд падкаморскі.** Межавыя спрэчныя справы падлягалі кампетэнцыі падкаморскага суда ў складзе падкамор'я і каморніка. Падкамор'я прызначаў сам гаспадар з ліку аселых павятовых шляхціцаў. Абавязак падкамор'я быў дажывотным. Каморнікі, у ліку аднаго або двух, выбіраліся падкамор'ем з ліку «шляхтічов в повете оселых людей годных і стотечных», якія, перад тым як прыняць на сябе абавязак, прыносяць адпаведную прысягу перад павятовай адміністрацыяй. Каморнікі маюць права па распараджэнні падкамор'я разглядаць спрэчныя справы. Суд каморніка раўнаважны суду падкамор'я. Апеляцыя падаецца на разгляд гаспадара, які вырашае спрэчную справу тым, што пасылае на спрэчнае месца камісараў з ліку мясцовых павятовых шляхціцаў пры ўдзеле і правінцыяльнае адміністрацыі ў асобе кашталяна або маршалка павятовага, перад якімі падкаморы павінен паказаць усё дзелаводства па спрэчнай справе, якое падлягае або зацвярджэнню, або зменам.

**Вынікі судовай рэформы.** Новае судаўніцтва зрабіла суд роўным і даступным для ўсяго шляхецкага стану. Ніякія судовыя прывілеі цяпер не мелі месца. Шляхецкі склад суда быў лепшай забяспекай таго, што інтарэсы шляхціцаў будуць захаваны пры разглядзе справы. Статут 1566 г. зменшыў судовыя падаткі. Суд стаў значна таннейшым у параўнанні з папярэдняй эпохай, а значыць, і больш даступным.

## 7. БЕЛАРУСКАЕ АДРАДЖЭННЕ

**Агульны характар Адраджэння.** Гандлёвыя сувязі з Заходняй Еўропай і паступовае павелічэнне з ёй тавараабмену, з аднаго боку, спрыялі развіццю шэрагу гарадскіх цэнтраў, якія прымалі вельмі выдатны ўдзел у заходнееўрапейскім тавараабмене; з другога боку, яны ўцягвалі ў кола тавараабмену ўласнікаў нерухомасцей і спрыялі награмаджэнню капіталу ў руках прадстаўнікоў землеўладання. Гандаль спарадзіў багатае мяшчанства і багатых землеўласнікаў. Гандлёвыя сувязі з Захадам пазнаёмілі літоўска-беларускіх землеўласнікаў з еўрапейскай культурай. Пранікненне апошняй у гарады і ў асяроддзе земле-

ўласнікаў выклікала ў Літоўска-Беларускай дзяржаве асаблівы гуманістычны рух, было прычынай літоўска-беларускага нацыянальнага Адраджэння. Як і заходнееўрапейскае Адраджэнне, беларускі нацыянальна-культурны рух меў індывідуалістычны характар. Індывідуалістычныя кірункі знайшлі сабе яскравы адбітак у літоўска-беларускім заканадаўстве, у пашырэнні рэфармацыйных ідэй і рэлігійных сект, у паяўленні нацыянальнае літаратуры, ва ўтварэнні літаратурнае беларускае мовы, у фармаванні новае беларускае інтэлігенцыі.

**Гарадскі гуманізм.** Новы культурны рух пачаўся перш за ўсё ў літоўска-беларускіх гарадах, куды пачалі пранікаць новыя рэфармацыйныя ідэі, якія, аднак, не пусцілі глыбокіх карэнняў у асяроддзі гарадскога грамадства. Барацьба паміж гарадскім станам і землеўласнікамі за эканамічныя прывілеі хутка паставіла мяшчанства ў варожыя адносіны да шляхецтва і да каталіцызму і пратэстантызму, паколькі апошнія станавіліся рэлігіяй варожага да мяшчанства стану. Барацьба са шляхецтвам і нападкі католікаў на праваслаўных прыдалі гарадскому гуманістычнаму руху нацыянальна-рэлігійны характар, што атрымала сваё выяўленне ў звязку з царкоўнай уніяй 1596 г. Гарадскі гуманістычны рух меў замкнёны характар і не выходзіў за межы горада. Вёска заставалася па-за сферай уплыву гарадской культуры.

**Друкарні.** Паказчыкам культурнага руху на Беларусі можа служыць друкаванне кніг. Першая беларуская друкарня была адчынена ў 1525 г. у Вільні, куды была перанесена друкарня з Прагі, адчыненая там беларускім вучоным Францыскам Скарынам. У палове XVI ст. ужо функцыянавалі друкарні ў Вільні, Нясвіжы, Заблудаве, дзе працавалі рускія друкары Іван Фёдараў і Пётра Мсціславец, уцёкшы з Масквы. Асаблівае значэнне мела друкарня братоў Мамонічаў у Вільні. Дзякуючы пашырэнню друкарскае справы стала даступным Святое Пісьмо, пераложанае на народную мову, а гэтаксама разнастайныя апалагетычныя і дагматычныя творы, спрыяючыя павелічэнню цікавасці да рэлігійных пытанняў і рэлігійнае творчасці.

**Гуманіст Францішак Скарына.** Ураджэнец Полацка, Францішак Скарына скончыў Кракаўскі універсітэт, затым вучыўся ў Падуанскім універсітэце ў Італіі. У 1517 г. Скарына быў у чэшскай Празе, дзе і залажыў першую беларускую друкарню. Палажыўшы ў аснову чэшскія пераклады Бібліі і Псалтыра, Скарына задумаў перакласці на беларускую жывую мову і надрукаваць іх. Але не ўсё задуманае магло быць выканана. Біблію Скарына выдаў не поўнасцю (22 кнігі). У 1519 г. Скарына перасяліўся ў Вільню, дзе залажыў друкарню пры падтрыманні бурмістра Якуба Бабіча. Першай кнігай, надрукованай у Вільні, быў Апостал (1525); затым паявілася царкоўнаславянская «Малая подорожная кніжіца». На гэтым і спынялася выдавецкая праца Скарыны. У 1530 г. друкарня згарэла ў часе пажару. Матэрыяльнае становішча Скарыны пагоршала. Культурная дзейнасць мусіла з канечнасці прыпыніцца. Кнігі, выданыя Францішкам Скарынам, хутка разышліся, але наступныя друкары надавалі нававыданым кнігам знадворны выгляд выданняў Скарыны. Перакладаючы Святое Пісьмо на родную мову, Скарына стараўся зрабіць яго даступным, зразумелым

для шырокіх народных гушчаў. Для Скарыны Святое Пісьмо мае аграмаднае маральна-наўчальнае значэнне як крыніца жыццёвай мудрасці і Боскай праўды.

**Сымон Будны.** Ураджэнец Беларусі, Сымон Будны атрымаў адукацыю ў Кракаўскай акадэміі, гаварыў і пісаў на беларускай і польскай мовах. Ён ведаў гэтаксама мовы: чэшскую, лацінскую, італьянскую, а гэтаксама грэцкую і яўрэйскую. Прытрымліваючыся кальвінізму, Сымон Будны быў пастарам у мястэчку Клецку, а затым пачаў схіляцца ў бок сацыніянства. Пакінуўшы сваё пастарства, С. Будны знайшоў прытулак і апеку ў багатага магната Яна Кішкі ў мястэчку Лоску. З С. Будным узнаўляецца традыцыя друкавання кніг на беларускай мове. У 1562 г. ён надрукаваў у Нясвіжскай друкарні кнігу «О оправданіі грешного человека перед Богом». З мэтай шырокага распаўсюджання пратэстантызму С. Будны друкуе там жа «Катэхізіс для простых людей руского языка в пытаніях і отказах». З 1579 г. Сымон Будны выдаў Біблію, перакладзеную на польскую мову, прызначаную для польскіх сацыніян. Яна была выдана ў Нясвіжы. З выданнем Біблііі на польскай мове Сымон Будны перастаў друкаваць кнігі на беларускай мове. Прычыны гэтага дагэтуль не высветлены. Магчыма, што прычынай гэтага была тая няўдача, якая спаткала яго Катэхізіс. Выдаючы на беларускай мове свой Катэхізіс, Сымон Будны меў на ўвазе як інтарэсы рэлігійнай прапаганды, так і развіццё беларускае мовы. Для С. Буднага ўсе мовы раўнапраўны, на ўсіх мовах можна «słówka pod niebiosa wynosić». Адзіную мову ў пытаннях рэлігійных С. Будны называе глупствам.

**Васіль Цяпінскі.** Традыцыі Скарыны і Буднага ў далейшым цягу праводзіліся Васілём Цяпінскім, беларусінам па нацыянальнасці. Аб яго асобе мала што вядома. Спачатку ён быў пратэстантам, затым пачаў схіляцца ў бок сацыніянства. Яго сувязь з Будным не падлягае ніякаму сумненню. Абмылковыя погляды тых вучоных, якія лічаць В. Цяпінскага праваслаўным. В. Цяпінскі заканчвае нацыянальна-культурную справу, пачатую Ф. Скарынам і С. Будным. Ён перакладае на родную мову Евангелле. Матывам нацыянальна-культурнай дзейнасці Цяпінскага было замілаванне да свайго «зацного» народа. Перакладчыку Евангелля было цяжка, што беларускі народ у сучасны момант карыстаецца няўвагай. В. Цяпінскі высока ставіць славян, якія «з давного часу» на сваёй мове «слово Божіе выложілі і мелі і нам зоставілі». Заняпад нацыянальна-рэлігійнага пачуцця ў сучасным перакладчыку грамадстве ён тлумачыць адступленнем ад сваёй нацыянальнасці. Грубасць, рэлігійная няразвітасць, умысловы і маральны заняпад правадыроў народа — духавенства — усё гэта вельмі балюча адгукаецца на В. Цяпінскім. Гэта выклікала ў яго гарачае жаданне прыйсці на дапамогу свайму народу і прычыніцца да яго культурнага адраджэння, тым больш што «духоўныя настаўнікі пісьма рускага і слова Божага не знаюць, не разумеюць і не наўчаюцца». Праца, задуманая перакладчыкам, спаткала шмат перашкод на шляху да свайго здзяйснення, як з боку ўладык, гэтак і паасобных асоб, якія ганілі яе і не давалі ніякае дапамогі. Не звяртаючы ўвагі на розныя непрыемнасці, Цяпінскі прыступіў да сваёй надзвы-

чай адказнай і канечнай у культурна-нацыянальных адносінах працы. Знаёмасць з Евангеллем будзе, па думцы Цяпінскага, крыніцай далейшага духоўнага развіцця, бо «Бог пробудіт ку можнейшім наукам в слове своем ку стоточному розсудку і ку умеетності». У сваім перакладзе Цяпінскі стараўся быць дакладным і зразумелым прастатою сваёй мовы. Перакладчык лічыць, што ў яго працы могуць быць абмылкі, але ён просіць чытача не тлумачыць гэтых абмылак «нашой злості, але люцкой крепкості а неумеетності». З вялікімі матэрыяльнымі труднасцямі Цяпінскі пабудаваў на свой кошт «убогую друкарню», у якой і надрукаваў Евангелле Мацея, Марка і частку Лукаша. Пакінуты самому сабе і не падтрыманы грэцкімі коламі, варожымі пратэстантызму і яго навацыям, В. Цяпінскі не мог давесці да канца задуманае справы.

**Браты Мамонічы.** Кузьма і Лукаш Мамонічы ўяўляюць сабой тып гуманістаў іншага характару. Віленскія мяшчане Мамонічы адчынілі пры дапамозе маскоўскага эмігранта Пятра Мсціслаўца друкарню. Мамонічы былі прадстаўнікамі артадаксальнае царкоўнае асветы. У іх друкарні друкаваліся кнігі на царкоўнаславянскай мове: Евангелле (1574), Псалтыр (1575). Культурная дзейнасць братоў Мамонічаў супала з націскам польскай матэрыяльнай і духоўнай культуры ў асобе іезуітаў, якая ў значнай меры змяніла матэрыяльнае становішча беларускага мяшчанства. Прадстаўнікі гэтае артадаксальнае асветы вельмі добра разумелі канечнасць асветы для барацьбы з іезуіцкімі сафізмамі, у паасобку — грунтоўную знаёмасць з кнігамі ўсходніх багасловаў: Дыяніса Арэапагіта, Яна Златавуста, Яна Дамаскіна і інш. Мамонічы падтрымлівалі перапіску з кансерватыўнымі дзеячамі шляхецкага гуманізму, з князем Андрэем Міхайлавічам Курбскім.

**Шляхецкія гуманісты.** Гуманістычныя тэндэнцыі праніклі і ў шляхецкае асяроддзе. Развіццё народнае гаспадаркі спрыяла награмаджэнню капіталу ў руках землеўласніцкага саслоўя. Гэта дало магчымасць падарожнічаць па Еўропе паасобным асобам са шляхты. Шляхціцы не толькі падарожнічалі, але і вучыліся ў германскіх і італьянскіх універсітэтах, адкуль прывозілі з сабой нахіл да асветы, замілаванне да навукі і пазнання, імкненне да прышчаплення новых рэлігійных ідэй. Новая культура змяніла быт шляхецтва. Яна спрыяла пашырэнню тут роскашы. Новыя культурныя павевы і настроі выклікалі ў часткі шляхецтва кансерватыўную рэакцыю, якая, аднак, усведамляла канечнасць шырокае асветы, хоць бы і ў старацаркоўным духу.

**Гуманіст-кансерватар князь Курбскі.** Цэнтрам кансерватыўнага кірунку ў беларускім гуманізме быў князь А. М. Курбскі, эмігрант з суседняй Масковіі. Курбскі — прыхільнік стараправаслаўнай традыцыі і абаронца арыстакратыі ў Маскве. На Літве-Беларусі маскоўскі ўцякач быў прыняты гасцінна і атрымаў ад вялікага князя Ковельскае староства (1564). Стыкаючыся з прадстаўнікамі беларускае шляхты, князь А. М. Курбскі аднёсся адмоўна да новае асветы. Начытаны ў Святым Пісьме і кнігах айцоў царквы, князь Курбскі быў з боку інтэлектуальнага выдатнай фігурай. Ён вядзе разнастайную перапіску. У ліку яго карэспандэнтаў былі князь К. Астрожскі, браты Мамонічы, княгіня Чарта-

рыйская, вучань старца Арцёма нейкі Макар і інш. Курбскі пратэстуе супроць розных рэлігійных захапленняў, перасцярэгчы ад якіх можа толькі грунтоўная знаёмасць са Святым Пісьмом і айцамі царквы. З'яўляючыся прыхільнікам асветы, без якое немагчыма змаганне з сафізмамі іезуітаў, князь Курбскі патрабуе, каб асвета мела нацыянальна-рэлігійны характар, угрунтованы на навуцы праваслаўнае царквы. З гэтага боку Курбскі абураны ўсялякімі нападамі на праваслаўную царкву, асабліва калі пашыраныя каталіцкім касцёлам новыя догматы стараліся апраўдаць «філонізмамі Арыстотэлеўскімі». Гэтаксама адмоўна адносіўся князь Курбскі да г. зв. «вольномыслій», у выніку якіх шмат якія «апостольскіе словы превращают, развращенно толкуют і на святых хулу возлагают». І пераклад Скарынін Святога Пісьма выклікае з боку маскоўскага ўцекача адмоўныя адносіны. Новым перакладам Святога Пісьма, вельмі блізкім да перакладу Бібліі Лютэра, нельга карыстацца, каб ухіліцца спакушэння. Прыхільнік старое царкоўнае асветы, князь Курбскі лічыць канечным бараніць ад нападаў з розных бакоў праваслаўную веру. Дзеля гэтай мэты з'яўляецца канечна патрэбным пераклад царкоўна-наўчальных твораў на славянскую мову, хаця ўсе труднасці гэткае справы зусім дакладна разумеў Курбскі. З'яўляючыся прыхільнікам усходнеславянскае культуры, князь Курбскі не быў безумоўным ворагам польска-еўрапейскае культуры. Ён толькі баяўся, што моладзь, падаючы ў новыя школы, адкінецца ад праваслаўя. Гэткім быў Курбскі. Яго праграма, занадта прымітыўная, не спаткала шырокага спачування ў шляхецтве. Феадальны кансерватар, прапавядаўшы феадальную культуру ў абставінах іншых гаспадарчых адносін, не меў паслядоўцаў. Кансерватараў у шляхецкім асяроддзі было занадта мала.

**Паступовы кірунак у шляхецкім гуманізме.** Двор князя Юрыя Юр'евіча Слуцкага быў другім цэнтрам культурнага руху ў краі. Пры двары функцыянавала школа, знаходзілася тут і друкарня. Тут пражываў са сваімі вучнямі старац Арцём, які наўчаў багаслоўя і марыў рэшту сваіх дзён ахвяраваць перакладам царкоўна-наўчальных твораў на славянскую мову. У прыдворным кружку князя Слуцкага не стараліся лацінскае і грэцкае моваў. Князь Слуцкі падтрымлівае зносіны з князем Курбскім. Імкненне абодвух гуманістаў прычыніцца да адраджэння славянскае мовы было прычынай іх зближэння. Двор Слуцкага князя быў прасякнуты кансерватыўнымі тэндэнцыямі, але не гэтак скрайна выяўленымі, як пры двары князя Курбскага. Другім цэнтрам прагрэсіўнага кірунку паміж гуманістаў быў двор князя Хадкевіча ў Заблудаве, закладчыка Супрасльскага манастыра. Хадкевіч праявіў вялікае замілаванне да збірання старых кніг. Тут жа была адчынена і друкарня. У 1569 г. Хадкевіч выдаў «Кнігу зовомую Евангеліе учітельное». Шляхецкі гуманізм не быў у сваёй аснове варожы да польска-еўрапейскае культуры. Ён толькі імкнуўся да адраджэння асветы на грунце царкоўнага пісьменства і праваслаўных традыцый. Ахоўваючы сябе ад націску польскае культуры ў асобе польскага шляхецтва, шляхецкія паступовыя кансерватары, прыхільнікі асветы, варожа адносіліся да адраджэння роднае мовы. Толькі славянская мова можа быць крыніцай асветы. І гэтыя адно-

сіны цалкам тлумачацца класавай усвядомленасцю шляхецкай арыстакратыі. Апошняя павінна была замкнуцца ў сваёй уласнай культуры і адносіцца варожа да імкнення наблізіць кнігі Святога Пісьма да народнага ўразумення, звязанага вузламі паншчыны. Развіццё народнае ўсвядомленасці было не на руку землеўласніцкаму класу.

**Вынікі беларускага Адраджэння.** Беларускае Адраджэнне галоўным чынам выяўлялася ў гарадах. Кансерватыўна-шляхецкі гуманізм быў задушаны польска-еўрапейскай асветай, якая пранікла ў шляхецкае асяроддзе. Беларускае Адраджэнне — гэта эпоха росквіту старога беларускага пісьменства, залаты век беларускае літаратуры. Асабліва была пашырана перакладная літаратура. Паяўляюцца пераклады кніг Святога Пісьма, зборнікаў твораў айцоў царквы, жыццяў святых і апакрыфічных твораў, пераклады гадальных кніг, духоўных і свецкіх повесцей. Перакладаліся гэтаксама і гістарычныя творы польскіх хронік Марціна Бельскага, Мацея Стрыйкоўскага, а адначасна з гэтым укладаліся і самастойныя гістарычныя і юрыдычныя творы, як летапісы, помнікі права: граматы, акты, літоўскія Статуты 1529, 1566 і 1588 гг. Апошні быў надрукован у друкарні Мамонічаў.

**Беларускія летапісы.** Самы старажытны беларускі летапіс быў напісаны ў Смаленску пры двары вялікага князя Аляксандра ў 1495 г. і вядомы як «Летапіс Аўраамкі»; гэты летапіс спісаны паводле летапіснага збору ноўгарадскага пахаджэння, але ў яго мову былі ўнесены мясцовыя асаблівасці. Арыгінальныя літоўска-беларускія летапісы ўкладаюцца пад уплывам агульнарускіх летапісных збораў, у якія ўносіліся падзеі мясцовага характару. Мова і настроі ўкладальнікаў насілі мясцовы каларыт. Літоўска-беларускія летапісы кароткія і адорвістыя, наогул сухія. У іх няма маляўнічай вобразнасці. Літоўска-беларускія летапісцы былі знаёмы і з польскімі храністамі. Летапісы маюць многа легендарнага матэрыялу, зусім невераготнага, і не даюць магчымасці пабудаваць дакладны малюнак аб ранняй гісторыі Літоўска-Беларускае дзяржавы. Летапісы паведамляюць аб разнастайных гістарычных фактах і з'явах у прыродзе: землетрасеннях, налётах шаранчы, кліматычных пераменах, голадзе і інш. Летапісы вядомы ў дзвюх рэдакцыях: кароткай і поўнай. Апошні, вядомы пад назовай Летапіса Быхаўца, напісаны ў другой палове XVI ст. Летапіс Быхаўца прасякнуты нацыянальным элементам. Аўтар варожа адносіцца да ўсіх праціўнікаў літоўска-беларускага народа. У мове летапіса многа паланізмаў.

## 8. ШКОЛА

**Агульны характар школ.** Літоўска-беларускія школы ў XV і першай палове XVI ст. былі цесна звязаны з пашырэннем хрысціянскіх веравызнанняў. Спачатку паяўляюцца школы праваслаўныя і каталіцкія. У першай палове XVI ст. з'яўляюцца пратэстанцкія школы. Спробы аб'яднання праваслаўнай і каталіцкай цэркваў з той умовай, каб праваслаўная царква прызнала верха-

водства рымскага ўладыкі, утварылі асаблівы від школ — уніяцкіх. Нягледзячы на рознае веравызнанне, школы ўсіх відаў мелі паміж сабой адно супольнае, а іменна: спачатку школьнае наўчанне мела прафесіянальны характар і павінна было здавальняць разнастайныя запатрабаванні той або іншай царквы. Утылітарны характар школьнае справы прыдаваў школам асаблівы адбітак, але ў той жа час такая школа была ядынай крыніцай падтрымання граматнасці ў тагачасным грамадстве — шляхецтве і мяшчанстве. Дзякуючы гэтаму гэтыя канфесіянальныя школы падтрымлівалі цікавасць да асветы. Беларускае Адраджэнне ўсіх кірункаў пры адсутнасці адпаведнага культурнага асяроддзя ніколі не было культурным рухам, які б пранікаў у гушчы мяшчанскага і шляхецкага асяроддзя.

**Праваслаўныя школы.** Школьная традыцыя бярэ свой пачатак з першых момантаў хрысціянізацыі Беларусі, і развіццё яе не перапынялася, хаця тэмп гэтага развіцця то прысяшаўся, то прыпыняўся. Школьная справа знаходзілася выключна пад кіраўніцтвам духавенства. Кандыдаты на пасады прыслужнікаў праваслаўнага культу павінны былі мець адпаведную адукацыю. Яны здабывалі яе або пры манастырах, або ў дому. Пры наследнасці царкоўных пасад кантынгент школ складаўся з прадстаўнікоў духоўнага стану, які заставаўся найбольш асвечанай грамадскай групай. Духавенства ж перапісвала і кнігі царкоўна-кананічнага характару. Духоўнікі часта пісалі і разнастайныя афіцыяльныя дакументы. Асяродкамі асветы па-даўнейшаму заставаліся манастыры. У Кіева-Пячэрскім манастыры знаходзілася значная бібліятэка, складзеная з духоўных і свецкіх кніг. Пісьменнасць была пашырана як паміж шляхецтва, гэтак і паміж мяшчанства. Гандаль і гандлёвыя інтарэсы прымушалі знаёміцца з пісьменнасцю. Францішак Скарына вучыўся ў Падуі і Кракаве і, прыехаўшы з Польшчы, увесь час заставаўся верным праваслаўным традыцыям. Адчыненне друкарняў у XVI ст. і друкаванне кніг славянскага друку з'яўляліся паказчыкам таго, у якім стопні пашыралася пісьменнасць у гарадскім грамадстве. Але дзе былі адчынены праваслаўныя школы — аб гэтым амаль што не маецца даных. У эпоху беларускага Адраджэння па ініцыятыве мясцовага грамадства пачалі адчыняцца школы. Гэтак, Красластаўская школа мела апекуна ў асобе мясцовага мяшчанства. Грыгоры Аляксандравіч Хадкевіч залажыў школу ў Заблудаве пры Успенскай царкве і забяспечыў яе матэрыяльна (1567). Ёсць весткі, што была школа ў Тураве (1572). Пры Кіеўскім Міхайлаўскім манастыры функцыянавала школа, у якой падгатаўляліся духоўнікі. Чужаземец Одэрберг адзначае, што ў беларусаў ёсць звычай адчыняць школы пры цэрквах. Настаўнікамі ў гэтых школах былі панамары, дзякі, а ў школах навучалі славянскай граматы, малітваў, сімвалу веры і псалмаў. Мялеці Сматрыцкі адзначае, што з даўных-давён у школах навучалі спачатку азбукі, затым — часаслова і псалтыра. Адначасна вучылі і пісаць. Часамі выкладаліся і пачаткі арыфметыкі. У другой палове сталецця ў Літву-Беларусь пранікае культурны ўплыў з суседніх краін: Польшчы, Масквы, з суседняй Нямеччыны ў выглядзе пратэстантызму і з Усходу ў асобе грэцкай царкоўнай іерархіі. Пад уплывам

запатрабаванняў эпохі — стычкі польскага і літоўска-беларускага капіталаў, барацьбы дзвюх нацыянальных культур — польскай і літоўска-беларускай — праваслаўная школа павінна была змяніцца. Гэтая змена датычылася найбольш гарадскіх школ. Паўсталі гэтак званыя брацкія школы, росквіт якіх адносіцца да наступнага перыяду ў жыцці Літоўска-Беларускае дзяржавы.

**Каталіцкія школы.** Першыя лацінскія школы паяўляюцца ў другой палове XIV ст. На біскупах і існаваўшых пры іх капітулах ляжаў абавязак клапаціцца аб школах. Літоўска-беларуская каталіцкая школа давала пачатковае навучанне. Апрача школ кафедральных, узніклі па ініцыятыве мясцовага духавенства і парафіяльныя школы. У XV ст. вядомы толькі дзве каталіцкія школы: Віленская кафедральная і Трокская. У XVI ст. лік каталіцкіх школ павялічваецца. Адчыняліся яны духавенствам, шляхтай, магнатамі, гараджанамі, членамі каралеўскага дома. Націск пратэстантызму ў значнай меры спрыяў гэтаму школьнаму ажыўленню. Школьнае пытанне ў звязку з тым, што шляхецкая моладзь імкнулася за граніцу, каб атрымаць адукацыю ва універсітэтах, абмяркоўвалася на памясцовых саборах каталіцкага касцёла. Саборныя пастановы рэкамендавалі дакладнае і стараннае вывучэнне дзесяці запаведзяў, Евангелля, лістоў апостала Паўла, твораў добраславёнага Амброжага, а гэтаксама Цыцэрона, Віргілія, Эзопа, Сенекі і іншых класічных паэтаў і прамоўцаў. З кафедральных школ вядомы Віленская, Кіеўская, Медніцкая, Луцкая. Найстаршай была Віленская, якая з часам з прафесіянальнай сталася агульнаадукацыйнай. Са з'яўленнем іезуіцкае школы ў Вільні (1570) кафедральная школа ўтраціла сваё кіраўнічае значэнне. У працягу XVI ст. адчыніліся парафіяльныя школы ў Начах і Трабах, Мастах, Крэменцы, Новым Двары, Заблудаве, Горадні, Кіеве, адчыненая ваяводам М. Гаштольдам, у Роўне, адчыненая княгіняй Б. Астрожскай. З паяўленнем іезуітаў лік парафіяльных школ павялічваецца. Канструкцыя каталіцкіх парафіяльных школ была прымітыўная. Адзінага наўчальнага плана не было. Навучалі чытанню, пісьму, спевам, часамі — лічэнню, як гэта было і ў праваслаўных школах. Гэткае становішча навучання было нездавальняючым. Кракаўскі універсітэт выпрацаваў у пачатку XVII ст. план навучання ў заняпаўшых парафіяльных школах. Гэтае адраджэнне цесна злучана з каталіцкай рэакцыяй, перамогай польскага матэрыяльнага і культурнага ўплыву ў Літоўска-Беларускай дзяржаве. Тэрыторыя парафіяльных школ — гэта тэрыторыя Літоўскага княства. На тэрыторыі Беларусі ўплыў каталіцызму быў пакуль што нязначны і непрыкметны. Каталіцкіх школ у першай палове XVI ст. яшчэ не было.

**Уніяцкія школы.** У XV і першай палове XVI ст. яшчэ не была ўтворана ўласціва уніяцкая школа. Сама ідэя царкоўнай уніі не была ажыццёўлена. Пры гэткіх умовах рымскаму біскупу прыходзілася рабіць захады з мэтай аднаўлення разорванай у канцы XV ст. царкоўнай уніі. Папа Грыгоры XIII звярнуў на гэта асаблівую ўвагу і з гэтай мэтай утварыў грэцкую калегію (1573) для падняцця асветы ў грэцкім народзе, што можа быць ажыццёўлена толькі пры дапамозе уніі. Калегія мела сваім заданнем выхоўваць змаганнікаў за унію з Рымам.

**Пратэстанцкая школа.** Школы, заснаваныя пратэстантамі, паяўляюцца на Беларусі з паловы XVI ст. Закладчыкам пратэстанцкай школы ў Вільні быў Ян Вінклер – лютэранскі казальнік. Гэткія ж школы былі заснованы ў Коўне, Віцебску, Мерачы. Магнаты-кальвіністы, закладаючы царкоўную супольню, адначасна пры ёй адчынялі і школу. Кальвінскія школы былі адчынены пры супольнях у Вільні (Мікола Радзівіл), Біржанах, але іх развіццё прыпадае на канец XVI ст. Пратэстанцкія школы на Беларусі спачатку мелі гэткі ж характар, як школы гэткага ж тыпу ў Нямеччыне. Школа здавальняла толькі прафесіянальна-царкоўныя інтарэсы. Гэткі ж канфесіянальны характар мелі і кальвінскія школы. Але пратэстанцкія школы, дзякуючы свабодным сваім адносінам да царкоўнае традыцыі, істотна адрозніваліся ад школ праваслаўных і каталіцкіх, а гэта з'яўлялася вельмі важнай крыніцай развіцця свабоднае крытычнае мыслі.

## 9. ЛЮБЛІНСКАЯ УНІЯ

**Нахіл шляхты да уніі.** Ашляхечванне дзяржаўнага і грамадскага ўкладу Літвы-Беларусі паставіла зноў на чаргу пытанне аб уніі. Шляхта вельмі добра разумела канечнасць уніі з Польшчай і глядзела на гэтую унію як на сродак для барацьбы з магнацтвам. Напружанае знадворнае палажэнне гэтаксама штурхала шляхту ў бок уніі. На Віленскім сойме 1563 г. шляхта дабілася пастановы аб пасланні соймавай дэлегацыі для перагавораў аб уніі, але з захаваннем унутранае аўтаноміі. Перагаворы з палякамі не далі ніякіх вынікаў з тае прычыны, што ідэалам палякаў была інкарпарацыя Вялікага княства Літоўскага. Перагаворы на Варшаўскім сойме 1564 г. не далі ніякіх вынікаў, хаця літоўская дэлегацыя патрабавала толькі захавання асобных законаў і ўстанаўлення асобных судоў і адміністрацыі. Па сканчэнні сойма Жыгімонт II апублікаваў ад імя свайго і сваіх патомкаў адмову ад сваіх «дедічных» правоў на Літву з перадачай гэткіх Польшчы.

**Люблінскі сойм.** Спробы літоўска-польскага ўрада прывесці ліцвінаў і палякаў да унітарнае дамовы дагэтуль канчаліся няўдачна. Для канчатковага вырашэння унітарнага пытання Жыгімонт Аўгуст склікаў сойм у Любліне. Палякі прапанавалі завязаць унію на прынцыпах уніі 1501 г. Літоўскія магнаты не маглі прыняць гэткіх умоваў. Жадаючы выратаваць становішча, літоўская дэлегацыя пакінула Люблін. У іх адсутнасці палякі далучылі да Польшчы Падляшша і Валынь. Праз два дні была далучана і Кіеўшчына. Літоўскім паслам прыйшлося вярнуцца назад у Люблін. Адарваўшы ад Літвы гэтак панадныя для Польшчы землі, палякі ўжо не ўпіраліся на поўнай інкарпарацыі Літвы і згаджаліся зрабіць ліцвінам пэўныя ўступкі.

**Люблінская унія 1569 г.** На падставе акта аб уніі ад 1 ліпеня 1569 г. Літоўска-Беларуская дзяржава была пазбаўлена значнай часткі тэрыторыі: Падляшша, Валыні, Кіеўшчыны і літоўскага Падолля. Літва і Польшча складаюць адну дзяржаву з адным гаспадаром, які абіраецца супольна ліцвінамі і палякамі і ка-

рануецца ў Кракаве. Рада і сойм павінны быць супольныя. Замежная палітыка вядзецца ад імя абодвух народаў: завязанне дамоваў, адпраўленне паслоў адбываецца з ведама і згоды абодвух народаў. Устанаўліваецца агульная манета. Але Літва захоўвае свае законы, суды і ўрады. Палякі і ліцвіны атрымліваюць права набываць усюды сабе маёмасць. Старыя наданні застаюцца ў сіле. Урады ганаровыя і службовыя могуць раздавацца толькі асобам, прысягнуўшым каралю і кароне польскай. Шляхціцы і іх падданыя звальняюцца ад выплаты ўсялякіх падаткаў пры продажы сваіх сельскагаспадарчых прадуктаў унутры дзяржавы або пры вывазе за граніцу. Люблінская унія 1569 г. падсумавала вынікі працяжнай барацьбы палякаў за унію. Парламентарная унія 1569 г. устанаўлівала дыктатуру шляхецтва. Палітычная роль магнатаў скончылася. Яны ўтрацілі магчымасць прымаць удзел на пасяджэннях сойма па асабістым запрашэнні вялікага князя.

## ЗМЕСТ


Напісанае — застаецца ... 4

**I. Тэрыторыя і яе мінулае**

1. Агульны выгляд ... 18
2. Мінулае тэрыторыі ... 21
3. Дагістарычнае мінулае славян ... 25
4. Славяне ў эпоху каланізацыі ... 32
5. Каланізацыя тэрыторыі Беларусі і ўтварэнне беларускага народа ... 37
6. Гісторыя беларускага племення да паловы XI сталецця ... 41
   - А) Эпоха племенных саюзаў ... 41
   - Б) Утварэнне дынастычнае дзяржавы ... 43
   - В) Гандлёвыя сувязі Беларусі ... 48
   - Г) Грамадства ў эпоху дынастычнае дзяржавы ... 55
   - Д) Дзяржаўны ўклад ... 57
   - Е) Хрысціянізацыя Беларусі ... 58
   - Ж) Праўныя погляды ... 61

**II. Беларускія землі ў XI—XIII стст.**

1. Утварэнне самастойных зямель-краін ... 64

**III. Беларускія землі ў эпоху самастойнасці**

1. Гісторыя Смаленскае, Тураўскае і Полацкае зямель ... 74
2. Народная гаспадарка ... 84
3. Грамадскі ўклад ... 87
4. Палітычны ўклад ... 89
5. Царква і дзяржава ... 91
6. Заканадаўства ... 94
7. Духоўная культура ... 96
8. Палітычныя тэорыі ... 100
9. Культурныя ўплывы ... 101

**IV. Беларусь у складзе Вялікага княства Літоўскага**

1. Утварэнне дынастычнае дзяржавы ... 104
2. Магнацкая феадальная манархія ... 119
   - А) Літоўска-польскія уніі ... 119
   - Б) Нацыянальна-палітычная барацьба ў XV ст. і лёс уніі ... 122
   - В) Літва і краіны ў XV ст. ... 124
   - Г) Літоўска-Беларуская дзяржава ў барацьбе супроць уніі ... 126
   - Д) Замежная палітыка Літоўска-Беларускае дзяржавы ў XV і першай палове XVI ст. ... 128
   - Е) Нацыянальны склад Літоўска-Беларускай дзяржавы ... 133
   - Ж) Краінныя канстытуцыі ... 134
   - З) Народная гаспадарка ў XV і першай палове XVI ст. ... 137
   - І) Грамадзянскі ўклад ... 140
     1. Ваеннаслужылы клас ... 140
     2. Мяшчане ... 143
     3. Сельскае насяленне ... 146
   - К) Палітычны ўклад ... 147

Л) Царква і дзяржава ... 149
М) Заканадаўства ... 151
Н) Культурныя ўплывы ... 153
**V. Пачатак шляхецкае феадальнае дзяржавы**
1. Літоўска-польскія адносіны ... 156
2. Знадворныя адносіны ... 157
3. Аграрная рэформа ... 159
4. Палітычнае ўмацаванне шляхецтва ... 162
5. Царкоўна-рэлігійныя адносіны ... 164
6. Заканадаўства і суд ... 165
7. Беларускае Адраджэнне ... 168
8. Школа ... 173
9. Люблінская унія ... 176

Навуковае выданне

**Scriptor universitatis**

**Пічэта** Уладзімір Іванавіч

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ**

Адказны за выпуск *А. І. Трушко*
Мастак вокладкі *Л. У. Ледзенева*
Карэктары *Н. Б. Кучмель, Г. А. Рабянкова, Н. Г. Шчарбакова*
Камп'ютэрная вёрстка *К. А. Крэнь*

Падпісана да друку 14.01.2005. Фармат 70×100/16. Папера афсетная.
Гарнітура Пецярбург. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 15,16. Ул.-выд. арк. 11,46.
Тыраж 1000 экз. Зак. 757.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага універсітэта».
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць № 02330/0056919 ад 01.04.2004.
Ліцэнзія на паліграфічную дзейнасць № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ЦЕНТР БГУ

В серии
«SCRIPTOR UNIVERSITATIS»
вышли следующие издания:




***Чарняўскі М. М.* Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі: Першабытны перыяд**

У кнізе папулярна апавядаецца пра старажытнейшы перыяд гісторыі Беларусі — ад першапачатковага засялення краю ў ледавіковую эпоху і да эпохі Вялікага перасялення народаў. Кніга багата ілюстравана малюнкамі і фотаздымкамі археалагічных матэрыялаў, картамі, схемамі і рэканструкцыямі.

Адрасуецца вучням, а таксама ўсім неабыякавым да айчыннай гісторыі.




***Пичета В. И.* История белорусского народа**

Издание приурочено к 125-летию со дня рождения замечательного ученого-историка, одного из создателей и первого ректора БГУ, одного из организаторов Инбелкульта и НАН Беларуси, Института славяноведения и кафедры истории южных и западных славян МГУ академика Владимира Ивановича Пичеты (1878—1947). В книгу вошли труды «История белорусского народа» и «История Литовского государства до Люблинской унии», не переиздававшиеся со дня их первого выхода в свет. Они посвящены истории Беларуси и соответствуют главному кругу проблем, которые интересовали ученого.

Адресуется преподавателям истории, студентам, а также всем тем, кто интересуется жизнью и научным наследием В. И. Пичеты.




***Бригадин П. И., Лукашевич А. М.* Военная школа в Беларуси, XVIII — первая четверть XIX в.**

В книге рассказывается о становлении военной школы в Беларуси в XVIII — первой четверти XIX в.: от первых военных школ времен Речи Посполитой до создания сети военно-учебных заведений в Российской империи. Прослеживается эволюция взглядов на военное образование, раскрывается процесс подготовки реформы военной школы в начале XIX в. На примере ярких образов екатерининской эпохи (С. Г. Зорич и его окружение) показывается деятельность Шкловского благородного училища — первого учебного заведения в Беларуси, готовившего офицерские кадры для российской армии.

Адресуется всем, кто интересуется отечественной и военной историей.




**Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края**

Книга «Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края», изданная в 1890 г. П. Н. Батюшковым, долгое время считалась одной из фундаментальных работ, посвященных церковной, военной и политической истории Беларуси с древнейших времен до XIX в.

Адресуется историкам, студентам, аспирантам, а также всем тем, кто интересуется историей Беларуси.

---

Эти издания можно приобрести в книжных киосках РУП «Издательский центр БГУ»:
Минск, пр-т Ф. Скорины, 4 (главный корпус БГУ),
Минск, ул. К. Маркса, 31 (филологический факультет),
Минск, ул. Ленинградская, 14 (химический факультет),
а также в книжных магазинах республики.

*По вопросу оптового приобретения изданий за безналичный расчет обращаться:*
тел./факс (017) 227-87-71.

*Для писем:* 220030, Минск, ул. Красноармейская, 6. РУП «Издательский центр БГУ».



# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ



ISBN 985-476-157-6

9 799854 761571

ВЫДАВЕЦКІ ЦЭНТР БДУ

У. І. Пічэта

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ